# ПАСЛЯВАЕННАЯ ВЁСКА ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ Ў ДЫСКУРСЕ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ



Зборнік матэрыялаў экспедыцый
Цэнтра вуснай гісторыі
і палявых даследаванняў




ДЗІСЕНСКАЯ ФАЛЬКЛОРНА-ЭТНАГРАФІЧНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ 2019 ГОДА

Этнаграфічная палявая група студэнтаў першага курса вочнай формы атрымання адукацыі гуманітарнага факультэта спецыяльнасці 1-21 03 01 "Гісторыя (па напрамках)" Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта з кіраўнікамі практыкі.

Намётавы лагер знаходзіўся побач з г. Дзісна (0,5 км ад в. Бычыншчына). Выбар месца для лагера быў абумоўлены зручным размяшчэннем і канцэнтрацыяй паселішчаў у вывучаемым мікрарэгіёне, а таксама багатай гісторыяй і спецыфічным культурным ландшафтам, сфарміраваным не толькі беларусамі, але і яўрэямі, палякамі, рускімі старaверамі. Геаграфія даследавання ахапіла г. Дзісну, населеныя пункты Мікалаеўскага, Завуцьеўскага, Туркаўскага сельсавета Мёрскага раёна Віцебскай вобласці, а таксама Астроўшчынскага сельсавета Полацкага, асобныя вёскі Верхнядзвінскага раёнаў.

Падчас практыкі было апытана 123 чалавекі, зафіксавана больш за 110 гадзін аўдыё- і відэазапісаў.

ISBN 978-985-531-897-3
9 789855 318973

ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
імя Еўфрасінні Полацкай

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

# ПАСЛЯВАЕННАЯ ВЁСКА ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ Ў ДЫСКУРСЕ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ

Зборнік матэрыялаў экспедыцый
Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай
2024

УДК 39(075.8)
ББК 65.521(=411)-71я43
П19

Рэкамендавана да выдання саветам Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта
імя Еўфрасінні Полацкай (пратакол № 4 ад 02.12.2024 г.)

СКЛАДАЛЬНІКІ:

канд. гіст. навук, дац. А. В. СУМКО (прадм., раздз. 1, 2, 3);
канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК (прадм., раздз. 3, 4, 5)

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

канд. гіст. нав., дац., загад. сектара захавання фальклорнай спадчыны
Цэнтра беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі
Ю. І. ВНУКОВІЧ;
канд. гіст. нав., дац., выклад. гісторыі
Віцебскага кадэцкага вучылішча
М. В. ПІВАВАР

**Пасляваенная вёска Паўночнай Беларусі ў дыскурсе вуснай гісторыі:**
П19 зб. матэрыялаў экспед. Ц-ра вусн. гісторыі і паляв. даслед. / склад., прадм. А. В. Сумко, У. Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т імя Еўфрасінні Полацкай, 2024. – 192 с., 20 іл.
ISBN 978-985-531-897-3.

У зборніку прадстаўлены ўспаміны жыхароў Віцебшчыны, якія адлюстроўваюць чалавечае бачанне гісторыі – гісторыі пасляваеннага аднаўлення з пункту гледжання прадстаўніка вясковай супольнасці, які ва ўмовах татальнага разбурэння беларускай вёскі рэалізоўваў усе рэсурсы дзеля стварэння аптымальных жыццёвых умоў для ўласнай сям'і (вёскі, дзяржавы). Біяграфічныя наратывы, прадстаўленыя ў зборніку, маюць не толькі навуковы, але і адукацыйны патэнцыял, бо перыяд аднаўлення пасля Вялікай Айчыннай Вайны – гэта перыяд крышталізацыі характару, пошуку жыццёвых магчымасцей.

Прызначаны для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей, даследчыкаў у галіне гісторыі і народазнаўства, а таксама для ўсіх, хто цікавіцца мінулым роднага краю.

**УДК 39(075.8)**
**ББК 65.521(=411)-71я43**

На вокладцы: «Дзеці парцізана Іспраўнікава на папялішчы свайго дома», в. Лазаватка Суражскага р-на. Віцебская вобл. 1945 г. З фондаў установы «Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў».

**ISBN 978-985-531-897-3**
© Сумко А. В., Аўсейчык У. Я., складанне, 2024
© «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай», 2024

# ПРАДМОВА

Выданне “Пасляваенная вёска Паўночнай Беларусі ў дыскурсе вуснай гісторыі” акумулюе матэрыялы экспедыцый Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай (раней – Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта). Аўтэнтычныя фальклорна-этнаграфічныя і вуснагістарычныя запісы адлюстроўваюць асобныя старонкі з жыцця вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі пасля вызвалення ад нацысцкай акупацыі і ў перыяд пасляваеннага аднаўлення. Некаторыя прадстаўленыя ў зборніку фрагменты інтэрв’ю ўтрымліваюць успаміны непасрэдна пра падзеі Вялікай Айчыннай Вайны, якая стала своеасаблівай “зарубкай на сэрдцы”, што застаецца ў чалавека на ўсё жыццё. Завяршэнне адной з самых спусташальных войн у гісторыі краіны таксама знайшло адлюстраванне ў жывой народнай памяці, і іншы раз менавіта з яго пачыналася размова: “*Як вайна закончылася, ай, сколькі радасці было! Ай, крычалі!!!! Уся дзярэўня крычала!!!*”

Пасляваенная вёска знаходзілася ў вельмі неспрыяльнай эканамічнай сітуацыі, вяскоўцы вымушаны былі рэалізаваць увесь свой патэнцыял, каб вырашаць надзённыя праблемы жыццезабеспячэння сваёй сям'і, паралельна прыкладаючы тытанічныя намаганні для аднаўлення сельскагаспадарчай вытворчасці. Гэта асобная старонка ў гісторыі пасляваеннага перыяду – праява беспрэцэдэнтнага працоўнага подзвігу беларускага сялянства, якое ў надзвычай складаных умовах змагло ліквідаваць наступствы нацысцкай акупацыі і вайны: “*Як вайна кончылася, як плуг цянулі! Жэрдзіна длінная і плуг прывязаны. За плугом, з гэтай стараны мы пад грудзямі дзяржом палку – 10 чалавек нас было. Нас пяць дзяўчынак, а там жанчыны. Мальчык за плугом, ручкі трасуцца… Які там мальчык? 15 гадкоў, можа… І як запяюць, калі зусім цяжка: «Вставай, страна огромная…». Пагурачак узаром – так рады, што ўзаром! Узаралі на сабе 5 сотак, а тады схадзіць у Бароўку, каб семяны якой узяць, каб заўтра пасеяць…* ***Каб не мае ручкі****…. Зямельку нада было ўзараць, каб хлебец быў на прылаўку. Гэта ж мы ўсё сеялі! А тады сажнем рукамі і малоцім палачкамі…* ***Гэта мы ўсё вастанавілі!***”[1].

Вусны дыскурс пра пасляваенную рэчаіснасць разнастайны і шматпланавы. Безумоўна, кожны ўспамін – гэта гісторыя канкрэтнага чалавека, які, знаходзячыся ў пэўнай жыццёвай сітуацыі, дзейнічаў тым ці іншым чынам. Аднак на ўласны жыццёвы досвед уплывала прыналежнасць да пэўнага сацыяльна-культурнага асяроддзя, эканамічны ўклад, у межах якога жыла адпаведная сям’я, што, у сваю чаргу, вызначала нейкі ўніверсальны алгарытм

[1] Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1930 г.н, в. Цясты Верхнядзвінскага р-на.

паводзін, выбар жыццёвых стратэгій характэрных для вясковага соцыума ў цэлым.

Адлюстраванне пасляваенных рэалій у індывідуальнай памяці мае свае адметнасці, асабліва, што датычацца храналогіі тых ці іншых падзей. Таксама трэба вылучыць эмацыянальнасць успамінаў. Асабліва гэта характэрна для людзей, дзяцінства якіх прыпала на гады ваеннага ліхалецця і цяжкі перыяд пасляваенага аднаўлення. "Дзеці вайны" перажылі жахі Вялікай Айчыннай Вайны, страту родных людзей, а потым разам з дарослымі ва ўмовах разрухі і голаду ўключаліся ў аднаўленчыя і вытворчыя працэсы. Спецыфічная пасляваенная дэмаграфічная сітуацыя прывяла да пераразмяркавання ролі дзяцей і падлеткаў у сістэме жыццезабеспячэння. "Дзеці вайны" вымушаны былі адаптавацца да складаных умоў жыцця і вельмі хутка пасталець. Дарэчы, палявыя даследаванні фіксуюць праблему вызначэння рэальнага ўзросту рэспандэнтаў. Гэта тлумачыцца тым, што падчас вайны дакументы былі страчаны (гэта характэрна для насельніцтва спаленых населеных пунктаў) і яны аднаўляліся ці афармляліся ўжо ў паваенныя гады. Іншы раз узрост вызначалі па знешнім выглядзе дзіцёнка ці са слоў бацькоў. Пераважаюць запісы пра тое, што адбывалася "амалажэнне" дзяцей у афіцыйных дакументах.

Прадстаўленыя вуснагістарычныя і фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы маюць бясспрэчны інфармацыйны патэнцыял адносна рэгіянальнай гісторыі беларускай вёскі ў перыяд пасляваеннага аднаўлення, іх аналіз дапамагае скласці тагачасную карціну свету і наблізіцца да разумення гістарычнага мінулага, сфарміраваць павагу, удзячнасць і эмпатыю да старэйшага пакалення, чыё штодзённае жыццё было, па-сутнасці, подзвігам.

З мэтай захавання прыватнасці асабістых даных рэспандэнтаў пазначаецца пол: "жанчына", "мужчына", а таксама год нараджэння і месца, дзе быў зроблены запіс. Тэкст рэспандэнтаў запісаны з максімальным набліжэннем да аўтэнтычнага вымаўлення, што дазваляе перадаць яго асаблівасці, зафіксаваць эмацыянальны стан суразмоўцы і перанесці чытача ў атмасферу пасляваеннага паўночнабеларускага вясковага асяроддзя.

Выкарыстаны фотаздымкі з асабістых калекцый, архіваў Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай і ўстановы "Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў".

Праца па падрыхтоўцы зборніка праходзіла ў рамках выканання праекта БРФФД "Стратэгіі выжывання і адаптыўныя практыкі вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі ў пасляваенны перыяд" (дамова № Г23ИП-037 ад 02.05.2023 г.).

# ПАСЛЯВАЕННАЯ ВЁСКА ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ: УЗРОВЕНЬ ЖЫЦЦЯ І СТРАТЭГІІ ЖЫЦЦЕЗАБЕСПЯЧЭННЯ

Вялікая Айчынная Вайна мела катастрафічныя наступствы для Беларусі, пераадоленне якіх расцягнулася на доўгі перыяд. Чалавечыя і матэрыяльныя страты, знішчэнне тысяч паселішчаў, скарачэнне пасяўных плошчаў, ураджайнасці адмоўна адбіліся на стане пасляваеннай вёскі (“*Вайна сільна скурожыла нас*”). Найгоршыя ўмовы былі ў жыхароў раёнаў, тэрыторыя якіх стала эпіцэнтрам карных экспедыцый нацысцкіх акупантаў. Згодна з дакументамі, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, у 1946 г. статус найбольш пацярпелых раёнаў рэспублікі мелі 36 раёнаў, з якіх 13 раёнаў адносіліся да тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці (Асвейскі, Ветрынскі, Дрысенскі, Полацкі, Расонскі, Ушацкі, Гарадоцкі, Дубровенскі, Сіроцінскі, Суражскі, Чашніцкі, Лёзненскі, Мехоўскі). Як фіксуецца ў архіўных дакументах, насельніцтва гэтых раёнаў знаходзілася ў вельмі неспрыяльных умовах: “…на момант вызвалення пасяўныя плошчы складалі не больш 27% к 1940 году, коней засталося 13%, у асабістым карыстанні калгаснікаў хатняй жывелы засталося 14% к даваеннай колькасці. Насельніцтва галадавала, мелася вялікая колькасць знясіленых…”[2]. У надзвычайным становішчы апынуліся тыя, хто вяртаўся з нямецкага палону або эвакуацыі, бо яны не мелі ўласных харчовых запасаў і не маглі разлічваць на ўраджай са сваёй сядзібы. Акрамя таго, трэба ўзгадаць, што пэўны прамежак часу сем’і былі раздзеленыя падчас ваеннага ліхалецця і сустракаліся выпадкі, калі дзеці заставаліся сам на сам з праблемамі элементарнага жыццезабеспячэння. Успаміны пра гэта фіксуюцца па ўсёй тэрыторыі рэгіёна.

Адноўленыя ў першы год пасля вызвалення калгасы знаходзіліся ў цяжкім стане. Пры значным скарачэнні матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, калгасныя гаспадаркі перш за ўсё павінны былі забяспечыць неабходны ўзровень вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі для дапамогі фронту, аднаўленчых працэсаў, мабілізаваць насельніцтва на выкананне абавязковых паставак. У першыя гады пасля вызвалення ўсе работы збольшага прыходзілася выконваць сваімі рукамі ў надзвычай складаных умовах: “*Ой, страшная вешч!.. Мы ўтраём галодныя, а мама на ноч… Как эта?.. Факелам свяціла трактару, а днём кароў глядзела*”[3].

Фонды аплаты працы ў калгасах фарміраваліся па астаткаваму прынцыпу – што заставалася пасля выканання калгасамі абавязковых дзяржаўных

---

[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4-п. Воп. 29. Спр. 267. – Л. 29.
[3] Запісана ў 2019 г. ад мужчыны 1938 г.н., в. Сядлова Расонскага р-на.

паставак. Рэспандэнты сістэму аплаты ў пасляваенным калгасе называлі "калок", "палачкі" і адзначалі, што ў першыя гады пасля вызвалення на працадні амаль нічога не давалі.

Распаўсюджанай была сітуацыя, калі калгасы з найбольш пацярпелых ад нацыстаў раёнаў не маглі выканаць абавязковыя пастаўкі і разлічыцца з дзяржавай. У шэрагу калгасаў магчымасці эканамічнай дапамогі насельніцтву былі вельмі абмежаваныя, што адбівалася на ўзроўні жыцця вяскоўцаў. Напрыклад, у дакладной запісцы сакратару Полацкага абкама КП(б)Б ад 25.01.1946 г. паведамлялася наступнае: "У ходзе вызвалення Асвейскага раёна было адноўлена 74 калгасы, у якія ўваходзяць 2 200 гаспадарак. З прычыны дрэннай і позняй апрацоўкі глебы… ураджай сабраны нізкі. Вясновая сяўба яравых культур праходзіла ў вельмі цяжкіх умовах і зацягнулася да 1 ліпеня 1945 года, гэта, а таксама цяжкія кліматычныя ўмовы паўплывалі на ураджай. З 2 296 га яравых сабрана ўсяго 6 660 цэнтраў, з якіх калгас здаў дзяржаве 3 221 цэнтнер, 1 363 цэнтнера на насенне, што далёка не забяспечвае патрэбнасці для пасеву. У сувязі з існуючымі абставінамі калгасы не маюць магчымасці аплаціць працадні калгаснікаў і 800 тысяч працадняў выпрацаваных сёлета засталіся не аплачанымі. Толькі 6 калгасаў выдалі аванс па 100-200 гр на працадзень, а 65 калгасаў не выдалі ніводнага кілаграма. У выніку насельніцтва апынулася ў вельмі цяжкім становішчы і перажывае вялікія матэрыяльныя цяжкасці, не маючы зусім хлеба ці іншых прадуктаў, якія маглі б замяніць хлеб. Цяжкасці насельніцтва павялічыліся яшчэ і тым, што многія калгасныя гаспадаркі з-за адсутнасці насення не пасеялі прысядзібны ўчастак. З 2 200 гаспадаркі пасеялі на 75% – 280, на 50% – 1176, на 20% – 612, 112 гаспадарак зусім нічога не пасеялі і толькі 20 гаспадарак цалкам засеялі свой агарод <...> Усё гэта стварыла немагчымыя ўмовы жыцця людзей бо з 8 948 чалавек, якія пражываюць у раёне, 7 000 чалавек не мае зусім хлеба ці іншых сродкаў да існавання"[4]. Неспрыяльная жыццёвая сітуацыя вызначала спектр магчымых сацыяльных дзеянняў, якія прадпрымаліся вяскоўцамі, каб вырашыць праблемы элементарнага жыццезабеспячэння ў пасляваенны час.

Архіўныя дакументы і матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць пра тое, што жыццезабеспячэнне беларускай вёскі ў перыяд пасляваеннага аднаўлення мела сваю спецыфіку. Вельмі выразна яна прасочваецца на прыкладзе Паўночнай Беларусі (Беларускага Падзвіння), гісторыка-этнаграфічны рэгіён, што ў разглядаемы перыяд (1944 – 1954 гг.) адміністрацыйна ўваходзіў у склад Полацкай і Віцебскай абласцей, сацыяльна-эканамічныя адрозненні паміж якімі былі абумоўлены ўключэннем у склад першай раёнаў, якія ў міжваенны час уваходзілі ў склад Польшчы (Браслаўскі, Відзаўскі, Глыбоцкі,

[4] Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка (ЗДА г. Полоцка). – Ф. 143. Воп. 2. Спр. 25. – Л. 1.

Дзісненскі, Докшыцкі, Дунілавіцкі, Мёрскі, Пліскі і Шаркаўшчынскі). Дадзеную акалічнасць неаднаразова падкрэслівала кіраўніцтва Полацкай вобласці: "Сельское хозяйство Полоцкой области имеет некоторую специфичность – она объединяет районы неоднородного социально-экономического уклада: имеются районы полностью коллективизаванные и районы, где преобладает единоличное хозяйство. Это усложняет руководство"[5].

Агульная колькасць сельскага насельніцтва Віцебскай вобласці (14 раёнаў) на 1 студзеня 1945 г. складала 433, 8 тыс. чалавек (61% да даваенных даных), па ўсходніх раёнах (6 раёнаў) Полацкай вобласці – 123,5 (52,3%), па заходніх раёнах (9 раёнаў) Полацкай вобласці – 241,2 (75,5%)[6].

Такім чынам, пасля вызвалення ад нацыстаў рэгіён меў у сваім складзе не толькі раёны з неаднолькавымі стартавымі ўмовамі для пасляваеннага аднаўлення, але і раёны з рознымі тыпамі сацыяльна-эканамічнага ўкладу. На працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя сацыяльна-эканамічны і палітычны кантэкст мяняўся, а разам з ім і ўмовы жыццезабеспячэння. Неабходна адзначыць, што наратывы пра жыццё пасля вызвалення ад нацыстаў і перыяд пасляваеннага аднаўлення сведчаць пра ўзнаўленне традыцый этнічнага вопыту выжывання ў неспрыяльных умовах, а менавіта пераемнасць адмысловых мадэлей паводзін і практык, якія пастаянна рэалізуюцца этнасам, як толькі падыходзіць крызісны час. Асабліва яскрава гэта праяўлася ў сферы жыццёвых стратэгій і адаптыўных практык вясковага насельніцтва.

Прадстаўленае поле біяграфічных наратываў – гэта гісторыя пасляваеннага аднаўлення з пункту гледжання прадстаўніка вясковай грамады, якая дазволіць выявіць асаблівасці і агульныя тэндэнцыі адлюстравання ў народнай памяці пасляваеннай штодзённасці. Неабходна адзначыць, што вусны дыскурс складаецца з успамінаў рэспандэнтаў, якія адрозніваліся па свайму сацыяльнаму статусу і ўзроўню заможнасці. У адной і той жа вясковай грамадзе па-рознаму пражываліся пэўныя аспекты рэчаіснасці, што для адных было нормай, для іншых – нечым нязвыклым.

Выбар стратэгіі вясковага насельніцтва вызначалі сацыяльныя і жыццёвыя рэсурсы, магчымасць іх выкарыстання. Аналіз матэрыялаў палявых экспедыцый, якія датычаць вясковай паўсядзённасці Паўночнай Беларусі ў паваенны час, дазваляе падзяліць жыццёвыя стратэгіі паваеннага часу на некалькі тыпаў.

---

[5] ЗДА г. Полацка. – Ф. 1974. Воп. 1. Спр. 118. – Л. 74.

[6] Витебщина освобожденная: октябрь 1943 – декабрь 1945: док. и материалы / сост. Н.В. Воронова [и др.]. – Витебск: Витеб. обл. тип., 2009. – С. 241–242.

## Стратэгія выжывання і стратэгія адаптацыі – на падставе пастаўленай мэты[7]

Пад *стратэгіяй выжывання* разумееццa сукупнасць спосабаў і форм адаптацыі ва ўмовах неспрыяльнай жыццёвай сітуацыі з мэтай забяспечыць базавыя ўмовы жыццезабеспячэння (элементарнае фізіялагічнае выжыванне сялянскай сям’і). Асабліва складанымі ўмовы жыцця былі ў першыя гады пасля вызвалення, калі людзі былі вымушаны змагацца за выжыванне, максімальна выкарыстоўваючы ўсе наяўныя рэсурсы, бо вызначальным заставаўся лозунг “Усё для фронту! Усё для Перамогі!”. Стратэгія выжывання была распаўсюджана сярод насельніцтва, якое вярталася на месца цалкам знішчанай вёскі і спрабавала вырашыць праблемы элементарнага жыццезабеспячэння. У якасці прыклада можна прывесці ўспамін жыхаркі Лепельскага раёна пра вяртанне дамоў, у спаленую вёску Стайск Слабадскога сельсавета: “*Так спалілі… Былі калодцы, былі бярозы… Нічаго – усё роўна зямлі. Нічаго не асталась! Толькі попел. Печы стаялі адны… Усё згарэла. Як было 30 з лішнім двароў – усе спалілі. Прыйшлі – во, што надзета. Дождь пройдзець: снііміш, выкруціш і апяць надзел. А як жыць? Тады пайшлі па родственнікам, хто куды…*”[8].

Людзі капалі зямлянкі, жылі ў непрыстасаваных для пражывання памяшканнях, а таксама па некалькі сямей у адной хаце. Згодна з архіўнымі звесткамі, у Полацкай вобласці без прытулку засталіся 34% сельскага насельніцтва, Віцебскай – 37,3%[9] Якасць часовай забудовы і працягласць яе выкарыстання залежала ад магчымасцей той ці іншай вясковай сям’і: “*А пасля вайны мы сталі землянку капаць. У землянцы жылі, наверна, гады тры ці болей, а тады сталі строіцца. Мама, – мужчыны ж не было – дзве бабы... Бацька пайшоў да вайны ў армію і тым годам далжон быў прыйсці, а тут вайна началася. Ён і пагіб у вайну*”[10].

Успаміны вяскоўцаў фіксуюць, што вельмі актуальнай была праблема фізічнага выжывання на спустошанай тэрыторыі, калі пагроза гвалтоўнай смерці знікла, а на першае месца выйшла пагроза смерці ад голаду. У складанай жыццёвай сітуацыі знаходзіліся сем’і, якія засталіся без бацькі і мелі абмежаваны рэсурс для аднаўлення. Безумоўна, выбар стратэгіі вызначалі сацыяльныя і жыццёвыя рэсурсы (мабілізацыя асабістых рэсурсаў і рэсурсаў прыроднага ландшафту), магчымасць іх аптымальна выкарыстоўваць.

---

[7] Сумко А.В. Жыццёвыя стратэгіі вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі ў пасляваенны перыяд // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гуманітар. навукі.– 2024. – № 1(69). – С. 84–87.
[8] Запісана ў 2023 г. ад жанчыны 1937 г.н., г. Лепель.
[9] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4-п. Воп. 29. Спр. 267. – Л. 35.
[10] Запісана ў 2022 г. ад жанчыны 1936 г.н., в. Багданава Сенненскага р-на.

У паваенныя гады насельніцтва, якое пражывала ў населеных пунктах, дзе ступень разбурэння была нязначная ці ўвогуле адсутнічала, з аднаго боку, мела лепшыя стартавыя ўмовы для аднаўлення, але з другога – пасляваенная рэчаіснасць адрознівалася ад звычайных умоў жыццядзейнасці і вымушала выпрацоўваць адмысловую мадэль, якая прадугледжвала выбар адаптыўных практык, магчымасць пераразмяркоўваць жыццёвыя і сацыяльныя рэсурсы з мэтай дасягнуць аптымальнага ўзроўню жыццезабеспячэння.

*Стратэгія адаптацыі* практыкавалася, пераважна, у раёнах з аднаасобнымі гаспадаркамі (Браслаўскі, Відзаўскі, Глыбоцкі, Дзісенскі, Докшыцкі, Дунілавіцкі, Мёрскі, Плiскі і Шаркаўшчынскі) і калектывізаванымі раёнамі, якія знаходзіліся ў зоне адноснай стабільнасці (ступень разбурэння нязначная ці ўвогуле адсутнічала). З большага стратэгія адаптацыі насіла кампрамісны характар. Як паказвае аналіз архіўных дакументаў і матэрыялаў вуснай гісторыі, ва ўмовах неспрыяльных жыццёвых абставін пераважалі рацыяльныя паводзіны, а прадстаўленне пра сацыяльную справядлівасць пэўным чынам трансфарміраваліся.

Неабходна адзначыць, што іншы раз складана вызначыць выразную мяжу паміж стратэгіямі. Вялікае значэнне мелі такія фактары, як ступень разбуранасці мясцовасці, наяўнасць працаздольных членаў сям’і і магчымасць апрацоўваць зямлю, месца ў іерархічнай лесвіцы, сацыяльны клімат у вясковай грамадзе.

### Стратэгіі па форме ці спосабе рэалізацыі мэты

Такія стратэгіі (у залежнасці ад мэтанакіраванасці) былі прадстаўлены наступнымі:

– вяртанне да натуральнай гаспадаркі, якая дазваляла дасягнуць пэўнай ступені гаспадарчай аўтаномнасці і, у залежнасці ад запатрабаванняў сям’і, праз абмен рэсурсамі забяспечыць сябе неабходнымі прадуктамі харчавання, сыравінай, адзеннем і прадметамі паўсядзённага жыцця;

– жабрацтва – прашэнне міласціны давала магчымасць не толькі пазбегнуць галоднай смерці, але і атрымаць рэсурсы для аднаўлення асабістай гаспадаркі. Жабраваць хадзілі ў раёны, якія найбольш ацалелі пасля вайны, а таксама па раёнах, дзе пераважаў адзінаасобны сектар;

– адыходніцтва практыкавалася пераважна працаздольным насельніцтвам, дазваляла атрымаць рэсурсы для аднаўлення гаспадаркі і дасягнення пэўнага ўзроўню дабрабыту;

– нетыповыя формы эканамічнай і гандлёвай актыўнасці сялян дазвалялі атрымаць грошы, неабходныя для набыцця тых прадуктаў і прамысловых тавараў, што нельга было вырабіць ў межах сваёй гаспадаркі, а таксама для ўплаты падаткаў і пакупкі аблігацый дзяржаўных займаў;

– выкарыстанне дзіцячай працы (ступень выкарыстання і практыкі адрозніваліся ў залежнасці ад узроўню жыцця канкрэтнай сям'і)[11].

Вызначэнне дадзеных відаў стратэгіі мае істотную геаграфічную дэтэрмінаванасць. Адна сям'я магла выкарыстоўваць адначасова розныя стратэгіі: весці натуральную гаспадарку, практыкаваць жабрацтва ці адыходніцтва, пашыранае выкарыстанне дзіцячай працы і г.д.

Рэспандэнты ўзгадвалі, што ваенная рэчаіснасць пасля вызвалення захавала сваю злабадзённасць. Пагроза для жыцця, перш за ўсё, зыходзіла ад узброенага супраціву, які дзейнічаў у заходніх раёнах (Глыбоцкі, Пастаўскі, Дзісенскі, Шаркаўшчынскі, Дунілавіцкі, Браслаўскі, Мёрскі, Відзаўскі, Докшыцкі) з больш высокай ступенню антысавецкага настрою, абумоўленай непрыняццем пэўнай часткай грамадства савецкіх парадкаў, якія былі ўсталяваны пасля 1939 г. Рэспандэнты з заходніх раёнаў адзначалі стракатасць узброеных атрадаў, якія праследавалі розныя мэты. Аналіз успамінаў, захаваных у архіве Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, сведчыць пра тое, што пасля татальнага гвалту перыяду акупацыі любыя нелегальныя групы са зброяй у руках успрымаліся вясковай большасцю (хіба, за выключэннем блізкіх сваякоў), як патэнцыяльная пагроза ва ўжо мірны (пасля вызвалення) час і ў большасці выпадкаў ідэнтыфікаваліся як бандыты. Сур'езную небяспеку для жыцця прадстаўлялі замініраваныя ворныя палі, бальшакі, ускраіны лесу і г.д. Успаміны фіксуюць даныя пра ахвяры і няшчасныя выпадкі ад кінутых боепрыпасаў і схаваных мін. Прычым большасць аповедаў прыходзіцца на ўсходнія раёны рэгіёна.

Размешчаныя аўтэнтычныя біяграфічныя наратывы дазваляюць зразумець стартавыя ўмовы пасляваеннага аднаўлення ў межах Паўночнай Беларусі, узровень дабрабыту вясковага насельніцтва ў канкрэтным раёне, а таксама выбар жыццёвых стратэгій.

***А. В. Сумко***

[11] Сумко А.В. Жыццёвыя стратэгіі вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі ў пасляваенны перыяд // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гуманітар. навукі.– 2024. – № 1(69). – С. 84–87.

## “Людзі пасля вайны, пакуль схваціліся, – трудно было”

Асяродкі. Іх спалілі немцы. [*А ў Асяродках ці многа двароў было да вайны?*] Да вайны было многа двароў. Да вайны нямнога было зямлі, нямнога, бо было дужа людзей. Аб’явілі – вайна, не ўспелі аглянуцца – танкі прышлі. А потым і Махірова спалілі, а мы пашлі ў лес сюда і Махірова тожэ пашлі ў лес. Сядзелі ў землянках. [*Так, а вы ў лесе ці доўга жылі?*] Доўга, вот вайна началася в іюне месяцэ, а мы сядзелі – мароз ужэ стаў, ужэ замёрзла вада ў балоце (мы ж ваду з балота бралі, не выхадзілі з леса). А тады прышлі старыкі, падзелалі тут у дзярэўне землянкі і ў гэтыя землянкі адзін на аднаго – цесна было. А мужыкоў забралі на фронт. А патом яшчэ раз спалілі.

[*А як у землянках жылі, ці сеялі што?*] Сеялі, хадзілі міластыню прасілі, дзе не палена было. Там людзі спакайней жылі, іх так немцы не беспакоілі, як тут. А тут Баравуха, радам немцы гэты, эсэсаўцы – гэта самае страшнае! З мамай мы ідзём, тады відзяць, што рэбяты. А тут жа, знаеце? Вот, напрымер, у Махерове жэ зналі друг друга, вот, ілі ў Кушліках вот там. [*Ну і што давалі вот так?*] Вот, ну малака маглі наліць і маглі зерна даць. [*Болей хадзілі па знакомых людзях?*] Не, ішлі проста, ішлі па дзярэўні і ўсё. Як у хату прыйдзеш, так мама плачыць і мы стаім, нам там што-нібудзь дадуць у руку. Там хлеб такі пяклі, хоць цёмны, але пяклі, а мы ж тут не пяклі нічога, у нас не было: тока пасеялі яшчэ, іюнь месяц. Шчаўлю насабіраець мама і картошка, каторая згніўшая калхозная на полі высахла, такая белая стала, як крахмал. Пірагі такія пяклі, але сціснуць зубы нельзя было, сільна пясок, ну яго ж не аддзелаеш, крахмал тот ад песка. Вот, а яны нам хлеба, хто хлеба, хто дранік. Памагалі, выжывалі троху. [*А якую можа ешчэ травічку, каб вот есці? Можа, крапіву?*] Крапіву ж варылі, шчаўлю нада было дабавіць, каб кіславата троху было, і ўсё – не было нічога тады. А болей нічога, па людзях хадзілі прасілі, а такім баяліся атравіцца. Бо атраўляліся людзі.

[*А ці была соль?*] А ў зямле была закапаная ў каждага. Эта да вайны, ужэ як во сказалі, што вайна будзець, ну ўжэ пашла па дзярэўні, – дзярэўня жэ эта ж вечна, у горадзе дык не так, а ў дзярэўне запугалі адзін аднаго і ўжэ началі закапываць. І вот, хто мяшок, хто два, хто сколькі мог. Закапалі ў гэты ямы, дзе калі-та бульбу сахранялі.

А тады ж калхоз вастанаўлівалі, а работаць жа нада было. А ўжэ ў нас гады падыйшлі – сястра з дваццаць шастога, а я з дваццаць васьмога. Вот такіе дзяўчаты цягалі плуг. Касіць наўчылі нас, ужэ якія старыкі нам косы атаб’юць, а мы пайшлі ўжэ ўбіраць осенню – касілі гэтыя зернавыя. Тады малацілку нам прыцянулі такую, рукамі нада круціць было ўдзвюх-утрох, меняліся. Круцілі гэту малацілку, малацілі гэтае зярно.

Вырасцім буракі сахарныя, а затым ім, а яны гарэлку гоняць. [*Каму?*] Так гэта дзеравенцам, каторыя багата жылі, каторыя грошы маглі плаціць, а мы ім плацілі буракамі. [*А чаму яны былі багатыя?*] Мужыкі былі, а ў нас нікога. Семена даставалі абыяк: хто дасць ці выпрасім. Людзі пасля вайны, пакуль схваціліся, – трудно было. Мы ім буракі, а яны нам боты ці плацця. Буракоў сеялі много, бо зерна не было. Яны нагоняць самагонкі і прадаюць. З буракоў гналі і абменівалі ў гэтых… Пайдзець мама, і тады гімнасцёркі гэтыя з вошамі – кіпятком, а тады выскрабець гэтым жалезным, гэтым, як ножык, выскрабець, і нам тады цётка шыла (радня наша), нам, ну адзявання. Мы раздзетыя былі. [*Гэта выменівалі ў Баравухе?*] Да-да-да… Там усё выменівалі.

[*А вот, як немцаў прагналі, ці хадзілі ў Западную? Гаворaць, там, што багацей жылі?*] Людзі туды хадзілі, але нас не любілі. Але ж есці хочацца! З мамай пойдзеш, – усё ж хатомачак нейкі дадуць. Мы ў Дзісну і ў Луначарск хадзілі. Пяшком адсюль туды. Вот мы прыхадзілі, а ў іх былі, дажэ работніц дзержалі! Скоту многа, яны столькі хазяйства дзяржалі і работніц (работалі за яду). Тожэ бедныя работалі. [*А ці часта вы хадзілі туды?*] Часта хадзілі, хадзілі часта – з’ядзём і пашлі апяць. [*Так эта вот как называлась “па жабраках” ці “па старцах”?*] “Жабракі” звалі, канешна. [*А вот, як у хату прыходзілі, як прасілі?*] Мама крэсцілась. Помню, перакрысціцца, вот, плакала часта, калі нічога давалі, і саседзі хадзілі з намі. [*А вот як з мамай хадзілі па жабраках, ну а сваё ці сталі ўжо сеяць паціхоньку?*] Усё сеялі, дзе дом быў, маме камні, помню, выкачываць памагалі старыкі гэты. Распахавалі і сеялі. І лён дажэ сеялі, а тады вымачывалі лён. Ну, панімаеце? Рассцілают так, а тады дзелаюць валакно, а тады прадуць. І мама ткала і дзелала простынь там якую. Кросны. Я дажэ не магу вам сказаць. У старых былі кросны, а дзе яны іх сахранялі? Як палілі? Як іх вот, ілі іх дзелалі?.. Я знала касіць, плуг цягаць, малаціць – во гэта нас маладых усюды затыкалі дыркі.

[*А мама хлеб ці пекла свой?*] Яна пякла тады, калі нас асвабадзілі. У бочку паставіць, закісліць, замешаець, маленькіх піражкоў накачаець, гэта ўжо нам на заўтрак, а тады буханкі бальшыя і хлеба ўжо мы елі ўволю. У нас ужо свой быў хлеб. Тады ў нас камбайнаў ж не было, а палкамі малацілі, малолі ў такія жорны круглыя і пяклі хлеб. [*Ці дабаўлялі чаго? Можа, бульбы?*] Бульбу – абязацельна, каб закісла! Гэта так. Ён рыхлейшы тады хлеб быў, мяккі…

[*А вось, Вы казалі, што мама гімнасцёркі выменівала. А яшчэ, можа, сукенку з чаго шылі? Вось казалі, што нейкую плёнку пакупалі?*] Нямецкія плёнкі. Я не знаю, што яны імі дзелалі. Тады кіпятком абварываеш і вот так во лупіш, как пер’я, і тады гэты кусок палучаецца. Ну, бальшы кусок – метры

два з лішнім. Ну, плацце палучалася, вот. Помню, і карычневае, і зялёные… А што немцы дзелалі з ім, – і сягодня не магу знаць. Ну, плёнкі былі і кіпятком аблівалі, і партніха, наша цётка, радня мне была, нам шыла ўсё врэмя. І ўжо мы дзеўкамі сталі, ужо сталі мы на танцы хадзіць, і ўжо ў нас былі такія “шолкавыя” плацці – называлі іх. [*А на ногі што абуць?*] А на ногі – сапожнік быў. І гэты сапожнік з сапагоў з нейкіх… Не знаю, якія там сапагі, ці керзавыя, ці якія, – лодачкі шыў нам. І мы гэты лодачкі толькі на танцы, а так – туды ідзём босые і з танцаў ідзём босые, каб не знасіць. [*А вы яму што-та давалі ўзамен?*] Да, давалі. У яго сям’я была. То буракоў, то капусты – хто чаго. Што сям’я бальшая была сільна. [*А мама на рынак у Баравуху хадзіла?*] Хадзіла, мама хадзіла. Меняла больш на трапкі. З гімнасцёркі юбка палучалась.

После вайны ўжо хлеб дзешавей стаў. Без вайны ўжо не страшна, толька былі б грошы. А іх не было. А патамушта робілі на трудадзень. А на трудадзень – дзвесці грам гірсы дадут такой, каторая втары сорт ідзець зярно. Зярно гасударству аддаваць нада, а гірсу гэту нада есці. А яна калючая, ніякая! Хлеб неўкусны палучаўся, вот. [*Так, а дзе тую капеечку ўзяць? Можа, вот, што прадавалі? Ці як?*] А тады ўжо, як мы купілі цялушачку маленькую, выгадавалі карову ўжо, тады ў Баравухе сталі такіе баракі строіць і ў гэтых бараках сем’і афіцэрскіе жылі. І вот тады туды мы малако насілі. Сабярэ мама там літр малака. Там не давалі столькі, якое там малако? У бутылкі (былі такіе бальшые), і гэтат літр нясеш, а тады ўжо прыдзеш і хлеба прынясеш буханку. Гэта была бальшая разніца, што хлеб быў куплены, харошы, не такі як гірса, а гірса і крапіва ўмесце – плахое. [*Так гірсу з крапівай разам?*] Змалолі, гэта атварыш. Рэшата такое было, а на рэшата і льюць густую крапіву, туда гэта паложаць. Туда, у гэту гірсу, троху бульбы, крапівы натаўчэць вот такое мама, і так во елі. Несмачна было. [*А вот, прымерна, што вы елі раніцай, у абед, увечары? Колькі разоў елі ў дзень?*] Калі два, калі раз, – як палучалась. Есці мала, галадалі. І робілі, і ўжо зямлю пахалі, і ўсё. Не знаю, як вам сказаць? З вайны сталі прыхадзіць нашы мужыкі, і як яны прыйшлі, сталі камандаваць: хто брыгадзірам, хто прэдседацелем. Вот так прама і сказаць, нічога ў нас не было лішняга, – галодныя. Фасоль прывязуць, дык яшчэ і паспораць, калі, скока нам даць. Фасоль гэту чорную…

Рыбу елі. Прадухі рабілі – дыркі там дзелалі, ну, прабівалі, а туды лезла рыба. Многа ў мамы, многа было рыбы. Яна накідаець, а тады перавозім вечарам на санках, памагаем маме. [*Эта з таго азярка?*] З гэтага азяра, яно бальшое было, а цяпер тут не паймёш. [*А што вы с той рыбай дзелалі?*] Аж у Полацк насілі прадавалі. І самі елі. Мама ўжо курэй сваіх завяла пасля вайны. Яйцо якое ёсць, і тады нада шкурку сняць, ад касці, ад рабрыны, шчука бальшая, мяса нада парэзаць, а тады туда яйцо ўбіць і мукі троху,

шкурку зашыць і ў кіпяток, і ўкусная сільна рыба, вот такую. Сільна ўкусная рыба была. [*Так мама хадзіла прадаваць рыбу ці гэту фаршыраваную*?] Сястра мая ўжо насіла прадаваць, мама мая толька знала, как згатаўляць, а сестра насіла аж у Полацк, пяшком хадзіла. Ідуць з саседнім з кім-небудзь, ну, каб назіраў, што яна яшчэ маладая была. [*Так яна сырую рыбу прадавала ілі вот то, што фаршыраваную?*] Замёрзлую. Яна ў клеці налажыла на гэты, такія засекі, дзе пустыя. Гэта зімой.

[*А вот у якім годзе вы ўжэ хату паставілі сваю?*] У сорак васьмым. У сорак дзевятым я ўжэ замуж вышла. [*Хто хату ставіў вам? У вас жа мама да сестра толькі?*] Старыкі, каторые тут. Да, нанімаліся, а што дзелаць? Ужо карова ў нас была і ў Баравуху да работы ўжо хадзіла я, малако насіла. [*Да работы?*] Да работы. Нада ў тры часы ночы. І вот мы хадзілі, ну вот такія, у каторых мужыкі ўжо пагіблі з рэбятамі асталіся, і я з імі. І якое малако надоем, такое няслі ў гарадок і прадавалі, і сабіралі. Во сабралі на зрублю – плацілі, лес дармавы быў нам. Дарма быў нам і на доскі тожэ давалі нам. А за пілку нада даць, а нада грошы. Апяць, пакуль сабярэш гэтыя грошы. [*Ну вот і ў колькі гэта хата абышлася? Колькі вот трэба было сабраць?*] Многа, многа. Як і цяпер, дык гэта нічога не значыла, а тады многа было. Нашу малако, сабіраю, а хочацца… Ужо хлеб сталі даваць у магазіне, а хочацца ж хлеба добрага, ня хочацца ўжо гэтых галушак есці, з гірсы каторыя. [*А вот малако вы ўжо нейкім сваім знакомым насілі, ужо дагаворана было?*] Да, пастаянные. Я прыхажу, а мне банкі стаяць пастаўленые, і вот я наліваю, нада так наліваць, каб было наліта поўна. [*Дык, а вам тое малако ці даставалася?*] Барані Бог! Якое там?! Толька зналі падаіць. Варылі такую калатуху і рады былі, што па верху малако плаваець. А патом да нас бабушка прыйшла. Выгналі к маме, а мама вдава, мужыка нет, дзве дзеўкі-сіроты. Што дзелаць? Нада бабулю к сабе браць. Узялі бабулю. Вот і ў нас лішній рот быў ужэ. А яна, бедненькая, у ягады хадзіла, сабірала, а я тады ў Баравуху насіла, прадавала. А там куплялі "камандзіршы", – гэтак звалі іх. І чарніцы, – усё. І клюкву осенню вёдрамі сабіралі і насілі. Балоты бальшые, клюквы было многа. [*І вот афіцэрскія жоны пакупалі*?] Да, яны пакупалі, да. Былі харошыя, а былі і плахія. А прыйдзеш, бываець, ужэ яны з белай мукі пяклі булачкі, начынялі іх там, каторы вот бальшы празнік, а малако нада жэ, рэбяты былі ў іх малые, – нада. Прынясеш, а яны: тазік стаіць, а ў тазіку гэты булкі ўкусные, такіе, піражкі разные. Ну што, калі плакала. Усяк было! Плакала, так хацела. [*Ці ўгашчалі?*] Ну былі, што ўгашчалі, а былі дажэ возьмець і палаценчыка накінець ілі што-небудзь, каб і ня відзела. [*А Вы калі белую муку ўвідзелі?*] Ну калі дзелалі, тады і ўвідзелі, ну ўжэ сталі ў сельпо даваць і нам ужэ давалі. [*Эта ў якіх гадах прымерна?*] Наверна пяцьдзесят с чэм-та ўжэ. Ужэ ржаная

мука стала. Хлеб ужэ пяклі са ржаной мукі, з жыта. Вот, эта ўжэ хлеб харошый! Мама спячэць, – рыхлый, харошы. І белая мука стала, а еслі ня белая, то тады пшаніцу куплялі, помню. Самі і змелем, і смачные булкі вкусные былі.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1928 г.н. (нарадзілася ў в. Асяродкі) у в. Махірова Полацкага р-на***

**"Мама з сорак пятага года ўсё на сваіх плечыках!"**

43 год, парцізаншчына пачці асвабадзіла, ані ж ужэ на сябе кое-што калхоз запахаў, для фронта нужна. 44 год, ужэ ш спакойна яны там пахалі, а мы асвабадзіліся ў 45 годзе і прыехалі дамой, у калхозе ўжо што-та было. Прадседацель сказал: "Не хочаш галадаць, бегі на поле!". Калхоз убрал ячмень, калхоз убрал рож, а каласкоў сколькі ж на гэтым полі, і мы, дзеці, хадзілі, бывала па такому мяшочку каласкоў саберём, на печке сядзім, вот так палушчым. А ў дзярэўні камні ж асталіся, – жорны, – немцы ж іх з сабой не забралі. Ізмелілі мучышку, а на заўтра мама спечот што-небудзь, а на заўтра мама зацірку сдзелаець. [*І многа вас такіх маленькіх хадзілі па полю, сабіралі каласкі?*] Так дзярэўня ж, хто дзе быў: хто ў Літве, хто на Западзе, хто ў балоце сядзеў. Нашы родственікі ў балоце прасядзелі, майго дваюрад-нага браціка, ён быў камандзір парцізанскага атрада, на глазах убілі.

[*Так вы ж прыехалі ў ліпені, нічога не было свайго, как вы жылі? Вы казалі, што дом на печцы дзяржаўся?*] А людзі добрыя, па бульбенкі давалі, садзілі дзе-та сотак дзесяць-дваццаць картошын. [*А што, людзі проста так давалі, ці можа мама жабраваць хадзіла, гаварат, што сільна многа жабракоў хадзілі?*] Каждый асвабаждзёный хадзіў. То есць, у цебя было какое-то тряп'ё, кусок мацерыялу – метр, хадзілі па-дзеревням, хто даст, хто вымяніець. Большы к Літве сюды хадзілі. Патом к Велікім Лукам хадзілі, кругом. Мама хадзіла. Карочы сабіралі па свету. Вот первае Радство, мы прыехалі ў іюле ўжо, а там сабіралі і тое-сёе ў людзей, і калхоз даваў трошкі, і з сабеса трошкі давалі, чуць-чуць. Помню, мама пут палучыла мукі гэтай, хоць горкая, а тюльку дзелалі. Первае Раждзество, мароз, халодна, у хаце халодна, а мы на печке ўсе вот так радком ляжым. Первае Раждзество, а мы нічога не елі, нічога ў нас нет. Ляжым ціханька, і ўдруг мама з'яўляееца пад утра. А, можа, я ня помню врэмя, і мама дастала ў рыбакоў дзе-та на возеры, нескалька рыбін. Яна кажа: "У нас сёння празднік, сення рыба!". Помню атварыла картошачкі і вот эту рыбку. Мы ўсе селі на печкі, а печка ўжэ цёпленькая была, і мама гаварыць: "Ну вот, паздравляю вас з празднікам, сягодня Раждзество!". І мы ўсе наеліся, усе давольныя былі. А хлеб толькі на Раждзество і Пасху, – мы другога дня не зналі ў тыя годы.

Крапіву сабіралі. Прыязжалі к нам са свету за крапівой, з гарадоў, вот хто галадаў страшно! Тады мяшкамі сабіралі, спрашывалі: “Дзе які кустарнік, дзе лучшэ крапіва расцёт?” Сабіралі, дзетачка, гэтую крапіву. Мы самі пачці галадалі і к нам каждый дзень па дзесяць чалавек прыхадзілі: “Што-небудзь дайце”. Каму бульбіну, каму дзве, каму лепёшку, каму бліночак, каму какой заціράчкі даш паесці, людзі галодныя.

У нас мама па свету сабірала картошачку. Папа ў сорак пятым гаду пагіб, не было. І мама з сорак пятага года ўсё на сваіх плечыках! А картошачку, зімой на мароз, утром мёрзлую зварыць у печкі, патом, как абычна, вады, еслі дастанеш капельку дражэй на базары (пасля вайны ўсяго было на базары), і вот стаяць бочкі дзерэвяныя, тады такімі падсцілкамі, крышкі ж такой нет, яно там быр-быр-быр-быр, а тады жалезную бочку друг другу адалжалі, пара кірпічэй, пад ніз касцёрчык гэты, ана і капець. [*А што значыць вынуждзена?*] Свадзьба старшай сестры, а дзе ана вазьмёт што? Ну вот яна немножка выгнала, наўчылі там саседзі, а саседзі – да, то ў сарае, то ў лясочку, то дзе-та. [*А ў дзярэўні хто-небудзь прадаваў гэтую самагонку?*] Я не знаю, ну ў нас не было такога, што кто-та прадаваў, еслі нада, ён цябе дасць бутылачку, дзве, а патом ты ему кагда-небудзь атдасі.

[*А вот мама ваша, ана адна з дзецьмі асталась пасля вайны, папа пагіб, а нада ж было налогі плаціць пасля вайны, вот сорак пяты ж, сорак шастой, сорак седзьмой?*] Правільна, за каждый куст смародзінкі, нада было плаціць. Людзі выкапывалі і сжыгалі. А прыйдзець з гэтых налогаў: “А дзе ты відзеш, што ў мяне кусты? У меня нічога нет”. Ён прыйдзець, носам паверціць, ён такой жа чалавек, как і ўсе, ён знаіць ўсё.

[*А каровка калі паявілася?*] А кароўку я лічна, з мамай… Я была ў сядзьмом класе. Хадзілі ў Вялікія Лукі, ну, там жа ж больша асвабаждзена, – і купілі кароўку за восем тысяч. [*А дзе ж вы столька ўзялі?*] А гэтыя дзеньгі былі пустыя, но яны ж даваеныя, послеваеныя аставаліся эці. Сабіралі, што вазілі, хто даваў, а тады складчыну складалі, каму нада. [*Так вы кароўку ў складчыну пакупалі ілі толька на сваю сям’ю?*] Не-не, я гавару, еслі эці восем тысяч у дзеньгі перавесці, ну я не буду падробнасці, ну калхоз памагаў, хто мог, і собствена, всегда ж яны с сабой вазілі, дзеньгі гэці. Я как помню, вот малыя ж былі, і ў лагеры, і ўсюды, дзе-та ж, каля нагі быў падвязаны такой вот, как лента всё раўно, ці ў пояс, а там эці савецкія дзеньгі ўсё врэмя. А мама кажыць: “А вдруг асвабадзяць, а вдруг паможуць?!”. Вот так усе дзелалі.

Калі кароўка паявілася, мама насіла ў Віцебску, на Смаленскі рынак, грошы нада было, каб вучыцца. [*А вам што-небудзь аставалась малачко тое, ілі всё шло на рынак?*] Мама сабірала нам, ана цэлую недзельку сёстрам

не давала, ана толька перагонае давала. Хадзілі к саседзям, был апарат у адной бабкі на дзярэўні, і очэрэдзь выстраівалася, слівачную смятанку на базар, а гэты гончак себе. А малая мая сястра гаварыць: “Мамачка, ну дай мне папробаваць гэтага малака, я ўжо не магу гэты перажон есці”… А хазяйка каждая, каторая прыдзёт, – літр малака атліваець. Ну, тая ўжо дасць апарат гэты.

А калі я ўжо ў Віцебску жыла, калі вучылася, у сорак васьмомпяцідзесятам, мая хазяйка ўставала ў тры часа ночы і шла к магазіну, занімала очэрэдзь, а патом мужыкі на работу, ані жа галодныя, ані вот так, штурмам, – вжых, усе ў старане. Ані палучаць хлеб, а эці стаяць ні з чэм. А тады прадавец гаворыць: “Хлеб закончыўся, хлеба больша нет”.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1931 г.н. у г. Дзісна (нарадзілася ў Віцебскім р-не, там правяла і першыя паваенныя гады)***

### “Забіць у нас нікога не забілі, толькі што спалілі дзярэўню”

У Мажуйках радзілась, тут жыла, тут і вайну правяла. Тут усё. …Вось сядзім мы на дварэ, лятуць самалёты... І кругом дзярэўні абляцелі і паляцелі, абгледзелі так вот, нямецкія самалёты. А мы на дварэ, і папа мой, мама была і я з імі, там яшчэ жэншчына радам сядзела, саседка прыйшоўшы. Гэтыя паляцелі, а цэраз, можа, паўчаса, можа, болей троху, чатыры самалёты і вот началі квасіць дзярэўню. Збамбілі ўсё. Папалілі многа. Многа хат спалілі, кідалі бутылкі, кідалі такія, як начоўкі, а ў іх міны. Такая вот вузкая, но длінная такая… а там мін наложана. Вот яны тады начоўкі кідаюць, міны тыя рассыпаюцца, разлетаюцца, рвецца дзе што. І раніла некалькі і, праўда, забіць ў нас нікога не забіла. Уцяклі ў балота, у лес, хто ў раку, хто куды… А патом сабралі немцы ўсіх, там сарай такі стаяў, думалі, што спалюць там. Патом людзей усіх пагналі на Селішчы. У касцёл запёрлі. Хто ў нізу быў, хто на вярху, у кляштаре, хто дзе. Вот мы пераначавалі ў гэтым касцёле, а назаўтра выгналі нас, тут каля касцёла паставілі мужчын маладых, каторыя былі. Усіх у шарэнгу паставілі, жаншчын маладых тоже аддельна, а старыков і рабят аддзельна – ў трэццю шарэнгу. Маладых забралі і павязлі… А нас усіх сабралі. Старыкоў, абсалютных старыкоў, каторым ужо па семдзясят было, і старухі. Вот мой папа быў ужо стары і мама, немцы іх не бралі ўжэ, не нада ім былі. А я малая, а брата забралі, і дзядзьку забралі... Ну, а нас сарганізавалі немцы кругом такія, такія пры баках небальшэнькія лапаткі балтаюцца, як вот сёння гляджу на іх, і сабакі ў руках ў іх, і кругом нас. І за

кладбішча туды нас за пагналі, у Селішчах за кладбішча. Вот, гонюць, а пакуль жа зайшлі тут усе, а едзець конна немец і ў руках дзяржыць вот пакет, вот так ляжыць, у руках. Вот яны забалбаталі между сабой тут, як ужо нас туды за кладбішча прыгналі. Сталі, загыркалі па-сваему яны, сабраліся ўжо в места. І да таго, хто на кані прыехаў. І вот пагаварылі яны там, между сабой, і ён гэты пакет ім паказаў, яны там што-та чыталі, глядзелі. А мы ж стаім усе, глядзім, што тут далей будзець. Сейчас прышлі, пераводчык сказаў: "Ідзіце ў тую дзярэўню і там распалагайцесь па хатах". Ну вот, як адпусцілі, тады ўжо пашлі мы туды, у тую дзярэўню, у Дарожкавічы. І ў гэтых Дарожкавічах былі дзве нядзелі па людзях, па хатах разышліся. Там яшчо брыгадзір был у іх. І ён тады пастанавіў, дзе ў каго, у каго па скольркі чалавек. Вядома ж, дзярэўня не бальшая, а тут жа парадашна людзей прыгналі. Ну, вот і пабылі, пабылі пака мы там, пабылі, тут ужо меней стала... То парцізаны, то немцы; то парцізаны, то немцы. Во так. Ну, і после рашылі сысці дамоў. Вярнуліся дамоў, а немцы яшчэ былі тут, мы вярнулісь і ў бане жылі. Хата згарэла. Усё згарэла. І хлявы, і хата, – усё. Толькі баня была далёка так, у кустах баня асталася. Ну вот і ў этай бане тады, – банька старая была, – і жылі. Пасля таго, як асвабадзілі, як немцаў не стала, як ужо, як ужо стала свабодна, тады ўжо папа стаў робіць маленькую хатку.

[*Ну вот, можа, у вайну рабілі абыдзенную наметку?*] У блакаду рабілі. У нас ткалі. Сабраліся ўсе жаншчыны, і эта яшчэ згарэўшы не былі мы, пака бамбіць яшчэ (не пачалі) эта было. І пралі лён, пралі, ніткі робілі, пралі, пралі цэлы дзень. Усё пралі, а снавалі палаценца такое – "намётка" называлася. Палаценца длінnаватае такое. А снавалі жаншчыны і выткалі за дзень. Выткалі, а тады ўсе кругом, гэтыя (жанчыны), кругом дзярэўні абыйшлі з гэтай намёткай. А ўжо ў Празарокі не маглі занесці яе за тое, што ну, ноч ўжо засцігла, не справілісі. А назаўтра ў дзвюх жаншчыны насілі ў Празарокі, у цэркаў эту намётку. Ну вот, забіць ў нас нікога не забілі, толькі што спалілі дзярэўню, а забіць нікога не забілі.

[*А што кушалі?*] Вот хадзілі, сабіралі шчаўлюк на поле рос. Палявы шчаўлюк такі, нізкі. І ён не цвеціць, а красненькія пупышачкі на ім такія. Вот эта красненькая (пупышачкі) сморгалі, сушылі, і ў ступе таўклі. Яшчэ сабіралі бульбу на полі каўхозную, капалі, дзе астаўшыся была. Ну яе ж не паравоўраў ж ніхто, а бульба ж астаецца. Там такі крахмал. Ну, гніллё, гніллё. Палюры. Во, палюры. Ужо і забылась. Палюры капаць хадзілі, вот эці палюры мы сабіралі. І тады шчаўлюк этат, палюры, і вот кленцы былі. І гэта мама размочыць, яно скользкае. Злепіць, укусныя, кісленькія. Крапіву мы ня елі. Вот ня елі. Мы болей шчаўлюк елі этат, і шчавель ужэ, як стаў. Шчавель тожа варылі, но яго многа нада, ён жыдкі, многа нада яго. А вот шчаўлюк такі

суханькі, падсушыць мама яго і зробіць гэткія смачныя кленцы. [*І нават мукі не дабаўлялі?*] Не было. Не было ж ніякай мукі, паначалу нічога ж не было, як прышлі. Гарод жа не пахалі, нічога ж не было. Ну вот так і гаравалі. Пасцепенна, пасцепенна…После, як сталі ягады, сталі грыбы, хаділі ж, сабіралі, але і ў лес баяліся ісці. Многа ж было бітых у лесе… Ляжыць чалавек, а хто, – адкуль мы знаем? [*Што, так і ляжалі?*] Да. После ўжо сталі тады, як тут раён арганізаваўся, ужо начальства стала тады, ужо сталі прыязжаць, сталі сабіраць людзей. [*А ці хадзілі на заробкі ў Западную?*] У Западную хадзілі, к ім на работу хадзілі. Жалі, кароў пасцілі… Хлебам плацілі, а то скацініну якую дадуць. Ну вот так. Ад іх і начыналі жыць.

Хадзілі ваўкі, рады не было. Хадзілі ваўкі, стаямі. Дык ў бане, помню, палажыў, – што ён там, я не знаю, дзе ён што браў. Палажыў, і вот жа ждаў, што прыйдзе воўк. Быў нейкі, нейкі абрэз, нашоў нейкі абрэз. Было накідана ж тады ўсяго-ўсяго, было накідана ўсякага гэтага аружыя было, так быў нейкі атрэз, аддаў после яго. І гэта, і ў бані праз ваконца пілнаваў гэтага ваўка. Забіў, тады паставіў назаўтра на такі казёл, што дровы рэзаць, тады ўжо і рэбяты этыя прыбягалі ўсе глядзець этага ваўка, што забіў бацька.

У Празарокі ж хадзілі на базар. Там ўсё было. Прыязжалі машыны… І обуў прывазілі, і прадукты прывазілі. І яны ўсё прадавалі там, што мелі. І скаціна была на базары, і свіней прадавалі, і кароў, і падцёлкаў – усё, што было ў іх там. Адкрыты базар быў. [*Так, а вот за што купляць было, як грошай няма?*] Так вот купляць за неваштa… А як ягады сталі, дык ягады насілі прадаваць. Капейку за ягады там заробюць, у іх ягад не было, у іх там лесу нет. Ну вот ягад ужо после, як пабольше, сабяром, панясём, прададзём. [*Эта ўжо дзеці болей?*] Да, дзеці хадзілі. А так, яшчэ менялі. У каго, вот у лесе нахадзілі машынкі. Свае ж, сваё тут усё. Усё згарэла, усё разбамбілі, нічога не было. Што было, – тое ўсё прапала. А вот у лесе можна было знасці рознае. Вот, ну дак вот, па лесе, хто не баяўся, па лесе хадзіў. Найдуць дзе машынку якую, дзе адзежыну якую, дзе што – дамоў прывязуць. Мама за свае чулкі купіла курыцу адну. Цяпер жа чулков нет – калготкі, а тады ж былі чулкі. І ў яе былі чулочкі. Яна іх прывязала на сябе і ў блакаду насіла. Як і немцы туды гналі, і яна ішла з гэтымі, – з прывязкай з гэтай. І вот эты чулочкі вынасіла, а тады, як ужо можна было ў западную хадзіць, пашла на базар туды і ў жаншчыны выменела на эты чулкі курыцу. Во, як жылі, началі жыць, очень цяжало было.

Не было нічога. Хадзілі так, у лахманах, якія былі. А после ўжо, после, мусіць, цераз год які, учыцель быў ужо, школа была ўжо ў Кублічах. Тады давалі па пяцьдзесят рублей на рабёнка, ужо сталі плаціць, што яны ўжо, як сіроты эта асталіся. І вот эта, ну, мала папалучалі, ну можа поўгода папалучалі

эты грошы. У Полацку ўжо можна было з’ездзіць на базар, поезд хадзіў. Паеду, палаценцаў куплю (мацерыяла дужа не было – палаценца прадавалі). Палаценцаў куплю, рубашкі пашыю з гэтых палаценцаў. Вот так жылі, што перагаравалі, Бог знаець, Бог знаець…

Як ужо блакада эта прайшла, як асвабадзілі стаў жа калхоз арганізавацца сразу. Коней ж не было, нічога, капалі лапатай па сколькі там. Нада ж сеяць што... Ну сколькі лапатай ускапаеш? Я малая яшчэ была. Мама пойдзе капаць, капаем. Хадзіла з мамай пахаць гэту зямлю, хадзілі. А после, тады ўжо якім та парадкам коні сталі. І тады ўжо баранавалі на конях, і сеялі гэты сотачкі, сеялі панямножку. Што там, што там сеялі, што там якая лапатамі накапалі, ды нядужыя ўсе былі, якія там…Жаншчыны былі, старыкі былі, маладых жа не было, нікога маладых – старыкі толькі, а маладыя ўсе ў Германіі былі.

Пасля вайны сразу, там жа не плацілі. А што будуць плаціць? Чым? Плаціць жа, нечам плаціць жа. Хадзілі, хадзілі жалі сярпочкам, жалі тое ўсё, што сеялі, сярпочкам сабіралі. Гэтым сярпком жалі ўсё поле, сколькі там пасеялі, аббівалі ўручную пранікам сколькіх там снапоў тых было. Аббівалі пранікам, усё арфавалі – гэта ўжо на семя к будушчыму году.

Дзень пісалі, дзень труда, дзень – пісалі трудадзень. Нічаго не палучалі, сначала нічаго, а после там, як ўжо сталі грэчку сеяць, паболей тут ўсяго. Тады па трошачку давалі, па дзвесце грам на дзень там, па трыста грам на дзень давалі ў канцы года. Давалі зярно, грэчку давалі, помню вот.

Судзілі строга, судзілі строга. Вот я вам раскажу. У нас была такая, быў мусіць 47 год ілі с 47 на 48 год. Было нечага ж есці. Было ў сястры трое рабят. Мужыка ж забралі ў Германію, і тады яны (улады) адправілі на шэсць гадоў (у савецкі лагер). Як асвабадзілі іх там, адправілі на шэсць гадоў. Што ён ў партызанах быў, а іх там немцы акружылі. Забралі парцізана этага, забралі немцы. Ну і ўсё. А як ты? Страляйся, но не здавайся. Ну і вот, после, як іх там асвабадзілі ў Германіі, адправілі на шэсць гадоў на север, а яна тут адна с рабятамі была. …Яны ехалі за сенам. Ужо падцёлачак ў яе быў, купіла дзе-та. Ці калхоз, быў, даў?.. Я ня знаю. І ехалі сена эта прывезці скаціне. Ідзець трактарыст з работы. Ужо трактар быў, трактарыст з работы ідзець, кажыць, што, ай, ня едзьце вы за сенам, давай ўскінем тры бабачкі жыта. А есці ж то хочацца… Ускінулі па дзесяць снапоў жыта. І вот за этыя дзесяць снапоў жыта… А сейчас дабражалацелі даказалі – відзелі, што яны прывязлі эта жыта. Яны абабілі ў торбе таго жыта. Было там вот столечкі, – сколькі там жыта таго? І вот пасадзілі. Далі восем гадоў. Асталіся дзеці адны, трое рабят асталося, а ей далі восем гадоў. І далі, ну, яны ж былі ўтраіх там, і мужчыну далі дзесяць, таму, што з імі быў. Бабе другой тоже восем (гадоў),

вот. І ў той тоже трое было. Асталісь эты дзеці, дык вот я там чатыры гады жыла з этымі рабятамі. После ўжэ дзетдом паявіўся. Есці нечага, і голыя, і ў хаце вокны адзіночныя. Сягодня вот ў нас вокны двайныя стаяць, а там яны толькі хату яшчэ пастроілі былі перад самай вайной, і хата эта была – вокны адзіночныя, яшчэ ня зробленыя былі. А маразы ж якія былі, а снягі якія былі! Намёрзнуць вокны, вот так вот роўна з рамамі, саскрабу гэты снег нажом, саскрабу, сядзім на печы. Вот так жылі.

[*А вы там як аказаліся?*] А мама адправіла туды, а яны тут с папам былі ў бані і хату робілі. Хату робілі, жыць жа недзе, вот. І вот, я з гэтымі рабятамі чатыры гады была, пакуль не паявілісь дзетдом у Селішчах. Як паявіўся ўжо ў Селішчах дзетдом, там школа на месце, там ўчыць ўжо можна было. А так хадзілі ў Зерчаніцы ў школу (чатыры кілометры). Абуць нечага, не адзець нічаго, а нада ў школу ісці ж. Дзяўчына хадзіла большая, хадзіла ў другі клас, а малец ў першы клас хадзіў. Ну, і вот тады ўжо здалі гэтых рабят у дзетдом, вот яны вучылісь, і дзякуй Богу, людзьмі сталі, людзьмі сталі, а гаравалі.

Спачатку паштальёнам робіла. Мяне ўгаварыла дзяўчына. Тады ж не пускалі з калхоза, у нас паштальён дзяўчына была, робіла. Гавораць: “Найдзі на сваё месца паштальёна, тады пусцім цябе з калхоза”. А нада ж было паспарт, паспарта ж не давалі, нада спраўка з калхоза, што цябе пускаюць, разрашаюць табе паехаць ў горад. Строіўся Новополацак і тады рухнулі ўсе ў Новополоцк, каб гэта, там як-небудзь ужо ўстроіцца. Тады ж там стройка была, і кварціры ж давалі. Туды-сюды – і кварціру палучуць. Ну, і ўсе туды страмілісь. І вот яна мяне ўгаварыла, каб я пошту насіла. Тут, ай, кажа, штодзень дваццаць пяць плоцяць. Гэта ж многа – у дзень дваццаць пяць, гэта ж нада заробіць грошы. Эта ж паработаць нада ці зжаць многа, ці скасіць многа, а касілі ж і жалі ўсё ўручную. Эта ж нада многа сотак. Ну, а я, як дурань малады, сагласілася. А эта хадзіць восем кілометраў нада было ў Кублічы, схадзіць нада ў Анікеўшчыну, сведзенья ўзяць у прэдседацеля. Занесці ў Кублічы, з Кубліч прынясці сведзення. Увесь калхоз абысці – эта, можа, пятнаццаць кілометраў за дзень нада было. Аж з ног кроў с пят ідзе, ведзь босая, абуваць жа нечага было. Мама купіла брэзентовікі такія, мальчукоўскія насы такія, былі трошку кожаныя і пяты, а эта страпак. Вот купіла такія брэзентовікі, і я ўжо ў Кублічы іду па дарозе босая. А ў Кублічы ўжо прыйдзешь ў сельсавет, стыдна босаму, ужо настаяшчая пачці дзеўка, стыдна босаму ісці ў сельсавет, там тады надзену. З Кублічэй потым зноў здзену, каб жа не парваць.

***Запісана ў 2020 г. ад жанчыны 1933 г.н.***
***у в. Мажуйкі Ушацкага р-на***

## “Мамы пашці год не было, а я з цёткай жыла”

Папа на вайне пагіб. Катлавіну не спалілі, но часць пагібла ў лесе. Небальшая вёска была – 20-30 дамоў, дзе-та 4 км ад Боркавіч. После вайны было бальшое гора, голад. Хату не спалілі, а ў вайну ўсё пазакапалі ў яму, а іх пааткрывалі. Не ў адных нас. Дом небальшы, каля дома бальшая яма – варонка ад міны, вясной вада там стаяла. Глухая сцяна ўся ў дырках… Так і жылі. Крыша з трасніка гады два-тры стаяла. Мама нажне, перакрые – наняць не за шта было. Сабіралі гільзы. Навучыліся міскі, ложкі з алюмінія дзелаць, растаплівалі і дзелалі ямкі, залівалі… Дзе-та быў разбіўшыся самалёт, і хто мог здзелаць – дзелаў. Кошыкі з лазы плялі.

Мне дзе-та было гадоў пяць… І хадзілі пахалі, і людзі ішлі шарэнгай і падбіралі гэту бульбу мерзлую. Мяне ў вочарадь не ставілі, мне адзін закіне ў карзіначку, другі… А вочарадь была такая: хто быў паследні – становіцца наперад, каб каждаму сабраць. Шчавель – не хватала. Все галодныя. Маму забралі ў Германію за каровамі, і мамы пашці год не было, а я з цёткай жыла, а яна балела. Яны сабралі гурт 200 галоў, дагналі да Польшы – атабралі, іх апяць вярнулі ў Германію… Крапіву дабаўлялі, бо шчаўля не хватала. Скатá ніякага не было. Мама з Германіі прышла, ей патом карову далі.

Як зажываліся? Цётка харашо шыла. Хто бульбіну прынясець, кусочак хлеба. Жабраваць не хадзілі. К нам прыхадзілі старыя, но мала. Адна жанчына хворая была, яна хадзіла са сваёй місачкай. Сядзіць на завалінку, ей хто-небудь штосьці дасць, яна пакушае, паспасібуе – і пашла.

Лес быў. Хадзілі з цёткай ў лес, але ён небальшы. Дроў не было, коней не было. Мы з ёй сходзім і цягнем – мне 6 гадоў было.

Бульбіну атрэзалі, дзе росцік, і садзілі… Я шуму каля хаты сабіраю – удабрэння.

Як мама прышла, карова паявілася. З каровай лягчэй. Мама стала робіць у калхозе. У Боркавічах прадавала яйкі, масла. Былі свае пакупацелі. Нада ж было і адзецца, нада налогі заплаціць, хлеба падкупіць. За папу трохі плацілі. Мама на ферме робіла, а я памагала маме.

[*Што плацілі?*] Год робілі дарма, тады на трудадні зерна. Не хватала. Жылі з агарода і каровы.

***Запісана ў 2023 г. ад жанчыны 1941 г.н.***
***у в. Каханавічы Верхнядзвінскага р-на***
***(да 1954 г. жылі ў в. Катлавіна)***

## “Мы за маму, вот як цяпер помню, за спадніцу гэдак, – я з аднаго боку, а брат з другога боку”

У нас спалілі ўсё датла ў 44-м гаду вясной, усіх выгналі з дзярэўні – і на падводы. У Зябкі ў баракі гналі нас. [*А ці прыходзілі пасля вайны з масточнай, можа, каб хлеба зарабіць?*] Прыхадзілі. У папкі сястра была, там жылі. Як сказаць? Дзярэўня… Малыя Дольцы, Вялікія Дольцы, за Кублічамі. Прыхадзілі. Тут ужо ж было, а там сільна бедната была. Тут неяк троху зямлю пахалі, ну, жылі ж людзі, а там сільна бедна жылі. Так і мы, калі нас папалілі, па жэбрах хаділі з братам. Мы за маму, вот як цяпер помню, за спадніцу гэдак, – я з аднаго боку, а брат з другога боку. Пашлі, а куды ісці? Нейкія знакомыя было… Там дзярэўня называлася Ходарава, каля Празарок. Туды пашлі жабраваць з мамай. Няма ж чаго есці! Брат наняўся там нейкіх авец пасціў у нейкай бабы. Ну, а я ж ужо з мамай пашлі жабраваць, каб хто што даў, хто што ўсыпіць там, ці хлеба кусочак дасць. А ў вадну хату прышлі: так чыста! Вот як цяпер помню, чыста, пол гэткі (даўней не красілі, як цяпер), пол гэткі белы, палавікі пасланы і эта стол белым заслана. “Ну чаго ж вы прышлі?” Ну, а нам бы сказаць… Вот як цяпер помню. “Вон з хаты!” – мама заплакала. Раз мама плача, дык і я ж плачу, ну і пашлі.

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1940 г.н. у в. Калечполле Глыбоцкага р-на***

## “Старцы! І я старчоўка была”

[*А вот жабракі тут ці хадзілі? Старцы ці жабракі?*] Хадзілі, хадзілі, ой тады хадзілі. [*Дык эта ўжо после вайны?*] Ой, да вайны я не скажу вам. Не знаю етага. А после вайны – хадзілі, хадзілі. Тады ў нас сторaж ужо бежанка была, с унучкай, хадзіла па вочарадзі, кармілася. [*Дык, а вот як іх называлі? Старцы ці нішчыя, як эта вот… жабракі? Як іх звалі такіх людзей?*] Старцы. Старцы і ўсё. Па-нашаму, па-простаму. Старцы, і я старчоўка была, і я старчоўка была. [*І дажэ еслі дзеці хадзілі, так называлі, да?*] А як жа. Усё роўна, якая разніца? [*А вот як прыходзіць старац, вот трэба даць абавязкова што-небудзь?*] Хто дась, а хто нічога не дась, хто не дась. Я помню, мы з мамай з саначкамі... па тады мама на мяне: “Ідзі ты наперад, ідзі наперад”. Яна ў адну сторану, я ў другую. Ну, дзе дадуць, дзе нічога не дадуць.

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1932 г.н. у в. Сіроціна Шумілінскага р-на***

## “Голад застаўляў усё дзелаць”

Ай, не дай Бог! Як мы выжывалі… Па первасці, первы год ляжала бульба ў людзей закапаная ў ямах. Елі гэтую бульбу старую. Яна пад вясну на крахмал дзелалася неяк…А на другі год гарод пахаць нечым было, мама нескалька бульбін пасадзіла, не знаю, дзе яна іх брала. А там адзін мужык прыйшоў ноччы і выкапаў. Ен быў бедны, беззашчытны. З голаду ўміралі ў Валатоўках. Я помню, вот бабка адна памерла, тады гэты, які бульбу быў выкапаўшы, памер з голаду, тады яшчэ адна памёрла: і сама, і сын памёр з голаду. А мы – не, мы не памёрлі, мы з сястрой хадзілі па жэбрах, па старцах. Расонскі раён очень пастрадаў, таму што тут парцізаншчына была, штаб стаяў парцізанскі, Машэраў камандаваў. І немцы весь Расонскі раён былі спаліўшы, пастраляўшы людзей і дажэ папалілі. Такія Пірагі ёсць, там ваабшчэ сабралі людзей і спалілі ў хаце – усю дзярэўню. [*Так, а куды вы жабраваць хадзілі?*] Мы хадзілі па Полацкаму раёну, яны жылі, іх не эвакуіраваў ніхто, яны агароды пахалі. Мы і хадзілі: Баравуха-1, якія дзярэўні былі – туды і хадзілі. Мы па аднаму месту цягаліся. Нас ужо зналі. Ну, берым штонебудзь – давалі людзі. Прынясем дамоў. Мама балела сільна. Яе малярыя трасла, і тады ангіна нейкая была… Не дай Бог, гланды такія – гузы! А мы прыйдзем з сястрой, а тады пойдзем у лес (мы жылі каля лесу блізенька), дроў нацягаем ей – і апяць пашлі. Так і выжылі. [*У Западную ці хадзілі?*] Да. Гэта далёка было. Помню, сабраліся ідті, гэта яшчэ 45 год быў, яшчэ вайна не кончыўшыся была. Мама і яшчэ тры жэншчыны з Валатовак, ну і я папрасілася і пайшла. Вот мы ішлі на Боркавічы, тады і прыйшлі ў Дзісну, а прыйшлі – ўжо Дзвіна была атышоўшы ад берагу. Вот так, як ад парогу да мяне – кладкі стаялі і дождж ліў… Мы пахадзілі, ніхто нам нічога не даваў. Мне па скібачке хлеба далі – і ўсё, а гэтым нічога. І мы апяць вярнуліся ў тыя Боркавічы і ногі распухлі, столькі прайшоўшы. Пабаяліся, што Дзвіна пойдзіць. Гэта, можа, март быў…

У нас адна бабка намалола апілак, троху – жменьку – чагосці дабавіла, наварыла і памерла. Страшна было, страшны голад быў! Коні здыхалі, – людзі падлу елі. Мы то не елі. Мы па старцах хадзілі. А людзі падлу елі і тады ветарынар абліваў нейкім, каб людзі падлу не елі, бо ўсялякія здыхалі, і каровы карослівыя, і коні… Аблівалі і зямлёй закапвалі, а людзі даставалі, мылі і елі. Страшна-страшна… Голад застаўляў усё дзелаць.

***Запісана ў 2019 г., ад жанчны 1935 г.н.***
***(пасля вайны жылі ў Валатоўках),***
***у в. Галоўчыцы Расонскага р-на***

## “Выгарэла ўсё!”

[*А ці бальшая семья?*] Пяць мальцаў і адна дзевачка была. Папа з мамай работалі на зямлі, у калхозе. Калхоз – 8 брыгад было пасля вайны. Тут сеялі зернавыя, лен. [*А як немцаў пагналі, у якім стане вёска была?*] Выгарэла ўсё! Адкуль-то аттуда…акоп наш быў за канавай, мы ў акопе былі. Аттуда сталі страляць. А хаты крытыя былі ўсе саломай, і як раз па ветру аттуль загарэлася, да перакростка… Выгарэла гэта часць. [*А ваш дом?*] Згарэў. [*Дзе жылі?*] У хаце тры сям’і. [*Падсяляліся там, дзе не спалена?*] Да. [*А, можа, землянкі?*] Не. У нас адна была там, адна такая, не знаю… Яны, можа, якія прэдацелі… Жылі – у тых была землянка. [*А як патом атспраіваліся? Как долго…*] Ха. Я был з 34, брат з 32…самі мы не строілі. Здесь сразу у цёткі – клець, дзе зярно, гэту паставілі на места хаты і жылі. Яна такая была – во, як комната…[*Ну там печачка была?*] Да, печка была, усё, як нада было. [*Папа дзелаў печку?*] Нет. Быў стары дзед такі, печку зделаў. У 53 гаду брат і мамаша строілі хату. [*Вы, па суці, у хату толькі ў 53 перайшлі?*] Да.

Нічога, нічога не было. Спалілі летам [*А, вот, што кушалі?*] Што шевялілася – ўсё елі. [*А што шавялілася? Можа вы з братамі на ахоту?]* Не, барані Бог! Не хадзілі. [*А можа бульбу перамершую сабіралі?*) Так гэта ж быў дзелікатэс! [*Ташноцікі – быў дзелікатэс?*] Да, а што ж. [*А што быў не делікатэс?*] Грыбы, ягады, шчавель – гэта, як гаварылі, “жывату до, а рот есці хоча” – бескаларыйны гэты шчавель, сколька ня еш, а ўсё раўно… [*А як вы яго елі?*] Варылі. Шчавель тады голы елі. Тады ж ні курыцы, нікаго не было. Дажэ асаку семена сморгалі, клевер. [*А соль?*] Не было. Дажэ яшчыкі выварвалі, дзе когда-то да вайны салілі сала, но і прапітанае соллю – пасеклі і ў чыгун, пакіпяцілі. [*А раскажыце пра делікатэс, як вы яго дабывалі той делікатэс?*] (Смяецца). Дзеці есці хацелі ўсе. Рэчка Абылянка ў нас там, яна чысценькая была, малюскі былі такія двухстворчатыя, такія як дзве ложкі ў кучу скласці, падагрэлі – раскрылась і жарылі. [*А як вы зналі, што гэта можна есць?*] Што ў рот палезла, то ўсё палезна.

[*Можа рыбу лавілі?*] Тады не лавілі, а глушылі. Сколька тады пагібла! Толам глушылі. [*А глушылі вы? Ці взрослыя?*] Хто як мог. А я адзін раз папаўся – перада мной вірок такі, і вот глушыць пайшлі. Нада ж у гэту капсуль бекордавый шнур, а то не было… Тры парашын туды, курыў… А за рыбай – я, а тады яшчэ такі ж жываглот, той падрыўнік… Яна як ахнула – 400 грам толу ў руках! Толькі кішкі паляцелі кверху… Руку і не нашлі.

***Запісана ў 2022 г. ад мужчны 1934 г.н.***
***у в. Расно Сенненскага р-на***

***

Как жылі после вайны? Цяжэла жылі, канешна, пахалі на сабе, агароды пахалі на сабе, лашадей не было. Ну і нечего было кушаць. Елі ўсяк, шчавель елі, таўкачыкі сабіралі, крапіву дабавлялі. Каровы ў нас не было. Немцы забралі ў нас карову.

Каноплю вырашчывалі. Тада ж не зналі, што. Эта было очень дэфецытнае такое расценне! Расцець такая высокая, высокая, а сцебель тоўсты, а тут тады ўжо лісця і канапля сама. Вот эту канаплю атбівалі, семена ўсё сабіралі, а сцебель мачылі ў рэчке ці сажалке. Патом яе выцягвалі і мялі (былі такія самадельные мялкі), і вот яе ложуць так вот, самнуць, патрэпюць, і з гэтага палучалася, як лён, такое: дзелалі вяроўкі, вожжы, каб коней запрагаць, вазы ўвязываць, ну на ўсё дзелалі – вяроўкі. А канаплю, як у вайну і после вайны столька, бабушка сеяла, ад мусара аддзяляла і таўкла, растірала, і палучалася такая белая, ну, не як малако, і вот у эта мачылі, аладзі дзелала. Елі семя, пяклі… Хадзілі па полю сразу, гдзе было калхознае поле, дождь, пройдзе снег, вясной эта ўжо растаець, і там, палучаецца, дзе-нібудь выкапываецца картошына. Вот этыя **гацакі зваліся**, эта сабіралі. Там толька астается адзін белы крахмал. Вот перабіралі, перамывалі і пяклі тожа неяк.

Па восені сабіралі ягады, асобенна брусніку, клюкву. Взрослым хадзіць некагда было: ім же нада было работаць, іх же тады штрафавалі, еслі так, ну, еслі, наказывалі кагда не выходзяць на работу. А дзеці хадзілі. Асобенна брусніку! Брусніку сабіралі і смажылі. Вот яе ў печку паставяць, у чугун. Как сасмажэцца, сделаецца, тада вылівалі ў бочку, сматря ў каго якая была, а зімой – картошка і во эта брусніка. Вот эта была тоже еда. Картошкі садзілі очень многа, стараліся абрабатываць. Тожа – у каго як. Кто мог, кто ня ляніўся і налажываў, і абрабатываў, у таго і картошка была, а ў каго-та яна не радзіла.

[*А што абычна утрам елі?*] Утрам елі ў каго што было. Картошку елі. [*А ваабшче разнаабразная была еда?*] Аткуда ана была разнаабразная?! Нет! Утрам елі картошку, варылі капусту, хоцьь і постную. Вот картошыну і капусту в прыхлёбку, всяк. [*А мяса елі?*] Еслі было, еслі хто сумеў вырасціць, тада да, тада запраўлялі мяса. Толька ж яго ня елі так – мяса і сала дажа. Кідалі, вот, када сталі ўжо каждый год парасёнак расціць… Халадзільнікаў жа не было. Мяса, сала засалівалі. Сколька там таго мяса?! З'ядалі, а летам ужо тады кусочак сала ў капусту эту ці суп, а тада яго разатруць і кінуць назад для ўсіх. Так і мяса калатоўкай раскалоцяць па ўсяму гаршку.

[*Гавораць, што ў калхозе пасля вайны грошы не плацілі, а давалі нейкія трудадні, а што за трудадні?*] Вот ты работаешь дзень, цябе пішуць трудадзень. А патом у канцы года ўсе эці трудадні сабіралі. Усё, што вырасла, усё

эта дзялілі, падзялілі па трудаднях. Хто заработаў больше, таму і давалі больше, а кто не работаў, не хацеў, таму меньше давалі. Давалі столька, сколька он заработал. [*А сколькі іх было?*] Кажды дзень выхадзілі, каждый дзень. Трудадзень, как і деньгі, ты можеш заработаць десяць рублей, а кто-та на другой рабоце, таму десяць з четверццю, – вот так. А кто-та может і десяць не зарабатываў. Вот такія былі трудадні. Проста, как гаварылі, палочка, палачку паставят – і ўсё. А кагда было так, што неўражай ці плоха ўрадзіла, пагода плахая, тады ўжо і нечым было расчытывацца ў канцы года. А денег у калхозе не давалі. [*Кагда людi не атрабатывалі, што з імі делалі?*] Не плацілі і ўсё. А што не атрабатывалі эты трудадні, ужо ня помню што, но садзіць у турму не садзілі. Делалі нейкае наказанне.

Налогі былі бальшыя… У нас было двое дзяцей, атец мой, значыць, вышчытывалі халасцяцкіе: нада было трое дзяцей, а ў нас было двое, вот. Нада была здаць малако, у каго карова была. Як карову нажылі тады, малако здавалі. Была абязацельна сколька літраў должен здаць. Быў такі прыказ, пятьсот літраў, можа, здаць за год, пяцьдзесят – эта я не знаю, я же дзяценкам была. [*А падаткі плацілі грашмі?*] Да. [*А аткуда тыя грошы бралі?*] А вот расцілі куріцу, прададут там…Ну, што-нібудь атец мог каму-небудзь што сделаць, каму нада, там, у дом што-нібудь, а то нада было хату зрубіць. Якія там платы былі?! Так, сабіралі… Нада ж было купіць соль, усё эта. Соль, главнае, купіць нада было, керасіна: тада ж света не было, лампы былі. [*А еслі не заплаціць, што делалі, наказывалі*?] Наказывалі, маглі і ў цюрьму пасадзіць. Маглі забраць у цябе што-ліба ў доме. Займ яшчэ быў. Вот на займ, в начале года падпісывалі на займ, ездют і падпісывают – ты должен столька і столька. Ну вот, кагда я ўже і работала, – эта ўжо мне была шаснаццать лет, – я работала, быў ў мяне аклад сорак рублей, знацыць, ілі чатырыста. Тады было так, такіе дзеньгі былі. Я дална была падпісацца на четырестапядзесят, і каждый месяц высчітывают. Цяжка было, цяжка, жылі цяжела.

[*А дзе можна была деньгі заработаць?*]. Не знаю, ведь паехаць нікуды нельзя было. Нада было заработаць так, чтоб ты атработаў у калхозе дзень, а патом, вот, прымерна, чалавеку нада зрубіць сарай, сделаць, паствіць. Жэншчына с вайны адна, ей нада памоч. Но ана там нейкія капейкі плаціла. Но эта ты не должен ісці днём, а толька мог утрам рана пайці ці вечарам. Мой ацец после вайны делал у калхоз даже цапы. Провалкі было многа пасля вайны, вот он эту провалку прыцянец і тады яе рубіць, і вот так закручіваець, і делает. А в калхоз ані, – нада кароў прывязываць. І за эта ему плацілі. Эта ўже не ў наш калхоз, а ў чужы, ў другую дзярэўню, а свой калхоз – эта ставят трудадзень. [*А са знакомых, можа, хто хадзіў у Латвію ці Літву на заробкі?*] Дзядзька хадзіў, атцоў брат. Так эта ж нада умець, а еслі чалавек не умеет,

что он заработает?! Так і жылі, усяк жылі. Эта ужо было, канешна, я ужо была бальшая, шеснадцать лет мне было. Нас бралі на лесаразработку. Куда толькі мяне не пасылалі! Усюды. Было, што даже сваі забівалі на рэчке, вот, как у Віцебск.

[*А хватала, таго што выращывалі на зямле?*] Не хватала. Дзе ж ты вырасціўшь на цэлы год на дваццаці сотках?! Не хватала. Ну, тады, вот, троху падрабатывалі ў калхозе. Усяк, усяк цянулі. [*А што садзілі?*] Што садзілі? Больше садзілі картошку, садзілі рукамі. Вот, плуг і тут такая палка, а тут вот палка бальшая, і, вот, мы становімся: з этага боку – два, і з этага боку – два, а ззаді чалавек пашет. А мы ідём бараздой, як лошадь, цянем, а хто-та там дальше садзіў. Тада назад закапывалі, плугам зарывалі. Зярно после вайны ў агародах не разрешалі сеяць, патаму што можна эта ж і украсць у калхозе, – не узнаешь. Не разрешалі. Картошку, у аснавном, картошку садзілі, капусту, маркоўку, буракі. А ў аснавном, была ў дзярэўні картошка і капуста. Капусту загатаўлівалі очень бальшые дежкі: такіе бальшушчые, такіе высокія. І тада ўже давольны, што столькі капусты. Ну, эта не ўсе, не ўсе эта расцілі. Не ва ўсіх расло, не ўсе хацелі дагледзіць. Каторые труділіся, – тыя і расцілі.

***Запісана у 2019 г. ад жанчыны 1929 г.н.***
***(нарадзілася ў Сенненскім р-не) у г. Віцебск***

**“Весь Расонскі раён, счытай, згарэўшы!”**

Бацьку, маці і сястру младшаю немцы забралі, а мы асталіся. Мы дзевяць месяцаў у балоце сядзелі. А тут усё, усё пагарэўшы! Уся наша дзярэўня згарэўшы. Весь Расонскі раён, счытай, згарэўшы. У дзярэўню пойдзеш у час які, раскапаем, дзе ямы закапвалі людзі, там жыта якое ці што. Тады ў нас кацялок быў, у той кацялок насыпалі, і ноччу, як прахадзілі ў землянку, елі. На дзень мы выходзілі ў балота, а ноччу прахадзілі ў землянку. Днём нельзя было, за тое, што немцы каждый дзень прачэсвалі лес і хадзілі без конца. Так вот сядзелі дзевяць месяцаў. Вот адсядзелі пасля вайны вышлі з лесу.

На пянёк сталі, пастаялі, пакруціліся, – бур’ян… Нічога! Было тры таполі, дзе наша хата стаяла. І мы з сястрой вясной прыехалі на чыстае поле. Тады (а тут былі нямецкія бункеры), мы з сястрой тады ўзялі такую павозку, была нямецкая: калесы такія бальшыя-бальшыя… І мы паехалі за даскамі. Во тут, за Янкавічам, немцы стаялі, і там іхныя, каля рэчкі, выкапаныя акопы іхныя, – яны там даскамі обіўшы, былі, гэтыя акопы. Вот мы дасок надралі, а ў нас усё згарэла, толькі ў нашай бані астаўся вянок. Будзем дзелаць сабе якую-небудзь хату. Жыць то нада! І вот цягнулі гэні доскі. На сабе дзве дзяўчонучкі: вот, яна з 27 года, а я з 28 года. Панімаешь?! І наклалі столькі

дасок! Мы цягнулі… Я да кладбішча дацягнула, а тады заваліласа на кладбішчы і гавару, ды і цяпер не забылася, легла і галашу: “Каб я сабе гэты доскі на гроб прыцягнула, каб я памерла, як я ужо жыць не хачу!” Дужа цяжка было, знаешь… А пясок, а калесы гэтыя рэжуцца… Так вот і зажыліся! Баньку троху накрылі, там неяк зделалі і сядзелі ў гэтай бані.

[*Дык вы ж не адні там былі? Дюдзі вярталіся на папялішча?*] Да, вярталіся. Летам – мама з сястрой, іх жа асвабадзілі з Латвіі, і яны прыехалі. Ім сказалі, што можна ўзяць там усё ў хазяіна, яны ж нескалька месяцаў там атработалі. А мама сказала: “Не, нічога мне не нада: яны нас не абіжалі, есць нам давалі, і ня білі. Я бяз іхнага разрашенія ня будзем браць”. І нічога не ўзялі. А хазяін сказаў: “Робце да восені, я вам яшчэ і каня дам, карову дам і хлеба дам, толькі да восені паробце у мяне!” Мама адмовілася: дзевачкі там асталісь і яны, можа, мертвыя лежаць, вораны там цягаюць… А я тут буду сядзець у Латвіі?! Прыехалі… Як стаяць, – такая падушка была ў іх і больш нічога не прывязлі.

[*А што кушалі, усё ж спалена?*] Кісліцу елі, страківу елі. Гегялі ўсякія сабіралі па полю – хвошча такая, расцець па полю. Гэты шышачкі сушылі, тады таўклі і так і елі. [*А, можа, што дабаўлялі?*] Нечага было дабавіць: ні яйца ні было, ні малачка ні было.

[*А ці збіралі ягады, грыбы?*] Канешне! Вы ж падумайце, калі чарніцы, ужо не памрэш з голаду! Ужо з лесу вышлі, ўжо суніцы былі, ужо ўсе было, грыбы былі. Разве памрэш з голаду?

Соль выменіваць хадзілі, солі не было і выменівалі, краснае ўдабрэнне куплялі на базары, банка паўлітровая стоіла, я не знаю, сколькі стоіла, ня буду гаварыць сколькі, але я знаю, што красным удабрэннем этым саліліс. [*А на што мянялі?*] Рыбу, што насушылі, яна без солі сохла, насілі на базар. [*А рыбу як лавілі, на што?*] Па первасці глушылі. Не мы, – другія. Пайдзеш каля берага, – мы ж там жылі недалека, – а яе прыб’ець вална, калі вецер адтуль. Белабела каля берагоў было рыбы! Сабіралі, а як жа? Гэта ж наша самая еда была!

Сястра езділа ў Літву – хадзіў поезд. Вот яны садзяцца там, на гэты, на палкі якія, на броўны і даедуць туды. Яны хадзілі па старцах. І тады насабіраюць кусочкі хлеба хто дасць, хто гароху дасць, хто што, ну такі і прывязуць. Вот так і жылі. Адзін раз сабралі многа чаго, а ў іх укралі, калі дамоў ехалі.

[*А вот вайна закончылася, гэта ж нада было курiцу адкуда взяць?*] З Латвіі прынасілі курыцу, у Латвію ездзілі за каровамі. Вот, у каго машынка засталась (закапая была), вот, насілі машынкі тыя. За машынку прывязуць кароўку! Многа хто хадзіў. А патом яйкі на базар насілі. Было два базары – у Расоне і ў Полацку, больше негдзе было. Стаіш, во, на базары, выставіш… Адін раз баба адна, каля прылаўка, узяла 10 яец і на месце біла і піла, біла і піла, і выпіла ўсе! Баба з Ленінграла прыехаўшы была, да радні.

Тады ўжо ў калхоз пашлі, а ў калхозе нада было робіць. Мы ж пешшу хадзілі ў Полацк за семяной, як зажывалі калхоз после вайны. Сеяць то не чым было! Вот, сперва шэсць чалавек за плугом становяцца, аром. Узаралі кусочак, на заўтра ідзем за семяной! Семянаў прынясеш. Вот мне было, можа, 15 гадоў, я хадзіла ў Полацк. Мне пуд семяноў на плечы. Я с Полацка несла дамоў. І каб ужо ні адну семянінку не узяўшы! Там звешваюсь, і што б дамоў прынеслі. Штоб пуд быў гэты семяны. Вот жа сходзі цяпер пяшком! А мы ж галодныя, шчытай, ішлі. Што ж мы елі?!

Тады малацілі ўручную, веялі, каб чыстае было. Усё дзелалі! І хаты хадзілі рубіць. Вот после вайны, як раз на Грамніцы, рубіць. Мая сестра на ўглу стаяла, як мужчына. А мы меншыя зразалі з пня і насілі на плячо. І хат шэсць пастроілі. Гэта сем'ям, дзе мужыкі пагіблі на вайне. І сабе самі делалі.

Мы робілі каждый дзень! Нада было норму вырабатаваць, каб заробіць тот трудадзень, нада было скасіць. Мне, напрыклад, нада было скасіць 40 сотак, хоць убей! [*А ці былі тыя, каторые не робілі?*] Такіх не было. Панімаеце, каб вот цяпер, як бягуць у ягады, каб даўней так пабеглі ў ягады, – цябе б абрэзалі агарода да клямкі. Вот, я замуж зашла, – ужо з сваей дзярэўні ў Грыбова, у другі калхоз, – так маей матке гарод атрэзалі, 25 сотак кінулі.

А вот знаеце, як не плацілі грошы?! А мы такія, па 18 гадоў, дзеўкі ўжо. Нам нада было заплаціць гэтат, як яго?.. Бяздетнасць. А дзе браць грошы? А тады, вот, курыца, дзе яйцо якое знясець, ілі карова, там, – масла якое збярэш, на базар, у Расоны, панясеш. Прадасі, – і так расчытываліся. А як жа вы думалі?! Канапю ў стаканах… Стаканам прадавалі. Хадзілі ў адной сукенцы! Адна сходзіць, а тады другая надзеніць.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1928 г.н.***
***у в. Янкавічы Расонскага р-на***

## "Кісліца і крапіва – гэта не бяда!"

Мы былі забраны ў Латвію, нас прадаў прадацель. Пасля вайны ў сваю дзярэўню прыехалі і жылі – мама і чатыры дзеўкі. Прыехалі – ні есць, ні піць…У нас дзевачка з голаду памерла, сястра, самая малодшая. Кісліца і крапіва – гэта не бяда! Мы асот елі! Насморгаеш лісцікаў, зварым. Ёсць чым – прыбелім, а нет – і так хлебалі. А цяпер хлеба белага ня хочам!

За Сакалішчам, у тых Пярэках, (не знаю: ці была там вайна, ці не), але там былі ўжо агароды пазапаханыя і людзі бульбу елі. Мы ўвосень прыйшлі і ім агароды перакапвалі. Яны выкапаюць, а мы перакапвалі, сабіралі і елі. Хадзілі, прасілі. Бывала, жнуць, нячыста ўбіралі, нам межы давалі, мы ў межах сабіралі.

Абстраіваліся, як маглі – ўсё было папалена. Сперва нейкая халупка была, аббілі жалеззем… А тады пастроілі дом. Мне не прыйшлося ў гэтым доме жыць – я замуж вышла, яшчэ дом не закончылі, яшчэ мой мужык памагаў. Ні каня, нічога не было. На сябе ўсё цягалі, рэзалі. Не дай Бог, як пасля вайны было! Папа на вайне пагіб, і нам былі даўшы карову на 6 чалавек. Сёння мы доім, заўтра іншыя.

Фасоль і трапкі нейкія з Амерыкі былі. Так мы хадзілі пешшу ў Полацк, як гэтую помашч дадуць, прадавалі за дзеньгі. Нада ж было агарод пасадзіць, бульбіну купіць…

Пасля вайны клюкву збіралі. Там абнесена ўсё было балотамі. Здавалі. Мы жылі з ягад і хадзілі на работу. Я ў другі клас хадзіла і за жнейкай хадзіла, снапы вязала – такі работнічак! А дзядзька з вайны вярнуўся ўвесь паранены. Ён брыгадзірам быў, пісаць ня ўмеў, толькі палачкі ставіў: шчытаў, колькі зделалі. Я пайшла рабят нянчыць, к сястрэ мамінай у горад былі ўзяўшы, каб з голаду не памерла. Яна замуж пашла і мальчык радзіўся, а я глядзела, і так тры гады атнянчыла. А потым на смале робіла, лес жа возяць.

У 20 гадоў замуж пашла. Бяруць – ідзі! Сіроты! Плацце сястра купіла, дзе я рабёначка глядзела. А так у нас было плацце – хадзіла па дзярэўне. Я стала лучшэ жыць, як замуж пашла.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1937 г.н.***
***у в. Горспля Расонскага р-на***

## “Пасля вайны нам трудна было”

ІНФ (1): Пасля вайны нам трудна было. Мы прыехалі ў землянку. [*Самі зрабілі?*] Не, хто-та там жыў і перайшоў. А да землянкі жылі ў железнадарожнай бані. Есці было няма чаго. Людзі пасадзілі, а мы яшчэ там былі (усю сям’ю забралі ў Германію – аўт.). Адно спасенне, то папа сахраніўся: і ў вайну, і пасля вайны нам легчы было. Хоць адно яйцо – падзелім на сям’ю. А патом – стаіць таз на стале, і мы выбіралі. [*А што ў тым тазу?*] А ў нас сваяк быў, ён папе кажа: “Ты падайдзі, мы будем рассыпаць авёс коням…” Так там і гарох, і віка чорненькая – мы гэта выбераем, з’ядзім, вады папілі і пашлі. Што мы толькі не перанеслі! Но моладасць усё сцёрла… Патом папін друг узяў нас з землянкі да сябе. Пакуль пастроіліся… Папа са шпал пастроіл такую комнатку, і чугунка стаяла ў хаце. Перазімавалі. Потым папа пасеяў усё, картошку пасадіў, градкі пасадіў, і ў нас ужо восенню стала нармальна – мы сталі на ногі. А кароўку як… Хадіў куда-та далёка-далёка, пяшочкам (услышаў, што там прадаюць) і купіў кароўку. Во тады зажылі! А потым усё і пашло, і паехала. Хату пастроіў. Ай, колькі радасці было! Не было абоеў.

Была такая бумага сіняя. Паклеілі. Цёмна ў хаце. Давай бяліць… Гэта быў, можа, 47 год.

У школу я толькі год хаділа. Трудна было вучыцца – толькі і думаеш, што паесці. Патом рашылі так: я пайду работаць, сястра паедзе вучыцца, малодшы брат пойдзе ў школу.

ІНФ (2): Хто на проізводстве работал, той капейку зарабляў, а хто ў калхозе, – тыя нічога, толькі з зямелькі: нажаў, кароўку, свіне держалі. А налогі: налог на мяса, яічкі, малако… А чым плаціць?! Кагда Сталін памёр? У 1953 г. А пасля Сталіна Маленкоў. Ён мала. Яго з'еў Хрушчоў. А так былі налогі… За яблыні, кусты, за пчол… А людi сталі выразаць сады. А ўзнаюць, што выразаў – штраф. Так вот, таму, хто сабіраў тыя налогі, падчаравалі: у баню нешта падкінулі чужое. У дярэўне стараніліся яго.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1927 г.н. (ІНФ 1), ад мужчыны 1932 г.н. (ІНФ 2) у в. Боркавічы Верхнядзвінскага р-на***

***

Бацька займаўся рамяслом. Калёсы дзелаў, а затым прадавалі ў Латвію.

А людзі траву елі, хадзілі ў Латвію, пад Дагду, прынасілі і зярно, і картошкі, а тады зажываліся. Хадзілі восенню, как поле ўбіралі. Калхознае начальства само адпускала, бо адна сям'я памерла ад голада. Хадзілі па людзях… Паработаем нядзельку – гароху давалі.

Судзілі за каласы. Каласкі ў Сялядцове… Хтосьці даказаў – і міліцыя найшла. 8 гадоў далі.

Карову даў сельсавет на две сям'і.

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1928 г.н. у в. Стралкі Верхнядзвінскага р-на***

***

Пасля вайны, (нас асвабаділі на Пятро, а Пятро было ў іюле) у наябрэ нас паслалі (мне ўжо было 15 лет), паслалі рэзаць шпалы. А яшчэ ідець вайна. Паслалі ў Савейкі, вот, за Боркавічамі, рэзаць. Пайшлі цераз ручэй, за жалезнай дарогай, а тады там лес недалёка, можа, поўкілометры лес, і нам там рэзаць стойкі, каб класць жалезную дарогу, каб ішоў поезд. Зайшлі ў ручэй, а ён увесь засланы салдацікамі пабітымі! Гэта Пятро, і сколькі месяцаў ляжалі і чалавечаская нага не ступала?! А мне нада было ідці. Я як глянула: ляжыць салдацік, з карманка тарчыць карандашок хімічэскі і кніжачка… А Райка падайшла і цягне кніжачку, а ў яго валосікі так: вецер

ганяець… У гімнасцёрачках: каторы ў акопу, каторы вакол акопу, каторы так ляжыць… Я плакаць – мёртвыя салдацікі ляжаць! Мы – пілу, тапор і абратна, не перайшлі ручэй, не пайшлі рэзаць ад страху і са слязьмі ўсе вярнуліся.

Тады прыйшлі, а на кварціры мы ў дзедушкі, у Крыўко Васіля, а з ім внучок-сіротачка: у яго бацькоў пабілі… Як ён саабшчыў у Баравуху ваенным, а назаўтра прыехалі машыны з бальшым, як яшчык, як гроб збіты, ваенная машына. І мы павялі гэтых салдацікаў паказаць. А я помню аднаго: ручкамі падняла галоўку, а ўжо галоўка ня дзержыцца. А тут пілотачка ляжыць і я неяк ручку паклала пад шыйку, галоўка ўжо ня держыцца… І нікакога запаха, – вецярок тамка. Гэта было ў наябре. Гэтых салдацікаў пагрузілі і мы памагалі. Я толькі помню, як я пад галоўку… А лічыка – усё нармальна, толькі вочкі закрытыя і праваліўшыся. Я так глянула ў лічыка: так мне жалка было! Такія малоденькія! І вінтовачка каля яго… Тады ўсіх у гэты яшчык, у Баравуху, у брацкую магілу.

В деревне мужчын не было. Толькі мальчыкі 12–15 лет, што плуг цягнулі, і старыкі. Ні аднаго мужчыны ў Красным Беразе. Патом з плена папрыхадзілі, хто з вайны. Папа прыйшоў чуць жывы…

Мама карміла толькі утрам, а ў абед няма чаго… А вечарам глядзім на маму: ці дасць кушаць?

Быў у калхозе нашым карослівы конік, мылі толам…жыў – ен астаўся з вайны – Касалапы. Патом склаліся, мама прадала яічкі…, купілі у Мёрах жарабеначка ў калхоз, назвалі Орлікам. А там людзі жылі аднаасобна. Жарабёначка выкармілі. І ў нас, каб на лета плуг не цягнуць, быў конік.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1930 г.н.***
***у в. Цясты Верхнядзвінскага р-на***

## “Жызнь… Дзецтва я не бачыла!”

[*Пасля вайны як зажывалісь?*] Ну, як зажывалісь? Мы ў бабушкі жылі, так і засталіся. Патом я ў школу пашла. Я поўнасцю не скончыла, я шэсць класаў скончыла і бросіла, патаму што ў меня отчым пьяніца быў. Як нап’ецца… Жызнь… Дзецтва я не бачыла! [*Што елі пасля вайны?*] Як прыехала (з Германіі – аўт.), хадзіла прасіла картошку старую. [*Па жабраках хадзілі?*] Да, хадзіла. Я хадзіла прасіла: ці можна ў вас перакапаць картошку старую? Ну, набяру – добра, пол вядра. Ну, а потым счысчываешь, трэш. Ну, паёк нейкі давалі. Трохі мукі чуть-чуть. Ну, даждаліся лета. І гэта ўжо аджылі: паявіўся шчавель, паявіліся грыбы… А ў нас быў пацан, бежанец, з намі жыў, і я з гэным пацаном, вернее, карміліцай я была, матка ж не магла дужа хадзіць… То ў яе нага, то адно, то другое. А малыя... Я ўжо, як снабжэнец

старшы. І ягады, і грыбы мае былі. Тут ужо і агарод пасеялі, восенню мы ўжо нармальна былі. У нас ужо і картошка была, ужо запасліся. Тут у нас ужо началася харошая жызнь.

У школу сама прыбіралась, як магла. А потым паняла, што нічога ў мяне не выйдзе. Работа свалілася ўся на меня. Да гэтага, куда б я хацела вырвацца, нічога не палучалась. Хацела на ткацкі ў Оршу пастуціць, у Віцебск – не палучалася. А тады набор у механізацыю быў, а там стыпендыя, кормюць… Ну дык во, я паехала ў Магілёў. Вучыцца на трактарыста.

Я ж толька ў 20 гадоў пашла на танцы. Я ж бедная, з беднай сям'і. Як замуж пашла – нічога з дому не ўзяла. Так пастулова зажываліся.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Шпакоўшчына Полацкага р-на***

## "Па старцах хадзілі"

Па старцах хадзілі. Вот, торбачку возьмеш і пойдзеш. А што то, калі ўсе галодныя?! Ездзілі ў эту самую, дальшэ туды, у Западную. Там жа лепей жылі. Ну, і торбачку… На таварняках, на этых, і далой прыгалі. Я ездзіла з маткай. Пакормюць. Зайдзеш у хату, – пакормяць. Ну, што-нібудь там: баначку мукі ўсыпіць, хто круп, хто кусочак хлеба дасць… Хто што мог даць, то давалі. Вот так. Ну, і саберыцца торба. А тады як жа ідці?! Паязды ж хадзілі, таварнікі. Ну, і тады падойдзеш к этаму таварняку, прыцішыць ход трошачку, там у Палаце, і, бывала, мяне скінець матка, а тады і сама, пад аткос паляцім, падымімся і…

***Запісана ў 2016 г. ад жанчыны 1937 г.н.***
***у в. Казімірова Полацкага р-на***

## "После вайны і хадзілі такія, што паесці нечага было"

[*Не пяклі каравай?*] Ну, тады ж мукі не было. А ж там, у старынушку, якая там мука? Дзе тое, у жорны змелеш, дык яно ж там – не цяперашняя мука, не мяккая. Што перадзерыш, шчытай. А вот у вайну елі – сабіралі плюшкі. [*Што за плюшкі?*] Бульба гэта вот зімавала, на полі, і тады хадзілі сабіралі. А яна ўжо такая… Ну, там адзін крахмал астаўся. Ну, вот тую бульбу прынасілі, мылі, пяклі бліны і елі. Шчавульнік елі ў вайну, сморгалі. Як цвіцець ён, і, вот, з тога сачні пяклі і елі. І старцам давалі. [*А што за старцы?*] А, вот, я не знаю адкуль яны. Ну ў іх нічога не было после вайны. І хадзілі такія, што паесці нечага было. Ну, там, дзе хата ў каго згарэла, прыюціцца недзе… Ну,

дык вот і хадзілі па дзярэўні. У каждую хату заходзяць, і даеш што ёсць, паследнее там, які хлеб, які сачэнь спечаны – ўсё і яму давалі, і ён сабіраў, той старац.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Чурылава Бешанковіцкага р-на***

## “Хадзілі, жабравалі”

[*А, вот, ці хадзілі тут такія старцы, жабракі, пасля вайны яшчэ?*] А няўжо ж! Галадающчых знаеш сколькі было?! Мама наша хадзіла, што яна адна, а нас трое. А што ў каўхозе раньшэ зараблялі? Нічога. Трудадзень напішуць, палачку табе паставюць, што ты быў на рабоце, – вот табе і зарабатак! Хадзілі, жабравалі. [*А, вот, гаварылі, што, можа, яны там памінали радзіцелей, маліліся за памёрлых?*] Не. [*А, вот, после вайны цяжка жылося?*] Я ж гэта помню. Я после вайны харашо помню! Дажа помню, як мы ў адступленне адхадзілі. У нас карова была. Мама мяне нясець на руках, а сястра за юбку дзяржыцца, а большанькая, сем ці восем гадоў была, вядзець кароўку на хустачке…Каровы равуць, мужыкі, каторыя асталіся дома, каней пазапрэгалі, сваіх дзяцей на цялегі, а мы ўтраёх з мамай валім па гразі… Каб хто-нібудзь сказаў, што “давай, падвязём”! Тады зайшлі ў лес, – як сталі бамбіць! Гэта я добра помню. Мама нас усіх у кучку, а сама, – так во, наверх, як курыца на цыплят, і гаворыць, дзеткі, калі ўжо заб'юць, дык ужо ўсіх умесце. А карову дальшэ прывязалі, каля сасны.

Галадалі, хадзіла мама хлеба прасіла, бульбінку – хто што дасць. А хто і не даець. Галадалі, страх як! Шчавель елі, лебяду. Мама дзе-нібудзь там зярна прыдумаець трошку к гэтаму ўсяму і спячэць такія пірагі.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1939 г.н.***
***у в. Бачэйкава Бешанковіцкага р-на***

***

[*Скажыце, а тут раней не хадзілі старцы?*] Старцы – гэта ў вайну хадзілі. Бежэнцы. На 8 кілометраў прыхадзілі к нам. Нечага было есць з вайны. [*А гэта старыя людзі?*] І маладыя хадзілі. [*Так гэта ўсіх старцамі называлі?*] Да. Нету есць чаго з вайны. Мы з вайны так жылі плоха. Ну жылі, зато здаровыя. Сратыкі па 80, па 90 гадоў. Мы ж гэту бульбу, якая астанецца на зямле, ходзіш вясной яе сабіраеш. І мама нам такія… Нам пякла пышкі. Патаўчэць, яны ж чорныя такія. А хлеб які дзелалі?! І клевер красны дабаўлялі, і зярно, што малацілі, лён, і пяклі такі хлеб. Ліш бы толька не памерці. Мне было 12 гадоў.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1933 г.н.***
***у в. Вяжышча Бешанковіцкага р-на***

***

[*А вось, жабракі, ці хадзілі у вас? Ну, людзі, вось, якія проста ў любы дзень прыходзілі да хаты, прасілі што паесці?*] Гэта раней называлася “старцы”. Гэта хадзілі раньше, эта после вайны. Хадзілі па хатах, прасілі паесці, каб далі кусак хлеба ці паесці чалавеку гэтаму. Хадзілі і жэншчыны, і пажылыя мужыкі, і дзеці хадзілі. Эта я добра помню. [*А вось, ці рабілі яны нешта за тое, што ім ежу давалі? Можа маліліся за памерлых?]* Ай, эта рэдкі случай быў. Спасіба скажэць і пайшоў. [*А так яны не абяцалі, што маліцца будуць?*] Не, толькі гэта. Еслі ўжо пакорміць і дасць ужо што-небудзь, тады ўжо спасіба скажэць і ўсё. А што больш? Яму нічога не трэба. Ну дык голад тут ужо после вайны. [*После вайны быў?*] Ну жылі людзі каторые і нічога жылі (было і есці ў іх, і тое, і тое), каторые ў вайну сахранілі зярно. А купіць дужа і не купіш: грошы ж не заработаеш нідзе. Ну і вот, тады… Ну, жылі так, упрогаладзь. Не хватала. Бульбы, ну, там ужо, там дзе як-небудзь пасееш зярно, тады ўжо троху после вайны стала.

***Запісана ў 2013 г. ад мужчыны 1936 г.н. (нарадзіўся ў в. Тоўпінцы Ушацкага р-на), жанчыны 1948 г.н. у в. Шыпулі Бешанковіцкага р-на***

***

[*Жабракі пасля вайны, кажуць, сільна хадзілі...*] Очэнь многа. В аснавном насілі што-нібудзь з адежы меняць. Былі две клічкі: “западнікі” і “васточнікі”. Гэта ўжо большэ хадзілі “васточнікі”, патаму што “западнікі” как-нікак адналічна жылі і ў іх была астаўшысь і зерна большэ там, і кабана, можа, вырашчвалі. А ў васточных калхозы былі, там былі болей бедные. І вот ані хадзілі, і гімнасцёркі там, і шынелі, і какую-та ніжнюю адзёжу прадавалі на хлеб, штоб выжыць. Начэвалі. Ставіла мама такіе скамейкі, падсцілала ім там кое-што, ані спалі ў нас часта. Эта і Палюдавічы там, і далее. Хадзілі эта. Ані былі, можа, не жабракі, ані абменівалі. Хадзілі жабракі, у каторых не была вабшчэ нічево, старушкі такіе. Ну, эта всегда хадзілі. [*Всегда, да? І пры Польшчы?*] І пры Польшчы хадзілі. Очэнь многа. Помню, хадзілі, кусочкі хлеба в мешочэк такой, кусочкі хлеба там ім давалі, хто зерна… І тожэ ў нас начавалі эці старушкі, эці “жабрачкі” ўжэ называлісь, эта ўжэ жабрачкі былі, хадзілі. Пры Польшы было многа тожэ бедных. Хто што мог – давалі. І хлеба давалі, і кармілі всегда іх. [*А, можа, яны больш па святам, ну да нейкага свята хадзілі?*] На святы хадзілі вот. Но, но есць ім хацелась не толька святамі, всё врэмя хацелі.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1927 г.н. у г. Дзісне (нарадзілася ў в. Рэдзькі Мёрскага р-на)***

***

[*Ну, а вось, а вайну ці памятаеце?*] Ой, ідзі яна к чорту! Малыя былі. Бацьку забралі, – так і ўсё, і ў вочы больш не ўвідзелі. І было нас трое. Матка гадавала адна, цяжка было. Ну, але як-то жылі, сражалісь. Цяпер, дык, можа, гэта і прапаў, а так і памагалі. Ну, робілі малыя, папросіш там на гарод бульбу разагнаць, дык капаць утрох пойдзем. Пакуль разгоне там, баразны якіх дзве… Пасля вайны было цяжка. Мужыкоў не было, – забралі ўсіх, пагіблі. Адны ўдовы жылі.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1935 г.н.***
***(нарадзілася ў в. Чурылава Бачэйкаўскага сельсавета)***
***у в. Дзятлы Бешанковіцкага р-на***

**"Паваенныя калгасы"**

Некоторых раскулачвалі. Гэта каторыя дужа багатыя, а нас нет. [*А ў калхозе лепей стала?*] Калі калхоз абразаваўся, тады стала добра. Толькі што пасля вайны калхозы гэтыя бедныя. У калхозе робішь, а табе палочку ставят, што была на работе. Тады на гэтыя палочкі якога зерна давалі. Не дай Бог такога жыцця! Тады ужо па троху стаў калхоз багацець, сталі ўжо грошы даваць.

***Запісана ў 2007 г. ад жанчыны 1934 г.н.***
***у Бешанковіцкім р-не***

**"І асталісь мы без нічэво"**

Вот тут, на этом месте, гдзе эта хата, но яна згарэла ва врэмя вайны. І мама сама здзелала хібару, патаму што жылі в землянках. Сказалі нам, што сейчас будзе фронт, і мы – ўзялкі за плечы. Мне была пяць лет. І папёрлі ў лес. І всё, нічэво не взялі, абсалютна. Всё разбамбілі здзесь, всё сраўнялі, нічэво не асталась. Мы так асталісь без нічэво, вабшчэ. Карову адну немцы забралі, втарую карову (ана была там навязана), ў нас хутар был – семь гектараў землі, – была навязана карова. Ана сарвалась гдзе-та, і так мы её… Гдзе там будзеш іскаць, еслі танкі вездзе, рвут па дліне фронта?.. І асталісь мы без нічэво. Так. Ні есць, ні піць, ні жыць гдзе, – нічэво! Навернае две недзелі жылі вот так, в лесу. Такая гара была, ну і ручэй внізу цёк… Лес бальшой – яловы, сасновы, – такой там. Здзесь жэ бальшые леса. Мама лапату прынесла ад каго-та. Не знаю, гдзе ана там в лесу нашла?.. Вырылі такіе ў гарэ норы. І вот жылі мы недзелі две ў эціх норах. Ну, я помню, што ўжэ лісцікі ў бярозак былі, патаму што мама падкладывала, штобы накрыцца. Не было ж нічога… Мне было очэнь холадна! У меня бабушка ешчо была. Мама

с адной стараны ляжэць, бабушка – з другой, а меня пасрэдзі, штобы мне цяплее была. І вот так мы тагда. Какіе-та харошые людзі, очэнь харошые, – я а ніх всю жызнь буду помніць, – пусцілі нас жыць к себе на хутарэ. Там, ну, атсюда – чэтырэ кіламетра дзе-та. І мы жылі ў ніх семь лет. Семь лет пражылі! І людзі нікакой платы не бралі! А чэм плаціць была? Какіе дзеньгі?! Аткуда?! І жылі мы тамака семь лет, і мама патом… В обшчэм, там зберэжэнія какіе-та ў мамы былі, ацец работал ва Францыі, в Страсбурге горадзе, і там у нево какіе-та былі зберэжэнія. І вот, за эці зберэжэнія мама купіла карову. Купіла… І вот, купіла там ад каво-та пастройку какую-та, і ў пяцідзесятам гаду яна ўжэ здзелала эту хібарку… Но гарэвалі страшна!

[*А вот, што кушалі?*] А есць не было абсалютна нічэво. Там, у дзярэўне, не згарэлі хаты, там, гдзе чатыры кіламетры ў ту сторану, у сторану Латвіі. І там маме далі шалупаек ад картошкі варанай. Вот, картошка вараная, знаеце? Шалупаечкі. Вот, эці шалупайкі. І патом шчавель вот этат, што расцець, вот этат во цвятны. І вот эта смешывала мама і запекала на агне такіе лепёшэчкі. І всё. І вот горкія яны былі, нявкусныя, ташніла ат іх. Хазяін этат какое-та врэмя малака давал, карова была. Ну, а земля ж была вытаптана танкамі. У нас пасеяна было ўсё, всё вытапталі, нічэво ўжэ не была. Ну, хадзілі, там людзі картошку садзілі. Там ня вытаптаны хутары былі, так мама хадзіла перакапывала. Ужэ после марозікаў. І нахадзіла там картошку, такой белы крахмал ад картошкі. І мама прынасіла, там перацэджвала как-та, што-та дабаўляла… Ні скаварады, ні кацялка, – варыць есць не ў чым. А лес радышкам. Вот, як атсюда, ад хутароў, ну, вот, буквально чэраз дарогу лес начынаўся. Вот агнішча, значыць, дзелаем. Не знаю, дзе мама работала, дзе-та хадзіла, там, каму што паможэць – дадуць ей атрубей какіх-нібудзь, там ашакоў какіх. І мама прынесёт, вот, мы разложым агнішча… Варыць не ў чым. Нашлі снарады, ну бальшыя. Снарады былі медные, па-моему, жолтага цвета яны былі, насколькі я помню, і вот у эціх снарадах варылі есць. А мне хочыцца тожэ себе сварыць есць, а я сабе атдзельна пастаўлю ў ракетніцы, алюмініевыя такія былі, і вару баланду, эта не есць было, а баланда, штоб толькіногі цягаць как-та. Вот так мы жылі…

Патом, вот, на следуюшчый год, пасеялі мы ўражай. У хазяіна была лошадзь, і мама дала палавіну зямлю сваю. Ён нам пахаў, палавіна уражая нам аставалася. Вот я этага не забуду: хаты нет, нічэво нету, всё разбамбілі, тут усё сраўняна было, ямы толькі былі… Аблажылі налогамі. У калхоз мама пайшла ў пяцідзесятым гаду, можа. Аблажылі налогам. Значыць, здаць нада была: шэсць кілаграм масла за карову, семдзесят пяць яічак – ці есць, ці няма курэй – нада было аддаць, сорак кілаграм мяса аддаць нада была гасударству, гдзе хочыш бяры! І зярна, вот не помню, сколькі нада было аддаць, вот этава я не помню.

Там школа была, на хутары, чатыры класа. У школу хадзіць не ў чым: адзець нечага. Ні абуць, ні адзець – нічэво. Пака басяком хадзіла, так вот ужэ замаразкі. Мальчышкі там былі, здзелалі мне мальчышкі хадулі. [*Так яны высокія былі?*] Ну, ад зямлі – на таком растаяніі, патом палкі водзіш рукамі, дзержыш… Прыбітыя такіе, дзе ногі ставіць. [*Санціметраў тріццаць?*] Да, да, да. [*І вы так вот хадзілі?*] Ну, я рукамі дзержалася. І я бягом дажэ бегла на іх! Я так прылаўчылася… Хадзіць не ў чым была. У пяты клас нада было ў Друю хадзіць у школу. Эта гдзе-та кіламетра чатыры нада было хадзіць мне. Осень, а там аврагі бальшыя очэнь. Ну, вот Града Браслаўская, так называемая, да? Яна к Двіне падходзіць. Там руч'і разліваюцца, а снегу раней жа наметала аж з галавой. І я іду ў школу, мама даст мне фанар такой, керасінны бальшой фанар, і я іду. А такія ветры, а такая гразь!.. Рэзінавых та ботаў нету, я не знаю, как я дахадзіла… Ветры бальшыя былі, пагаснет фанар – і я стаю… А цемната ж, осенню цемната! І я стаю, і не знаю куда ідці. І пака не начнець віднець, я стаю на этым месцы, гдзе патушыць фанар. Патом чуць-чуць забрызжэць свет, і я пайду ў школу тады. [*А вы адна хадзілі з хутара?*] А хто будзець вадзіць мяне? Хадзіла адна, і чэраз лес, нада было прайці кусок леса.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у аг. Друя Браслаўскага р-на***

**“Адны бабы былі”**

[*Вот вы вернуліся і як жылі?*] Нікога не было. Усе мужыкі пайшлі ў партызаны. У партызанах многа пагібла. Пасля вайны цяжка было. Работалі, плугі цягалі, баранавалі. Бабы былі. Адны бабы былі. [*Так і вы тожа барану цягалі?*] Не, я барану не цягала. Слабая была да бараны да той. Бабы ўсё цягалі. Аралі плугом. Цяжка было пасля вайны. Не дай Бог! [*А вот, говорят, после войны жабраков много было. Хаділі жабравать?*] Я сама хадзіла жабраваць. [*А куда вы ходілі жабравать?*] На Польшу сюды. [*Куда? В Западную?*] Ну, вот тут во. Мы з цёткай Адэляй хадзілі. Дык здесь з 20-га года Польша была. Зярно сабіралі на хлеб. У торбачку насыпюць, і пайшлі… [*І ходілі по домам і просілі.*] Да. Прасілі. [*А, может, там как вы просілі, может, вы молілісь?*] Не, нічога. Ніякога там малення не было, нічога не маліліся. [*А давалі нармальна?*] Хто даваў, а ў каго не было. [*А так многа, наверное, с деревні жабравать хаділі?*] Ну, не знаю. Мы ездзілі адседа з Віцебскай області, ездзілі сюды, ў Польшу. [*Так вы это зерно, которое нажабравалі, вы его кушалі ілі саділі?*] Дамой. У жорны і малолі. Малолі дома. Хлеб пяклі. [*А что ещё? Зерна, наверное, не так много. Может, какую траву добавлялі, может, картошку?*] Картошку сабіралі мы мёрзлую. Зімой

яна аставалася, а з вясны яна такая… крахмальная. Дабаўлялі тады ў хлеб. Сабіралі такую траву. Ну, цяпер такой няма. [*Может, хвощ такой вот?*] Да, да. [*Хвощ? Да? А как вы его добавлялі, вы ж его, наверное, сушылі, а потом мололі?*] Перамалывалі ўсё. [*Можа, ягоды, грыбы сабіралі?*] Ніколі мы не сабіралі. Баяліся ў лес хадзіць, каб на міну не нарвацца.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1926 г.н.***
***(нарадзілася ў в. Марагі) у аг. Друя Браслаўскага р-на***

### “У нас же фронта не было, не затоптали всё”

[*А як после войны?*] А мы не гаревалі, у нас зерна ў мешках было, а потом засеяли всё, у нас же фронта не было, не затопталі всё. Патом ж вайна кончылась, хто не прышлі, а хто ж прышлі. Ну, тады ж, сначала, часная собственнасць была, патом ужэ калхозы сталі. Сільна ж как-та нам дзіка было, мы ж маладыя яшчэ былі. [*Ну і што ў калхозах? Як жылось?*] Када толька стаў калхоз, не было ж ні трактара, нідзе ж нічаго не было. Ну, ў каго конь, патом забралі… А не было ж ні хлявоу, ні канюшынь – нічога. Дзе чыя сараі, – там канюшню здзелалі… Мы, у нас, у каго конь быў, а ў каго не было, дзяліліcь. Як во пішуць і паказываюць, што цягалі жэншчыны плуг пасля вайны, эта дзе вабшчэ фронт прайшоў, страшна. А ў нас – не. У нас сільна не пастрадалі ў нашай старане. Ну, там галадоўка ж была ў некаторых. Былі паля засеяны там, снялі ўжэ, у каторых не было. Ды, еслі забілі бацьку, рабяткі маленькія асталіся, – ну, каля людзей. Памагалі ж адзін адному. Патом патроху, патроху… Што сказаць? Патом ужэ і на палях, і трактара, і камбаіны, і удабрення, і расці стала. А што ж, бывала, конем успашаць, уручную пасеюць, ай… Гаваруць: “Вырасла на маём агародзе, как у калхозе.” “У калхозе”, дык гэта, ну, не была ухожэная зямля, нічаво сільна там некаму было. [*А плацілі ў калхозах?*] Сначала дык і не плацілі, нечым было плаціць. Трудадні толькі пісалі, а то ж у канцы года, ну, зерна там…

[*А ці хадзілі жабракі пасля вайны?*] Пасля вайны, яшчэ фронт ішоў, ай-я-яй… А ў нас жа тут, як Польша была, ну тут ужо Полацк гэты, туды ў Расію, за Дзвіну, о тут Латвия, а тут да Бігосава от сюда, а там, патом, там ужо Беларусь, ну дык вот… А ў Расіі ж, там, стаялі доўга і фронтам там яшчэ, білі, палілі… Дык, хадзілі. Прыходзяць і тры чалавекі, а патом, помню, у нас дом быў бальшы, дык і сем чалавек… Прынімалі, памагалі. У нашай меснасці ўражаі ж. Мы снялі, што было пасеяна. Вот, дык тут хадзілі, хадзілі… Наверна ж, гаварылі, што тут у нас, быўшы ў Польшы, молюцца, а там ужэ не маліліcь, дык яны прыходзяць, бабкі, і раза тры перакрэсцюцца, і ў пояс кланюцца. Эта ж так яны падлажываліся, штоб мы ета ўжо…Што маглі, ўсем давалі. Людзі памагалі!

[*А варылі лі самагон пасля вайны у вас?*] А как жа ш?! [*А навошта?*] Дык, вы знаеце, што? А за самагон жэ ўсё было. Адкуль дзеньгі? Ну, аткудава дзеньгі? Калі ў каго карова была, значыць самім прадуктаў хватала, ну і хлеба хватала. А каб што дзенег, тады ўжо нада, если хто лішніх карову ці, там, авечку нада завясці на базар, тады ўжо дзеньгі. А так, – самагонам. Дзе ў каго нада штоб наняць, штоб хто што здзелаў. Мужчыны і не спрашываюць сколька дзенег, гаварылі: "Ну паулітра, літр (смяецца)". [*А з чаго гналі?*] З зерна, больше з ячменю. Надо было яго проросціць, высушыць на печы (печ руская), высушыць, на мельніцу, у жорны намеляць. Сястра мая замуж выходіла, – круцім эці жорны… Надо ж много накруціць было. Ну, і самогонкі…

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1929 г.н.***
***(нарадзілася ў в. Казакова) у аг. Друя Браслаўскага р-на***

***

[*А после вайны дужа цяжка жылося*?] Сматра каму. Каторыя шнітку елі і нечым было пракалаціць. А ў некатарых трошку і было што. [*А шнітку, дык гэта, калі ў каго не было есці*?] Да ва ўсіх там мала што было. Але ў каго хоць жменька якая мукі, дак шніткі той навараць, пазакалоцяць, замуцяць вадзічку гэту – ужо і прыятней, смачней. [*А калхозы калі тут началі становіцца?*] Калхозы ўстанавіліся – я канчала первый клас. Ня помню ў якім гаду. [*А ці хацелі людзі ў калхоз ісці?*] Нет. Здавалі свой скот, у нас вот пара коней было – двух каней бацька здаў, карову, авечку. Ну і так во ўсе, хто што меў – усе здавалі. Ну цяжка ж раставацца каждаму са сваім нажытым. Ну але как-та саедзініліся, можа года два работалі і каждый на сваей зямле, і ўсё нікак. Ну ўсё ж уручную, ні трактароў, на конях. После ўжо па-маленьку сталі арганізоўвацца. Зарплат не было, там у канцы года па пяць капеек рашчытвалі на трудадзень. Ну хлеба было, давалі. Бацька конюхам быў, ну і дзве сястры работалі ў калхозе, мама. [*А вот ці былі кулакі якія? Што гаворaць, можа іх саслалі патом?*] Ну, як не знаю, каля нас жыў адзін чалавек. Ён не кулак быў, но ён багаты чалавек, ён не пайшоў у калхоз. Была ў яго можа пара кароў, пара коней, былі ў яго сыны тры – бальшыя мужыкі, мужныя. Ну яны работалі, зямлі было чатырнаццаць гектараў, яны гэта ўсё абрабатвалі самі. Ну было ў іх, і хлеба было і ўсяго. Но ён не кулак, ні ў кога не атбіраў. Хазяін крэпкі. Ну, а пры Сталіну гэта ўжэ кулак называўся. Ну і вывезлі яго бедненькага дзе-та не знаю. І ўсё асталася, толькі далі там с сабой што-та ўзяць, якія-то вешчы і ўсё. А кулакоў не было.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1939 г.н.***
***у в. Кяпсні Браслаўскага р-на***

## “Хоць у нас і было ўсе сваё, але грошай не было”

Сям’я была такая: нас было трое. Вайну мы ніхто не памятаем, таму што я 25 дзекабра 1944 года радзілася, паэтаму я вайны не ведаю і не помню нічога. Тата мой быў у Германіі, прышоў з Германіі, ну і пажыў ён не вельмі многа. З Германіі прышоў, я крышачку помню, як ён прышоў, мне, напэўна, было, можа, два годзікі… Смутна помню… Знаю, што ён узяў меня на калені – вот эта мне запомнілася. Гадаваліся ўсё ўрэмя ў вёсцы, потым скончыла беларускамоўную школу і перашла сюды вот, у Дзісну. Працавала на кірпічным заводзе. У калхозе, нават, (як тата памер, мы засталіся трое ў мамы), у калхозе ставілі палачкі-трудадні. І на трудадні мама прынясе за плячамі нейкай гірсы, ці чаго, – і ўсё, усе даходы. Ніякіх грошай не было. Былі даходы ў нас, то што меньшая сястра с 51 года, атрымоўвалі мы дванаццаць рублей дапамогі. Вот, за эты грошы мы і жылі. Паэтаму, нават, кніжкі я не магла купіць. Паэтаму мне прышлось ісці працаваць, каб закончыла вячэрнюю школу тут, у Дзісне, а затым далей.

[*А можа помніце ці мама расказывала, вот, не хацелі ж ісці ў калхоз пасля вайны ці пра калхоз не чулі?*] Гэта помню, дзядуля ў мяне быў. Адзін дзед быў багаты, татаў бацька, ён быў, як пан, і былі ў яго, ну, як, “парабкі” называюцца. Тата мамы маей быў бедны. У нас калхозы арганізоўваліся пазней за ўсех. Я помню, як дзядуля мой плакаў… У яго была свая арфа. Ну, ведаеце? Арфа, дзе чысцілі дабро ўсе. Арфа была свая, значыт, прывад быў, лён гдзе мялі, там эта вот всё была сваё. У дзеда тры каровы былі, два кані былі такія прыгожыя, а потым, як прышлі ў калхоз ужо, – як дзядуля плакаў! Усё атнялі! Усё-усё-усё на свеце, што было: і коней, і карову, усё-усё, што ен меў, і раздзялілі ўсе пораўну, па сорак пяць сотак. Былі такія, што даўней самагонку гналі, пілі, і тым па сорак пяць сотак. І той дзед мой, які працаваў, і раніцай уставаў і, можа, не ведаю, калі лажыўся, каб усё дагледзець. І так дзядуля пераjжываў, плакаў!.. Ну, я помню, як ён ужо ўмер, навернае, ат гэтай дасады, што так яго лішылі ўсяго. Хаця ён быў, як называлі, “панам”, лес быў у яго вялікі і ўсё сваё было, але ён сам працаваў. [*А як ён працаваў?*] Ён працаваў на сваей зямлі. Ён вырашчваў усё-усё. Гадаваў коней, кароў, вот. Там жа і сад быў у яго, усё-усё рабіў. Не было ніякіх электрычных машын, нічога не было. Працаваў лапатай. Лапатай, плугам, канём… І ўсё абрабатываў і так зарабатываў на сябе, але каб атрымаць грошы якія, значыць, дык бабуля, помню, хадзіла ў Дзісну. Рабілі масла, фармавалі ў такіх формах, па чатырыста грам, твораг прадавала, насілі аж у Дзісну (кіламетраў шаснаццаць да Дзісны). Вось яны раніцай пойдуць і к вечару прыходзяць. Хоць у нас і было і сала сваё, і ягады, ўсё свае было, але грошай не было. Трэба было гэтую прядукцыю рэалізаваць як-та, а як? Нідзе нічога не было. І вось хадзілі

яны пяшком па шаснаццаць кіламетраў. [*А чаму пешком, а не на лошадзі?*] Як калі, калі на лошаді, калі пяшком, як конь заняты. Але бабуля, яна любіла, захадзілі ў Нікалаеў касцел. І на конях часта ездзілі. А як ужэ коней атабралі, ужэ тады пяшком хадзілі, таму што, таксама ж у калхозе ж грошай не давалі, трудадні ставілі. А трэба было ж жыць! Ну і працавалі дзень і ноччу.

[*А вот, можа, тут жабракі хадзілі после вайны? Можа, да дзеда прыхадзілі?*] Прыхадзілі жабракі, прыхадзілі. У нас, вот, на Западнай Беларусі, у нас было ўсё. Так эта мы не галадалі. А вот прыхадзілі людзі, хто адкуль, хто з Расіі, в обшчам, гдзе-та тут была граніца ж Польская. Па Двіне і аттуда, із-за Двіны, прыхаділі жабракі. [*Так яны за яду ці так проста хадзілі?*] Прыхадзілі з торбамі льнянымі. Помню, давалі малако, хлеб давалі, масла, у каго што есць давалі. [*А не атказывалі?*] Не, жабракам ніхто не адказываў. Не часта, але прыходзілі. [*А хто больш, мужчыны ці жанчыны?*] Жанчыны болей, более старэнькія. [*А можа, яны па святах якіх хадзілі, ці проста, як прыдзецца?*] Проста так прыхадзілі, не па святах.

Мы не галадалі, а так людзі другія галадалі. Сабіралі, нават… Такія гіргялі растуць… Крапіву, траву… Елі, што папала.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1944 г.н.***
***(нарадзілася ў в. Фядосава Мёрскага р-на) у г. Дзісна***

## “У нас сталі калгасы”

[*А вось, можа, ўспомніце, а як сюды калгасы прыйшлі?*] Слаба я помню, але помню, што ў нас сталі калгасы. Я помню, як мой брат плакаў старшы. Бацька пака жыў, зарабляў там троху, после вайны. То жа, вот, строіў хадзіў, і школы, і гэта ўсё. Купіў коніка. Вот, ну гэта ж быў свой конік. І тут калхоз! Толькі сталі зімой абучалі гэтага коніка, ездзілі на саначках. Такія сані, быў, зробіўшы бацька. А вясной гэтага коніка забралі. Вот, я помню, як гэта брат дужа плакаў… Мне, дык, там гэты конік, – я яшчэ была малая, – надабны быў. А ён плакаў… Забралі коніка, забралі калёсы. Усё бацька быў паробіўшы, паробіў усё. І санкі. Зімой на санках яго аб’язджалі. Як казалі даўней, аб’ездіць нада маладога каня. Началіся калхозы. Тады сталі хадзіць у калхоз. То лён рваць, то жыта жаць у калхоз.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у в. Слабодка (Пунькі – нар.) Браслаўскага р-на***

## “Лучшэ ў каўхоз”

После вайны, канешне, цяжэло было. Што гаварыць? Как вайна прашла, – бах, каўхоз! Усё абагулілі, усё атабралі: і сараі, і клеці, і амбары, і плугі,

і коней, і ўсё. Кагда былі ешчо после вайны едзінолічнікі – пару гадов, сколько мы былі? Налогі былі! Не дай Бог какія! І хлеба аддай, і картошкі аддай, мяса сдай, і малако сдай… Лучшэ ў каўхоз!

[*Ну, навернае, было цяжалавата пасля вайны і есць асоба нечага было, ці як тут?*] У каго не было, у каго было. Садзілі для себя, было. З голаду ніхто не памер. Усе жылі. І кабана дзяржалі, как абычна, на сала, і авечку.

Раньшэ калхознікам паспарта не давалі і плацілі натураплатай. Там, два мешка цебе какого-небудзь, адходаў, зерна дадут, – і ўсё. А ў 60-я, пры Хрушчове, сталі плаціць дзеньгамі і ўжо прошчэ стала как-то.

***Запісана ў 2021 г. ад мужчыны, 1931 г.н.***
***у в. Кірыліна Браслаўскага р-на***

### “Спасіба камуністычнай партыі, што вывела меня в людзі!”

После вайны была галадоўка. Осталіся дзеці і старыкі, ані ніякай скаціны не было. Далі карову нямецкую на ўсю дзярэўню (у акупацыю партызаны ўзялі корову і далі распіску). І, вот, далі эту трафейную корову. Да і то, што тата вернулся інвалідам з войны. Цягала са взрослымі плуг – сабіралісь некалькі сямей і абрабатвалі вучасткі.

Які хлеб?! Баланды якой, запасы с агарода. Калхоз сразу вастанавіўся. Сюды (у Пастаўскі раён) па распределенію, вышла замуж і осталась. Жылі са свайго. Мы не прадавалі, а іншыя прадавалі: яйкі ў Паставы. У Савічах жыў вучастковы, доўга быў, да самай пенсіі. Спачатку быў у партізанах, после асвабажденія ў арміі, а потым стаў вучастковы. Ён быў трэбавацельны, ну чтобы людзі абіжаліся – такого не было, яго ўважалі. Калі ён сказаў – гэта закон! А я была председацелем калхоза 17 гадоў. Ладзіла превосходна! Что пажылі пры Захараўне, так пажылі! Дзержалі першае месца ў раёне па картофелю. Спасіба камуністычнай партыі, што вывела меня в людзі!

***Запісана ў 2017 г. ад жанчыны 1932 г.н.***
***(нарадзілася ў Сенненскім р-не) у в. Русіны Пастаўскага р-на***

### Жыццё пасля вайны

ІНФ (2): – Папрыехалі дамоў. Вунь, баня была ля кустоў. А тры сям’і у гэнай бані жылі. Ні паесці ні было, нічога. Асаку збіралі елі, картошку, дзе была гнілая, мылі крахмал.

ІНФ (1): – Крапіву варылі, тады асакой мішалі.

ІНФ (2): – З вераса. А тады послі рыбу началі лавіць. Рыбай троху аджылі. А рыбы было, ай! Тады было ляшчы, ліні такіі як парасяты. Ну, але

рыбіну з’ясі, пабегаіш, і есці хочыцца. Заставіць бацька две соткі ускапаць лапаткай – капалі, каня ж ні было.

[*А, можа, там гаварылі, што самі людзі пахалі?*]

ІНФ (1): – І жанчыны пахалі плугам, бароны і усё. Самі, сколька вот, упрагаюцца і цігаюць. Лапатамі капалі самі.

ІНФ (2): – Вот адмерацьдве соткі, ускапаіш, тады ідзі пабегай у возіра. Хадзі пакупайся.

ІНФ (1): – А весела ўсе адно было, весела. Маладзёжы як было многа. Дзяцей было многа, піялі ўсё, а цяпер во ўсё ядуць і добра, а плачуць людзі.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1940 г.н. (ІНФ 1) і мужчыны 1934 г.н. (ІНФ 2) у в. Шо Глыбоцкага р-на***

## “Начынаюць калхозы строіць – ідзі ў калхоз”

Прыехаў дамоў. А куды дзецца? Нічога няма. Начынаюць калхозы строіць – ідзі ў калхоз. У калхозе нічога, зямля гэта. Хадзі ў калхоз. У калхоз хадзі – аддавай сваё хазяйства і сам ідзі, хітра зробілі. [*А калі хто казаў, што не аддам?*] Прэдсідацель калхоза: «Ага, сколькі зямлі ў цябе, дзесяць гектараў». Ты ўспеў пасля вайны сколькі сотак запахаць, толькі каня дзе дабыў… А тады налог плацілі – стока зямлі, а дзе ты яго возьмеш, а як? Аддавай – і сабе нечага астанецца. Аддай. Хітра зробілі! У калхоз аддай – аддалі. Ужо зажыліся, мы, сорак пяты-сорак шосты зажыліся, каня купілі, і ідзі ў калхоз і каня аддавай. А тады ідзі і прасі ў яго каня гэтага, ужо гэта іхныя. Каторыя пастройкі былі імшаныя, тыя абагуліць у калхоз, а тады разбіралі ўжо ў калхозе, што тут строілі землі. А я тады тут пагдядзеў, што нічога няма, – у вярбоўку Карэлафінскую. І я звербаваўся ў Карэлафінскую, а тут – нічога. У Карэлафінскай адбыў і палучыў паспарт. Там работаў на сплаве леса, палучаў грошы, добра плацілі, і дамоў памагаў. Год адбыў, прыехаў дамоў сюды. Нада хату строіць, нада імшыць, перэвазіць усё. Апяць прыходзяць – у калхоз нада ісці, ужо калхозы сталі. А ў мяне, як ужо паспарт ёсць, я, – дасвіданья вам, калхоз! У Полацак паехаў, нашол работу. У Расонах работаў па дагавору, Сакалішцацкі сельсавет, Расонскі раён. І там, у калхозе, нас было чатыры чалавека: два з-пад Ветрына і адгэтуль, ад нас, два. І пастроілі мы ў Расонах, у калхозе, свінарнік і два кароўніка. А там лясная зона ў Расоншчыне. А к нам тады з Полацка прыязджаюць, купляюць дамы, лес. А мы выразаем, дом робілі, а яны нам за работу, што зрабілі, плоцяць.

***Запісана ў 2010 г. ад мужчыны 1927 г.н. у в. Рускі Завулак Глыбоцкага р-на***

***

[*А ці многа даўней было жабракоў?*] Былі жабракі. [*Ну, вот, як людзі да іх адносіліся?*] Вы знаеце, даўней хадзілі… Адзін каробачкі сабіраў ад спічак. Вот прыдзець, дай яму каробачку, я патанцую, вот такое, вы знаеце, ён ненармальны быў. Была яшчэ такая жэншчынка, хадзіла, прасіла. Хто што дасць. Яна нармальная была, жанчынка, адзінокая старушка, тожа "жабрачка" яе ўсе звалі. "Жабрачка, – кажуць, – ідзець!" Яе пакормюць, пасадзюць… Давалі кушаць ей, і, нават, з сабой давалі. Еслі ўжо позна, даже начавать астаўлялі, не пускалі. Пасцелюць дзе-нібудзь ей, яна пераспіць і пойдзіць. Былі такія нішчыя даўней. [*А чаму да іх даўней так добра ставіліся?*] Я счытаю, раз людзі верылі ў Бога, значыць нельзя было чалавека абідзець. [*А ці былі жабракі, якія маліліся за памерлых?*] Былі. Ім даже спецыяльна давалі там хлеба, там калбасу якую, за упакой, за такіх і за такіх. [*Запісвалі?*] Не, яны ж чытаць не ўмелі. Толька на славах. Яны ж чытаць не ўмелі, хто там умеў з тых людзей?.. Яны, вот, даже каля царквы сядзелі. Падходзіш к цэркві, вот, "за упакой за такіх" скажыш, і яна моліцца. [*А за здароўе не давалі? Толькі за ўпакой?*] За ўпакой толькі, за здравіе толька ў цэркві давалі. Толька бацюшка можыць за здравіе маліцца.

***Запісана у 2007 г. ад жанчыны 1928 г.н.***
***у г. Глыбокае***

***

[*А раней ці хадзілі бабушкі, жабракі?*] Хадзілі. Асобенно, после вайны крэпка многа было жабракоў і бабка. Дажа гадавалі іх па нядзелях, па дзьве. І з дзеткамі прыхадзілі. Асобенно после вайны многа такіх было. І тата мой ніколі іх не абмінаў, пастаянно абдорыць, і падзяржым, асобенно адтуль, з Расіі, дзе вялікія былі баі, перастрэлкі, франтавая лінія, дык людзей многа. У нас бабка тожа тутака жывець, тожа яна васточная, ну і яна хадзіла жабравала. Казала: "Шукаіш бульбінкі мёрзлай, каб дзе найсці і травіцкі дабавіць, каб гэткаю ляпёшку спячы", з'есці не было чаго. А адзецца?! Палаткі нямецкія. Во, дзе парашуты звалюцца, найдуць, з гэткай сукенку пашыюць і ходзяць. Не абуць, не адзець не было, – гэткае было гора. Ну, а тады ж прыйшла яна, стала служыць у людзей, хоця і яны былі там ня крэпка багатыя, але то кароў пасціць, то па хазяйству памагаць. Гэта бабка, яна з Ушач сама родам, і прыйшла сюды і ў майго мужыка ў цёткі асталася на кватэры жыць. Ну, і служыла па людзях, кароў пасціла, памагала і гэдак так жыла гэта бабка. Тады ж ужо сталі калхозы арганізаваліся, тады ж яна пайшла за сьвінарку,

сьвінні былі. Купіла ж яна, – зарабіла грошай, – купіла хатку такую худзенькую, маленькую. Ужо маіць сваю хатку, парасёначка купіла, і далей – болей. Гэдак абжывалася! Бацька пагіб на вайне, брат пагіб на вайне, а маці памёрла, а яна і з цёткай гэдак хадзіла.

***Запісана ў 2012 г. ад жанчыны 1937 г.н. у в. Хоцькі Глыбоцкага р-на***

**“Міліцыя пабіла і ў ссылку ў Сібір – яны лішыліся Родзіны”**

Усе Каліты былі спалены, толькі чатыры хаты былі астаўленыя. Бедна жылі. Будаваў бацька хату. У 50-м гаду прыйшлі ў гэтую хату. У хаце нічога не было. Абоеў не было, з газеты павыразаем і вешаем на вокны. Бедна жылі… Мала хлеба было. А спачатку мы жылі ў таку, каб дзе жыць было. Печь была зроблена вялікая. Палок быў зроблены, бо сям’я вялікая была. Пасля пажару схавалі зерна. Мама ў хаце выкапала яму і там хавала, а пасля таго, як хата згарэла, мама раскапала. Хлеб пяклі, але слаба хлеба там было, бульбу дабаўлялі.

У школу на месте хаділі, в Каліты. Вучыцеля не месныя, са Смаленскай вобласці. Велі на беларускай…была Марыя Міхайлаўна Касацікава, а первая Зінаіда Эдуардаўна. Много детей было. У першы клас хадзілі і ў 12, і ў 6 гадоў. [*А дзе падручнікі бралі?*] У Дунілавічах куплялі. Усё было ў адным магазіне: і кніжкі, і адзежа, і ўсё.

Самагон гналі сабе ціханька. Участковыя хадзілі, нейкія агенты хадзілі, страхоўкі падпісвалі. У калхоз заганялі – мы яшчэ малыя былі. Трэба было ўсё здаць ў калхоз: і каня, і упраж, і ўсё. І не хацелі ў калхоз уступаць, тады па тры дні дзяржалі, каб у калхоз уступілі, у хаце адной, у дзепутата…

[*Колькі ў бацькі было зямлі?*] Мала было – шасцінка. У нас было 7 душ (пяцера і тата з мамай). [*А калі калгас пачаў ставарацца?*] У 1949-м. І бацька не хацеў ў калгас ісці. Уступі ў калхоз – нада ж коней здаваць. Жалелі коней здаваць. [*Кого-небудь раскулачылі?*] Не помню, мама гаварыла, што жыў такі Якавіцкі, так іх жа вывезлі ў Сібір. Які там ён багацей быў, але ж вывезлі, і яны не вярнуліся. Мая сястра на паству ганяла – служыла тым людзям. Быў яшчэ пан Грабоўскі, яму далі за нейкую ваенную службу, нагрaдзілі зямлёй (асаднік). Так яны пасля вайны выехалі да Польшчы. [*А яшчэ выязжалі ў Польшу?*] Ай, многа выехала ў Польшу. У 50-я гг. хаты пакідалі… Потым на госці прыезжалі… У Латвію, у Літву многія выязжалі ў 60-х.

Мая мама служыла ў Латвіі. Пасля вайны ў хазяіна: зямлі ў яго было многа, скаціна… Кароў там мама даіла. У нас 5 дзяцей, а коні ў нас здыхалі. Так вот, які хазяін без каня?! Так вот, паедзе – заробіць грошы. Два раза ездзіла, кідала малых рабят і паехала. Сезон работала, кароў даіла, бульбу капала.

Піянеркай была. На танцы хадзіліі. У нас 30 маладых было ў Калітах, хлопцаў і дзяўчат. Танцавалі польку, вальсы, кадрыль, шыбра – быстрынька скакаць. Весела было! Танцы былі пад вочрадь – у розных хатах. …Такія пастаноўкі рабілі, сцэнкі ставілі, у другія вёскі ездзілі… У хаце збіраліся, ставілі Несцерку, Паўлінку ставілі. Лазанская даліна – такая красівая пастаноўка была, на беларускай… Святкавалі: Вялікдень, Каляды, Троіцу, Пятро. Дома празднавалі. Касцёлы былі закрыты. У нас праваслаўная адна была – яна замуж прыйшла. Так яна вянчалася ў касцёле. Мужык каталік, а яна праваслаўная. Ксенз у хаце вянчаў. Я тожа вянчалася. Председацель за гэта не ганяў. [*А хто у вас быў прадседацель пасля вайны?*] Былі з Расіі, а зараз месныя. Участковы нямесны быў, з Паставаў. Насцярожана да яго.

Дезерціры хадзілі пасля вайны групамі варужоныя. Долга. Банда... Пры немцах яны не служілі. Тут служыў адзін, Янка Каліцкі, ў немцах. Ён тады з немцамі выехаў. А гэты – не. Міхась – вясковы хлопец, у дезерціры пайшоў, каб на вайну не ісці. Усю вайну хаваліся ў лесе. Дезярціры былі. Ідуць дзяўчаты ў ягады, а яны ляжаць – цэлая группа пад кустамі, вааружонныя, ґаварaць: нікому не гаварыце, што нас віделі. А так, яны хадзілі, магазіны абкрадалі, цэрквы абкрадалі пасля вайны. Вясковых не чапалі. У Слабадзе Мядзельскага раёна цэрква – укралі залатыя крыжы… То боты хромавыя адбяруць, то яшчэ што… [*А дзе яны сядзелі?*] У лесе, недалека ад Калітаў. Лес густы быў – Гарохавы лес звалі, Гарохаўе. Іх настаяшча было, больш за шэсць чалавек было. Чатыры гады пасля вайны бадзяліся. [*А хто іх і як славілі?*] Міліцыя пабіла і ў ссылку ў Сібір – яны лішыліся Родзіны. А потым прывязлі сюды хараніць… А так пасля вайны спакойна было.

***Запісана ў 2017 г. ад жанчыны 1942 г.н.***
***у в. Каліты Пастаўскага р-на***

## Пра бандзітаў

А ну гэныі бандзіты былі такія. Ну гэтыі Гронскіі. Яны стрылялі там. Ну, гэта пасля вайны было. [*А каго яны стралялі?*] Вот, там земля была наша, свёкра. У Скрабутунах. А яны жылі тут, у Завулку. Дык пойдуць, гаворуць, бульбу тамака капаць, ці што, а яны сідзят і страляют. Ну чалавека аднаго забілі. Кралі хадзілі, – абіралі, абіралі людзей. А тады абабралі магазін у Селішчах. Тады даследзілі іх і пабілі.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1934 г.н.***
***у в. Рускі Завулак Глыбоцкага р-на***

***

[*Так, а хто вот яны? Як іх называлі?*] Ну, я считаю так. Во-первых, там были люди разных убеждений. Были тыя, которые не согласны з савецкай власцю, и тыя, каторые выпалняли прыказы. Былі тыя, каторые нашкодили там што-та, – пры любой власці неслі бы атветственнасць. Разных кацтыгорый люді туда пападалі. Это не абязательна, што ані там былі между сабой ў дружбе все. Ну, ім нада было как-то выжыць, пераждаць врэмя. У аснавном, всё-такі, былі тыя, которые, когда раскулачіваніе… Тут эта не называлась раскулачіваніем, а этой самой калектывізацыяй, кагда всё атбіралі. Ну, челавек азлоблены был. Вся его жызнь была направлена на то, чтобы ўвелічыць своё хозяйство, абеспечыць сям'ю, абаспечыць своё потомство, а тут – всё, сдаваць всё.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1929 г.н.***
***у аг. Друя Браслаўскага р-на***

***

[*А ці спакойна тут было пасля вайны?*] Было ўсякае. Былі, што некаторыя ўмудрыліся здезярціраваць. Але ж трэба хавацца, власть тут жа ўжо паявілася. Ну дак, яны у лесе сядзелі, дзе хто. Зімой хаваліся ў сваіх знаемых. Адзін тут быў… Як сказаць? У 52-53 вылавілі яго, астатніх палавілі. А адзін хаваўся. Тут такая дзеравушка Забалацье ёсць, і там у нейкай бабы, і мужык у яе быў. Як яны там, не знаю… мужык прыжаты быў. [*А як его схвацілі?*] За ім слядзілі, ужо зналі НКВД, што ён есть тут і выследзілі. Прыслалі ў суседнюю деревню председателя калхоза, а ён у КГБ служыў, ваенны чалавек. Ну яму трэба было ўсё разузнаць і разнюхаць. Яны троху зналі, ну не ўсё. Ён хаваўся у гэтай бабы, у Забалацы. І вот, НКВД солдат з Пастаў патрэбавалі, акружылі гэтую хату, і гэты прадседацель тоже быў. Не знаю, якое званне было. Можа, майор ці больше… А гэты бандзюга на печы ляжаў у гэтай хаце, на печы, укрыўшыся… Ну, тады бандзюга, мусіць, поняў, што дзела нячыстае. Ляжаў-ляжаў, утаішыся, і тады ўжо саскочыў з печы – і на ваеннага! Ну, ваенны тожа спасобны чалавек! Ну, і качаліся ў хаце… То адзін, то другі наверх... Убіць не мог ні адзін, ні другі. Ну, тады, салдаты, каторыя стаялі на дзежурстве, на дворы, пайшлі на помашч: скруцілі таго. Ужо после таго не было ні чуваць такіх. [*А што тыя бандзіты ўспелі плахога нарабіць?*] Ну, убіваць каго не чуваць было… Грабілі магазіны… Хто ж яго будзе карміць?! Людзей грабілі.

***Запісана ў 2017 г. ад мужчыны 1929 г.н.***
***у в. Груздава Пастаўскага р-на***

## “Вядома, свае людзі, каб ім Бог здароўя!”

Зямлі паўвалочкі – 12 га, харошы хутар. Уж жыліся мы за Польшчай. Ровары былі. Малако здаешь, – яны грошы ў месяц выплачвалі і вышчытавалі, а тое што аставалася – нам. У 47 гаду ішла замуж, у 45 гаду вайна кончалася. А ён вярнуўся з вайны, яшчэ два гады – і мы пажанілся. У 1949 г. вянчаліся ў Ажунах (я праваслаўная). Такая красівая цэрква ў Ажунах! У Варапаева спалілі немцы царкву. У 47 гаду мы жаніліся, яшчэ мы на хутарах былі. Я ішла, было 17 га зямлі ў майго мужыка, але ў яго было трое братоў. Два гады пажылі, а потым… У нас на Сібір з вёскі павывазілі, а нас адно спасло…

У Міхаліне Карэцкі быў пан, гэта за Польшчу, але ён быў тожа праваслаўны. А палац які быў красівы! Міхаліна, Сяргевічы – гэта быў двор. А тады, калі Польшчы не стала, а Расея, – так яго вывезлі ў Сібір. Было два браты. Адзін жаніўся, а другі – не. Так вось, за Саветамі ён доўга жыў аж і памер ён тут. Яго не тронулі. Ен прадаў сваю зямлю. Іх было 2 браты, яны падзяліліся. Гэны брат рабіў сваю зямлю, а гэты – прадаў. Бамжом быў, нічога не было. І ён жаніўся і жыў. Пахавалі на Дунілаўскім. А гэтага вывязлі ўсю сям’ю. Пасля вайны. Пасля вайны 14 ваякі, іх награждалі па 25 га зямлі, яны зваліся “асаднікі” і яны моцна добра жылі. Тады зачалі, як савецкая власть устанавілася, і зачалі іх на Сібір. Праўда, тут быў прадседацель, і з маім яны былі ў арміі Польскай, друг такі, добры. Ен у Дунлавічах. Харошы такі быў мужчына. І на майго, такі, кажа: “Ты знаеш, як небудзь дзялі зямлю на тры браты, аднаго ж забілі, але ж засталася жонка і двое дзяцей. Дзялі зямлю. Паедзеце на Сібір. Вы ж кулакі!” Тады мой паляцеў у Міхаліны. А яго брат быў вельмі добры каваль: таму пану, ў Міхалінах, рабіў ўсё. Дзе ж тут граматнага ўзяць? Нада ж і дакументы зрабіць, і ўсё. Да пана. І ён сагласіўся. Ноччы прыехалі і раздзялілі гэтую зямлю на трох. Болей, як па 5 га. Власць устанавілася, – у сельсавет. Гэтыя ўсе дакументы парабілі на трох, і мы асталіся. А, во, ў гэтай хаце жыве цяперака бабуля. Дык, ейнага бацьку, а ў яго 10 га зямлі было, – у цюрму. Як яны засталіся, матка і трое рабятак, як яны выжылі?.. Пасля вайны старасту пасадзілі пры савецкай вайны, на 25 гадоў пасадзілі, дык 8 адседзіў: нейкая амнісція была. І вярнуўся, жаніўся, і ў Польшчу выехаў з жонкай.

Калі перайшлі з хутара ў веску, спалі, не зашчапіўшыся, – не было ніякіх зладзяёў, ніякіх бандітаў. А тады ўжо сталі, дальше – больше.

Падаткі, ой, я помню тата, гэтак, змалоцяць воз цэлы, і вязець – гэта ужо за савецкай уласцю.

Мыла варылі. Такі сіні камень, жалезная бляха, і вылівалі, загушчалася. Яно толькі чорнае мыла было. Ліцо мыць мыла рабілі… Яйкі нада было біць і адекалон пакупалі. Дык, ліцо мыеш – і пахніць.

Пасля вайны власць стала справядлівая, нармальная стала…

49-50 год – калгас. Футар абсеены, а ў восень каб абсеелі поле, бо будет калгас. Сваё кушалі, паназапашвалі: свірны былі пазасыпаныя. А ў калхозе гады тры нічога не палучалі. Там гірсы нейкай на плячах прынясець пуды тры, а калі б не сваё, – дык паздыхалі. А за хлебам – у Дунілавічы, па паў булачкі давалі хлеба. А тыды зачалі спекуліроваць хто чым. Хто чым. Мой спекуліраваў. Надта моцна дарага быў лён. Даўней мялі лен у банях свой. Тады здавалі на базарах, скуплівалі гэтыя спекулянты, перапрадавалі. Так мой стаў лёнам спекуліраваць. Ездзілі, цэліну разраблялі, а там моцна пшаніца расла. Так, гэтую пшаніцу давалі, і яшчэ і грошы даплачвалі.

Па аднаму кабану пры Хрушчове. Помню, было два кабаны. Ну аднаго заперлі ў хлеве, а другога ўсцягнулі на сарай, на паталок. Ну і ходзіць рэвізія, сколько ў каго свіней. Яны ідуць міма нашага сарая, а гэты кабан лыч выставіў і "рох-рох". Вядома, свае людзі, каб ім бог здароўя! Кажуць: "Убярыце, вы гэтага кабана з хлева, каб яшчэ хто-небудзь не ўвідзіў!"

Пасля вайны карову держалі. Самагонку гналі, але ж ганялі, ай, ганялі. Кажэн, кажэн гнаў… У нас і баня цяпер стаіць. У прадбанніку. Для сябе гналі. Нада ж было дровы прывязці, лясніка напаіць, нада ж гэтак вот бутылку… А дзе накупляессі гэтых бутылак?! Помню, быў участковы ў Дунілавічах. Суббота, мой… Усё ж баня цепліцца, дымок, усё ж ідзець з бані. У субботу гнаў самагонку, участковы хадзіў – хадзіў, чакаў аўтобус. Даўней так аўтобусы хадзілі, то ў Паставы, то ў… Па 4 разы. Хадзіў-хадзіў гэты ўчастковы, а тадды, гляджу, ідзець у дворышча, а мой запёршыся, але відаць было. І казаў, так спужаўся, а тады на пяць гадоў тюрмы – гэтак жа строга было! Ну што рабіць?! А той захацеў у тувалет і пашоў у туалет, сваё дела справіў і пайшоў на дарогу. Было моцна строга, але ж усё роўна гналі, у лесе… Гэта дзіва на дзіва, столькі жыву! Каб гэта даўней – баба і водка… Моды гэткай не было! А цяпер – бабы горш, чым за мужыкі.

***Запісана ў 2017 г. ад жанчыны 1922 г.н.***
***у в. Пятроўшчына Пастаўскага р-на***

## "Крупинка за крупинкай ганяюцца з дубинкай"

Помню, мне было 4 года, когда привели в Поставский. Помню, как везли: жарко было, очень кричали, ехали очень долго. Потом многие заболели тифом. Нас распределяли по деревням. Мы попали в хорошую семью: женщина, у неё были 2 дочери. Мы: я, мама, две сестры и брат. И мы жили, пока война не кончилась. Жили у той женщины. Если было что есть, так она наливала, а так нас нанимали: пастить за кого-то – так и жили. Коровы у всех

были, в войну сохранили, порядышна было коров. Был пастух и три пад-паска, возле леса. За еду пастили, 6-7 лет было. После войны вернулись домой, думали, отца найдем, а там деревня сожжена, там только окопы, блиндажи, воронки от снарядов. Год мы там пожили, мама заболела и умерла от малярии. Приехал брат (работал) и забрал нас в Поставы.

После войны – голод. Собирали мерзлую картошку и добавляли весной с красненькими головками – потом мы это «голодом» звали, ели молодые листочки липы, корень аир – все что можно, то и ели. Женщина, у которой жили – у неё, было, что и хлеб… Корова отелилася и, если телёнок отелился, их в дом брали. Мужа мы яе не видели. Мы хадили на кладбище: вот весной и осенью люди ходят, – и мы ходили. Вместо того, чтобы класть на могилки, они давали нам. Придёшь к кому и просишь, кто и давал, а другой: "Што ходзіце?! Мне самому нада". Был такой мужчына, сад был агароджаны – жалко было яму.

В 1946 от сельсавета дали документы, завезли у детский дом. Вторая четверть началася, у детдоме было болей 100-120 чалавек: и русския, и беларуси. Жизнь нармальная: як па тем временам, то нармальна. Хлеб утром 125 грам, у абед – 200, а уже вечарам 100. У людзей и таго не было. Нам суп варили, так смяялися "крупинка за крупинкай ганяюцца з дубинкай". Причем, гэта спецдетдом, где было лучше, чем в других, для детей, у кого радители погибли у вайну. Правда, было несколько детей, которых нашли радители. Первыя три года – русская школа, а 4, хто хацеў, на беларускай можна было. Первы клас канчали в детском доме, бальшая комната, там были малыя и дяди 15 гадов. Кто старший был, особенно ребята, забирали у ФЗУ. Многа на фабрику "Камунарку"… А я пашла в Ашмянскае педвучилишча…

***Запісана ў 2017 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у в. Васіліны Пастаўскага р-на***
***(нарадзілася ў Пскоўскай вобл., у 1943 г.***
***немцы вывезлі ў Пастаўскі р-н)***

# ШТОДЗЁННАСЦЬ ВЯСКОВАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ ВЫЗВАЛЕННЯ АД НАЦЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ І Ў ПЕРЫЯД ПАСЛЯВАЕННАГА АДНАЎЛЕННЯ

Дадзены блок біяграфічных матэрыялаў утрымлівае сюжэты, якія дазваляюць зразумець, як пасляваенная сітуацыя адбівалася на жыцці вясковай грамады: пра спажыванне і размеркаванне матэрыяльных дабротаў, спецыфічную дэмаграфічную сітуацыю, асабістыя жыццёвыя практыкі, якія датычыліся функцыянавання хатняй гаспадаркі, дапаможных галін жыццезабеспячэння, пра баўленне вольнага часу.

Адным з наступстваў Вялікай Айчыннай Вайны стала дэфармацыя сацыяльна-дэмаграфічнай структуры, што абвастрыла праблему працоўных рэсурсаў вёскі Паўночнай Беларусі. Галоўнай сілай сталі жанчыны і падлеткі. Неабходна адзначыць, што так як большасць рэспандэнтаў у пасляваннны час былі дзецьмі, то цэнтральнай фігурай ва ўспамінах выступае постаць мамы, якая выратоўвала, як магла. Увогуле, жанчыны ў паваенны час былі найбольш дзеяздольнай групай, а сям’я, у якой быў працаздольны мужчына, лічылася заможнай.

Пасляваенная паўсядзённасць адбілася на побыце дзяцей, якія вымушаны былі адаптавацца да складаных умоў жыцця і вельмі хутка пасталець. Нагрузка на дзецей у паваенныя гады ў сістэме жыццезабеспячэння беларускай вёскі значна ўзрасла, што, у сваю чаргу, скарэктавала баўленне вольнага часу, а таксама адмоўным чынам паўплывала на магчымасці атрымаць ці працягнуць адукацыю. Вельмі красамоўна адзначыў адзін з рэспандэнтаў: “*Маё децтва малое прайшло: да пятнаццаці лет вайна, а тут у мяне ўжо пашла ўзрослая жызнь, з пятнаццаці…*”[12]

Прыведзеныя фрагменты запісаных інтэрв’ю сведчаць, што надзённай праблемай у першыя гады пасля вызвалення з’яўлялася адсутнасць базавых прадуктаў харчавання. Экстрэмальная сітуацыя з харчовымі рэсурсамі была часткай рэчаіснасці ў першую чаргу для вясковага насельніцтва, якое пражывала ў раёнах – эпіцэнтрах карных экспедыцый нацыстаў. Пашыраным было выкарыстанне ў ежу розных раслінных сурагатаў. Прычым рэестр раслін, што выкарыстоўваліся ў якасці харчовага дадатку, значна павялічваецца за кошт тых, якія ва ўмовах адноснага дабрабыту не выкарыстоўваліся (кара дрэў, канюшына, шчавульнік, асака, лебяда, хвошч, кісліца і інш.)[13].

---

[12] Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1930 г.н., в. Первамайскае Верхнядзвінскага р-на.

[13] Сумко А.В. Збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманит. науки. – 2021. – № 1. – С. 184.

У першыя гады пасля вызвалення самым “хадавым” прадуктам была бульба, пакінутая на палях пасля ўборкі ўраджаю. Некаторыя рэспандэнты падчас інтэрв’ю падкрэслівалі, што страву з гнілой бульбы называлі “ташноцікі”. Вельмі кранальна ва ўспамінах гучыць тэма пасляваеннага хлеба. Калі размова ішла пра пасляваенную сістэму харчавання, то рэспандэнты адзначалі істнотную нястачу солі, і кожная сям’я па-свойму выходзіла з гэтай сітуацыі. Шэраг рэспандэнтаў казалі, што захавалі ў памяці і пранеслі праз усё жыццё смакавыя адчуванні пасляваеннай гастраноміі.

Ва ўмовах разбуранай эканомікі па выніках вайны адбывалася вяртанне да натуральнай гаспадаркі, якая дазваляла дасягнуць пэўнай ступені аўтаномнасці: “жылі толькі са свайго”, прычым гэта было характэрна як для калектывізаваных, так і для раёнаў, дзе пераважаў анаасобны сектар. Эканамічны патэнцыял уласнай гаспадаркі дазваляў выжыць у неспрыяльных умовах. Адметнасцю перыяда было тое, што ў першыя паваенныя гады ва ўмовах адсутнасці ўліку частка зямельнага фонда была самастойна размеркавана паміж сялянамі, якія свядома не спяшылі яе вяртаць у калгасны фонд, бо фактычна выжывалі за яе кошт. Асноўную долю прыбытку, у тым ліку і ў грашовым эквіваленце, сяляне атрымлівалі ад рэалізацыі прадуктаў са свайго прысядзібнага ўчастка і тавараў рамесленнай вытворчасці. Таму наяўнасць рынкаў збыту для ўласнай прадукцыі адыгрывала вельмі важную ролю. У лепшым становішчы знаходзіліся сяляне, якія жылі недалёка ад чыгуначнай станцыі, буйнога мястэчка, ваеннага гарадка, горада, дзе насельніцтва атрымлівала заробак грашыма. Рэспандэнты падкрэслівалі, што ў паваенны час актыўна выкарыстоўвалася тактыка мінімізацыі расходаў.

У якасці дадатковага сегмента гаспадарчай дзейнасці сялянства Паўночнай Беларусі ў паваенныя гады выступалі традыцыйныя рамёствы і промыслы, распаўсюджанне якіх залежала ад лакацыі населенага пункта. Улічваючы тое, што рэгіён меў вялікую колькасць вадаёмаў, здабыча рыбы ператваралася ў дадатковы рэсурс, які не толькі ўключаўся ў сямейны рацыён, але і разглядаўся як магчымая крыніца даходаў. Рэспандэнты ўзгадвалі, што рэалізацыя рыбы ў пасляваенным горадзе ва ўмовах карткавай сістэмы была вельмі выгодным бізнесам. Распаўсюджанай практыкай стала вяртанне да самаробнага абутку і даматканага адзення.

Асобны блок прысвечаны самагонаварэнню, якое ў пасляваннным вясковым соцыуме прадстаўляла сабой складаны сацыяльна-эканамічны феномен, які, апрача сваёй утылітарнай прагматыкі, меў некалькі важных дадатковых праекцый – сацыякультурную, абрадавую і камунікатыўную.

***А. В. Сумко***

## “Бацькоў пачці што ні ў кога не было”

Вот пасля вайны жылі очэнь-очэнь плоха. Бацькоў пачці што ні ў кога не было. Што мы былі пасля вайны?! Самая большая я была, мне было пасля вайны 8 гадоў. Матка адна і нас трое было. Ну вот, бярэш вяровачку, ходзіш у лес, вось такіх пруточкаў насабіраеш у вяровачку – на плечы, прынясеш, каб яна вытапіла печ. Летам… Цяпер, во, сын у мяне, ён жа дажа і з хаты не выйдзе басяком! А мы хадзілі ў лес басяком, па лясу хадзілі, сабіралі…

Жылі бедна, грошай не было. А тады, после вайна, троху сталі жыць лучшэ ўжо, дык усё роўна да 61 году грошаў у нас у калхозе не было. Пісалі якія-та трудадні, а на трудадні там давалі… Калі троху дадуць, а калі і нічога! Цяпер дажа не расцець тая “гірса”, як яе звалі. Цяпер яе нет нідзе. Касцяроў дадуць грам тый кілаграм, – тый касцер есці нельга было. А я без бацькі гадавалася, дык не дай Бог! І шчавель елі, і, во, клевер выспеіць, і, во, этыя медункі рвеш, таўчэш і елі. Ён не лез у горла! Крапіву, во гэта, рвалі… Крапівы было!

Нас многа было ў дзярэўні – дзяцей, людзей. Цяпер этага нету, а раней было многа. Дзяцей было многа, па тры ў каждага, па чатыры. Па тры дык гэта абязацельна. Ну і ўсе хадзілі, усе ж такія былі. Бацькоў не было ў нас. Ну хадзілі і рвалі. Я дажэ раз адзін, у тое ўрэмя было, што нідзе шчаўлю нет. Пашлі мы на кладбішча. На кладбішчы нарвалі эта шчаўе. Прынесла я дамоў, я нічога не гавару, дзе я нарвала. А там суседка, ну і мама гаворыць: “Ой, дык сёння ты шчаўлю харошага прынесла”. Я кажу: “Мар’я нас завяла ў Чурылава і па кустах хадзілі і нарвалі”. Зварылі мы гэтага шчаўю, а я яго ня ем. Я знаю, што ён з кладбішча. Ну, мае, як не зналі, ядуць. А я сама ня ела, я знала, што ён з кладбішча. А ім не сказала. Не было дажа шчаўя! Не рос, ой! Не дай Бог так, як мы жылі пасля вайны!.. Ні адзець, ні абуць – нічога. У мяне цяпер яшчэ матрас ёсць, які раньшэ набіваўся саломай ілі сенам. І падушка з саломы. Матрас эты набіваўся сенам ілі саломай, і гэта… Спалі на гэтым… Пра простыні ніякіх разгавораў не было. Прыходзіць Пасха – матрас гэты вытрасаеш, выбіваеш, памыеш яго, высушыш, апяць набіваеш і апяць спіш. Свежай саломай ілі сенам, чым прыхадзілась.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Далосцы Бешанковіцкага р-на***

## Пра бацьку, як той дзяцей не пазнаў

Пасля вайны, канешна, дужа цяжка было. Раскажу вам яшчэ як бацька… Ён быў шафёрам, і яго куды-та пад Пскоў. Ну, і вот, вайна ўжо кончылась

і ён з начальнікам вёз куды-та прадукты мяняць на што-та, адтуль, дзе ён ваяваў. Там, дзе ўжо слабанілі. І яму нада было ехаць міма Полацка. А я ўжо помню, як прыязжаў ён, як мы прыйшлі з ягад, ён нас нікога не узнаў. Вот так во вайна так давяла. Расказваў: “Начальнік задрамаў, а я гляджу – бірка стаіць “Полацак – Расоны” і, гляджу, стаіць кіламетраж, я і махануў цераз Полацак. Каля Трэццяй Баравухі ён абачнуўся. Паглядзеў па карце: “Стой. Куда вязеш? Я цябе расстраляю!” Ён пашчытаў, што я прыдацель. “Страляй! Ты панімаеш, што я еду 20 кіламетраў ад сваей дзярэўні? Страляй! Я хочу ўзнаць хто ў мяне астаўся ў жывых!” А ніхто ж нічога не знаў. Стаяў, стаяў: “Ладна, садзіся, паехалі”. Ну, вот прыехалі сюды, а маме прыйшло пісьмо ў Юравічы, бо Юравічыскі сельсавет тады. І яна с сваей братавай пашлі ў сельсавет пісьмо эта палучаць. Пошты не было, а на сельсавет. А бацька прыслаў на сельсавет, штоб узнаць, хто астаўся ў жывых, ці ёсць такія. А цётка нашла нейкі кацёл такі, ламаны, і варыла там кашу. А мы рабяты былі ўсе ў ягадах. Ён яе ўзнаў, а яна не ўзнала яго. Не узнала! А тады, як стаў пра рабят распрашываць, а яна: “Ай, ай, эта ж Паўка! Эта ж Паўка прыехаў! Ай-яй-яй!”. А дзе Аляксееўна? Аляксееўна пашла і с Фамічнай у сельсавет. А рабяты? А рабяты ў ягадах. Ну быстра тожа мы дамоў прыйшлі, за маткай ён з’ездзіў прывёз з сельсавета. Ну і тут начальнік гэты. Паглядзеў начальнік, што голыя, босыя, есць нечага, абсалютна. Палез на машыну, скінуў мех сухарэй, сахару, круп якіх тамака, мукі. Бацька ругаецца: “Што ты будзеш дзелаць? Цябе расстраляюць і мяне расстраляюць. Хто-та паверыць”. А ён: “Нічыво, Захаравіч, мы ўсе дела ўрэгуліруем, нада спасаць цех людзей, каторыя асталіся жывыя, прышлі ў свае дзярэўні”.

[*А ў Полоцк на базар ці ездзілі?*] Канешна, вазілі пасля вайны, у каго было малако. Мы туды мала ездзілі, – у нас сям’я бальшая была, нам тока самім хватала, – а каторыя адзіночкі: карова ёсць, малака збяруць, масла збяруць, творагу, яічак… Завязуць бульбы, завязуць і прадаюць. Во, з поезда злезіш, і ля поезда бегаюць. Шчас ля поезда тут і прадасі. Свабодна. Не так, як цяпер: нада і места, нада прайці аналізы… Не-не-не, так не было! Свабодна.

***Запісана ў 2016 г. ад жанчыны 1937 г.н.***
***у в. Казімірова Полацкага р-на***

**“Мы голаду страшнага не цярпелі, бо ў нас быў папа”**

Пасля вайны папа быў ваеннабязаным, і яго забралі разам з кабылкай лес вазіць і рамантаваць масты. Паставілі на ўчот і ім давалі паек на малых. А мы з мамай на іх іждівеніі. У нас была карова (я атабрала ад немцаў), быў парасенак, былі куры, быў агарод. Садзілі бульбу, капусту. А ў гэтых былі

пайкі. Мне далі дзве, можа, пары белых чулкоў. Я іх надзявала на танцы ў сапагі. Тады далі кусок матэрыялу, а там тры ўзоры: спіна такая, рукавы – такія, але ж ў мяне сарафан. Тады ён (папа) кабылку прывядзець (потым у яго кабылку забралі), не кідаць жа там. Сена накосіць – і апяць паехаў. Мы голаду страшнага не цярпелі, бо ў нас быў папа. Другія па палях хадзілі, асаку смургалі…

Папа плёў жакі і ставіў у раку. Мама насеіць канаплі і вырасціць, абмалоціць, а тады дзелаець пакулля, спрадзець, а папа тады вяжыць жак. Пляцець-пляцець, дабаўляе, і атрымаецца такая бочка. Тады ўпляцець з лазы такі абруч. Горла такое дліннае і так закасанае, а тут дырачка. І рыба ўпалзець і назад не выйдзець. Выцянець рыбу, – у мяшок і ў Дрысу. Як пойдзе ў Дрысу, так на вуліцы расхватаюць рыбу (да базара не дахадзіў), тады не запрашчалі. Мама яйкі прадаець, масла і бутылку самагонкі. [*За грошы прадавала?*] У апрэдзелённую хату насіла, а яны тады давалі – плацілі гэтым жа, што яна прасіла: на мыла, там, на соль, на табаку, запалкі… Гэтага не было ў магазінах.

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1923 г.н.***
***у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на***

**“Вайна кончылася, казалася, што большай радасці не было!”**

Мы малыя былі, а мама адна была. Папа ў Фінскую загінуў. Толькі дзедушка быў. Спалілі нас. Жылі ў землянках – яма, сверху бровна, крышу з жордачак і дерван. Мама хадзіла ў траснік, з трасніка былі здзелаўшы крышу. Самі печачку дзелалі. Мы ў землянкі 2 сям’і жылі. Дзедушка делаў з дерава прадметы абіхода, мебель. Зімавалі ў землянцы. Дом сталі застаўляць строіць, крэдыты давалі. У каго мужчыны былі – быстро пастроілі. Мы перашлі ў 47 годзе ў дом…

Вайна кончылася, казалася, што большай радасці не было! У вайну схавалі ў яму скрыню, у каго што было. Швейную машынку закапалі. Трохі шылі пасля вайны.

Голадна было. Усяк кушалі. Картошку гнілую з саўхознага поля… Мяса… Кабылу застрэліўшы былі. “Ідзі, Насценька, мяса ёсць, вон там ляжыць конь…” Солі не было. Удабрэнне хто-та прынасіў. Мама выварывала. Крапіву сабіралі, шчавель.

Пасля вайны пашла ў 4 клас. Хадзілі ў Юзафова, у хаце пола нет… Я в школу в даматканым – все носілі. Мама ткала і я ткала. І на калавроце пралі. Пралі з лёну. Калі сарціруем і сабе па кулечку прынасілі.

Пашла ў калхоз. У Брушкава хадзілі за зерном – пуд, каб засеяць калхознае поле. У Боркавічы хадзілі за зерном.

[*Калі зажыліся?*] Хто яго знаець… Можа, калі первы раз зарплату далі. [*А так як жылі?*] Больш жылі са свайго агарода. Картошку ў аснаўном, зярно. Жорны былі ў саседа. Муку малолі. Хлеб пяклі з чаго было.

***Запісана ў 2023 г. ад жанчыны 1930 г.н.***
***у в. Каханавічы Верхнядзвінскага р-на (нарадзілася ў в. Доўгае)***

## “Нам робіць нада!”

Ой, каб сягодня паглядзела маладзёж, як мы тады робілі! Што ж, маладая саўсем была. Сталі раць, сталі пахаць. Мама кажыць: “Мне твая учоба ні нада, – бацька бальны, я бальная, – а нам робіць нада”. У плуг шэсць чалавек становіцца, сёмы ў сярэдзіне, тры чалавекі па баках, а ззадзе ідзець плуг. [*Так, а вы з якіх час пачалі ўжо робіць у калхоз?*] Як толькі вайна кончылася, так і пашла робіць. Мама не пусціла мяне на ўчобу, сястру меншую наўчылі. [*А вы старшая?*] А я старшая была.

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1931 г.н.***
***у в. Мураўшчына Полацкага р-на***

***

Ну, тады ж цяжолыя пасляваенныя гады былі… Бацька мой… Яго ўбілі… Гэта цяпер дзеці ў школу ходзюць, а мы ўжо кароў пасцілі. Гадоў у трынаццаць я ўжо ў калхоз пашла. Пяць класаў толькі кончыла. Хадзілі і мальчікі, і девачкі ў калхоз, лён рвалі. Тады ж усё ў ручную было, цяжка было, дужа цяжка… Дзеці ўсё робілі: за агароднінай мы ўхажвалі, скаціну мы гадавалі, кароўку… Я толькі сем класаў – нада было работаць, а ад 13 гадоў у калхозе з мамай лён палола, жыта жала.

Быў перыяд, што дужа было цяжка – гэта ад 45-га да 47-га. Я помню, як мы па полі хадзілі, мерзлую бульбу, якая вот засталася невыкапаная… І такія плюшачкі з гэтай картошкі пяклі. Шчавель быў. Ягады – абязацельна, грыбы – абязацельна. Мама прынасіла двумя карзінкамі грыбы. Бабушка кіпятком залівала ў такіх бальшых карытах, вымачвалі – гэта на зіму. Мы самі малыя, меншых “на матушку” і дзеці з усёй дзярэўні пайшлі за ягадамі. [*А што значыць “на матушку”?*] Ну як (смяецца). Друг за дружкам, ну за сабой цягнулі. Земляніку, чарніку, галубіку – ўсё сабіралі. Маліну здавалі, нейкія капейкі плацілі. Возле леса быў прыёмны пункт. Мы ўсёй дзярэўняй сабіралі. Гэта за Курылавічамі мы хадзілі і капеечкі зараблялі. У школу ж было сабіраць сільна цяжка. Помню мама, які агурочак вырасціць, прадавала. Яйка якое – усё прадавала. Каб абуванне якое купіць. Кніжкі куплялі.

Калхоз у нас арганізаваўся ў 49-м. [*А ці былі такія, што ў калхоз не пайшлі?*] Былі ў нас такія. Ну, яны тожа нічога не выйгралі. У Латвію з’ехалі. [*А як да калхоза жылі? У вас жа зямлі немнога было?*] Цяжка было. Я помню, радзілася сястра ў 46 годзе і прыйшлі жанчыны ў атветкі і, як сёння помню, прынеслі блінчыкі з маркоўкі, такія красненькія… Бедствавалі. Гірсы давалі, тады постнага масла са льна. [*А ці ўкуснае было?*] Ну, ня очэнь. Яго з лукам жарылі. Дзеці ж паўгалодныя былі, памакнём хлеба – і пабеглі. Мама кацёл бальшы круп ячменных зварыць, забеліць і паставіць на стульчык. Ну мы пабегаем, пабегаем і чэрпаком чэрпаеш крупы і пабег.

У дзярэўні было многа дзяцей, ну і стада кароў настаяшчае і пасцілі. Старэйшым нада было на работу хадзіць кажны дзень. Было дужа строга, што калі жанчына застанецца дома – 5 трудадней зрэзалі. Таму мы наніма́ліся. Карочэ, 10 рублёў за этую пасту. Так было дажа такое, што вот, еслі не нас пазавуць, а з другой сям’і, – ужо прама абіжаліся.

Людзі абшчаліся, людзі добрыя былі, дружылі. Дзяцей ражалі і ўсе дружылі. Вот у калхозе, напрымер, вот начынаецца сена ўборка, усё ж уручную і ўсё з песнямі!

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1940 г.н.***
***у в. Цвеціна Мёрскага р-на***

**…Рэбяты, гэта іхная работа**

Вот, ужо ў маю юнасць з 38-га, можа, (пасля вайны 10 гадоў), пасцілі кароў. Вот і я лічна. Стада – там восем кароў: нашы, дедушкі, дяді. Вот і кажды день рэбяты, гэта іхная работа, пасцілі кароў. І, вот, кагда ў сенцябрэ мы ў школу пайшлі, мая сестра маладзей на год за мяне, у разныя змены хадзілі, пагодкі: адна ў першую смену, другая ў другую. Ну, вот, адна на пасце, другая ў школу. Гэта прыгодзіць, гэта ідзе на паству, а та ў школу. Пасцілі не як цяпер па палях, а ў лесе палянку нейкую там. Так і пасцілі.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у в. Папшулі Мёрскага р-на***

***

Харошае дзетства было. У школу хадзілі – ні цетрадзей, нічаго. Помню, газеты палучылі, на газеце пісалі. Гэта ўчыцель дзе-та дастанець кусок газеты. Так што жа, мы гэтыя цыфры па мацемацікe на газетах напішам, а нам жа нада пасчытаць. На чым жа? Не каждый к даске пойдзець. [*Гэта*

*пасля вайны ілі да вайны?*] После вайны. Адзін учыцель на чатыры класа. Два класа, вон тут, гэты ряд занімаюць, а два класы – вот гэты. Учыцель даёць першаму-другому класу вот гэта заданне, трэцці-чацвёрты чытаюць. Патом гэта правяраюць, тут эці чэм-та занімаюцца. Адзін учыцель на чатыры класа. Ад папы асталіся бацінкі, я надзену гэці бацінкі, штоб да школы дайці, а школа была недалеко, цераз два дома. Прыходзім на парог школы, бацінкі – хэць, ногі пад себя, селі, ножкі пад попай, цёпленька, ну і сядзім, слухаем і што-та дзелаем. Мама з пятага года, у неё было пальто, ана яго распарола, пашыла мне плацье. Форма нужна была тагда, нужна была карычневая і нада ж было з варатнічком. Ана пашыла, я хадзіла, плаціца берагла тры года: васьмой, дзевятый і дзесятый. І каждый раз ты прыйдзеш са школы, ты яго акуратненька паложыш, павешаеш дзе-та на стульчык, каб яно не памялася. Толька ў школу! А дома – што прыдзёцца.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1931 г.н. у г. Дзісна (нарадзілася ў Віцебскім р-не)***

**Паваенная гастранамія**

[*Як пасля вайны жылі?*] Ай, после вайны, есць нечаго было, хадзілі сабіралі **ташноцікі**. Такая картошка. Зямля замёрзла, і картошка, как крахмалена. І прідём сабярём, дзяцінку елі. [*А дзяцінка ета што такое?*] Трава такая, – дзяцінка, – клевярочік такой розавенькій. Насушім і ядзём. Вася, бывала, пайдзець, ташноцікаў наберыць, а мама патом етых аладзей напікець. Патом давалі нам паёк. А што засеялі мы жыта, – тое ўсё ў калхоз забралі. Як нас асвабадзілі і осенью снялі ўсё жыта… Было харошае, а яго ў калхоз знялі.

***Запісана ў 2012 г. ад жанчыны 1925 г.н. у в. Надзёжына Лёзненскага р-на***

***

А пасля вайны адразу калхоз стаў. Немцы ўсё спалілі, жылі ў лесе ў землянках. Есці нечага. Канюшыну, цвяты такія розавыя, збіралі, лісця, бульбу збіралі, елі. Там, на гарэ, былі ліпы, і ў ліпах былі дуплі, і там шпакі завадзіліся. Дык падросткі хадзілі: наберуць, наб'юць гэтых шпакоў і дамоў прынясуць. Апаруць, абскубуць – і елі...

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1933 г.н. у в. Дзедзіна Докшыцкага р-на***

***

Мама дзелала бліны – прыснакі такія з мякіны – елі. [*А дзе бралі мякіну?*] Ну калхоз лён сеяў. Мякіну… Асаку сморгалі – елі, рачыкі елі – яны зялёненькія такія і лытка вырасціць, як у асакі, тады гэтую дыдку абсмаргаем – семена, як паспеюць. Мальцы, меншыя за мяне, хадзілі сабіралі бульбу гнілую на калхозным полі. [*А муку ці дабаўлялі ў тыя прыснакі ці картошку?*] А дзе мукі было ўзяць?

***Запісана ў 2022 г. ад жанчыны 1937 г.н.***
***у в. Немойты Сенненскага р-на***

***

Што кушалі? Што пападалася. Раньшэ кушалі, мая дзетка, ташноцікі – бульбу сабіралі гнілую і елі. [*А чаму ташноцікі?*] З таго, што бульба за зіму перагніла, а тады яе сабіралі, пяклі і елі. Шчаўля нарвем, бульбы напарым і постна і ядзём. Мама на работу пайдзець, а мы гэтак абед гатуем. Я младшая была, а тая з 37 года. [*А вы тожа са старшай сабіралі тую бульбу?*] А няго ж! Падраслі трошку і блындаліс. Пойдзем у другі калхоз сабіраць бульбу гэту, ідзём, у канаву ўвалімся, выпаўзем і ідзём далей. [*А чаго ў другі калхоз? А ў сваім?*] Ну ў сваім, можа, дзе поле далей было, а там бліжэ. [*А вы гэта вясной сабіралі?*] Вясной, канешне. [*Вы з сястрой хадзілі ці вас было больше?*] Нас такіх было многа. Многа ўдоў паасталіся з вайны. Пол дзярэўні ў нас было ўдоў. Мужыкоў мала было. Семя льняное таўклі і з бульбай і макалі.

[*А колькі разоў кушалі ў дзень?*] А дужа я помню? Што тады дужа было кушаць? Можа, калі і тры, а можа калі і адзін. [*А ці хадзілі ў ягады?*] Хадзілі. Былі ўсякія: і чарніцы, суніцы. Ну раньшэ не было сахару, а сушылі ягады, тады заварывалі і несаложаныя елі. У Смаляны хадзілі прадавалі па стаканчыках: хто купіць, а хто не. Нас многа такіх было. Сабяромся табунком і пайшлі. Арэхі прадавалі. Рвалі, прадавалі і адзежу сабе пакупалі за гэтыя. Грыбы сабіралі. Дзе сушылі, дзе варылі. [*А ці салілі?*] Ой, не. Маме было не да гэтага. Яна як пойдзець, дзень атработаець, прыйдзець… А мы якія там былі?..

***Запісана ў 2022 г. ад жанчыны 1940 г.н.***
***у в. Рай Сенненскага р-на***

## “Што папала ў суп таўклі!”

Голад! Елі… Ня буду гаварыць! [*Гаварыце, то цяпер маладыя не знаюць, як цяжка было?*] Што папала ў суп таўклі, каб мягкае было. Усякія

лісця і бабоўнік ад бобу гэты. Усе, што было: апілкі рэзалі бярозавые і шчаўлюк сабіралі. [*А апілкі бярозавыя, што з іх ?*] Пірагі пяклі! Усё елі! Тада, як ужо вясна ды лета, тады лягчэй, ужэ на поле сабіралі шчаўлюк, там усякую траву, вясной – картошка дзе якая аставалася, па зіму капалі. Вот гэткаю картошку марожаную, мёрзлую. Яна такая мяккая, пірагі ўкусныя былі. [*А ў Западную ці хадзілі?*] Хадзілі ў Западную. Мы после вайны, дык туда пойдзем, дык яны нас ганялі там. [*Вы з мамай хадзілі?*] Сам я хадзіў: саберымся і пайшлі. [*Толькі дзеці?*] Дзеці. [*А, можа, на работу туды хадзілі?*] Некаторыя хадзілі кароў пасвіць там, за граніцу, за яду.

[*А, вот, калі сталі багацець?*] Багацець, як сталі калхозы пахаць, сеяць, то крыху нам вяселей было. Гірсухі гэтай дадуць... Трудадзень стаіць – каждый дзень ходзішь на работу. Мы ж у школу хадзілі тады паўголыя – адзеваць была нечага. [*Так, а што з той гірсы можна?*] Ну ў жорны. Яна пахожая на жыта, але лёгкая такая. Усё раўно ж, малолі... [*А грошай не плацілі?*] Не! Якія грошы?! Дзень работаеш – палку паставіць вот, і цякаць. Не давалі. Гірсу гэту дадуць, – свіней завадзілі мы сваіх, – мякіны гэтай льняной тожа на трудадні толька давалі… А грошаў не было.

***Запісана ў 2018 г. ад мужчыны 1936 г.н.***
***у в. Мураўі Полацкага р-на***

**“Што бабушка ў кацёл укінець – тое і елі”**

Летам мы прыйшлі з лесу на сядзібу, а там толькі комін стаіць. Дзярэўня была бальшая, яе напалавіну былі спаліўшы (Беляны – *аўт.*). Папа быў у партызанах, бабушка, мама і мы выкапалі землянку. Хадзілі на поле бульбу іскаць, есці ж нада! Больше всего мы елі мяздру ад асіны: вот так кару адлупіш, а там такая жыдкасць. Укусна было! Смактушкі з клевера. Бабушка эці цвяты ў картошку натаўчэць, а патом спячэць… І белы клевер, і красны, але болей краснага. [*А пяклі на чым?*] Так печы ж стаялі. Так две кірпічынкі, жэлезяку якую-небудзь уместа скавародкі, а можа і нейкую старую скавародку дзе знайшлі… Крапіву, лебяду, шнітку елі. Шнітку аблупім, ствол такі вот, аблупім і сладкі быў. Што бабушка ў кацёл укінець – тое і елі. [*А вот адкуль бабуля знала, што можна есці?*] Старыя ж людзі, яны зналі, якая трава не ядавітая, а якая едавітая. У лес хадзілі. Многа малін было. Ягады елі і прадавалі. Помню, адін раз набрала маліны і пашла ў Асвею прадаваць. А есці хочацца, я і з’ела… Хужэй за ўсё, што солі не было!

[*А ці выціскалі поснае масла?*] Гэта ўжо после, гэта ўжо мы ў школу хадзілі, давалі гэтае семя льняное. Гэта, можа, спусця года тры, а можа два, як мы вярнуліся. [*А зімой?*] Ужо сталі даваць зерна ў калхозе. І амерыканскія

пасылкі, помню, давалі: баначку фасолі чорнай і тады ў ваду гэтую фасоль і травы нейкай накідаець.

У Латвію на заробкі хадзілі. Некаторыя там і асталіся. У бабушкі там сваякі былі, дапамагалі, а адзін раз яна з Латвіі прыехала – двух курыц і ката прывязла! Тут жа ні катоў, ні сабак не было!

[*Пасля вайны адны жанчыны былі?*] Да, жанчыны. Раён Асвейскі – жэнскі раён быў! Пракурор – жанчына, прадседацель сельпо – жанчына, прадседацель райкома – жанчына, прадседацель камсамола – жанчына. Ну, патом сталі варочацца мужыкі, хто ў партызанах быў, хто ў арміі, хто калека, хто як – розныя. Панямножку. Гэта, можа, на пяць гадоў расцянулася. А так жанчыны робілі. Вала ў калхоз далі і пахалі на ім. Так яму ж бабы памагалі! Цяжка было…

Папа вярнуўся на кавелах. Трохі акрэп, а патом яго атправілі ў Германію за скатом. Ён прыгнаў сюды і яму далі карову. А з каровай мы зажыліся! Адна карова на ўсю дзярэўню. Яму ж далі за тое, што ён ездіў, а астальных у калхоз па раёнам… А нада ж і саседзям. Бабушка доіць, а ў іх маленькі, так яна і аднясе.

А як мы вучыліся?! (смяецца – *аўт.*). Нас жа ў дзярэўні было многа малых. Школы ж не было, на вуліцы селі, а настаўніца на пяску палачкай выводзіць "А" – вот так палачку і так палачку. На пяску вывадзіла буквы.

[*А вось што-небудь салодкае ці было?*] Я сядзела ў пятым класе з девачкай, а ейны айцец работал у райіспалкоме і ім давалі пасылкі. А я з ёй сядзела за адной партай. Мне бабушка напячэць камовікаў – бліноў драных Як цяпер помню, яна выбегае навстрэчу: "Ці прынесла?". Я ей камовікаў, а яна мне дзве пячэніны. Я рада-рада! Тут жа мы на хаду і з'елі.

[*А вось што гатавалі на святы?*] На першае Раство нічога не было. Ужо калі трошачку зажыліся, картошку пасадзілі, яна вырасла. Тады бабушка з Латвіі прынясець крупы якой, гароху пасадім. Бабушка ў Латвію 4 разы хадзіла после вайны да сваіх, памагала садзіць там. Мама ў калхоз хадзіла, нада ж было ў калхоз хадзіць – дысцыпліна! Так і мы ж… Я хадзіла ў 4 клас, школу кончылі – канікулы, а вучыцельніца прыйшла і сказала, што прыходзіў прадседацель і сказаў, штоб мы памаглі пасціць кароў. Вот так. Раз сказаў, – так нада. Устаем рана і ідзём пасціць па 4 чалавекі, як жывём, да вечара. А назаўтрае другія. І так ўсё лета.

[*А ці гналі самагонку?*] Мы не гналі. А ў дзярэўні гналі. Там самагонкі не столькі было, як на лекарства. Горла баліць – папаласкаць. Старушкі дабаўлялі травы туды. Жывот забаліць – самагонкі ложку. Памагала!

***Запісана ў 2020 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у аг. Асвея Верхнядзвінскага р-на***

***

После вайны очэнь было цяжка жыць! І трудна, не хватала яды, есць нечага было. Мы ўжо такія, дзяўчаты-мальчышкі, сабяромся, і во, што бульбу сеюць на гаре, выберуць, а вясной тады ета бульба валяецца па нізу гнілая. Хадзілі, сабіралі, называліся “ташноцікі”. Абмывалі і пяклі. Клевера цвяткі рвалі, сушылі, малолі. Усяго бывала. Очэнь трудная жызнь была!

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у в. Бальшыя Галыні Бешанковіцкага р-на***

***

[*Дык вот, а после вайны што кушалі? Ці сабіралі бульбу мёрзлую?*] Сабіралі, еслі дзе найдзёшь! У нас был лупін. Лупін такі, ён горкі. Яго есці нельзя, но прымастрайваліся так, што ў рэчку бацька панясець, і ён там мокнець, у вадзе ў бягучай. Ён там вымакнець, становіцца нягоркі, тады сушылі на сонцы і малолі ў жорнах. У гэтах… І пяклі такія… какоры, ну вот... Ай, пра што гаварыць?.. Якая там жызнь была?! Жызні ні какой не было, дзетства ніхто не відзеў…

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1927 г.н.***
***у аг. Друя Браслаўскага р-на***

## “Шчавель конскі, такі красненькі, цморгалі”

Пасля вайны лебяду сабіралі. Мама секачом насячэць і, там, жменьку мукі ўсыпіць. І тады такі во ляпеннік пасадзіць, а мы тады ядзім. Точна, як кароўі кал, – плехаўка ляжыць… Гэткае во елі... І гэдак шчавель конскі, такі красненькі, цморгалі. Яго і сушылі, дабаўлял мукі жменьку, і гэткія вот ляпешкі пяклі. Ужо быў такі наліты ячмень, яго мы нажалі (а есці ж хочацца) і бульбіны маленькія выкапаем (а есці ж хочацца), дык не даем маме, каб яна пачысціла! І з гэтымі шкарлупкамі наварам і ядзем. Посную хватаем і тут, значыць, поўны жывот бульбы напхаешь, а тут – хочацца есці! Бралі тады ячменю, ставілі снап на печ. Высах – абабілі, пранікам перасушылі-пасушылі, і давай у жорны малоць. А ў жорны малолі, а зяленая мука (ён зялены, няспелы)… [*А гэта вам колькі гадоў было?*] Ай, ну сколькі гадоў? Ну, можа, мне 11 было, можа 10... Крапіву варылі, як борщч. Трыпутнік варылі. Вот, як шчавель. І сабіралі леташнюю бульбу, а бульбіны ляжалі… Такія яны аблупіўшысі, кожачка гэта злежшы… А мы яе пабіралі і тады гэдак, жменю мукі, і вось з гэтых во… Там і чарвякі былі – ўсе ў гэтай во бульбе!

Дожч ідзе, а яна ляжыць. Вот, напабіраешь гэтага, тады яе размесіць мама, жменьку мукі ўсыпіць, і гэткія во ляпешкі елі, чорныя. І кажам, калі гэта мы будзем хлеб есці? А есці ж хочацца, так есці хочацца!.. Ходзешь, думаешь…

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1934 г.***
***у в. Парадні Мёрскага р-на***

**“1947 год – это ещё тоже голод был”**

Ну, вы знаете, в войну мы, конечно, поголодали! А потом, после войны, вот сразу 1947 год – это ещё тоже голод был! Во-первых, прошли страшные дожди, – все затопило. Урожай пропал. Вот… Ну, у нас было одно счастье, что присылали посылки американские. В тех посылках было… Вот, помню, коробки парафином закрыты, зелененькие небольшие коробки. И в этих коробках было сухое молоко, было печенье. У мамы маленький ребёнок (сестра была), и мама прятала на верхней полке в шкафу, чтобы я не лазила. Ну, я все равно лазила и лизала это молоко, неизвестно какая роскошь для меня была – сухое! Печенье, само собой… А также присылали чёрную фасоль маленькую. Её давали. Давали помногу. И из неё мама испекла хлеб. Туда добавила, даже не знаю, что… Ну, какую-то, может, муку, какие-то добавки были… Ну вот, в такой большой русской печи – печенный хлеб! Он потресканный весь, потому что фасоль. И кто горячего этого хлеба, мы же с голоду, знаете, как хлеба хотелось?! Ну, вы не знаете, конечно… Короче говоря, кто попробовал этого горячего хлеба, – многие поумирали. А мама мне не дала, сказала: «Остынет, тогда будешь есть». [*Вот говорили люди, что и крапива, и щавель и всё такое шло?*] Знаете, щавель не такой, который съедобный, – конский такой щавель, высокий. И вот, его брали семену, перемалывали, потому что у многих были жернова свои в домах. Перемалывали и ели. А о крапиве не говорите! Крапивой детей обкладывали специально, потому что туберкулёз повальный шёл! А лечить нечем было. Крапивой обкладывали. Спасала! Обыкновенная крапива...

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1936 г.н. у г. Дзісна***

**“Гэта дужа было смачнае пітанне!”**

Елі шнітку, крапіву (яе сама болі ўпатрэблялі): не жгучку гэту, што такая дробная і коліцца, а крапіву што бальшая расцець. І вот, як яна бальшая вырасціць, гэтых лісцеў нарвеш дробненька, а тады во гэта, што, як мяцёлка, – семена гэтыя, – гэта насмургаеш. Гэта ўсе змешаеш. А тады, вот, дабудзеш, на што-небудзь даменяць. Меняеш на якую-небудзь прадукцыю… І хадзілі

ў Дзісну, а ў Дзісне ў гэтай (я не знаю, адкуль там? Я, ня помню уже) прывазілі зярно! І вот, менялі. Дадуць зёрна, і вот адтуль, із Дзісны, туды вун – за ракой кілометры два, – на сабе пранасілі, па гэтаму, па пуду (па 16 кілаграм гэтага зерна). А тады гэта зярно… Былі, вот, майстры такія, каторыя робілі такія жорны: камень на камяні, і круціць. І вот, малолі гэта зярно. І тады вот этай крапівай з гэтай шніткай усё гэта мешалі і гэдак піталісь. [*Ну эта вясной толькі?*] Вясной, ну а зімой дык гэта самае насушывалі. Сушылі, а тады ў такія снапкі павешаеш, каб яно хранілася, ну а тады ў ступе ў гэтах і з мукой мешалі. [*Ну, з мукой лепёшкі ці што там пеклі?]* Ляпёшкі пяклі, але ж гэта на ляпёшкі нада было много. А так, вады закіпяціш, зварыш такую, як цяпер завуць, – “зацірка”. Гэта дужа было смачное пітанне!

После вайны, сама хуже было – гэта год-два после вайны, пакуль гэта. А после ўжо болі сеялі, вырашчывалі гэта зярно. Хлеб пяклі – добра помню! Мала яго, ня ўволю было, але пяклі хлеб добры. Гэта такая круглая дзежчачка была, – як сягоння помню, – такім абручом яна ўкраплена. Заварыш троху мукі, а тады ў гэту дзежачку, і яна стаіць, пака заквасніцца, пака кісля не найдзець. А тады ўжэ, як паявіцца гэта кісля, тады болі ўсыпіш гэтай мукі і яшчо яна пастаіць. І як ўжо ўкісніць (ну, там уже відалася), тады замесіш гэтай добрай мукой і пяклі чысты хлеб гэтат. Праўда, дорага гэтат хлеб тады быў!

Сеялі каноплі – такое высокае расло. А тады, як ужэ вырасціць, семена занясеш у Дзісну ці куды, выменяіш там, а сцеблі астаюцца высыхаіць. Тады такая была, вот такая вот, дліная… Як яна звалася? Забылася… Высахніць гэта сцебле, а тады на калодцэ каноплі гэты мялі, тады трапалі, разбіралі на длінае і на кароткае валакно і пралі гэта. Кросны ж гэтыя! І ткалі гэта палатно. А з пакулля гэтага, худшага, спрадзеш, а тады з гэтых нітак абыякіх свяжыш сабе кручком на ногі. Падшывалі рэзінай. Кругом абшывалі, каб ногі ня моклі. Во як людзі жылі!

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1932 г.н.***
***у в. Завуцце Мёрскага р-на***

***

[*Як пасля вайны жылі?*] Слаба мы тут кушалі, есць асоба чаго не было. У нас землі было мало – шасцінка, як ее называли. Садзілі... Хлеба не было в дахватку, картошку. Хлеб мама сама пякла. Ну, але не было з чаго пячы. Проста бульбу елі. Мама дзета хадзіла і даставала, а патом дзяліла па куску. Радзіцелі не былі граматнымі, – абыкнавенныя прастыя людзі. [*Самагонку гналі?*] Гналі. Радзіцелі для сябе. Не прадавалі. Все гналі. Пасля вайны сеялі

гароды, жыта. Дык, як толькі, помню, што расцілі гэта жыта, прырашчвалі, а як яны потым з жыта...

[*А ці былі магазіны ў Варопаеве?*] Такія очарадзі былі за хлебом пасля вайны! Мама займе вочарадь, атлучацца – дамой пойдзе, а нас паставіт дзяцей… Па очарадзі давалі булку ці паубулкі. Тады апяць у очарадь станавіся, а можа другі раз і не хваціць, як да цябе очарадь дойдзе.

***Запісана ў 2017 г. ад жанчыны 1935 г.н.***
***у в. Варапаева Пастаўскага р-на***

### "Хлеб там рэдка быў"

Вясной сабіралі шчавель. Праўда, у нас после вайны асталася карова жывая. І якім чудам?! І снарады рваліся, і ўсё… І яна навязаная была там, на полі, каля лесу. І яна асталася жывая! Утрам мама разбудзіць: "Ідзіце ў шчавель". Шчаўлю набяром, шчавель рос там. Многа ў нас каля лесу было яго. Пашлі, набралі, прыняслі. А есць хочацца! Пака сабіралі – наеліся. Жываты вот такія вот, а есць хочацца. А есці ўсё роўна хочацца! Ну, зварым шчаўлю гэтага. Забеліць смятанай там якой, ці малаком кіслым. Чым прыходзілася. Бульбы звараць. Ну і, можна сказаць, так і паелі. Ну, як была карова, – малако. Там другі раз супу якога забелюць. Свіней сразу не дзяржалі. Ужо после. Многа нас: вот на такую сям'ю, на сем чалавек… А тады яшчэ лён сеялі. Даўней жа нада было і гасударству здаваць лён. Еслі маеш зямлю, якую-та часць трэбы было лён сеяць і здаваць гасударству. Тады рабілі алей з гэтага льну-семя. У дзярэўні ў суседняй быў, гэта дзе робіць там, ціскаць. А тады пяклі вот з гэтага жмыха, што атходзіць ад алею. Дабаўляла мама там троху якой мукі, і пяклі такія какорыны. Пяклі і елі так. Хлеб там рэдка быў. Сільна цяжка было. [*А ў вас свае жорны былі ці вы хадзілі?*] Былі свае. [*А былі мельніцы, можа, якія аддзельныя?*] Мельніца была адна. Можа, кілометры два… Была ў яго спецыяльна зроблена, багацейшы быў. Там мельніца, рэчка была. Не знаю, як ён яе там круціў. Вадой ці чым… Хто багацейшы, тот возіў малоць. Нада ж было заплаціць яму. Мы, у асноўным, самі. Шэсцера дзяцей, а тады старшы брат у армію пайшоў.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у в. Слабодка (Пунькі – нар.) Браслаўскага р-на***

***

[*А як хлеб раней пяклі?*] Очень проста, была спецыяльная для гэтага кадушка, бочачка, у каго якая сям'я… У ёй усё ўремя пяклі, еслі ў другой,

тады хлеб не палучаўся. У каждай хазяйкі па-свойму. Яны цёплай вадой развадзілі муку ў бочкі, і стаяла там некаторае ўремя, пакуль падкіснець, на заўтра замешвалі. Во, мая бабка, я ў чацьвёрты клас хадзіла, мне памагала і задачы рашаць, яна тады хлеб месіць на скамейкі, каля стала, а я рашаю задачы, а ў мяне не палучаецца: “Ай, не магу рашыць!”, а яна: “Ты давай чытай, як ета там”, яна месіць, а я чытаю ўсловія задачы. Ну, пакуль я прачытаю, у яе мазгі ўжо сработаюць. Ну, я во так – і ўжо рашыла. Яна замясіла еты хлеб, ён падняўся ў бочкі етай, ужо на заўтра топяць печ, натапліваюць. Яна згараіць, тады ў старонку етыя галавешкі, ня венікам, а з сасны метлой, етым выметаюць печ, каб там было ўсё. Тады лапата з даскі шырокая, ложуць на стоў, стулаў не было, а былі лавы і передок, передок – более тоўстая, а лава – абыкнавенная даска. Падсцілалі ліст аіра – трава, – ён запах такі сільны, яго сушаць. Сязон яго цяпер. Нарываюць і падсцілаюць, ілі кялновым лісцем, я са школы іду і там, у рошчы… Ілі капустным лісцем. Любым лісцем, які панравіўся, а калі няма, то ваабшчэ саломкі на ету даску, а тады бяруць з бочкі цеста. Рукі ў вадзе, каб яно ета. І ложуць у печ на лапаце, а тады падкінуць трэстачак, каб чуць чуць прыхваціла зверху, ну, і закрываецца руская печ заслонкамі. Ну, і пячэцца часа паўтара, а можа і большэ. Ну, і падглядваюць, каб не падгареў, і ўсё, і хлеб…

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1939 г.н.***
***у в. Клешчына Бешанковіцкага р-на***

### “Сходзіць паследні акрайчык, яшчэ замешваеш”

[*А як хлеб пеклі, памятаеце?*] Канешне, памятаю! Прасееш муку, а патом учынеш, каб нямношка падкісла рашчына. Падкісла рашчына, а тады замешваеш гусцей. Печ натапліваеш. Лапата такая была ў печ усоўваць, пасцілаеш кляновы ліст, ілі аір насушваеш, ну, і ў печ булак пяць. Этых пяць булак з’ясі, тады яшчэ гатовіш. Сходзіць паследні акрайчык, яшчэ замешваеш, учыняеш. Хлебніцы спецыяльныя былі здзеланы. Каравай, само сабой, у печы здзелаеш, касой абрычок спляцеш (як касу пляцеш), абкладзеш, дзе грыбочкі пасадзеш – вот і ўкрашэнне на каравай.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1930 г.н.***
***у в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на***

### “Шэсць буханак хлеба ў печ улазіла”

Ой, які я хлеб пякла! Я дзелала, ў аснаўном, патаму што троху беднавата было, значыць. Машынак не была гэтых тады. Як іх? Месарубак. У дзяжу, дзе хлеб дзелаюць, варыла картошку, чысціла і такую ўжо негарачую,

летнюю, у гэту дзяжу і чыстым секачом пасяку меленька-меленька. Еслі яе таўчы, усё роўна будуць бувалкі, а еслі сеч – нічога няма. Вот, тады цёпленькай, цяплей трошку за хатней вады, вадзічкі і мукі ржаной, і ставіла на край печы. Гэта я дзелала з абеда. На край печы, і маё цеста падніміцца, аж чуць не поўная бочка і ападзець – эта счытаецца яно ўжо гатова, нада яго мясіць. Патом снімаюць эту дзежку з печы. Я вот так во рукой падаб'ю, так, што яна мне, кажыцца, жывое эта цеста, а патом сыплю мукі, салю, тмінку ўсыплю і раньшэ такая была чарнушка, – у хлеб сыпалі, – расла яна ў агародзе. І мяшу, падварачываю і мяшу, падварачываю са ўсіх бакоў і мяшу. Так замяшу, што ў мяне пад кулакамі трэскаець: трэсь-трэсь. Тады этай вадзічкай (ну, я ж бяру і вадзічку, рукі макаю) кругом, каля бочкі, вадзічкай абвяду, завярну і кругом каля бочкі вадзічкай абганю, заглажу і крэсцік пастаўлю, і апяць паставлю на тое месца, дзе ён стаяў. А печку накалім, нагрэем гарачую такую, памяло сасновае было, – вымецем. Эта я ўжо па-старыннаму гавару, цяпер формы.., а то качаргой выгрыбем усё с печы, печ накаліцца, і памялом сырым вымецем под: там жа кірпічы. Под вымецем гэтый, і тады такая была лапата, такая бальшая і з ручкай. Вот, падсыпаю мукі на эту лапату ілі аір, калі ёсць (я аір летам загатаўляла), тады аіру вот так во налажу на эту лапату, бяру рукамі хлеб, сколькі ўзяць, кладу на эту лапату, замазываю каля бакоў, так трошку каля нізу і ў печ. Шэсць буханак хлеба ў печ улазіла.

Тады гляжу, еслі ён яшчо падбелаваты, а тут жа, на загнеце, ляжыць жара, тады трошку туды жару, і ён станець румяны. Такі румяны, красівы! Ён пячэцца два часы. А тады с качаргой с печы яго цянем, а ён аж падпрыгіваець, цёплы такі, выпечаны! І наліваю ў таз вады, і гэту, еслі з мукой (еслі з аірам, – ня трогаю), а еслі з мукой, – вымыю ўсю эту буханку чыстай вадой і на лавке, на длінвай ляжыць скацерка такая, што сталы засцілалі, длінная, на адзін бок кладу этай скацеркі, зверху вадзічкай і другім бокам скацеркі закрываю. Чыстый, вкусный, румяный, з гэтым кмінам, чарнушкай! Ну, такі вкусны хлеб! Такога хлеба, мне кажыцца, ці пёк хто? Дык, я так дзелала хлеб, сама дзелала. А тады ўжо, як замуж вышла, формы былі. Шэсць формаў. У формы клалі, падагрэвалі, посным маслам з бакоў змазывалі і клалі ў формы. Ну, эта ўжо ня то…

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1925 г.н.***
***у в. Бачэйкава Бешанковіцкага р-на***

### "Меня навучыла мама"

Хлеб пяклі! Меня навучыла мама. Я мясіла ручонкамі, была маленькая. Мама ездзіла к састре ў Латвію, а мне сказала: "Вот, там, доченька, растворан хлебушек. Вот так, вот так зделай, вот так і вот так замешай". Так

і навучылась. І садзіла – такая лапата была – і ў печку на эту лапату. Падсыпаць мучыцку, там акуратненька, чысценька каб было. Но, ужо, кагда вытапіцца печ, толька вугалькі, тагда трэба было садзіць гэты хлебец. Так дзелала. [*А на што садзілі? Там, на ліст, можа, які там, ці на муку проста?*] Просто мучыцкі пасыпіш на гэту лапатачку, яна такая вот, кругленькая і длінненькая лапатка. І мучыцкі пасыпешь, і эта, і цеста. Цеста тоже замешывалася патом, штоб яно падхадзіла.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1940 г.н.***
***(нарадзілася ў в. Свярдлы Мёрскага р-а)***
***у в. Іказнь Браслаўскага р-на***

### “Таце гусцейшы – ён жа мужык, а нам ужо радзейшей”

Мы ж прыехалі: стаялі адны коміны – папялішча. Жылі ў акопе не адны, а потым тата зрабіў будку, і абшылі саломай і жылі. Хадзіла ў школу ў Слабаду. Тата прыйшоў з вайны і прынес бацінкі: адзін такі, другі такі. Так я, бывала, абую – і ў школу. Мож, дзе падабраў… Абутку не было, давалі бацькі раду. Партфель з трапачак, учэбнік “Роднае слова”, канэшна, куплялі.

Свая зямля, картошка, главнае – хлеб купіць! Базары былі ў Паставах, Варапаева… Яйко, малако на базар прададзем, а за гэта купім дабро: ячмень… Так і жылі. Усяк было! Хаділі з сястрой у Паставы ў магазін (за хлебам). Стаім ў вочарадзі… Нашы паедуць на базар, купяць ячменю. Змелюць. Таце густейшы – ён жа мужык, а нам ужо радзейшей заціркі прыбеліць малаком… Так і жывем.

Карова, масла сваё, малака хапала, яйкі былі. Мама выправіць мяне на базар: былі палаткі. Ну, стаюць прадаюць жэншчыны ўкрашэнне для девачак. А я ўжо была девачка, а там шпілечка ляжыць! А мне хочацца! А колькі стоіць? “Тры рублі.” – дык мяне задушаць!

У калхоз сталі зганяць з 47 году. Не хацелі ў калхоз... Гады сталі мокрыя, і урожай быў ня очэнь, а падаткі былі вялікія. Былі агенты па малаку і па дзеньгам. Я работала в калхозе – жыта жалі, лен рвалі. Мы ж былі нявучаны… На трудадень 7 капеек, як лен рваць, за сотку. Дваюрадныя сястры ездзілі на зарабаткі.

Празднікі ўсе празднавалі. Касцёл у Паставах. Цэрква работала весь час, а касцёл закрылі, маталі шпулькі… А ў Літву, у Гадуцішкі, на роверах пасля вайны з дзяўчынамі ездзілі на фэст: літоўцы і мы, беларусы. Патом вечарыны ў весцы: у іх карагоды, і мы тады, і хлопцы, і дзяўчаты…

У 55 гаду свадьба – харашо гулялі! Сваё усё было. Тата авечку зарэзаў. Самагонку пілі – самі гналі. Плацце белае была. У саседкі была свадьба, яна

давала. Цяперака напракат, а раней пазычалі і давалі фату. І з гэтай фатой сколька пар замуж выхадзіла!

***Запісана ў 2017 г. ад жанчыны 1935 г.н. у в. Міські Пастаўскага р-на***

**“На вёсцы жылі людзі, каторыя ўмелі ўсё рабіць”**

Раней самыя багатыя людзі – у каго было многа зямлі. Яны і працавалі многа, і тады прадукты сваёй працы вывазілі на рынак. А хто не меў зямлі, тады ён прыхадзіў і купляў гэтыя прадукты. Раней на кірмашах (фэстах) на святы, там былі старцы, былі каторыя яшчо жабракамі падаянія прасілі, ну, а каторыя болей заможны былі, тыя і давалі ахвяру. Тады счытаўся добры ўчынак зрабілі. І после, абыкновенна после того, як памаліліся і нагандляваліся, тады і на гэтых плашкадках, канешна, не ў касцёлах, не ў цэрквах, а на плашчадках, дзе былі гэтыя targовыя… кропкі. Тады танцавалі, ігралі. Музыкі былі.

[*Ці многа людзей было, адкуль здалёка прыязджалі?*] Было. Што і пабольшэ: каторые за свой час выезджалі куды-небудзь, каб папрацаваць, то тады на гэтыя святкі прыезджалі, каб праведаць сваі радныя мясціны, сваіх родственнікаў. Так што было. Людзі прыязджалі, праведывалі.

[*А вось пасля вайны ці прыходзілі на заробкі?*] Было на первых парах, пакуль вастанавіліся гэтыя калхозы, прыхадзілі з Васточнай, прыхадзілі ў Западную на работу. Было тут жаць ці касіць што-небудзь, а ў іх не было. Не было і не было на што жыць. Так, прыхадзілі жэншчыны. І па нескалькі дней прыхадзілі. После же ім плацілі зярном. Ратавалі сваю сям’ю. А некаторыя ўязжалі.

[*А ці хадзілі бедныя?*] Хадзілі ад хаты да хаты. Хадзілі бедныя, хадзілі каторыя ня маюць. Хадзілі ад хаты да хаты, і ўсюды то ім што-небудзь паесці нада, калі і адзець што захацелася. Памагалі такім людзям. А былі, каторыя пастаянна хадзілі.

Пасля вайны было, што, калі ў цябе вырасло што, то занясі і няхай і гаражанін паест. Ці яйка курка знясла, то сабе, як прыйдзецца, а ў горад нада прадаць – там грошы. А рабочыя ў горадзе працавалі на праізводствах, яны зараблялі… Хто гадаваў авечак, тады воўну прадаваў. Тады кажух там… Былі розныя спецыяльнасці па сельскай меснасці, што маглі і мэблю… Былі новыя сем’і. Аказалася, што ўсё можна прадаць. Усё! І калі была кароўка ў цябе, то тады яўрэям – масла, нам – маслянка. Тады рабілі масла і вазілі прадаваць.

[*А вось, пасля таго, як калхозы зрабіліся, як жылі?*] Хто не быў у калхозе, той не знае, што гэта такое! У калхозах многа працавалі, а атрымаць за гэту працу не маглі. На каждую сям’ю давалі нескалькі сотак ці сорак

сотак, і там, на гэтых сотках, што-небудзь выграшчывалі для сабе. Але як, як нада, то тады неслі ў горад, а гараджане куплялі гэтыя ізлішкі. Не так былі ізлішкі, як трэба былі грошы. Так што паследнее прадавалі, як нужны былі грошы. Соль надо было абавязкова купіць, такія тавары. Жыццё было ў калхозах цяжкае: працаваць нада было, а атдачы не было.

На вёсцы жылі людзі, каторыя ўмелі ўсё рабіць. І кавалі, і плотнік, і сапагі магла пашыць. Жбаны, гарлачыны… Усякіх спецыяльнасцей было ў вёсцы! Так што людзі прыспасабліваліся как пражыць.

Вырошчывалі лён. Палолі, каб было чыстае зярно. А потым за год нада было зрабіць кудзелі. Кудзеля – гэта было вырасціць, высушыць, пасля вымачывалі, каб зрабілася, – гэта мужчыны рабілі. А жэншчыны после, после дралі і на бялізну на якую… Грошай не было, каб які матэрыял купіць. Самі зрабілі кудзелю, пралі, ткалі і шылі. Такое было жыццё: і летам працавалі-працавалі, і зімой працавалі-працавалі.

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1930 г.н. (нарадзілася ў в. Язна Дзісенскага павета) у г. Полацк***

## “Усё самі дзелалі”

Усё самі дзелалі. І малацілі, і жалі… У нас жорны былі свае, і паочэрадзі, бывала, намелім і на хлеб, і на бліны… Штоб две нядзелі не работаць, каб не круціць тыя жорны. Бувала паочэрадзі: чатыры мальцы было і мы. Паочэрадзі хадзілі малолі. Засыпаеш і круціш, і муку такую беленькую дзелалі, усе. Абіралі спярва пашнічку, а тада малолі. І булкі мама пякла ўкусныя.

[*А як хлеб пяклі раней?*] Парылі бульбу срэднюю. Пачысцім яе, на машынку, перакруціш, яна такая, клейкая. Бульбы гэтай, мукі, такія былі хлебніцы – туды на ноч закалачываеш, яно там падкісаець усё. Утрам устаець мама, пака печку тапіць, туды мукі. Месіць, месіць, што б аж падходзюць яны. А тады печка вытапіцца, такая патэліна длінная, дзеравянная такая. Есць такая траўка – аір. Паложыш пад ніз, запах такі! Мукі, і тады такімі булачкамі. Абгладзіш-абгладзіш, і яно ў печы аж закісаецца. Вырасцець. Хлеб такі ж укусны! І булкі таксама пяклі. Замешвалі ў процвінкі, я і цяпер сама пяку. К Пасхе як спяку, так лучшэ, як куплена! І масла паложыш, і маргарыну, і яец, ізюму, смятанкі звальеш… Булкі такія – аж на возьмеж сціснеш, а яны растуць! Усягда пяку на Пасху булкі. [*А квас раней ці рабілі самі?*] Хлеб кідалі туды, скарынкі. Эта ўжо, як хлеб быў харошы такі. А з плахоха хлеба не здзелаеш квас. [*А былі людзі, што кошыкі плялі, гаршкі?*] Да, плялі. [*А гаршкі тут самі рабілі і прадавалі?*] Да. Гліняныя. Бувала, мама ў гэтых гаршках пражэнку дзелала. [*А што гэта?*] Зажарывала мяса, калбасцы зажарывала – усё туды. Кіпятку туды дабаўляла і яно ўсе гэта кіпіць,

прыпраўку туды. Усё закалачывала, муку пшанічную туды. Яна такая жоўценькая… Мы макалі бліны – аж вушы калаціліся!

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1933 г.н. у в. Вяжышча Бешанковіцкага р-на***

## “А на нас было ўсё хазяйства”

Я была самая старэйшая. Мне трэба было… Мама з татам ідуць у калхоз на работу, я павінна набраць ахрап'я, насеч, накарміць свіней, гусей дагледзець. Там каршуноў было многа, каб ніхто ні цыпленка не ўкраў, нічога. Еслі там нада была, дажджу не было, агароды паліць, усю скаціну дагледзець, усё хазяйства было на нас. Карова прыходзіць, карову нада падаіць у абед. Таму што працавалі ў калгасе: як пайдуць ад ранку да вечару, прыдуць толькі паядуць і снова на работу ідуць. Вот так вот. А на нас было ўсё хазяйства дамашняе, і куры, і каровы, і ўсё астальное. Пасціць, і вочарадзі, і нанімалі нас, дапамагалі другім.

[*А што звычайна кушалі?*] Яйка, сала. Амлет, вот, с салам такі і з яйкам, у печкі. Сала нарэзана такімі бальшымі-бальшымі, такое скварыцца, бліны драныя – вось такая яда. Капуста, у печы звараная, супы розныя вкусныя: фасолевы і ўсе такое… Не было там ніякіх салатаў. Бульбы наварана, камы варылі. [*А што такое вот “камы”?*] Камы?.. Варылі боб, і, значыт, картошку. Боб таўклі і картошку таўклі, а потым небальшыя кругляшы такія аткатывалі. Потым у луку і ў гэтым абжарывалі, і ў бальшую скавараду ставалі ў печы. Яны ў печкі стаялі, мы са школы прыхадзілі, яны такія вот румяныя, очэнь вкусные. Раўгеню дзелалі і потым з раўгеняй елі эты постны. Раўгеня – эта дзелалі, як хлеб пяклі, у гэтых дзежках. Там, дзе спецыяльная нейкая закваска была, эту хлебніцу ніколі не мылі: яна стаяла закрытая на печы. І потым ставялі туда тожа, разводзілі муку жытнюю, і вот ана слодыч набывала і закісала. І вось, яна колькі пастаіць – і гатовая. Елі мы, помню, у пост. Ай, смашна, я б і цяпер ела, але ніколі не раблю.

[*А што яшчэ смачнага з дзяцінства помніце?*] Вот, кісель такой вкусный быў з аўса, аўсяны кісель, такі белы. Вкуснае ўсё была! А патом дзелалі эта вот… У нас жа клюквы многа было, брусніка. Брусніку тушылі ў бальшых катлах у печы, без сахара, без нічога. Туды нічога не крышылі, адна брусніка тушоная такая. І стаяла яна ў варыўне ў холадзе. А потым наваруць бульбы і з этай бульбай елі брусніку, без сахара, без нічога. Было вкусна.

[*А мяса ці часта вы елі?*] Мяса елі тады, як заколем парасёнка. Елі… І курэй жа дзяржалі, гусей дзяржалі. Халадзільнікаў не было, а мяса і сала складывалі ў такія дзяравянныя бочкі. Вот такая бочка дзеравянная. І як зарэжуць парасенка, папа па акружнасці бочкі наразаў такія кругі сала. Ну,

туда соль і большэ нічево, а потым на эты круг камешкі намытыя меленькія чыстыя бралі, камяшкамі засыпалі эты круг. Камешкамі, потым круг сала і соль. Так, і снова этымі камешкамі закладываець, і так да верха. І самы верхні пласт сала, каторы ложыцца тожа, соль там, усё, – і сверху эці камешкі тожа, і закрываецца крышкай, але няплотна. Нікагда сала не было жоўтае, колькі помню, заўседы розавае! [*А камешкі зачем?*] А камешкі для таго, тата гаварыў, каб холад дзяржалі. Але ж камні чыстыя-чыстыя, вымытыя, дажэ храніліся ў чыстым месцы і потым засыпаліся. Небальшыя, многа іх было, – цэлы бідон стаяў у нас. Вот так вот рабілі… Сала было вкусным. Стаяла ў варыўне цэлае лета, аж да зімы. Тады первую порцыю сала атразаюць, ложаць адзельна, а гэта ўсе закрываюць – і стаіць там. Усё ўрэмя сала было, ат начала і да канца, укусна было.

[*А ў лес за ягадамі? Вот, вы клюкву, брусніку сабіралі?*] І клюкву, і брусніку сабіралі, і земляніку сабіралі, і чарніку сабіралі, і маліну сабіралі. [*А самі елі ці куды-ты здавалі, прадавалі?*] Здавалі ў гасударства – прынімалі ўсе ягады. Прынімалі і клюкву, і чарніку, і маліну прынімалі. Загатавіцелі былі, так называемыя. Загатавіцелі прынімалі, ну і капейкі нейкія плацілі. Помню, яшчэ не толькі ягады прынімалі, мы хадзілі дралі лазу такую, а патом у пучкі сушылі і сушоную лазу прынімалі тожа загатавіцелі.

[*А ці гналі самагонку? Вот, мы ходзім па Дзісне, – ніхто не гнаў самагонку.*] Як "ніхто не гнаў"?! У нас, у весцы, гналі, ішлі ў лес. І я, помню, хадзіла з татам у лес. У лесе, – там катлы былі такія, састаўленыя, і трубачка вісела, і лёну было на эту трубачку зроблена. [*А зачэм лёну?*] А каб сцякала, вот па этай во. [*А, па трубачке?*] Не, у трубачку такое – лён, і па льну сцякала эта водка. Вот эта так. Эта я помню. Хадзілі, ну было недазволена, але хадзілі ў лесе, водку гналі, каб ніхто не бачыў. І далёка. У нас тут кругом лясы былі. У лесе гналі самагонку. [*А з чаго гналі тую самагонку?*] З жыта. Хлебная. Я помню, як жыта гэтае засыпаў, эта ўжо Патап, дзядулю этага ўжо не помню, але жыта… А яно расты, расты пускала, а потым малолі, а потым рабілі брагу, і брага стаяла колькі. Як брага ўжо дойдзе, – у бідон зліваюць і ў лес вязуць. І ў лесе гоняць самагонку. [*Дык там агульны для ўсіх быў самагонны апарат?*] Не, эта самі рабілі. Самі рабілі, не было такіх. Во, такія катлы, як у мяне во тут во стаіць, два катлы ставілі, патом какая-та труба, а патом налівалась там халодная вада і па трубе, напэўна, як тут, вада падагравалась парам і з-пад пара цякла. [*Эта бацькі быў апарат?*] Да-да-да. [*А ў іншых там іншае было? І ў кожнага сваё месца ў лесе было?*] Не, месца не было, як хто прыспасобіцца ў якім месце, так. А многія дома гналі, але баяліся. Ганялі. [*А вот, можа, прадавалі эту самагонку? Ці навошта гналі?*] І прадавалі, і гналі для сябе. [*А прадаваць куды хадзілі? Можа, у Дзісну прадавалі*?] Ай

не, было пьяніц шмат і ў весцы, якія пілі і не працавалі, а водку куплялі. Не знаю, дзе яны грошы бралі... То дапамогуць што-небудзь. [*А што значыць "ці дапамогуць што"?*] Ну, дапусцім, мама адна, як тата памер. Жанчыны паасталіся свае, а мужчын пасля вайны мала было. Вот, прыдуць, дапусцім, дапамагчы скасіць што-небудзь, агарод запахаць… Грошай нет, – за водку. Расчот быў водкай, а не чым. [А *на водку дзенег, ці то самагонка?*] Самагонка, самагонка свая. [*Так, а нада ж была на сваіх сарака сотках, каб жыта на самагонку гнаць?*] Ну, так сорак пяць сотак хватала ж. Кусок садзілі гародніны, бульбы, жыта сеялі. Сорак пяць сотак – эта настаяшчы кавалак. Хватала. Помню, жыта сеялі, пшаніцу для курэй сеялі, авес па кусочку. [*А мама хадзіла што-небудзь прадаваць? Бо трудадні ж.*] Кароў трымалі. Значыць, масла, твораг… Хадзілі ў Дзісну, прадавалі на базары. У Дзісне быў базар.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1944 г.н. (нарадзілася ў в. Фядосава Мёрскага р-на) у г. Дзісна***

### "Рабілі і самагонку. Усяго прыходзілася…"

[*А вось раскажыце, як гналі гарэлку раней?*] Як гналі? Ну, чуць не так, як хлеб пяклі. Ну, толька што гарачай вадой муку залівалі. Мешаеш-мешаеш і панямношку так. Ну, а тады яна робіцца салодкая такая. Гэта, ну, мука гэта… цеста расчыненае. Салодкае. Ну, а тады яшчэ ў каго было сахару ілі буракоў сахарных, дабавіць яшчэ туды. Ну, а тады апарат, і гонюць. [*А, можа, акрамя буракоў, з чаго яшчэ варылі самагонку?*] Акрамя буракоў… Вот, я не знаю болей. Ну, хлебную ж, – гэта ясна. Асобенна пшаніца, жыта. Гэта, вот, прарашчвалі, а тагды малолі. А можна і не з прарошчанай. З прарошчанай, дык тады ўжо быстрэй. Кіпятком заліў – яна ўжо салодкая. Тут нада было 4-5 раз даліваць гарачай вады, каб яна стала салодкай. Рабілі самагонку. Усяго прыходзілася… [*А ці расплочваліся самагонкай раней, пасля вайны? За што-небудзь. Ці аддавалі самагонку за нейкую паслугу?]* Было. Было. Канешне, еслі кабана каляць, тады нада ўгасціць, самагонкі даць выпіць.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1938 г.н. (нарадзілася ў в. Пунькі) у в. Слабодка Браслаўскага р-на***

### "Адзін аднаму падскажуць"

Я помню, што мама, калі бацька яе памёр, ну, тут сабраліся. Але тады ўжо было троху зерна і ў нас. Мама запрагла каня… Бацька яе тут ляжыць, дома. А нада ж самагонкі – стол. І вот, яна павезла туда [у Западную – *аўт.*]

зярно і прывязла самагонкі. Ну, можа яна знала да каго ехаць. Адзін аднаму, можа, падскажуць. Яны прадавалі самагонку. Дагаварваліся, на сколькі зерна дадуць самагонку. Я помню, што первая куцця была ячменная. Як пámіралі, первы стол – ставяць куццю. Мама паехала і прывязла тады ячменню, а затым паехала за самагонкай…

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1941 г.н.***
***у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на***

***

[*А нашто гналі тую самагонку?*] Прадавала. Во, прыходзюць пьяніцы і купляюць. Дзеравенскім, хто прыхадзіў – таму і прадавала. Гналі, прадавалі, а грошы сабіралі. Купілі кароўку за гэтыя грошы, адзеваліся мы ўдзвюх з ею [з сястрой – *аўт.*], адзеваліся добра… З Латвіі карову прывялі. Паехала ўжо з грашамі за гарэлку.

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1928 г.н.***
***у в. Нікіціха Шумілінскага р-на***

## "Гналі ціханька"

Гналі ціханька. Пасля вайны хадзіла на рынак у Бігосава, і ў грелке: на жывот прівяжет. А там у неё была падруга. Ана падруге прінесёт, та, естественна, ей заплаціт, сколькі там, і прадаст.

Мама, чтобы сястра не работала ў калхозе (нада ж было ўзяць яе аттуда), мама нагнала самагонкі, калбас сахраніла, кагда парасёнка зарэзала, і праўленню калхоза (дзядя быў член праўлення калхоза). Ана отнесла ему туда і самагонкі, отнесла туда калбас эціх. Он эціх членаў правленія напаіў, угасціў і тагда далі спраўку – с колхоза выпусцілі. Ну, пад какім предлогом там, я не знаю… Но сястра пашла работаць ў Верхнедвінск.

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на***

## "Паравушку хто там, а хто катлавушку"

[*А з чаго? З жыта?*] З жыта, з пшаніцы. У лесе ціхонька. Ціхонька рабілі гэтак. [*Дружна жылі?*] Дружна жылі. Калі хто дзе і рабіў, дык дружна – адно за адно. Тут жа кусты ў нас скрозь былі. Гэта ўжо ў якіх гадах, можа, у 90-х меліярацыю зрабілі… У нас усё было заросшы, і эта за кустамі. Былі такія вогнішча: усе рабілі там. Інструмент быў. На адзін інструмент рабілі. Усё было дружна. І міліцыя ездзіла, і лавілі, і ўцякалі – ўсяк было.

[*Так гаварылі, што як свадзьбу правілі, дык сюды ў Калечполье ездзілі гарэлку купляць, што дужа, гаворaць, харошую гналі?*] Ну, харошую. Гналі харошую. Гналі хлебную, вы знаеце, што не сахарную, – бальшая ж разніца! Як кажуць, сахарная, – я яе ніколі ня пробвала, не знаю, – ну, сахарная яна ўрэдная: ад яе галава баліць і яна вабшчэ на сэрца врэдная. А ў нас – хлебную бульбай, бывала, даварываюць. Расцілі солад такі. Вырасціць зярно – змелюць яго, ну і дабаўлялі гэдак.

[*А які выхад, вот, быў? Колькі таго трэба было зярна*?] Ну, хто яго знаіць, сколькі?.. Ну, на кацялок. Тамка як кацялочкам рабілі. Як у лесе дак рабілі – "паравая" звалася. Як хто, бывае, дзе дома на якой пляце кацялочак які там заварыць. Паравушку хто там, а хто катлавушку. Кажны расчытаваў сколька чалавек у каго будзець і кажны расчытаваў, каб хватала.

[*Паравушка і катлавушка. А якая лепшая? Паравушка?*] Паравушка. [*Гэта выгадней было, чым купляць эту магазінную?*] Выгадней, канешне, не было ж надта за што і купляць, нягэдкія тут і зарабаткі ў нас былі. Адно, што сталі ўжо скаціну гадаваць.

[*Ну, а вот ўжо, калі так перасталі гнаць, ўжо ў якіх гадах?*] Перасталі гнаць, як ужо, знаеце, сталі ўжо ўсе старыя.

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1940 г.н.***
***у в. Калечполле Глыбоцкага р-на***

### "Лягчэй у горадзе – вахадныя былі"

Лягчэй у горадзе – вахадныя былі, а ў вёсцы працавалі ад цямна да цямна ў калхозе дарма, за палачку. Прыедзеш у горад, у вочарадь, калі што, станеш купіць: яны крычаць, ды "калхознікамі" абзываюць. У 1946 годзе пасціла ў поле і ў 1947 годзе. У дзярэўне есць было нечага, а у горадзе кармілі, а тут голад быў. А тады падрасла – на работу кожны дзень хадзілі, без вахадных робілі. Саберыш ягады якія, – і на базар, босыя. [*Ці часта вы наведваліся ў гарад?*] Як прадаваць ёсць што, тады наведвалася. Аднойчы ў канке нясла гарэлку прадаваць, тады з гэтай самагонкі і жылі. І два мальцы прычапіліся каля кінаціятру ў Полацку, крычаць: "Ты гарэлку нясеш прадаваць!" А я гавару: "Малако." Канка завязана платочкам белым. А яны ідуць сзаду і крычаць, завуць міліцыю, а я смяюся і кажу, што малако. Але тут кватэра была блізка, я скоранька – юрк, і яны ад мяне адсталі. І ўсё. Але ў мяне была гарэлка.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1934 г.н.***
***у в. Пуканаўка-2 Полацкага р-на***

## “Мы былі ў дысцыпліне ў папы”

Відзіце, якія гарбаценькія мае пальчыкі? Уже ў 9 гадоў я жыта жала. І як прыйшлося… Так урэжуць глыбока. Папа сказаў: “ідзі сама ў другую дзярэўню, ішчы на сваё месца, дачушка, работніцу.” І хадзіла! А як жа? Мы былі ў дысцыпліне ў папы. У нас так было. Еслі чужыя работають, папа садзіцца, і гэтых нада карміць, а тады мама з бабушкай і рабяты. Но еслі ў школу хто ходзіць, – эта асобенна. У школу ж раней нада было, а еслі ў школу не ходзіць, то ён казаў “не нада рушыць рабят, няхай спяць”.

Папалоць, ахрап’е насабіраць, – дык гэта наш закон быў! Вада – ўсё з рэчкі, а ў нас пад гару. Адно вядро нясеш – паставіш, тады другое, каб узлезці.

[*А з якога ўзросту навучыліся прасць?*] Дык, а як жа? Ну можа 10. [*А на кроснах ткалі?*] Можа, 13-14, нада ж у ніты ўкінуць, нада ж у берды – гэта сложна. Мама раскажыць, а тады ўжо я прынасіла адкуда-та пасцілку, каб узор гэты і я гэтую пасцілку разлажу… Я пасцілкі магла ўкінуць і ў шэсць нітоў… [*А ці была трыдыцыя, што на пасаг трэба наткаць*?] Было, але ўжо не так. А мама расказвала, што даўней, каб скрыня, – гэта было абязацельна, каб у дзеўкі трубкі ляжалі. Як я, так гэта атыйшоўшы было. [*А после вайны вы ткалі?*] А як жа?! Я і перабіранкі ткала. Болей восенню ткалі, кагда ўжо так работы меней, ілі самай вясной.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1928 г.н.***
***у в. Узмёны Мёрскага р-на***

## Скажыце, а калі перасталі прасці?

[*А як квас нада дзелаць?*] Малолі ячмень, пяклі сачні, і у марлю. Марлі раньшэ не было, – самі ткалі. У мяшочак у такой ложаш і вадой залівaеш, і кісліцца, і квас. А цяпер з яблакаў дзелають. [*З яблакаў? А як гэта?*] Яблакі сушым і тада тожа ў марліну, і вадой наліваем, і яна закіснець так, што яблакаў большэ сыпіш. Сахар не нада, нічога. [*Скажыце, а раньшэ водку дзелалі самі?*] Раньшэ гналі, канешне. Цяпер усё ў магазіне. Самагонку ўжо не гонуць, а пасля вайны было. Пасля вайны трудна было.

[*А ткалі тожа раньшэ ж самі?*] Да. Лён сеялі, вырашчавалі, абмалачвалі прянікам. Прянік такой быў: з палкі зделана. Вот такая вот лапатка, і абіваеш. Пайдзеш на ноч абіваць: 60 снапоў за ноч аббіць – эта звалась “капá”. А патом веялі на веялку. Веялка была, уручную веялі, семя эта сеялі апяць, на лён. А з семя масла поснае семянное гналі. А патом, када лён абмалоцішь, расцілають па полю. Ён вылёжваецца, тады падымають эты лён, у бабкі ставюць, тады здають і перарабатывають. Раньшэ і дома так дзелалі.

Было ж время такое, што давалі лён: сей і сдавай сам. Лён нада было самому здаваць. Лён эты, калі падымуць, вылежыцца, і яго мялі. Мялка такая была, як такая скамейка, што сядзяць. На туюу скамейку была яшчо зделана наверх прыжымала. Сушылі у банях: бані тапілі і сушылі. Эта для сябе, не для гасударства. І тада памнеш яго, памнеш, такое тряпло было. Тряплом абіваеш, тады был такой гребень: на даску гвоздзі набіты, і так вот чэшэш-чешэш і палучаецца, как вата. Тады прядзеш. І ткалі. Выбелівалі. Каб вы зналі, как: мы яго абрабатывалі залой. Залу сеялі, ніткі эты, а тада навінкі дзелалі. [*Навінкі? А што гэта?*] Ну, палаценцы, скацерць, былі і ў этым льне залой этай мылі, расцілалі па пожнях, і яно само па сабе на сонцы і беленька было.

[*А вот вышывалі тожа?*] Вышывалі, выкладалі, хто ўмеў. Выкладаюць навярху, есць эта, а знізу нет. Як вышываеш, звалася "выкладное". Мярожылі. [*Мярожылі? А што гэта?*] Ну, вот напрімер, палатно… Нітку так, вот сколькі – дзве ці тры ніткі – так выцянуць нада, а тады вот так во дзелаешь, а тада перавязваешь – очэнь бальшая была работа. І палучаліся очэнь красівыя і пакрывала, напрымер, как вот эта вот, вот здесь во, цвет красівы палучаецца, а здесь во – клетачкі, разныя ніткі былі.

[*А вот ткалі на кроснах?*] Да. Былі прялкі, снапряха, ляжак – эта тожа такая пралка. [*Скажыце, а калі перасталі прясці?*] Ну, эта знаеце, кагда, я яшчо сама пряла, эта ўжо было майму сыну чатыры года. Я яшчо пряла і кросны ткала. А ўжо сыну майму 59. [*55 гадоў назад вы яшчэ ткалі?*] Вы бы відзелі, как снавалі, какіе ткалі на этых кроснах!.. Цвятныя! Какія былі красівыя: і на койку засцілаць, і на стол, – куда хочаш. Цяпер няма, паўмерлі. Залоўка была, яна дужа ўмела снаваць.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1933 г.н.***
***у в. Засор'е Бешанковіцкага р-на***

## "І рушнікі, і скацеркі праджаныя былі"

Мама прала тама троху. Калаўрот быў. Ну і ета такая была… Кудзельку ставілі тут, і прала я так ніткі. І ткала, і юбкі шылі, кофты шылі, усё з гэтага. Бялілі не етат лён, а ета тканае залой. Залой бялілі. У печке яе заварвалі, а тады кідалі етае палатно. Я тожэ малая села. Кросны такія былі. В обшчэм, снувалі. А тады на кросны етыя наматывалі напраджаныя ніткі. Кросны етыя ставілі, і бёрды там такія былі, ну і ткалі. Ткаць пробывала. І рушнікі, і скацеркі праджаныя былі, – усё праджанае. Раньшэ работалі крэпка. Цяпер лягчэй. Жызнь саўсем другая!

***Запісана ад жанчыны 1942 г.н.***
***у в. Соржыца Бешанковіцкага р-на***

***

Мама прала, бацька здзелаў кросны. Выбелівала. Скроіць, пашыіць рубаху і штаны. Тады грошаў не было. З вайны у бабушкі была машынка “Зынгер”. Машынку закапалі, калі немцы былі. Лапці плялі. Мая мама пляла. Мальцы ў іх польку танцывалі. Аборыны льняныя і вакруг ног. Лапці з лыка. Хадзілі далека драць ліпу маладую.

[*А ці долга хадзілі ў даматканым?*] Долго. У армію ўжо ўсё куплялі.

Папа дзелаў дранку. Сураж быў палены, і яны дзелалі сасну на метр: пілюць і колюць яе, такі крюк… У руку – дранічана ў метр, дзве ўместа і адну наверх. Дзелалі на прадажу ў Сураж, ён жа разбіты… В частном парядке. Лес – ніякага хазяіна не было… Пака все восстанавлівалі.

Дралі лучынкі з сасны і дзелалі карзінкі.

***Запісана ў 2023 г. ад мужчыны 1935 г.н.***
***у в. Лужасна Віцебскага р-на***
***(нарадзіўся ў в. Канашы Суражскага р-на)***

## “У Заходняй Беларусі хватала ўсяго свайго”

[*Ці былі дзе ў вашай мясцовасці кірмашы?*] Да, былі ў Дунілавічах. Яны былі кожны аўторак і як былі фэсты. Людзей было многа, прыязджалі з розных вёсак: Свідна, Пераслега, Ажуны, Гліншчына, Пятровічы, Сяргеевічы, Паставы, Глыбокае, Варапаева і многа другіх, прыязджалі адусюль. На кірмашы былі і старцы, і музыкі, было весела: музыкі спявалі, іх частавалі цукеркамі. [*Што вазілі прадаваць, а што куплялі?*] Вазілі прадаваць сваё, хто што меў: і бульбу, зярно, гарох, яйкі, масла, сала. Куплялі што каму было патрэбна. [*А як кароўку трэба купляць, каб добра гадавалася?*] Глядзелі, ці ёсць зубы, а еслі парасят – ці кастрыраваныя, ці бальшыя вушы. Як вялікія вушы ў парасят – гэта добрая прымета. Даўней калхозаў не было, было ўсё сваё, а на кірмашы прадавалі ўсё сваё і за выручаныя грошы куплялі што каму было неабходна. [*Ці праўда, што з „лёгай“ рукі пойдзе ў прок, а з „благой“ – гадавацца не будзе?*] Праўда! Ёсць чалавек скупы, благі, ад яго нічога не завядзеш. Не пойдзіць ў прок. Раней яўрэяў было многа, яны прадавалі і на кірмашы, і ў магазінах. Цыганы прадавалі коней. З яўрэямі было лепей таргавацца. Яны былі чэсныя, хітрыя, разумныя. Прапаноўвалі розныя льготы, скідкі, крэдыты, абы толькі прымусіць селяніна нешта купіць. [*А яны самі па дзераўнях ездзілі, прадавалі – пакупалі?*] Ездзілі. Рызнікі сабіралі рыззё, у іх можна было на замен купіць іголкі, ніткі, хусткі. Куплялі, мянялі на рыззё. Гандаль мясам быў у руках хрысціян, яўрэі ім не гандлявалі і ў

суботу не работалі, – было свята. [*Калі тых кірмашоў ужо ня стала? А чым цяперашні базар у горадзе не такі, як даўнішні кірмаш?*] У 50-х гадах не стала кірмашоў. Зрабіліся магазіны. Ну, цяперашнія кірмашы больш багатыя, усяго больш там, многа прадпрымальнікаў, усё прывозяць саврыменнае, красівае, людзі жывуць багацей, маюць болей грошы. Могуць ўсяго купляць болей.

[*А тут жа недалёка ад Вас граніца была з Польшчай. Можа, чулі, як туды за таварам хадзілі?*] Ну, после вайны ездзілі за каўбасамі, вайной соль з Літвы прывозілі, а так у Заходняй Беларусі хватала ўсяго свайго. [*А пасля вайны ў Западную хадзілі, каб што купіць? Што на што, як доўга тое было?*]. Хадзілі, мянялі за яду, адзежу дзіцячую, мянялі, а так у Заходняй Беларусі людзі лепей жылі, чым у Усходняй, была граніца. Усходнія ўдзіўляліся ў 1939 годзе: чаму добра жывуць людзі ў Заходняй, яны не відзілі сала, ім здавалася, што людзі тут святкуюць пастаянна, у Заходняй Беларусі.

[*А вось калі калгасы сталі, як плацілі?*] Трудадні за работу ў калхозе. Трудадзень у дзень, а калі цяжкая работа, то і 2 трудадні. У канцы года за трудадні давалі зярно, за адзін трудадзень 100 г зярна і 13 капеек за адзін трудадзень. Спачатку зярно на дзяржаўны заказ, на дзяржаўны план, потым на нясенне, а ўжо астаўшаеся зярно людзям дзялілі за трудадні. Падаткі былі за ўсё: за яблыні, за кусты, за скаціну плацілі. А яшчэ нейкі быў, я ўжо слаба помню, халасцяцкі налог, хто быў не замужам, не жанаты, нада тожэ было плаціць падаткі. [*А дзе ж тады хоць якую капейку зарабіць было? Трэба ж і таго купіць, і таго...*] Прадавалі сваё, што мелі, што мелі сваё: яйкі, масла, сала, бульбу і за выручаныя грошы што было неабходна куплялі. [*А на свадзьбу ж грошы патрэбныя ці ўсё сваё было?*] На свадзьбу было ўсё сваё. Свадзьба ж не такая, як цяпер, а скрамнейшая: самагон, закуска простая. Як спякуць якую-небудзь булку… Усё сваё, рыбы напякуць. Усё было сваё, нічога мудрага не было. [*А вось самагон?*] Як была свадзьба, гарэлка была свая. Гналі ціха, хаваліся ў лесе, у кустах, гналі з бульбы і зерня. Калі каго улавілі, то давалі штраф, дамовіцца не ўдавалася. Бо было некалькі чалавек разам з участковым прыходзілі. [*А ці прадавалі каму?*] Самагонку прадавалі ў асноўным сваім ціха, за адну бутэльку рубель. Грошы куды каму трэба было што купляць. [*А як паміж сваімі, дзеравенскімі ці расплочваліся за што гарэлкай?*] Ну, даўней не надта расплачваліся гарэлкай, плацілі так грашыма, але даўней быў які добры звычай – талака. Сабіралі людзей, ці дом крыць ці што рабіць, а вечарам рабілі стол. Талака – гэта моцна выгадна.

[*А вось гэтая шафа мусіць куплёная? А дзе куплялі, за колькі?*] Даўней рабілі і шафы, і сталы, і табурэткі. Рабілі каторыя ўмелі – масцеравыя былі людзі. Даўней посуд вазілі на конях, прадавалі жбаны ганчары, рабілі з гліны,

прадавалі па 1-2 злотых. Ездзілі людзі… Часта, куплялі, прадавалі, кажды дзень нейдзе быў базар. Напрыклад, сёння ў Дунілавічах, на другі дзень у Паставах, у Глыбокім і гэдак далей.

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1944 г.н., ураджэнка в. Дунілавічы Пастаўскага р-на***

***

Было 6 дзяцей, ну, і папа, і мама. У папы было 20 га. Свіней, карову держалі, коні і жарабец был, очень красівый для выезду ў госці. Брычка была. Работнікі былі ў нас. Быў такі старычок, жыў у нас. Помню, раз памагаў няньчыць, калі мама на полі была, а мы з ім. Ну а так, калі ён быў малады, так быў рабочы па хазяйству: свіней карміл, кароў ганяў, ну, мы яму тожа памагалі. [*А вот колькі людей наймалі ў гарачую пару, вот як жыта жалі?*] Была ў нас сям’я такая: два сына ў іх і тры дочкі. Так вот яны просто ўсе шестером работалі ў нас. Бацька плаціл хлебам, там і грашыма – яны былі очень бедные. У іх вообшчэ землі… быў там агародзік маленькі. Як Саветы прыйшлі, папа ўжэ хазяйства такое не вёл.

[*А ў вашых краях калхоз пасля вайны, мусіць*?] Папа первый у калхоз. [*Первый пайшоў?*] Усе так былі недовольные, што ён пайшоў первый у калхоз, ну всё равно ж надо было ісці. [*А людзі не хацелі?*] Не хацелі. Очень не хацелі. Скандалы былі! Я была малая і то помню: плакалі, схадзіліся такія пряма заговоры какіе-то сабіралісь делаць. А папа пашёл у калхоз, напісаў заяўленне. Былі такія веялкі, сеялкі, малацілка, усё-усё папа здал у калхоз.

[*А ці хадзілі вот жабракі ці старцы?*] Хадзілі. Мама, вот, всегда давала. Тады такая была мацьбальная, она вся траслася і бацькі не было, а 6 дзецей, так почті мама іх і васпітывала.

Мама пекла раньше очень вкусные там всякіе здобные пірожкі там, а я на базары маленька прадавала.

Раней дысцыпліна была! Бацька выдаў мяне замуж зусім маладой, я хацела вучыцца очень, а бацька сказаў: “беруць в замуж – иди, вас многа, патом не дай Бог не паявіцца жених, састарышся. Як будешь? Іді замуж!” Парень з арміі прыйшоўшы быў. Бацька з’ездіў, паглядеў, што багаты там, у Браслаўскім районе, а ён быў старшы за мяне на 12 лет.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1936 г.н. у г. Дзісна Мёрскага р-на (нарадзілася ў в. Беляны таго ж раёна)***

## “Калі родзіцца сын, то вядро гарэлкі я пастаўлю…”

[*А ці можна было той самагон гнаць?*] Нельзя было, да. Нельзя, ганялі. Но раньше так ня пілі. Вот абгонюць па румачке-дзве – і ўсё. А вот мне помніцца, значыць, як эта раньше, вот еслі дожен радзіцца рабёнак, калі родзіцца сын, то вядро гарэлкі я пастаўлю, а еслі дачка, тады ўжо сколька прыйдзецца. Эта так абешчалі. Абычна ж усегда за сынамі гналіся, мужчыны, чтоб сын радзіўся, асобенна первы. [*Лавілі за самагон?*] За самагоку штраф плацілі, разаралі ўсё. [*У горад ці насілі самагонку прадаваць?*] Насілі после вайны, но мы не насілі. Насілі людзі, да. [*А на што тыя грошы трацілі*] Нада была дзяцей ў школу атправіць, і сабе што-небудзь купіць на ногі, голые ж не ходзілі. [*А паміж дзеравенскімі ці расплочваліся за што гарэлкай? Ну, каб бутэльку, каб дапамог чалавек?*] А, эта ўже после да, после было врэмя плацілі гарэлкай, ўсё плацілі гарэлкай, даже грошай не бралі. А вот сечас уже ўсё: гарэлку не бяруць, усё плоцяць грашмі.

[*А вось мэбля… Дзе бралі?*] Ну, эта дзелал хто-небудзь сам у дзярэўні, былі ж такія слесары, ці столеры. Вот, у мяне ж мой ацец быў кузнец, ягоны брат быў столяр, сестра была партніха. Вот іхні ацец стараўся ўсім дзецям даць спеціальнасць, паэтаму ён шчытаўся багатым, таму што яны самі маглі здзелаць. Яны самі маглі ўсё здзелаць: яны маглі зрубіць, яны маглі скаваць. Вот у вайну і пасля дзядзька дзелаў пралкі. Эта было ягоны падработак, яму плацілі ўсяк: у каго грошы, плацілі – зерна прынясець хто там, у каго ёсць. Ну, кусок сала, хоць сала сваё было тожэ этае… Расцілі. А ацец у кузне дзелаў усё, тожа нада была ўсё: пахалі зямлю і ўсё дзелалі, эта, у кузні тоже. Вот, няма ўжо ўсё, жывём і ўжо есць нечага. Вдруг хто-небудзь прыйдзець, прынясець, там плуг закажэць, там пачаніць нада… І прынясець нескалька фунтаў, фунты раньше шчыталася, фунты – чатыраста грам. Вот. Прынясець дзесяць фунтаў, пяць фунтаў, – сколька нужна (сколька там, можа, сколька скажыць). Эта вот так. І так мы і жылі.

[*А дзе куплялі жбаны, гарлачы?*] На базаре куплялі. Вот прыедуць у выхадной глядзець, значыць, на базаре, вот, на палу ж, на зямлі стаяць: красіва, многа, усякіе: і з ручкамі, і бяз ручачак, слоечкі і такія… гаршочкі. У Багушэўске быў кірмаш. Там насілі такіе вешчы: жбанкі, гарлачкі этыя, бочачкі. Усё гэта туды знасілі, прадавалі. Усё гэта прадавалі, што нада было ў хазяйстве. Людзі хадзілі туды – сабіраўся кірмаш. [*Ці многа людзей было, адкуль здалёка прыязджалі?*] Увесь сельсавет прыезжаў. А ў сельсавеце ў нас было дзвенаццаць дзеравень, па-мойму. Вот, увесь сельсавет прыезжаў туды! Вывадзілі кароў, прадавалі кароў і стаялі, вот. Ну, там тады таргуюцца... [*А ці пілі барыша, калі кароўку куплялі?*] Канешна, пілі! Пілі, ды толькі не так пілі, штоб дапьяна, толькі так, атмецілца.

[*А вось ці многа гадавалі?*] Вот цялілася карова. Цялёначка гэтага расцяць, а патом на поля выганяюць. Эта было как раньше. А ваабшче, у савецкае врэмя, не разрешалі гадаваць, у нас асобенна. У нас… Эта дзе-небудзь у Лёзна, там, дальшэ ад раёна, а ў нас тут раён быў блізка, дык не разрешалі гадаваць. Свінёнка аднаго толька, так нельзя было больше. Ну, а аднаго кабана гадавалі ўсегда.

[*А дзе ж грошы бралі, каб там тую кароўку купіць, калі ў калхозе не плацілі?*] Вот, людзі хто чым занімаўся. Ну, хто вот лепіў – ганчары, – вот еты прадавалі. А эта нада было многа ўсім… Нада было бочачкі, там каму карамысла нада… Вот і тады сабіралі, сабіралі дзеньгі, адкладывалі, канешна. Вот, як нашы садзілі многа лука. Тады вот эты лук пачысцяць, павяжуць у мяшок і завязуць у сельпо. Давалі дзеньгі. Ну а хто курыцу прадаст, сам ня можна з'есці – дзецям нада на карандашы ці на цетрадкі. Усё насілі, у каго што было: сметану, масла, яйцо паследнее. Я сама насіла масла, прадавала. А туды хадзілі таргаваліся. Яна ж, яўрэйка, нікагда не купіць то, што сказаў. Яна абезацельна далжна ўтаргавацца. Русска не ўтаргуець, а яўрэйка ўтаргуець – хоць дзесяць капеек, но яна ўтаргуець, усё равно з цябе вырвець. Эта вот курэй асобенна, куплялі яўрэі. Вот атнасілі курэй. Раньше ў магазіне не была.

Цяпер у горадзе базар – там ўсё ёсць: і прадукты разные, і адежда разная. Такога мы не відзелі раньше. Раньше всё шылі на даму, – людзі былі такія. Вот, у мяне цётка шыла. Бывала, хто каму пашыешь… Вот, ей некагда, а за яе там атработаюць: что-небудзь у агародзе здзелаюць ілі ў калхоз за яе сходзяць. Вот так.

[*А пасля вайны ў Западную ці хадзілі, каб што купіць?*] Хадзілі. Да, хадзілі. За солью хадзілі после вайны. Мае радзіцелі, – у нас немцы карову забралі, – хадзілі у горад. У Віцебске купілі кароўку, цёлачку, а іх абманілі, сказалі што яна была цельная, а яна была ня цельная. Вот ўсё. Ну, а за што куплялі? Сабіралі ўсё, што было: сколька было денег, сколька было якой лучше адежды… После вайны, за сараем у нас на агародзе ацец нашол нямецкія часы. Нямецкія ручныя часы! Ну і тады сразу гаварылі: "Эта табе!", а як нада была карова, этыя часы паняслі туды, атдалі…

***Запісана ў 2018 г. ад жанчыны 1929 г.н.***
***(нарадзілася на х. Собалі Сенненскага р-на) у г. Віцебск***

## "Хату купляла: зарэзала два парасенкі, аддала новыя валенкі, што-та яшчэ – не дзеньгамі"

Мы пераехалі ў 54 годзе ў Зябкі, бо наша хата развалілася. А мама купіла там хату пастроеную пасля вайны: два вакны, без пола… Яна ў 46 – 48 гаду строілася… Жыла семья, но тыя не маглі дастроіць. А тут далі дасок на

пол і паталок бесплатна. Мама яшчэ два акны здзелала, і крышу перадзелала. А тая жанчына пераязжала… Хату купляла: зарэзала два парасенкі, аддала новыя валенкі, што-та яшчэ – не дзеньгамі. Мы ўжо абутыя былі. Мама сама баню зрубіла там. Усякага было… Хваробы, вошы… У бані, керасінам галовы смазвалі. У доме спалі на саломе – мяшкі сшывалі і саломай набівалі. Сцерлася – паменяем. [*А можа к Пакрову гэта рабілі?*]. Не, мы гэтага не зналі. [*А мама веруюшчая была?*] Яна ў Бога верыла, у васкрасенне нічога не рабіла, але ў царкву не хадзіла. Таму шта, калі яе мама ўмерала, бацюшка тры дні спавядаў і карміўся, а тады забраў яшчэ тры мяшкі бульбы, а дзеці асталіся галодныя – а іх было 4: ад 7 да 16 гадоў. [*А вот, калі ў васкрасенне нада ў калхоз?*] Так гэта ў калхоз! Нада. Яна па дому нічога не рабіла.

Я замуж ў 58 гаду пашла. Па саседству жыў, сватацца прыхадзіў. Год устрачаліся. Прышол з сястрой і шваграй. [*А прыданае ці было?*] Якое там! Падушкі две, посцілкі… Мы скора ў свой домік перайшлі. Купілі зруб, а тады дастраівалі. Перайшлі ў свой дом – кравацьь купілі, здзелаў стол, две табурэткі, скамейка длінная. Праз год шкаф купілі – да і вешаць асоба няма чаго.

Я ўжо ражала ў бальніце. Бабушак не было, які прымалі роды. Декрет два месяцы да родаў і два пасля. Я ў паляводстве работала. Мама прыглядала. Соска з даматканага – пячэніну ў малаку размочыць і дае.

***Запісана ў 2023 г. ад жанчыны 1941 г.н.***
***у в. Каханавічы Верхнядзвінскага р-на (да 1954 г. жылі ў в. Катлавіна)***

## "Вот пасля вайны тагда людзі радавалісь жызні!"

На вечарынкі сабіраліся: танцавалі ну і ўсё. Раньше хадзілі дзереўні ў дзереўню, панімаеце? Маладзёж сабіралася. Асобенна пасляваеннае время. Я помню пасляваеннае, патаму што вайна началась – мне шэсць лет была, дзецтва не была… Вот пасля вайны тагда людзі радавалісь жызні! Панімаеце? Вот цяпер, еслі б хто запеў песню ў нас у дзереўне, сказалі бы, што ты ненармальны чалавек: сядзіць чалавек, паёт. А раньше сабіралісь вот так – пасідзелкі. Вот эта Еўдакімаў паёт: "Завалінка, завалінка…". А ў самам дзеле дзествіцельна на завалінкі, і раньше і называлась "завалінка". Сідзелі вот на скам'е, саберуцца саседзі, – там і бабкі, і дзевушкі – і пают песні. Вечар начынаецца… У нас было так у дзереўне – трі музыканта было, – пасля работы. Ну вот с работай спаравілісь – всё. Выходзяць: где музыка заіграла? Ну где музыка заіграла, там і сабіралісь. Ну вот і тагда вечар ужо і танцуюць, і паюць, і ўсё. Патом натанцавалісь, ідут дамой спаць, атдыхаць. Утрам ужо ідуць на работу, ну вот так вот. [*Дык а што піялі?*] Ну пелі ўжо савецкія, панімаеце, савецкія песні. Старінныя пелі песні, эта, старухі, каторыя зналі. А ну вот маладзёж асобенна етымі старыннымі не ўвлекалісь. А пасля вайны

больше такія патрыяціческія песні вот пелі, ваенныя, вот каторыя, ну цяпер іх ўжо і не пяюць. Вот пелі песню пра Зою Касмадзе’янскую, кагда яна называлась Тац’янай, панімаеце? Кагда яе паймалі. Вот я вот эты, я ў меня голасу нет, но я так прыблізіцельна вот:

“Село с расветам выйшла із тумана,
стаяў суровы утренні мароз.
Схвацілі немцы дзевушку Тац’яну
і паташчылі ў хату на дапрос.

В её глазах бесстрашые сіяла,
в её нашлі гранату і наган.
Пыталі, но ні слова не сказала,
не выдала Танюша парцізан.
“Нас не сламаць!” – услышалі кресц’яне,
палач вяроўку, яшчык прівалок,
і дзевушка в паследні раз взглянула
на в’юшчыйся над крышею дымок.

І дзевушка в паследні раз взглянула
на в’юшчыйся над крышею дымок.

Село с расветам выйшла із тумана,
стаяў суровы утренні мароз,
і дзевушку па імені Тац’яна
кресц’яне схаранілі ў берёз.”

Ну эта во такія песні былі. [*А што якія яшчэ пелі, можа помніце? Дык а старынныя не памятаеце?*] Не, ужо старынныя я ня помню. Такія песні, старынныя, не запамінала. Ну, а такія яні інцерэсныя.

Людзі радаваліcь жызні. Цяпер ужо гаварят, што плоха жыць, а я ґавару, што дзеткі, харашо цяпер жывёцца, патаму што ўсяго хватаець. Адзін раз у мяне ўнук прыехаў, сеў і кашу с маслам палажыла яму, а ён: “І ўсё, – гаварыць, – ета яда?” А я гавару: “А ты знаешь, мой унучок, а я ў вайну лебяду, ела цвяткі з клевера, і мне казалась очань вкуснай. Дык во, – гавару, – збегай сейчас, збегай, маё дзіцятка, на поле, сарві вот цвяткоў і пакушай: укусны яны будуць ілі не?” Знаеце, цяпер многіе не знаюць, гавораць, што жыць плоха. Харашо жыць!

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1935 г.н.***
***у в. Астроўна Бешанковіцкага р-на***

## Вечарынкі

Ну, раньше ж после вайны самагонка была, грошаў у людзей не было (у калхозе робілі дарма, не плацілі нічога). Дажэ на сваіх каровах у калхозе аралі зямлю. [*А ці памятаеце, як самагонку делалі?*] Ай, ну, вырашчвалі жыта, потым сушылі, потым малолі, а тады заварвалі, а тады дрожжы дабаўлялі. Атходзіцца яна ўжо там сколькі – дні чатыры ці пяць, тады ўжо гоняць. [*А калі троху ўжо пастаршэ станавіліся, ці памятаеце як на вечарынкі гэтыя збіраліся, вось што маладзёж рабіла?*] *Т*анцы былі. Гэтыя, на гармошку іґралі. А свету не было, лямпы палілі. А тады завядуцца гэта, ну, біцца мальцы з другімі, з другой дзярэўні, лямпу гэтую патушаць – і ў цёмную. А тут сабраўшыся старушкі – глядзяць, тады паўцікаюць на двор, павыбягаюць, а тады апяць лямпу запальваюць і далей гуляюць.

***Запісана ў 2013 г. ад мужчыны 1934 г.н.***
***у в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на***
***(нарадзіўся ў в. Валькоўшчына)***

***

У Юсціянаве танцавалі пад цымбалы і пад скрыпку. Тады ўжо трошкі забагацелі, сабралі ўжо ўражай, сабралі троху пшаніцы і, хоць дужа там есці няма чаго было, але па літру пшаніцы насілі таму, хто іґраў. У Западнай музыкант – гарманіст быў такі, – таму тожа нада было ці хлеба, ці постнага масла – плата. Адыграець суботу і нядзелю, а потым пад вечар да дому перавязём. [*А як сабіраліся?*] Дамаўляліся. Садзіліся на лодку і перавозілі, накормім і граіць. Вальс, каробачка, полька. [*А парней хватала?*] Абыходзіліся. З другой дзярэўні прыходзілі, з Западнай. Лампы гарэлі. Ціханька керасін з калхозу бралі. Керасін прывозілі ў бочках – кароў нада было карміць, даіць. Усё ж керасінам запраўлялі. А нада ж керасіна – вечарынка будзе! А дзе ж былі грошы?! [*А не баяліся?*] Так мы ж робілі так, каб нас не сцапалі! Мы ж усё знalі, калі, куды ён ідзе (стораж – *аўт.*).

А як ужо кіно прывозілі нам, а нада ж білет! А нада ж капейкі! А так жа не пусцяць у кіно, а капейкі хто мне дасць?! Так мы сыпалі соль, а ён жа на бензіне робіць, соль сыпалі, каб вечарынка была хутчэй, так ён і дамоў паедзе… Усяго было!

Ні хто ж не ішоў абуўшыся – усе босыя. Прыбіраліся хто як мог. У мяне дажэ было плацце з парашута. Мама дзе-та выменіла на базары на масла кусок гэтай матэрыі. Так пашыла плацце і занавескі начныя. А пальто было з нямецкай шынэлі перашытае, мальчуганскае такое. Тожа на базары купіўшы былі за масла і тварог.

Самагонку гналі. З Западнай такі быў, прыходзіў да нас, як мы сеялі зерно. Мы яму насыпем, а ён занясець да Двіны, у лодку ўкінець, а тады назаўтра ў Храброве ўжо стаіць з флягай – самагонкі нам прывёз. Яна ва ўсіх была! Як вядома, хто як мог дастаць. На танцы ішлі і бралі самагонку. Дзеўкі – закуску, мальцы – самагонку.

***Запісана ў 2020 г. ад жанчыны 1932 г.н.***
***у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на***

***

[*А ці памятаеце, калі былі вечарыны?*]

ІНФ (1): – А пачці што кажды вечар сабіраліся ў нас.

ІНФ (2): – Да… А танцы былі раньшэ… Гармошка, во. Рэжуць усё! Танцы… Хату бальшую ісчаць, – во і танцы. Маладзёж збіралася і з Заручэўя, і з Чурылава і з усюд!

ІНФ (1): – Ну гэта, вот, раньшэ ў армію ідзець – танцы. Цяпер жа ш няма гэткага. Раньшэ танцы былі. Называлі “адходзіны”. Вот суботу гуляюць, васкрэсенье – хто калі.

ІНФ (2): – Да. І з арміі прыйдзеш – танцы справлялі.

ІНФ (1): – Да, і з арміі калі прыходзіш, таксама танцы. Ну і хадзілі вакруг. Гулялі ж раньшэ багата… Танцавалі. Цяпер дык няма…

ІНФ (2): – Клубаў не было. У каго хату бальшую просяць, хату бальшую ужо, – ну, дасць хазяін. І тады гараманіст, каторы ўмее на гармоніку. Просяць з другой дзярэўні. З Шышова прывадзілі гарманіста да нас, мне свадьбу іграў Шышоўскі. Ну, ён харашо іграў, граў харашо.

ІНФ (1): – А плацілі чым? Па кружке ілі па дзве зерна гарманісту сабіралі. Плаціць нечым было.

ІНФ (2): – Па рублю збрасываліс.

ІНФ (1): – Па рублю – эта стала ўжо позжэ. Як грошы сталі троху. А так зярно, кружку зярна, кружку зярна ў мяшок збераць, то й мяшок на плечы і гармонь на плечы – і пайшоў. Вот такія танцы былі!

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1936 г.н. (ІНФ 1),***
***ад мужчыны 1934 г.н. (ІНФ 2)***
***у в. Далосцы Бешанковіцкага р-на***

# ВЁСКА ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ
# Ў ФОТАЗДЫМКАХ ЭПОХІ




**Фота 1** – «Дзеці парцізана Іспраўнікава на папялішчы свайго дома», в. Лазаватка Суражскага р-на. Віцебская вобл. 1945 г. З фондаў установы «Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў»




**Фота 2** – «Від на в. Задзежжа Асвейскага р-на Полацкай вобл., спаленую нямецка-фашысцкімі акупантамі ў перыяд Вялікай Айчыннай Вайны». 1946 г. З фондаў установы «Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў»



**Фота 3** – Святочная дэманстрацыя ў Дзісне. 1957 г. Фотаархіў Дзісенскай фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі 2019 г., з фондаў Краязнаўчага музея г. Дзісна



**Фота 4 –** Пахавальная працэсія. Пасляваенныя гады.
З асабістага архіва Пятровай Г.Г., в. Барок Шаркаўшчынскага р-на



Фота 5 – Вучні з настаўнікам. Пасляваенныя гады. З асабістага архіва Васільевай У.П., в. Мілейкі Мёрскага р-на



**Фота 6** – Бабуля з унучкамі. Сярэдзіна 1950-х гг. Фотаархіў Дзісенскай фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі 2019 г., з асабістага архіва Ляснічай Л.Г., г. Дзісна



**Фота 7** – Дзеці на вуліцы. З асабістага архіва Мацюка А.Р., г. Мёры



Фота 8 – Мужчыны. З асабістага архіва Мацюка А.Р., г. Мёры



Фота 9 – Кампанія на прыродзе. 1956 г.
З архіва Більдзюжскай сельскай біліятэкі Шаркаўшчынскага р-на



**Фота 10 –** Сям’я. 1956 г.
З архіва Більдзюжскай сельскай біліятэкі Шаркаўшчынскага р-на



Фота 11 – Дзяўчаты з бабуляй. 1955 г.
З архіва Більдзюжскай сельскай біліятэкі Шаркаўшчынскага р-на



Фота 12 – Жанчына доіць карову. 1950-я гг.
З асабістага архіва Мацюка А.Р., г. Мёры



**Фота 13 –** На танцах. Пасляваенны перыяд.
З асабістага архіва Пятровай Г.Г., в. Барок Шаркаўшчынскага р-на



**Фота 14 –** “На Петрачка” ў Чэрасах Мёрскага р-на. 1956 г.
З асабістага архіва Мацюка А.Р., г. Мёры



Фота 15 – Прыехала кіно! Пасляваенны перыяд.
З асабістага архіва Пятровай Г.Г., в. Барок Шаркаўшчынскага р-на



**Фота 16** – Маладры чалавек у пакоі. 1958 г. З асабістага архіва Мацюка А.Р., г. Мёры



**Фота 17 –** Маладыя на вяселлі. Пасляваенны перыяд. З асабістага архіва Пятровай Г.Г., в. Барок Шаркаўшчынскага р-на



Фота 18 – Маладыя на вяселлі. Пасляваенны перыяд.
З асабістага архіва Пятровай Г.Г., в. Барок Шаркаўшчынскага р-на



**Фота 19 –** Пахаванне. Пасляваенны перыяд. З асабістага архіва Пятровай Г.Г., в. Барок Шаркаўшчынскага р-на



Фота 20 – Жанчына з дзіцём. Пасляваенны перыяд.
З асабістага архіва Мацюка А.Р., г. Мёры



**Фота 21 –** Касцы. 1950-я гг. Фотаархіў Дзісенскай фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі 2019 г., з асабістага архіва Стомы І.М., в. Язна Мёрскага р-на



**Фота 22 –** Сям'я каля хаты. Пасляваенны перыяд. З асабістага архіва Мацюка А.Р., г. Мёры



**Фота 23 –** Хата ў в. Соржыца Бешанковіцкага р-на. Пасляваенны перыяд.
З асабістага архіва Раўковай Г.С., в. Соржыца Бешанковіцкага р-на



**Фота 24 –** Моладзь на прыродзе. 1950-я гг. З архіва Більдзюжскай сельскай біліятэкі Шаркаўшчынскага р-на



Фота 25 – Мужчыны на прыродзе. Пасляваенныя гады.
З асабістага архіва Пятровай Г.Г., в. Барок Шаркаўшчынскага р-на



Фота 26 – Моладзь каля хаты. 1949 г.
З архіва Більдзюжскай сельскай біліятэкі Шаркаўшчынскага р-на

## СВЯТОЧНА-АБРАДАВАЯ КУЛЬТУРА

У пасляваенны перыяд святочна-абрадавая культура вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі была прадстаўлена двума асноўнымі комплексамі: грамадзянскімі абрадамі і традыцыйнымі (у асноўным, каляндарнымі і сямейнымі). Грамадзянскімі абрадамі, у першую чаргу, суправаджалася правядзенне важнейшых дзяржаўных святаў (Дня Перамогі, гадавін Кастрычніцкай рэвалюцыі, 1 мая і інш.). Палявыя матэрыялы сведчаць аб бытаванні падобных святкаванняў у вясковым соцыўме Паўночнай Беларусі ў пасляваенны перыяд. Аднак трэба заўважыць, што ўрачыстае правядзенне гэтых святаў у першыя пасляваенныя гады не насіла масавы характар. Больш таго, актыўнае іх укараненне, асабліва ў заходняй частцы рэгіёна, адбывалася толькі з канца 1950-х гг. Менавіта канец 1950-х гг. адзначыўся новым уплёскам абрадатворчасці і ўкараненнем "новых" грамадзянскіх абрадаў[14]. У адрозненні ад даваеннага этапу, увядзенне сацыялістычнай абраднасці ў гэты перыяд насіла не стыхійны, а планавы характар, дзе цэнтральная роля належала органам кіраўніцтва. Як сведчаць матэрыялы палявых этнаграфічных даследаванняў у рэгіёне, у пасляваенны перыяд фіксаваліся і выпадкі правядзення сямейных абрадаў (радзінаў, вяселля і пахавання) па новых грамадзянскіх сцэнарыях ("чырвонае" вяселле, "акцябрыны" і інш.; гл. матэрыялы ніжэй). Аднак яны не атрымалі шырокага распаўсюджання ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі.

Пасля заканчэння вайны асаблівае распаўсюджанне атрымала ўшанаванне яе ахвяр. У Беларусі з сярэдзіны XX ст. стала традыцыйным напярэдадні ці ў Дзень Перамогі (9.V) ускладанне вянкоў і кветак да помнікаў і брацкіх магіл партызанаў і воінаў, якія загінулі ў час вайны. Аднак нягледзячы на існаванне ўстаноўленага агульнадзяржаўнага дня памяці ахвяр вайны, у некаторых мясцовасцях памінàлі загінуўшых і ў іншыя дні. Так, у в. Перавоз Расонскага раёна, дзе распаўсюджана традыцыя памінаць памерлых на Тройцу, памінàлі загінуўшага партызана на гэта свята: *«Ай, проста, там жа* [на пагорку – *А.У.*] *парцізан захаронены. Хадзілі на яго кажную Тройцу і гэтага парцізана памінàлі»*[15]. Падобная традыцыя існавала ў Шуляцінскім сельсавеце Расонскага раёна[16].

---

[14] Браим И.Н. Из опыта разработки и распространения новой обрядности в Белорусской ССР // Традиционные и новые обряды в быту народов СССР: сб. ст. / АН СССР, Ин-т этнографии им. Н.Н. Миклухо-Маклая; отв. ред. И.А. Крывелев, Д.М. Коган. – М., 1981. – С.72; Лобачева Н.П. О формировании новой обрядности у народов СССР (опыт этнографического обобщения) // Советская этнография. – 1973. – № 4. – С. 15.

[15] Зап. у 2009 г. ад жанчыны 1925 г.н. у в. Перавоз Расонскага р-на.

[16] Залескі А.І., Іваноў У.М. Новыя звычаі і абрады – у наш быт. – Мінск, 1960. – С. 41.

Як паказвае аналіз зафіксаваных матэрыялаў, асноўная роля ў гэтай сферы па-ранейшаму належала традыцыйнай каляндарнай і сямейнай абраднасці. Аднак у пасляваенны перыяд у правядзенні шэрагу абрадаў існавалі перашкоды, выкліканыя ідэалагічным фактарам. Разам са спробамі ўвядзення новай грамадзянскай абраднасці з боку дзяржаўных органаў і партыйных структур чыніліся перашкоды ў правядзенні традыцыйных абрадаў. Асабліва, калі яны суадносіліся з рэлігійным святам. Аб такіх захадах савецкай улады паведамляюць рэспандэнты: *«Да, на Тройцу запрышчалі хадзіць. Вот прыдут з райкома парціі. Мне нада ехаць на памінкі на трэці дзень, а з бюро райкома парціі возьмуць і вызавуць на работу. І рабі, што хочаш, і туды хочацца, і туды. І бальной пратваралася. І прыеду, хочацца на кладбішча. І выгаравaў сколькі рабілі, я вунь сколькі імела выгаварaў»*[17].

Трэба адзначыць, што велізарная колькасць апісанняў правядзення каляндарных і сямейных рытуалаў у першыя пасляваенныя гады, зафіксаваных ад мясцовага насельніцтва, дэманструе яшчэ традыцыйны стан абраднасці. Аднак разам з тым, назіраецца і некаторая яе эвалюцыя. Асабліва істотна на адбыўшыяся змены паўплывала цяжкае матэрыяльнае становішча насельніцтва ва ўмовах пасляваеннага аднаўлення беларускай вёскі. У шэрагу выпадкаў гэта праяўляецца ў ходзе і стуктуры абрадаў. Як паказваюць матэрыялы, у пераважнай ступені гэта датычыцца рытуалаў сямейнага цыкла. Іншы раз абрады становяцца больш спрошчанымі і згорнутымі. З іх выключаюцца як асобныя элементы, так і групы элементаў.

Так, цяжкае матэрыяльнае становішча прыводзіць да адсутнасці магчымасці вырабляць ці набываць неабходныя для абрадаў рэчы (напрыклад, вясельны строй для маладой, новае адзенне для нябожчыка і інш.). А таму выкананне шматлікіх абрадавых дзеяняў, звязаных з іх вырабам, знікаюць з абраднасці. Іншы раз, як сведчаць матэрыялы, нараджэнне дзіцяці або шлюб маглі ўвогуле не суправаджацца ніякімі абрадавымі дзеяннямі. Замацаванне шлюбу або факт нараджэння дзіцяці ў такім выпадку адбывалася толькі фармальнай працэдурай у ЗАГСе ці сельсавеце. Пра гэта даволі часта адзначалі рэспандэнты: “*Ай, Божанька мой, всяк! Бедна былі, і свадзьба. У мяне свадзьбы нікакой не была. Прыехаў на кані, забрал аж у Мёрскай раён*”[18].

***У. Я. Аўсейчык***

[17] Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1930 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.
[18] Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1939 г.н., в. Вайты Браслаўскага р-на.

## 8 сакавіка

А раньшэ ж было 8 марта, весела, песні пелі, гулялі, склашчыны дзелалі. Мужык тут адзін у нас такі быў, грыбоў насабіраіць, сырых насоліць бочачку. А тады гарманістам быў. Усе бабкі к яму пойдуць, песні пяюць, тэй грыбы салёныя ядуць. [*А што піялі, памятаеце?*] Ай, усяго пеялі. Я ўжо дужа ня помню. Я песні люблю пець. Усякія пелі песні. [*Ну ўспомніце якую-небудзь.*] Ну я помню песню я пела ўсё:

“Із-пад берага, із-пад сіняга,
Цячэць рэчанька, рэчка быстрая.
Малады купец вёў каня паіць,
А раўнівы муж вёў жану тапіць.

А яна плакала, усё прасілася,
А яна плакала, усё прасілася:
– Не тапі мяне ранней горачкай,
А тапі мяне поздна вечарам!

Дзеткі будуць спаць, людзі – меньшэ знаць.
Дзеткі будуць спаць, людзі – меньшэ знаць”.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***і мужчыны 1934 г.н.***
***у в. Бальшыя Галыні Бешанковіцкага р-на***

## Майскія і кастрычніцкія святкаванні

Ну ні было тада багатых, все былі роўныя. Адзінакавыя. Мы какіе-та добрыя былі. У нас грошай не была. У нас на хлеб было, на яду. Ну не стрэміліся мы! Но зато каждый празнік мы сапраўлялі! Первага мая… Арганізацыямі хадзілі. Там жэ Ленін у нас быў. Ну на столька весела была, настолька!.. Мы прыходзім у сваю арганізацыю – все накрываем стол. Как бы не напіваліся ніхто. Я прымерна савецкае врэмя люблю. Я за эта, за яго. [*А вот скажыце, на дземанстрацыі калі хадзілі? На якія?*] Седьмого. [*Седьмого. Это Акцябарская?*] Да-да. Это ж за первое место што б арганізацыя ўсе паказчыкі выпалніла. Первае места занімаеш. Там не то, што “стаў-стаў-стаў”. Там вот надо плаціца якое справіць. Эта настолька мы сабіраліся. <…> [*А вот скажыце а на майскія былі дземанстрацыі?*] Да. Обязацельна. [*А кагда вот? Вот чым яны отлічаліcь от акцябарскіх?*] Чым? Ветачкі

толькі начынаюць, бярозкі, і мы ветачак наламаем, цвяточкі ў эці ветачкі ложам. Мы, ну да-да… І тада… Я ж сама ўсю жызнь у кадрах праработала. У арганізацыі. Тада быў камбінат сраіцельных мацерыялаў. І ўсё врэмя ў кадрах праработала… Наказывалі, калі ты апаздаваў, калі ў цябе ёсць прагрэсіўчык, то ў цябе не будзець яе. Ня будзець яе. Ты не прынімаў учасціе. Паэтаму людзі і шлі. Все-все ішлі. [*А вот схадзілі на дземанстрацыі, а патом можа куды там?]* Ну да. Ну, можа… Ну, лічна мы сабіраліс і там нічога асобеннага не было: сядзем, там какая бутылка віна, разальём, хто там хоча. [*На прыроду?*] Ну, конешна! Ну, і ў КСМе было. Ну, всяк было што. Там што-нібудзь танцуюць усе. Ну так вясёлыя. Очэнь вясёлыя былі. Вот када очень вясёлыя былі людзі. Ну хто выпіўшы-нявыпіўшы – каенцэрт ідзець, усе пяюць. А тут, перад канцэртам, па зямлі танцуюць. Да упаду танцуюць! Эта ж так нада. І я настолька рада, што я пабыла там.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1937 г.н.***
***у г. Дзісне Мёрскага р-на***

***

[*А што за маёўкі?*] Ну ўжо маёўка. Сабіраліся тожа, гэта, ну, і дзеўкі, і парні, і гэта самае, і ўжо ж парні гэтыя няслі водку. Сабіралася… Вот, выберуць такое места на вуліцы, каб красіва, дзе такая паляна. Ну і тады скацерці. Усё ж там: яды ўсякай і гэта самае… І там музыканты. А ў восень, гэта. У восень гэта былі абжынкі. Гэта на Каляды была цярэшка гэта ўжо вот. [*Дык маёвыя там моладзь збіралася?*] Да-да. А гэта ўжо, як былі калхозныя абжынкі, у каждай брыгадзе. Гэта тады ўжо брыгадзір дасць якому мужыку жыта, зерна, самагонкі нагоніць. Ну і тады тожа сабіраліся. І дажа тут во, дзе гэта падстанцыя, магазін быў. А тады ж чыста было…

***Запісана ў 2012 г. ад жанчыны 1940 г.н.***
***у в. Гулідава Глыбоцкага р-на***

## Абыдзенная наметка

Ну і вот, гэта ў вайну, тады называлася такая “абыдзенная наметка”. Ткалі гэта палаценца, ну, вот такой шырыны (паказвае рукамі больш за метр – *аўт.*). Нада было за дзень напрясці лёну гэтага, аснуваць, выткаць. Тады дзярэўню кругом абняслі. У Матырыне там нейкая каплічка была, там быў нейкі старычок, які Богу маліўся. Вот, заняслі – і дзярэўню нашу не спалілі. [*Это собирались жанчыны?*] Да, усе жанчыны дзярэўні ў адной хаце. Вот

выткалі, надо было бы абязательно за день, да увасхода, а да захода сонца занесці.

***Запісана ў 2020 г. ад жанчыны 1931 г.н.***
***у в. Лажане Ушацкага р-на***

***

[*Ну вот, можа, у вайну быў тут абычай такі – абыдзённую наметку тут?*] У блакаду робілі. У нас ткалі. Сабраліся ўсе жаншчыны, і эта яшчэ згарэўшы не былі мы, пака бамбіць яшчэ (не пачалі) эта было. І пралі лён, пралі, ніткі робілі, пралі, пралі цэлы дзень. Усё пралі, аснавалі палаценца такое – “намётка” называлася. Палаценца дліннаватае такое. А снавалі жаншчыны і выткалі за дзень. Выткалі, а тады ўсе кругом, гэтыя (жанчыны), кругом дзярэўні абыйшлі з гэтай намёткай. А ўжо ў Празарокі не маглі занесці яе за тое. Што, ну, ноч ўжо засцігла, не справілісі. А назаўтра ў дзвюх жаншчыны насілі ў Празарокі, у цэркаў эту намётку. Ну вот, забіць ў нас нікога не забілі, толькі што спалілі дзярэўню, а забіць нікога не забілі.

***Запісана ў 2020 г. ад жанчыны 1933 г.н.***
***у в. Мажуйкі Ушацкага р-на***

## Рэлігійнасць і абраднасць пасля вайны

[*Можа ўспомніце, а када, прыкладна, закрылі касцёл? Запрашчалі маліцца, вот эта калі было?*] Ну, калі калхозы сталі. Стала такая власць вот эта. Сталі эты, партыўныя, запрашчалі ў касцёл, маладззёжы не давалі. Партыя, тым, хто ўступілі. Ай, там усё раўно хадзілі людзі, крадком, не баялісь. [*А ці лавілі тых, хто хадзіў у касцёл, можа, школьнікаў?*] Школьнікам не разрэшалі хадзіць, але ж па-ціхоньку хадзілі. Давадзілі іх да первай камуны, вучылі, але ж, ну, так, ціха. [*А кресцілі тогда как?*] Кресцілі также, дагавор с ксянзом – і пахрысцяць. Мала што там, не давалі. <…> [*А можа, успомніце, святы ладзілі, калі гэта ўсё запрашчалі?*] Чаму, свята ніхто не запрэшчаў. Святкавалі ўсе сваі святы, да. [*Ну, там, можа, Пасху запрашчалі святкаваць?*] Як калхозы сталі, так работаць нада было. І то, дапускалі ўсіх на першы дзень. Не работалі тады людзі. А нічо, святкавалі. Цяпер і раньше.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у в. Дзедкавічы Браслаўскага р-на***

## Дажынкі

[*А в толоки собирались?*] А талака – да, сабіралісь. Памагалі адзін аднаму. То жыта жалі, патом, еслі даже, тады дажынкі спраўлялі. Завязывалі паследнія станіцы снопу, жалі і ўкрашалі цвятамі гэтат сноп, пелі дажынкі, ну і патом угашчалі, у хату звалі.

***Запісана ў 2022 г. ад жанчыны 1942 г.н.***
***у в. Белеўцы Мёрскага р-на***

## Капліцы ў Докшыцкім раёне

Я купіла краскі, дачка ездзіла к бацьке ў бальніцу, кажа: "Мама, каб я ў капніцы паглядзела ваконцы пакрасіць, так яна знаружы пакрашана". Дык гэта дзярэўня як ахвіравалася, і вот сабіраюць пенсіянеры грошы, а там і свечы прывозяць купляюць, і пеўчыя, і бацюшка з матушкай. [*А якія пеўчыя, з Тумілавічаў?*] З Тумілавіч, з Шалаш дзве жанчыны, з Дзедзіна дзве. Гэта з вайны сталася. [*Гэта з вайны?*] Наша дзярэўня засталася, а ўсе пагарэлі. Так быў крэст, так стаяў. [*І да вайны быў? А капніцу паставілі?*] Даўна. Не, капніцу ж Васіль после вайны рабіў. Крыж быў. Пры Польшчы быў. [*А пасля вайны паставілі капніцу? З-за таго што…*] Дзярэўня збераглась. [*Не спалілі. А чаму на Пятра?*] Ну, вось чарга ёсць у цэркові распрэдзялённая, вось. У Старыне на первы дзень, на другі ў Рачныя. А ў нас гэтак выбралі. І вот у нас два разы дзярэўню паліць пыталісь! І вось, раз афіцэр стаяў і пайшоў. І там гумны запалілі, хату адну. Бацька быў, яго маці і дзядзька Сяргей, вышлі з пісьмам, што ў Германіі дзеці, а ён тады – "усем прыкраціць!" А тады другі раз, калі блакада была. Во гэтая хата гарэла, тожа, як сталі гэтымі пісьмамі. Усё, і засталася дзярэўня. Каб не пісьма – была бы спалена. Праказалі што дзеці забраныя. Паглядзеў.

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1936 г.н., мужчыны 1928 г.н.,***
***мужчыны 1924 г.н. у в. Стараселле Докшыцкага р-на***

***

[*Скажыце, калі ласка, а што гэта за капнічка такая? Ці даўно яе паставілі?*] Капнічка… Нідаўна. Даўней быў крыж, але на той бок стаяў. К рэчцы, на той бок, дзе дарога. [*Гэта там, дзе дарога?*] Не, дзе каменны крыж, тут бліжэй была дзеравенская дарога. Конная. Патом сталі ж гэтую

дарогу робіць, і п'яны Жоржык узяў, гэны крыж паламаў. Выўрваў яго на дарозе. Яму памешаў. Мусіць, не пры Саюзу, можа. Галя, сестра, у цэркві піяла. Вот яна бацюшку кажаць, што, бацюшка, вот брат так зробіў вялікую. Што робіць? Ён сказаў, бацюшка, гэтак: "Пусць паставіць…" [*Новы?*] Ага, і не будзіць яму нічога. [*А калі, напрыклад, не паставіў? Ці былі такія случаі, што вось там робіць такое абы-што, і Бог караў?*] Ну, хто яго ведаець? Вот, ён ўзяў гэны, паставіў сюды на гэты бок. Тут ужо дарогу сталі шырэць, асфальты класці ўжо. Дык ён паставіў тутака. А тады ўжо як сталі ўжо, і вот вайна, праўда, вот такія прышэдшыя былі. Спалілі ўсё, і крэста няма, і ўжо тут сталі… [*Гэта хто, немцы спалілі?*] Ага, немцы. Ага, сталі людзі троху, хто якую хацёнку, хто што… Перуны сталі паліць хаты. Граза. Там у нас у канцы чалавек з вайны. Гэта ж пастроіў хату, там усё. Толька ішоў з вайны, прыйшоў – нікога няма – ні бацькі, ні мацеры. Пабілі іх. Жаніўся. Найшла хмара там вон недалёка. Пярун – трах! Глядзім – гарыць хата! Шчэ там во гэткі ксёндз. Тады во, Амельяна спаліў. Во гэта ў Пеці, ў Пецька… Карову, знаіць ён, карову на пасці забіў пярун. Вот тады сабралісь етыя старэйшыя, кажуць: "Быў у дзярэўні крэст, нада паставіць крэст". Ну вот паставілі крэст тады, нада ж бацюшка каб пасвяціў. Ну, бацюшка асвяціў, ўсё. Цяпер робіць гэтак, трэці дзень, на Троіцу сюды, малабен адпраўляець. За здароўя. І зробілі гэтка ўжо, абгарадзілі. <…> [*І капнічка, каб Бог бараніў?*] Да. Ага, і тады кажам, вот памоліцца за ўсю дзярэўню, – здароўе падаём запісачкі. І ўсё, дзякуй Богу.

***Запісана ў 2009 г. ад мужчыны 1925 г.н. і жанчыны 1930 г.н. у в. Рачныя Докшыцкага р-на***

## Традыцыйныя каляндарныя абрады

[*А Купалле як вы адмічалі?*] А Купалле… Вытваралі разнае. Успаміналі абязацельна што-небудзь смешнае: то палкамі дарогу загародзяць, то калёса на крышу закінуць. Узнясуць, а тады ідуць смяюць: "Э Івана, ты куды сабраўся ехаць…" Маладзеш, бывала, устроюць іголку ў вакно – ета не абязацельна на Купала, – а тады катушка нітак, нацянуць і начынаюць. Ігоўка там, а там груз прівяжуць, нацянуць, і стук па вакну, стук. Еты выбяжа, агледзіць: нікога нема! Ета суседу майму рабілі, і ён тады брешыць! А яму ета інцересна: ён апяць у хату, а яны апяць стукаюць па вакну… То бароны паставя куды-небудзь. Кастры сабіралі паліць, палілі резіну, кастры, факелы но ета яны паўтаралі за старымі…

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1939 г.н. у в. Клешчыно Бешанковіцкага р-на***

***

[*А на Купалле ці сабіраліся?*] Сабіраліся і на Купалле ў нас. [*Раскажыце нам, як было.*] Ну, у нас як было? У нас тады што было? Саляркай палілі, разіны дужа не было, палкі якія сабіралі абычна. Да во прыйдуць па дзярэўні пройдуць – каму дзьверы падапруць, каму прынясуць броўны якія, што і накідуць на дарогу, – прайці няможна, убіраецца дзень.

Ну ў нас тады былі вечарынкі, ай! Цяпер такога няма. Тады, раньше… А Божа мой! За 10 кіламетраў хадзілі! Як сабярэцца 20 мальцаў, 20 дзевак, ці больше, і ідуць усе а с адный дзярэўні, з другій, з трэцій, хату просюць у каго ўжо большая хата. А этага, музыканта, нанямалі. [*А які музыкант? Хто, на чым гралі?*] На гармоніку ўсё время. [*А танцавалі што?*] Ой, танцавалі кадрыля і польку, і этые, як яе, ай… [*Вальс?*] Ета ж кадрыля, полька, каробачка, падыспанец, ай во поўна. [*Можа песні якія спявалі, можа памятаеце хоць?*] Ай, ну так пелі якія частушкі. Так, якія маладзёж хто што ўздумает. Тады так як мы былі, дык дужа такіх старых, старынных, не было, – усё такія. Толькі што цяпер ужо во ўсё ў клубе, там усё этыя двігаюцца, іграюць. А ў нас быў гармонік. Вот сёння ў нашай дзярёўне, напрымер, у суботу вечарынка, тут у нас сабіраюцца ўся акружнасць, дзе якія дзярэўні ёсць за 10 кіламетраў – усе сюды прыходзюць. Ну, вот адны згуляла – парція. Там на дварэ ўжо, на дварэ гуляюць ці смяюцца тама хто з кім як. А становіцца другая парція. Тыя згулялі, яшчо выходзюць – і да самага дня. Ідзём дамой, ужо развіднее, сонца ўсходзіць – нада іці сена грасці, ці жаць што-небудзь.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1926 г.н.***
***у в. Гарадзец Бешанковіцкага р-на***

***

[*Дык а вось гэта вы спеялі і гулялі ўсё на вячорках, да?*] Да, да, і гэта, і на вячорках, і на Купалу хадзілі, вось гэта і спявалі. Раньшэ ж Купала была. Гарманіст быў. Палілі банкі такія: трапкамі набівалі, гэтыя трапкі, патом факелы запалівалі. Ну і па жыту хадзілі, кастры раскладалі, хто што мог, тое і пеялі. Ну а па дзярэўне хадзілі… Я помню, папа вышаў карову гнаць, туалет вынеслі на дарогу і паставілі! Ага, тады папа мой устаў, а яго папёрлі саўсім, дык праз вакно вылезаў! Ну а Купала, здаецца ж, “Купала, што здзелаў – прапала”. Залезлі ў клубнік, к нам залезлі сюды, Валодзя пачуў, праз вакно выскачыў і гнаў іх аж да бальшыка. Была раньшэ, а сёлета нідзе. Я яшчэ банкі сымала, гавару: “Можа, залезуць ды паб’юць”. Ну, цяпер жа

ў Свячу панаязжалі, і чужых многа, што не знаем дажа. Раньшэ ж былі ну, свае, мы знали, а цяпер ідзеш – саўсім вот.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Свяча Бешанковіцкага р-на***

***

[*А што вот як раней Купалле атмечалі?*] Як атмечалі… Раньшэ ж не так было, як цяпер. Тады дзе-нібудзь украдзім у каго старае калясо, не рэзінавае, а дзеравяннае, – раньшэ калёса былі дзеравянныя калёса – і ў тое калясо наторкаем сколька чаго можна і тады яго на кол, аблiём троху керасінам ці чым, і на кол, і на масту прывяжым. Ён стаіць высока, эта калясо, і падпалюць такія мальцы, мальчышкі, як і я. Гэта калясо доўга-доўга гарыць, а на масту танцуюць пад гармошку, маладзёж танцуець. А старыкі ідуць у жыта на поле і пяюць такія песні купальскія, старынныя. Ну вот і гэта да ўтра такая гулянка. Вянкі в'юць, на рэчку пускаюць. Дзе вянок чый, вот вянок сойдзецца чый, гэта ўжо хто-та замуж выйдзець – і гэта глаўнае.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1925 г.н.***
***у в. Бачэйкава Бешанковіцкага р-на***

***

[*А вот, ну у советское ж время, ну наверна ж запрещали, чтоб и у костелы ходили, и нельзя было вот? Тут ти закрыты был костел у Друе?*] Закрыты был костел, закрыты. Знішчаны был, костел был превращен у склад тут вот. А в Педруе работал костел, ну и лодки перевозили людей, ходили. Ну, я в то время сама вот работала. Я работала в Мальковщине, там тепер ничога не осталось от средней школы – только заросли. Так унас директор такой был, и он, знаете? Посылал, посылал: идти посмотреть, кто из деток ходит в костел. Допустим, на Вяликдень, – ну, а што ж мне было рабіць? Я там пионер-вожатой работала, ходить я не ходила, а ён на други день дапытвае: должна я дать доклад, что хто хадил. Ну я назаву пару фамилий, а ён знал, хто ходить. Значит, тыя были, больше я не знаю. Я не ходила и не выдавала, потому что родители были верующие, а там заставляли, знаете это было очень строго, атеизм был. [*А вот не ругались, что там, например, у хате икона висит, ти не хадили, ни эта?*] Ну не хадзілі так, не заставляли, ну але, калі прыходзіць якое начальства, можа хто і снімал, – баяліся.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1939 г.н.***
***аг. Друя Браслаўскага р-на***

***

[*А скажыце, валачобнікі тут ці хадзілі?*] І валачобнікі ходзюць. [*А валачобнікі – гэта болей хто? Бабы ці мужыкі ходзюць?*] Усе. Да ёсць гармошка і цымбалы – усё, што хочаш. [*А вот гаварылі, што бралі мужыка, вот спецыяльны мех насіў, яго там смешна так называлі?*] Ня чула, у нас жанчыны бралі карзіначку і ідуць, пасля вайны ўсе бабы гэта хадзілі і пелі, а мы ззадзі бегалі, глядзелі і слухалі, як яны пяюць. [*Ну гэта к каждаму дому нада падысці?*] Да, пажылаць гаспадару харошага здароўя і ў хазяйстве, і ў хлявах, і ў сюдах, і каб дзеці харашо. Дужа інцерэсная песня. [*І там, можа, гаворуць, дзеўкам пеялі аддзельна?*] Дзеўкам адзельна – ну, дачкам, сыну адзельна пяюць, гаспадару – адзельна. [*А вот ці хадзілі тут такія старцы, жабракі пасля вайны яшчэ?*] А няўжо-ж… Галадаюшчых, знаеш, сколькі было?! І мама наша хадзіла. Што? Яна адна, а нас трое, а што ў каўхозе раньшэ зараблялі – нічога. Трудадзень напішуць, палачку табе паставюць, што ты быў на рабоце, вот табе і зарабатак… Хадзілі, жабравалі…

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1939 г.н.***
***у в. Бачэйкава Бешанковіцкага р-на***

***

[*А Цярэшку ці жанілі вы?*] І Цярэшку жанілі, да. [*А раскажаце, як Цярэшку жанілі?*] Як Цярэшку жанілі? Ну вот сабіраюцца, на такі-то дзень назначано такая вечарынка ўстроена, ну а тады дагаварываюцца мальцы хто з якой дзеўкай пойдзюць Цярэшку. Вот, сама я не хадзіла ні разу. [*Дык там усё па-сапраўднаму было ілі як там?*] Ну, па-сапраўднаму, як па-сапраўднаму? Не па-сапраўднаму, так, врэменна, вечар правясці. [*Вечар, да толькі вместа… Свадзьба – да? – такая была ладзілася? Дык, а гавораць з гарэлкай, да?*] Да, гарэлка, танцы, вечарынка, ну і мальцы падходзюць: і пойдуць і з тым, і з тым, а тады на завтра, ці як, закуску гатовяць і садзяцца парамі гэтымі. [*Дык а хто? Старыя падбіралі ці дзяўчына з хлопцам самі?*] Дзе ўже мальцы самі падбіралі. [*Мальцы самі сабе падбіралі?*] Мальцы самі, ну парні. [*А вось раньше якія інструменты былі, на чым ігралі?*] А ігралі на гармонік і цымбалы ігралі, і скрыпка, была скрыпка, вот такія былі. [*А песні ці спявалі?*] І песні спявалі. [*А якія спявалі песні? Можа памятаеце якую песенку, якую спявалі?*] Дзеўкі пелі тады, як ужо каму які малец, з кім яна ўжэ будзець за стол садзіцца, дзеўкі пелі такія частушкі небальшыя. [*А як, можа, помніце якую?*] Помню толькі адна пела: "А я не выбірала, ды ўсіх адшукала". Нешта

такое… Не выбірала, малец красівы ей папаўся. А ў яе голас быў, ну вот, ну і так дзеўкі… Более я ня помню: "Цярэшка, Цярэшанька…" не, ай. [*А так калі не Цярэшка, калі так на вечарынку збіраліcь, можа, помніце якую песню пiялі? Ну якія песні?*] Ай, ну я ж уже после вайны хадзіла, пасляваенныя песні былі. [*Пасляваенныя, да?*] Да.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1929 г.н. у в. Гняздзілавічы Бешанковіцкага р-на***

***

[*А Цярэшку ці жанілі?*] Жаніла, я сама жаніла. [*Колькі разоў жанілі?*] Можа разы чатыры жаніла. [*А як жанілі?*] Выбіралі бацьку, матку, нанімалі гарманіста, дзеўкі дзелалі стол. Даўнее в деревне танцы былі ў хаце, лампа гарела і добра было, весела! Вось, адну суботу ці нядзелю ў адной деревне, другую – у другой. [*Запіскі пасылалі?*] Ну, было што і запіскі, па студзенам аддасі, я сама робіла пасля вайны. Кожны малец выбіраў сабе дзяўчыну, якую хочыць, а дзяўчына сабе хлопца. Малец прыносіў гарэлку, дзяўчына – закуску. Трэба было абавязкова прыносіць калбасу. [*А чаму?*] Гэта калядніца, Цярэшку жанілі. Трэба было калбаску. Калі няма, дык пазычаць, што есць, то і нясешь. Дзяўчына сядзела са сваім хлопцам за сталом, а потым былі танцы. Матка з бацькай песні піялі. Пахарагодзяць, тыя ж самыя танцы. Раньше на танцах гулялі ў розныя гульні.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1930 г.н. у Бешанковіцкім р-не***

***

[*А вось скажыце калі ласка, як вы Каляды святкавалі?*] Абычна Каляды святкавалі. [*Не калядавалі?*] Не. [*А ў маладосці?*] Не. Дзе я калядавала? Я маладая робіла, як конь. Задарма работала. За жменю касцяру. Папку майго забілі немцы. Маму тожэ чуць не забілі. Бежынцы знаеце хто такія? Хадзілі адступалі. Бежэнка мяне не брала мне два гады было, а немец на яе вінтоўку наставіў і яна ўзяла. Занянслі тут у дзерэўню. У Песках, тожэ Бешакавічэскі раён. Маму пусцілі з турмы, а хата ў нас была. Хату выцягнулі етай, пол, ну мост называюць. І ўсё людзі пакралі. Бацьку, значыць, забілі і маму заб'юць. Яна і вытаптала, нанасіла зямлі пад нагамі. Чым? Палкамі, можа. Так гладзенька! Мы жылі, пакуль я падрасла. Як у яе здароўя не было, немцы яе

білі. А як падрасла ўжо я, тады стала работаць. Цётка нам дала цёлачку маленькую. Выгадавалі кароўку. А кароўку тую тады прадалі. У другой дзерэўні хату купілі. Лучшую. Там харашо было. У хаце тожэ крышу накрылі, кірпіч узялі эты купілі там. А за што куплялі? Грошы ў калхозе не плацілі. Яічкі сабіралі. Там мама казу зарэжыць, прадасць мяса, трусоў (“кролікаў” цяпер называецца, і раньшэ “трусоў”) забівалі, шкуркі етыя прынімалі, за ета так жылі, а работалі ў калхозе. Лён прывязуць увосень, лён, яго сушылі на печкі, тады. Мялі, пралі, і чыста жменькі так звязвалі іх і здавалі такое. Зярно прывазілі ў калхоз. <…> [*А вось калі маладзёж збіралася. Можа былі гульні ў іх якія? Зімой што рабілі?*] Хадзілі тута во ў клуб. Кажду суботу былі танцы. Маладзёж эта хадзілі сюда. [*А ва што гулялі калі маладзёж?*] Кадрэль гулялі, інцерэсна. Кадрэлі гулялі, як я была. Адзін малец возьмецць прыгласіць, а тады другі падходзіць – ты ўжо занята.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1942 г.н.***
***у в. Соржыца Бешанковіцкага р-на***

***

[*А Каляды былі? Вы хадзілі калядаваць на Раждзество?*] Каляды хадзілі ўжо пасля вайны. Ну я маленькая была, мама мяне не пускала. А после вайны хадзілі пелі песні, касцельные такіе песні. [*А вы тожэ хадзілі в гэтым калядным гурце?*] Хадзіла. [*А кто там ешчо был в гэтым калядным гурце? Каза?*] Взрослые хадзілі, я толькі запомніла, што все пелі, што пад акно прыходзяць з гармошкай і всё, штоб што-та вынеслі, ну хоць паў сыра, няхай так будзе – усе заспяваюць. Адзін што-та каб далі запеваець, а ўся група астальная – няхай так будзець! Інцерэсна, всё раўно, взрослыя хацелі, танцы самі ўстраівалі. [*А раскажыце, какіе раньшэ танцы былі?*] А і я хадзіла, сядзела да ўтра на танцах. [*А с какова возраста вы пашлі на танцы?*] А я пашла ўжэ взрослая, ужэ в школу хадзіла, у старшыя класы. Эта маленькая хадзіла сматрэла ў первыя-втарыя і трэція класы. [*А как танцы назывались?*] Танцы: полькі, вальсы, кракавяк. После танцаў, када ўсе ўстануць, тады начынаець каманда адна і втарая дзевушэк. І вот, адны паюць сваі прыпеўкі, тады втарая група сваі прыпеўкі пяець. Ну і так да ўтра да самага.

***Запісан ў 2021 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у аг. Друя Браслаўскага р-на***

## Радзінная абраднасць

[*А вот, можа, раскажыце, вот як хрэсьбіны рабілі раней?*] Ай, не рабілі пасля вайны хрэсьбіны, не крысцілі яны. После вайны прыязжаў бацюшка і на дварэ, вот, чыя дзеці не крышчоныя, сабіраў кучай і ўсіх разам крэсціў. [*Дык, а можа баба вот на хрэсьбінах была, якую каталі патом па вёскі, не казалі?*] Гэта ўжо, калі дзелаюць хрэсьбіны, тады ўжо на баране бабу каталі і дзеда. [*А вот былі раней такія бабушкі, што і роды раней прымалі?*] Былі. После вайны ўсе ж ражалі дома. Іх звалі бабы-павітухі. [*Ну гэта ўжо такія пажылыя?*] Да.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1939 г.н.***
***у в. Бачэйкава Бешанковіцкага р-на***

***

[*Раней гаварылі, што як раней, як дзеці раджаюцца, ну ў бальніцу ж не вазілі?*] Не. Ну наш возрас ужо у бальніце ражаў. [*Ну а да гэтага ж не вазілі?*] Не. Ну матка мая, к прымеру, дома. [*А хто прынімаў тады дзяцей?*] Ну была бабка такая, і звалася яна “бабка”. Пачці па ўсей дзярэўне іх хадзіла, та рэдка што. А так, гэта такая бабка. У вас у бабы Жэнькі, яна Міроніха была, яна пачці ўсіх іх прынемала. [*А вот, гавораць, што які родзіцца і неяк па другому пераймаюць, нада умець гэта ўсё?*] Ну, гэтага я не магу табе зказаць. Ну быў спецыяльны чалавек. [*А вот, гаворацъ, як дзяцей купаюць першы раз то нешта нада ў ваду кідаць?*] Першы раз, як купаюць, то не нада ліць сразу гарачую ваду, а нада халодную ліць. А тады ўжо даліваць гарачай. Первый раз, рабёнка… І нельзя грэць ваду на агні. Гэта даўней, ў печ вытапяць і вугалле патухнець – тады ўсунуць гаршок, каб нагрэўся. [*А нічога ў ваду не кідалі?*] Ну, прамерна, я сама хадзіла купаць. Ну, еслі дзевачка, то я клала кальцо, а еслі мальчак – гвоздзік. [*А для чаго, кальцо і гвоздзік?*] Дзевачка, каб была кругленькая такая, спрытненькая. А малец должэн быць, як гвоздзік, крэпенькі. [*Па гэтаму?*] Ага, па гэтаму толькі. [*А гаворацъ, што і пастрыгаць нельзя да года дзяцей?*] Ну, не стрыглі. [*А чаму не стрыглі?*] Гэтае я табе не аб’ясню, но не стрыглі дзяцей да года. І па галаве, барані бог, каб не ударыўся! А то можа быць і нямы. Вот цемяшок тут маленькі, ён ж дыхаець. Вот барані бог, дажэ крэпка націскаць, як мы купаеш – нельзя. А то можа быць нямы. А ці праўда ці не…

[*Іх жа тады хрысцілі дзяцей?*] А как жа, абязацельна. Хрысціць усё роўна, хоць как. Я абодвух сваіх хрысціла. І мы храшчоныя. [*А калі нада, калі малых хрысціць?*] Я табе скажу – калі маленькі, ён дужа яшчэ не саабражаіць і не так пужаецца. А цяпер яны, як родзяцца, зразу ўсё, гатовы ў космас

ляцець, яны нікога не баяцца і нечога. [*І тады імя даюць?*] Імя, як захочаш, і даўней называлі самі. Ну, як яно цяпер у календарах пішуць: імя можаш выбіраць там, у якім месяцы якія імёны. [*А гаворацъ, кумы ёсць, а хто гэта такія?*] Хросныя бацька і матка. А ў вашым баку што, нет? [*Не ёсць, але іх так і называюць – хросныя.*] Хросныя і ў нас, кто кажа "кума і кум". А так хросныя. [*А каго бяруць ў кумы?*] Я табе так скажу, для мужчыны ці мальца гэта мусіць разніцы нет. А як дзяўчына маладая… Гэта мне самой было. Была старая. Старая, старуха, саседка наша. После вайны прыехаў яе сын, ён афіцэр быў, і ўжо было ў іх ці двое дзяцей. Вот, яны задумалі хрысціць, а тады тут ўжо ражджаліся. І гэта бабушка так хацела, каб я мальчыкаў пахрысціла первых, каб у мяне быў ўжо мой хрэснік. Каб быў первы мальчык, тады вот, казалі, работа спорыцца і вабшчэ добра. А дрэнны быў кум стары, ўзялі старога кума некрасівага. Узяла ды ўцякла. Тады ўсё раўно ждала тая бабушка. Радзіўся яшчэ малец, мяне ўсё раўно ўзялі, а дзяўчыну ўжо не хадзіла.

***Запісана ў 2005 г. ад жанчыны 1933 г.н.***
***у в. Старое Лядна Лепельскага р-на***

***

[*А як павітушкі хадзілі? Што ім давалі, як запрашалі?*] Ну, як яна прыйдзець, дык усе добра. Жанчыны, якая пры родах паможыць набыць гэтага дзіця, пакупаець яго, пупок адрэжа, зашывае, дзе вылезе наружу, у зямельку, каля дома закапаюць. Толькі па той сцежцы, каб не хадзіць. Там на абочыне, каля дома. Ну тады ей плацілі. А якая плата была… Можа, якое палаценце давалі, саматкальныя, красівыя, са льна. [*Гэта ж не любая магла жанчына рабіць?*] Не любая. Некаторыя панімалі гэта дзелаць. [*А маладыя не маглі?*] Маладыя, маладыя старухі. У мяне тожа была старуха, якая трое радзіла. І мне памагала. І пасля раждзенія прыхадзіла і памагала, і праз год тожа. [*А на чым пераразалі пупавіну ці?*] Неяк-та адшчыпівалі. [*А чым?*] Пальцамі адшчыплівалі. Пальцамі, нічога не нажнічкамі, пальцы нейкія нада. Яны жа тожа жанатыя былі. [*А ражалі дзе дзіцёнка?*] У сваёй койкі. У гэткія роды былі. І бывала тое ж, зямлі ў людзе многа было. Там па кусочку, там па кусочку. Паля былі бальшыя, ходзіць, пажнець сколькі снапоў есць, прынясе дамоў і родзіць на полі. [*А як дзяцей гэтых, што на полі нарадзіліся, як называлі?*] Ну неяк не называлі, ну назавуць, як хочаць. Сёння, як там назавуць, Валодзя, там, Коля. Павязуць хрысціць, тады і дадуць імя. У мяне і знаеныш есць. І крэпкія жанчыны. А цяпер нада яе ж на сахранасць лажыць. Елі гэтую бульбу, здаравейшыя былі. Кажацца, яны харашо пітаюцца… [*А, можа, помніці, як павітуха першы раз купала малога? Можа, што ў ваду сыпалі?*] Ну ў мяне яна не купала. А тады прыйшлы ка мне родная

сястра, і яна ўжо яго купала, і пеленала, я нічога не ўмела, я нічога не панімала пагэтаму. Гэта ўсё нада пры старых людзях. [*А да якога часу яшчэ хадзілі гэтыя старушкі?*] Да якога… Ну, як сталі бальніцы, тады ўжо рэдка. Што сталі бальніцы: у роўдом вазіць. Што так далёка вязці і не на чым… А цяпер, як машына ў кожнага маладога, а даўней жа не было. Як ужо нада радзіць, дык вязуць і машына… І тады ўжо скораю на дом вызавуць, і яна не ўспевае нікуды даехаць.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1920 г.н.***
***у в. Шо Глыбоцкага р-на***

***

[*А хрэзьбіны дзелалі?*] Да вайны хрэзьбіны дзелалі, а пасля ўжо ўсё. Я да вайны было адзінаццаць гадоў, калі яна началась. У Бачэйкаве разграмілі царкву, а мяне ўспелі ў Свячэ. Я радзілася, а на трэцці дзень і павязлі мяне крысць, таму што зналі, што не паспеюць мяне крысціць. [*А ці былі бабкі павітухі?*] Былі, прысутсвавалі. Бабка, каторая старэйшая, бальніц не было – вайна, разграмілі ўсё. Пака вастанавілі… [*А раднёй шчыталі?*] Ну канешне! Бабушку раднёй ужо шчыталі, рос рабёнак і гаварылі яму, што ета бабушка твая. [*А хрэзьбіны дзелалі з кумамі?*] Дзелаў. Вот сабіраюцца кумы, вот наняў бабушку, яна будзе кумой над маім рабёнкам, будзе насіць, дзяржаць у церкву.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1930 г.н.***
***і мужчыны 1935 г.н. у в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на***

***

[*Ну вось, а як хрысцілі дзяцей?*] Дзяцей мы хрысцілі на даму. Я ездзіў за гэтымі самымі… У нас цэрквы не было. Тут маленькая і счас цэркаў стала абразавалась. Ездзіў за папом (у мяне ўжо машына была), ездзіў – папа прывазіў на дом, і ён хрысціў дзяцей усіх на даму. [*А вось вас як хрысцілі, не распавядалі бацькі?*] Как? [*Ну вось калі вас хрысцілі ў дзяцінстве, бацькі не распавядалі вам? Ну можа казалі, як гэта было?*] Ну мяне хрысцілі малым. [*Ну, а не казалі яны пасля ўжо?*] А што сказалі? [*Ну можа распавядалі, як гэта адбывалася, ну, які абрад быў?*] Не, не гаварылі нічога. [*А вось хрэсьбіны атмечаліся, былі?*] Да, ужэ вот мы хрэсцілі, і тут жэ, ну, кум, кума дажэ эта… Я на папа гавару: “Можа са мной вып’еш?”, ён гаварыт: “Знаеш, нам жа не паложана выпіваць”. Ну, усё раўно я яму літр гарэлкі, каўбасы палажыў, после хрышчэння мае кума, кум значыць, усе мы садзілісь, выйпівалі,

песні пелі, вот так во. [*А вот скажыце, раней жа не была бальніц, былі ж нейкія бабкі-павітухі, да? Якія прымалі роды. Ці былі яны ў вас у вёске?*] Ну вы знаеце, як мае дзеці раждаліcь, ужо бальніца была, бальніца вот Бачэйкаўская. Бальніца была, вот. Я работаў на кірпічным заводзе, – тут кірпічны завод быў, – дык яна сама! Сама пяшком туды: плоха ей стала, яна не пазваніла, нічога. Тада ж і целефонаў не было дома, гэта самае… Я прыехаў, гаворыць матка мая, гаворыць: “Надзя пайшла”. Я гавару: “Як пайшла, чаму вы яе адну адпусцілі? А ўдруг што-нібудь на дароге?” Ну, дык вот такая… Такое… У нас у бальніцы ўсе, вот, майго возраста. Усе ў бальніцы ражалі. У нас харошая такая была акушэрка, і харошы ўрач быў, дажэ мой друг, ён ужо памёр, вот. [*А вось калі на хрэсьбінах, не было ніякай бабкінай кашы, якую куму нада было выпукаць, за грошы вось? Кум нейкую кашу павінен выкупаць?*] Не, у нас гэтага не было. Я ж гавару, вы знаеце што, вот там дзето ў Брэсце, там яно і сейчас. Вот такое. Мы былі камуністы. Гэта Віцебская обласць, яна, знаеце, к Расіі тут блізенька. Ну, не то, што ўсе камуністы. Я, напрымер, у парцію мяне настока звалі. Я работаў экскаватаршчыкам, дажэ орден прыйшоў мне, значыць, на маё імя. А я не быў эта членам парціі, і орден мой аддалі другому. Вот так…

***Запісана ў 2013 г. ад мужчыны 1931 г.н.***
***у в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на***

***

[*А ці былі раней бабкі-павітухі, ці памятаеце вы?*] А што-та гэта мне не ў памяці… [*Якія роды прымалі?*] Ну, вот роды прымалі. Мая мама не хадзіла, мая бабушка хадзіла. Раньшэ ж не была гэтага! Ну, бабушка, звалі яе – хадзіла, яна роды прымала. Ну, а тады хадзіла, купала рабёнка, тады ўжо дзелалі стол, – які там стол, – бабу гэту звалі, песні пеялі вот: “Шышы-мышы шалелі, бабцы фартух паелі, ідзі, дзедзька, ў лапушок, залабацай гвартушок”. Гэта бабуля мая яшчэ во гэту, дык яна такая маленькая. Дзе я ўжо гэта помню?.. [*А вось гэта бабка-павітуха вось яна на хрэсьбіны ці прыносіла якую кашу ці бліны?*] Ну, я вам гэтага не магу сказаць. Ну, канешна, баба шла не з голымі рукамі. Баба несла палаценца, ну, там, ужо якія пялёнкі нясла гэтыя, дзяцёнку яна нясла. Ну і што было, то яна пякла… Што-та я ня помню, ну што-та пякла баба, як шла. [*А вось, а калі купалі дзяцёнка, яго можа там якія травы клалі ў вадзічку эту?*] Я гэтага ня помню, я і сама купала, і сама ніякія, ні травы, нічога я не кідала. [*А серэбраныя манеты?*] А у мяне іх не была. [*А рэчы ніякія таксама не клалі, да?*] Не-а, не-а... [*А вось дзяцёнка, яго ў пялёначках купалі, да?*] Да, надзевалі шапачку раньшэ, такія маленькія былі

шапачкі, і ў пялёначкі. [*А вось, ну, на хрэсьбіны кум, кума таксама назначаліся, да?*] Абязацельна. [*А хто гэта былі? Нехта з родзічаў?*] Ну, вот я крэсціла ўнучку адну і другую, родны брат быў за “татуся”, а ўжо мужыка майго дваюрадная сястра была “матуся”, былі родзічы. Ну, тут во ўнука красціла гэтага, ну ён нам не родзічы, а проста дружылі. Ну вот і “матуся”, ну ён “татуся”… Здзелаў абышто: ён задавіўся, малады задавіўся… [*А вось не казалі, што калі ў сям’е шмат дзяцей было, якія памiралі, то маглі браць проста выпадкова куму, кума, з уліцы каго-небудзь?*] Не-а, у нас эта, слава Богу, такога не была. А тады ўжо сталі вазрастаць, ну дык вайна была. Там коклік, тое-сёе… І так умiралі: ні врачоў дужа, нічога не была… [*А вось, як дзяцёнка ў царкву як бы вязуць красціць, ці былі нейкія прыкметы, вось як ён там сябе паводзіў?*] Ну, як ён паводзіў… Было, я красціла малых. [*Ці спалі, ці плакалі?*] Ну, плакаў Андруша, у тое ж врэмя красціць не разрашалі, нада з сельсавета была спраўка, спраўкі не давалі. Ну дык вот, я чужога, друга ягонага, брала за татуся, а старую брала за матусю, што связі таго, што ў сына быў паспарт, ну дык гэты паспарт – гэта ўжо мая кросная давала, ну ўжо татусю, каб разрашылі красціць. У Чашнікі вазілі, красцілі ў Чашніках, ну а дачку я красціла тут, у Бешанковічах, дык я не магу дажа толкам сказаць.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Свяча Бешанковіцкага р-на***

***

[*А вот скажыце детей раньше вець крісцілі?*] Крісцілі, а как же крісцілі. [*А вот раскажіце как эта проісхадiла?*] Ну, эта бывала абычна ў цэркву вазілі крісціць, дольша больше. Тут жа запрашчона было. Сталін паўністажаў гэтых папоў, уністажаў. Не то, что цяпер, эта самае, судзяць, дзелаюць, а запіску хто-небуць напісаў, што ён поп, ён моліцца, прыехалі, забралі і ўсё. І ўсё. І па сягодняшній дзень нет, неізвесна дзе яны. Дзе яны памёрлі, ці ў Сібіры, ці за Сібіры.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1927 г.н.***
***у в. Пільна Бешанковіцкага р-на***

***

[*А у савецкае время нельзя было ж і венчацца, запрешчалі наверна?*] Ну, можна было, хто хадзіў у касцёл. [*А дзяцей ці красціць было можна, не ругаліся?*] Ну, еслі я вот як учітельніцай – нельзя было учітелям. Ну, хто-та эта

мне запрешчалі, ругаліся, ну а там і свабодныя былі. [*А дзе крэсцілі? У Браславе дзе?*] Я дзяцей сваіх у Педруі крэсціла. [*У Педруі. А чаго там, адкрыта было?*] Да, у Друе ж не было касцёла, а тут Педруя. Паром хадзіў цераз Двіну.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1946 г.н. (нарадзілася ў в. Інава Браслаўскага р-на)***

## Вяселле

[*А вот ці расказвалі, што нейкія такія ў савецкае время былі такія камсамольскія свадьбы. Не чулі пра такія?*] Ай, не, не... У нас тады ў дзярэўні. Не, у дзярэўні – не, гэта не камсамольскія, не. Не было. Тады ж яно проста. Я не знаю, цяпер яны к богу вяруліся, а раней к Пасхе яічкі красіць, прынясці ў школу, ну, як мала яшчэ, дык, господзі мае! Яны ж дажа перад класам паставяць тады, еслі ўвідзяць у цябе. Ну, аправергалі. Ага. А цяпер жа ж яны ваабшчэ адны гэтыя рэлігіозныя празднікі, каб і не знаў, дык яны гэта.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1938 г.н., мужчыны 1937 г.н. у Бешанковіцкім р-не***

***

[*А як раней свадзьбы страўлялі? Не так, як цяпер, пэўна?*] Ну як даўней, мая ты дзетка, як даўней машын не было – на конях ездзілі. Я сама яшчэ ж, после ўжо ж вайны мы, после вайны мы тут, у дзярэўні, і замуж я вышла. У дзярэўні радзілася і малец у мяне быў, і з мальцам ездзілі. Паехалі зімой на эта, – не было ж гэтай машын, – толькі на конях. Ай, Божанька! А снег! Абварачвалі, і паедзем у цэркву, – вянчаліся там. Бацюшка вянчаіць нас. Запальваіць тутака свечкі… І тут ён нас вянчаў, у Псуі. Тады, ці то пры Хрушчову, ці пры Сталіну, цэрквы ж разраблялі, дзетка. Вы чулі? Цэркву ж тую разробілі, але мой стары после хадзіў сабіраў грошы, і яшчэ строілі другую. Во як робілі. Цэрквы растрасалі ўсё, ня верылі. У мяне ў маіх дзяцей унукі, дак мы ж хацелі іх перахрысціць, як унук паехаў, хадзіў у школу. А тайцам стаў. Тады ў яго спрашывалі дзе ты быў? Ён кажа "ў музеі", а ён – мы ў цэркву вазілі яго, перахрысцілі. І яны кажуць, што, а дзе ты быў? Еслі яшчэ ў парцію ж прымалі. Мой сын у парцію прымалі. Уперад у камсамол, гэткі малады, як вы. У камсамолы прымаў. Усіх, хто ў камсамолы, а тады камсамолы ўжо ўсё. Ён ужо вырас, ужо перарос. А тады ў парцію стаў прымаць.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1929 г.н. у в. Хралы Глыбоцкага р-на***

***

[*Так вот, можа, раскажыце: на свадзьбах жа раней на машынах к жа не ездзілі, наверна?*] На конях. [*А што вот на конях? Вот, гаворацъ, неяк у сваты раней хадзілі?*] Хадзілі, і цяпер ходзюць. [*А ці прыходзілі да Вас сваты?*] Прыходзілі. [*А ўспомніце, як гэта было?*] Ай, даўно было, ужо ня помню. 60 гадоў было, дажа боле шэйсят гадоў назад… [*А ў колькі Вы выхадзілі замуж?*] У 21 год. А цяпер мне ўжо 84. [*Ці многа прыйшло да Вас сватоў?*] Ай, дак гэта ж после вайны скора! Тут некаму было. Нямнога. [*А што там за кампанія была? Дзядзька, можа, ці бацька, ці брат старэйшы? Хто ў сваты тут хадзіў?*] Ну, ідуць тут бацька, ну і матка дажа можыць ісці. [*А каравай вот на вяселле ці пяклі?*] Пяклі. [*А можа ўкрашалі яго як?*] Ну, канешне ж, украшалі. [*А для чаго каравай? Гэта проста да столу, ці што там?*] Ну тады гасцям дзелюць гэтат каравай. Гэта нявестка дзелаіць. [*А яго вось, калі свадзьба была, хавалі каравай куды, можа, у кладоўку?*] Ну, як хто можа. [*А вот на дзяжу ці садзілі маладую?*] Ай, эта даўно дужа садзілі, цяпер ужо не. [*А калі дзеўка, гаворуць, ня чэсная, песні маглі такія пеяць?*] Тады пяюць. [*А вот гэта свадзьба адзін дзень раней была ці болей?*] Ай, як у каго пазваляецъ. Можыць не адзін дзень. Так 2 абязацельна субота і нядзеля. [*А вот ці вянчаліся пасля вайны?*] Пасля вайны блізка тут не было цэрквы, дык не.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1927 г.н.***
***у в. Кублічы Ушацкага р-на***

***

[*А вот скажыце, вот, як вы жаніліся? Вот раней жа свадзьбы ж не так?*] Да, ну свадзьбы ж не так былі. У маё врэмя былі камсамольскія свадзьбы. [*А вот раскажыце, што за?*] Ну ў нас лічна не была камсамольскай, но гулялі мы камсамольскіе свадзьбы. Ну і, ну і как… Ну, абычна сабіралісь все камсамольцы, вот чалавек 50 было, мы сабіраліся, но эта называлася “камсамольская свадзьба”. Рэгістрыравалісь, так, как і цепер рэгестрыравалісь. Гулялі тры дня, так, как і цяпер гулялі. Ну от там была вся маладзёж. Там радзіцелі – гэта аддзельна ўсё было, а гэта маладзёж была – очэнь весела! Дажэ была ў нас адна свадзьба, што проста выехалі так, ціпа лясок. Выбралі такое места, пакрылі, вот, ну вот… Эта ж бедные свадзьбы былі…

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1937 г.н.***
***у г. Дзісна Мёрскага р-на***

***

[*Як у старыну жынілісь, як у сваты хадзілі?*] Ну, прыязджаюць сваты, сватаюць. Ня пойдзеш – адказ дасі. [*А хто ў сваты ездзіў?*] Жаніх і свата беруць, чалавека з адной дзярэўні ў сваты. Панравіцца дзевушка, не панравіцца, – а яна адказваець. І яны ўязджаюць… [*А калі не адказала?*] Прадаўжаюць і свадзьбу дзелаюць. [*Можа вечарынку дзелалі?*] У суботу ўсегда “заручаны” называліся, а патом на заўтра ўся радня на свадзьбу. [*А што на заручаны?*] Маладзёш сабіраецца, ды гармошка іграе. [*А былі аддзельна дзівішнік і мальчішнік?*] Не, маладзёш збіраецца разам, дзевачкі з адной дзярэўні, з другой, з трэццяй, і ў акружнасць, каторая блізка дзярэўні, прыходзяць на заручаны. І на свадзьбу хадзілі: жаніх прыязджаіць папераду к нявесце, стол адседзіць, тады забіраець нявесту сябе. [*А прымакі былі, і як даіх адносіліся?*] Былі, ну еслі харошы прымак, дык харошае гавораць, а еслі плахі – плахое… [*А ў царкве венчаліся?*] Венчаліся, пасля вайны вянчаліся, а да вайны запрешчено было, іконы паскідалі… [*А застолье на свадзьбу, што дзелалі?*] Хто багаты, той багатае справіць, а хто бедны… [*А як раней у сваты хадзілі?*] Я і сам хадзіў, сабіраўся жаніцца, са мной ехаў старшы сват і брат старшы. Прыехалі к нявесце. Яна дома сейчас плацце пагладзіць, а маць яе – стоў. Падгатовелі самагонкі, стаяла каля стала. Ну, селі сватацца і сталі разгаварваць: “Мы прыехалі ў сваты з нявестай. Так і так”. Хвалілі адзін аднаго: харошая, рабочая, здаровая… Ну, і нявеста сагласна замуж ісці. А патом паехалі дамоў: нявеста дома і я дамоў паехаў. Сабіраешся к свадзьбе дзелаць. Пажаніліся, ну і жану – хоп-хоп…

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1930 г.н. і мужчыны 1935 г.н. у в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на***

***

[*Як раней у сваты хадзілі? Ці памятаеце? Ці хадзілі ў сваты?*] Ну, хадзілі сваты. А тады, у суботу, ўжо заручыны гулялі. А тады свадзьба ўжо. [*А заручыны ўсе разам спраўлялі? Там дзяўчыны і хлопчыкі?*] Ну, ну… [*А можа песні якія помніце? На заручынах ці гулялі, пеялі?*] Ну гулялі мужыкі, ну. [*А сама свадзьба, ці былі нейкія там у цэркві вянчанне ці як застолле праходзіла?*] Ну хто вянчаліся, а хто не вянчаліся. Усяк… [*А вось застолле, што абавязкова павінна быць на стале? Можа, самагонку гналі? Ці была самагонка?*] Ну, раньше ж после вайны самагонка была, грошаў у людзей не было, у калхозе робілі дарма, не плацілі нічога. Дажэ на сваіх каровах у калхозе аралі зямлю. І бесплатна, не плацілі.

***Запісана ў 2013 г. ад мужчыны 1934 г.н. у в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на***

***

[*А вось скажыце, можа памятаеце, як раней жаніліся ў старыну вось, да вайны яшчэ?*] Да вайны, вы знаеце, да вайны мы жылі бедна, но дружна. Мне ўжо дзесяць гадоў было, як вайна началася, я помню ўсю вайну. Помню ўсё зверства гэта фашысцкае, вот. Жылі, работалі ў калхозе, палучалі мае бацькі саўсем плоха. Давалі на трудадзень эта па пяццот па трыста грам этага жыта. Толькі там не жыта, а касце такі, знаеце? Ну, але настока людзі былі дружны, настока верылі ў Леніна! Я не знаю. Вы знаеце, вот пахалі канямі. Упашуць – гэта ўпашкі, якія там сабіраюцца ўся дзярэўня і гуляюць. Эта упашкі. Патом эта самае жніўё. Эта ужэ, значыць, уборка кончылась. Тожа гулялі. Ну, былі дружныя. Былі уважалі друг друга, знаеце? Вот счас трошку эта… Вот, как мне старыку дажэ во эта кіно во гэта… Хоць наш Лукашэнка – мы чынім яго! Ну, вот пачэму НТВ во эта перадача? Там жа адзін разбой! Там жа жэншчыну б’ець! Ну там кіно ж пастаўлена, – Сталін вінават, Сталін всё здзелаў. Депрэсію эту самую. Сталін – эта звер быў капітальны. Ну, мы ўсё раўно, мы верылі яму! І вайну, вы знаеце, ён вайну – бальшое дзела, – ён і людзей пагубіў многа, капітальна людзей пагубіў з-за таго, што прыказ даст, – яго ўсе баялісь. Гэта діктатар быў. Дык вот, да вайны жылі вот так.

Значыць звадьбы былі дзеравенскія, якія свадьбы былі? Я вам раскажу свадьбы якія былі. Сначала дажэ ездзілі ў сваты. Вот харошая дзеўка там, у дзярэўні, трудалюбівая. Ну, малец, еслі нармальны, ага, дажэ і не знакоміўшы, – вот так едуць у сваты. І пасватае, эта самае. Еслі невеста сагласна, значыць, завадзілась свадзьба. Ну, тожа после вайны распісвалі. Ну і да вайны распісваліcь. Вот. Ну, свадзьбы былі, какіе свадзьбы былі? Вот, значыць, жаніх з сваёй раднёй, вот сёння свадзьба. Вот жаніх з сваёй раднёй сначала свадзьбы, маладая – з сваёй радні, сначала садзяцца за сталы. Вот. Выпілі, закусілі, ну п’яных нет. Понімаеце, п’яных нет. Эта раньшэ. Цяпер, дык можыць, дык там вінтом пайці, і счас глядзеце – сколька там гора эта гарэлка, вот, надзелала! Маладзёж спілась... Тагда ж такога не было! І вот тут мы пасядзелі. Ну, як мая свадзьба, – за дзвенадцаць кілометраў. Эта Свеча – там мая, еслі вунь адтудава, а я – адседава. Едзем ужо навеселе, трошку выпілі, едзем туда. Прыязджаем, сваей раднёй прыезджаем. Вот. Тут нявесту выкупляюць. Ну, сначала подводзюць старую жэншчыну: “чы эта твая нявеста?” Штукі тры вот так мяняюць, – ну, эта юмар такой быў, знаеце? Ну, патом ужэ надаест – невесту паказваюць чэраз парог. Малады выкупляець. Вот ейнай радні, там, сёстры эты самыя ілі малыя такія. Ну, чым выкупалі? Дзеньгамі. Ну, падарак які даёш там ілі, ну, сначала з цябе выцягнуць усе грошы, якія ў кармане ёсць. Ай, цяг… А маладзёж, эта самае… Ну, берыш па дастатку ж, эта самае. Вот, выкупілі. Усё. Садзяцца там вот, радня мая ужэ, а та

радня ходзіць па уліцэ. Яны нас угасчаюць. Усё. Патом, пасля, сваю радню садзяць. Садзяць… Ну, і начуеш… А на утра ўжо вязеш маладую сюды. Вот такія свадзьбы былі.

[*А каравай ці быў?*] Былі, да. Караваі былі, і каравай быў, ну спечаны з эта, сваей эта. [*А ці былі нейкія абрады? Ну маладым, там, рукі звязвалі, можа, яшчэ што? Разбіваць што, можа, трэба было?*] Нявесту ж надзялялі. Вот, я сабраў сваю радню, і надзялялі. Чым? Дзеньгамі. Тарэлку ставілі, палаценца там, холст які лажылі, ну і ўсе надзялялі, жалалі здароўя, шчасця. Вот эта ў первый яе надзялялі там. А нас надзялялі вот эта… Вот эта такое было. Ну, хто па тройке, – тада ж нішчэта была капітальная. Я жаніўся тожа ў песятыя: эта ў песятпервым, песят другім гаду. [*А сукенку дзе нявеста брала?*] А сукенку… Вы знаеце, былі ўжэ этыя самыя ў нас – дом быта. [*А, ужо набывалі, да?*] Дом быта быў. Давалі на пракат вот эта самае, сукенкі этыя, вот. Ну, мая дык сабе шыла. Там такое дліннае плацье, раньшэ ж кароткі крэпка не насілі. Ну, як нявеста – па пяты такія гэта. Ну, такая сукенка была, дзяшовенькая. Ну па цем врэменам. [*А вот скажыце, перад свадзьбай сабіраліс ь, магчыма, нейкія вечарынкі? Мальчышнікі вот, дзе там песні пеялі. Можа там, як ужо перад самай свадзьбай? Ці было такое?*] Ва врэмя свадьбы. [*А до свадзьбы, до свадьбы ці былі?*] До свадьбы – не. [*Не сабіраліс ь вечарынкі ніякія, да?*] Не. Ну, тут жа, еслі свадьба, сабіраецца, эта, усей дзярэўняй сабіраюцца. І танцы ж гарманіст іграець, маладзёж танцуець, а старыя жэншчыны, ну, лет… Як старыя, – па сорак пяць, па песят. У то ўрэмя ўжо, знаеце, яны зналі ўсе песні вот этыя нашы, песні беларускія. Ну вот сядзеў, напрымер, за сталом з сваей Яфімаўнай, а яны песні пелі старынныя. Песні пелі. Вот…

[*А як рыхтаваліся да вяселля? Можа, гатавалі што? Які стол павінен быў быць?*] Стол... Раньшэ стол быў… Мы, напрымер, як мая свадзьба была, дзе мы калбасу куплялі? Я дык не помню… У нас тут, у Беларусі, тут было сільна слабавата з гэтым. Ездзілі мы дажэ, я дачок сваіх жаніў, дык ездзілі ў Рыгу мы за калбасой. І ў Менск ездзілі. І ў Маскву. Вот, у Маскву ездзілі, у Мінск і ў гэту самую, у Рыгу.

***Запісана ў 2013 г. ад мужчыны 1931 г.н.***
***у в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на***

***

[*Ну раскажыце, як раней жаніліся, як у сваты хадзілі? Вось тут старыя людзі, можа, расказывалі вам, як гэта было ўсё?*] Ну раньшэ ж жаніліся як, – хто как. Я, во, жаніўся… Сам жыву, наверна кілометраў 10 адседа, туды дальшэ, а можа… Найшоў во тут маладзіцу сабе, жаніўся таксама. З арміі

як прыйшоў і пайшоў тут па танцах: па дзераўнях жа танцы былі разныя пачці ў кажнай хаце. Там тожа ў суботу. У васкрэсенье – эта абязацельна. Вот, эта сабіралісь… Ну, а тады маладзіцу знайшоў – астаўся. Свадзьбу здзелалі. Тут, у яе была і ў мяне была. На конях і на машыне ездзілі. На конях ездзілі. Ну, тады ж после свадзеб пеpазоўкі – эта ўжо чэраз нядзелю. К маладому ідуць, а тады ад маладога ўжо едуць к маладусе ўжо. Дык, так гэта ўжо “пеpазоўкі” эта завецца. [*Перезоўкі, да? А ў сваты ці хадзілі раней?*] Ну, дык правільна! Ну, дык сабіраесся. Я дык тожа хадзіў-жаш. Браў вось там, з саседняй дзярэўні, мужыка, ну ён свій. Ну і з ім прыйшлі сюды. Раз тут танцы былі ў іх, у гэтай хаце, ну вот і я тут. Панравіў дзяўчыну, пагуляў і з ей і астаўся з ім і гэтым мужыком. Ну, я, карочэ, пагаварылі-пагаварылі: сагласна? Сагласна. І ўсё. Вот такія і сваты былі. Ну, старэйшыя, можа, там і большае. Усяк было. [*А скажіте, а в сваты бралі кого-то із своіх ілі можно любого человека?*] А любога, гэта нікога не касаецца. Можаць і свій быць, можаць і чужы, так што, карочэ, па-дружэскі там саберуцца і пойдуць, ну. [*А на свадьбу якія павінны блюда быць? Можа, што там абавязкова? Як там што рабілі, што дзелалі там, які стол?*] Не, ну свадзьба, яна ж дзелаецца там, сабіраецца, гатовіцца там. Сколькі? Ну, якое чысло там, прымерна, зберуцца. Ну, тады ўжо ў маладога свадзьба і ў яе свадзьба. Малады ўжо сюды прыязджаець, забіраець маладуху, вязець тую дамоў сабе. Ну, і яны гэтыя ўсе свадзёбнікі ўжо едуць туды. У маладога адгуляюць і там нявеста астаецца, у яго. Ну гэта тады ўжо нанач сюды прыходзіць, к маладой ужо. Ну, я ж кажу, што тут такая, ўсё такое што… [*А каравай ці рабілі ладзілі на свадзьбу?*] Да. Я во, – дочкі тры, – дачкі аддаваў замуж, я караваі заказываў у Бачэйкаве, у ПМК. Караваі там, што хто як можа… [*А ў старыну ці, магчыма, можа, маці яшчэ расказывала, як каравай рабілі? Можа вы самі бачылі?*] Ну, яны ж яго… Мы заказывалі. Я вот заказываў у Бачэйкаве. [*А раней ці самі, можа самі?*] Ну самі там саўрасяць які… Раньшэ ж не было такога – ні мукі такой не было, каб купіць. Сваей там пшаніцы якой змерaць троху, – такі і дзелалі. Пышкі пяклі ўперад. Тожа ш свадзьбы. Каравай – а то гэта к свадзьбе. [А *ці былі там прыкметы нейкія са садзьбай, вяселлем, звязаныя? Чаго нельга было рабіць накануне там? Вось, вам як жаніху. Што, наадварот, трэба было зрабіць там, каб не зглазілі, мабыць? Такія былі прыкметы?*] Ну, хто дзе як мог. Я ніякіх прыкметаў не знаю. У мяне (дзевак аддаваў) не было ніякіх прыметаў. І гэта, і сам жаніўся – тожа. Якія там былі прыкметы?.. [*Ну, мабыць, што там нельга рабіць, напрыклад, там шпільку нейкую ў адзёжкі зняць.*] Ну эта ўжо маладуха, гэта яна там у плацце купіла сабе шпількі гэтыя, каб ужо… А мужыку гэтаму маладому там… Што там? Ну, вот такія.

***Запісана ў 2013 г. ад мужчыны 1936 г.н.***
***у в. Шыпулі Бешанковіцкага р-на***

***

Сватацца не прыхадзіў. Дагаварыўся. Свадзьба на 30 чалавек. [*А што на стол ставілі?*] Шо было. Каб што-небудзь салодкае – прадаваліся булачкі кругленькія па 6 капеек і тады купялі іх, разводзілі павідла з вадой і булачкі рэзалі на кусочкі і макалі, і на стол ставілі вместо салодкага. Астальное – мяса. Я ўжо робіла ў леспрамхозе, у мяне каўбасы былі харошыя. Сялёдкі там (салаты ніхто не рабілі), бліны…

Плацце пашылі з крэмдышына светленькае і вяночак. Новае.

Я дома стол дзелала, а ён – у сваіх. Свадьба па-аддзельнасці.

[*Як свадзьбу дзелалі?*] Спачатку зарэгістрыраваліся ў сельсавеце, а затым раз’язджаліся. Я – дома, у мяне ў суботу гуляюць, васкрэсенне гуляюць. Ён дзелае дома: яго гостці гуляюць суботу, васкрэсенне. Патом едуць на машыне ка мне са сваімі гасцямі. Мае госці гуляюць, гармошка іграе… Яго госці садзяцца за стол, пьюць, гуляюць. Вылазюць са стала, умесце з маімі гасцямі пагулялі, тады ён мяне забіраець і я сваіх гасцей забіраю і еду к яму. І ягоныя госці едуць дамоў і мае госці едуць к яму – у яго гуляем. А яго госці ў гэта врэмя танцуюць, а мае госці ў яго за сталом сядзяць – васкрасенне вечарам. Цераз васкрасенне на паразоў хадзілі – гэта сваты, сваты ж ня ездзілі нікуды. (Два васкрасення – спачатку адны сваты, затым к другім. Два паразова). Я яшчэ сына жаніла і свадзьбу атдзельна дзелала…

[*А вас выкупалі?*] Да. Я сядзела за сталом… Каждый жа па-свойму. Песні старадаўнія піялі – хто ўмеў, той і піяў. У дзярэўні было раньше, што той, хто не гуляець, і то прыходзіць глядзець.

***Запісана ў 2023 г. ад жанчыны 1937 г.н. у г. Лепель (вяселле – в. Стайск Лепельскага р-на)***

***

[*А песні пеялі там нейкія?*] Ну песні, дык песні пеялі. [*А ці памятаеце вы нейкія песні?*] Не, я не помню. Я не пеяла дужа. А так, пеялі: і жніво, – усяк. [*А як у сваты хадзілі, ці памятаеце?*] Ну, а ў сваты… Ну, прыйдуць, удвух і жаніх. [*А што бралі з сабой, што далжны былі браць?*] Нічога не бралі. Тады ўжо запоіны дзелалі, тады ўжо бралі гарэлку, тады прыхадзілі із гарэлкай, ці віно там, што-небудзь. Ну, радзіцелі прыязжалі, бацька, матка. Ну. Ну, а тады свадзьба. [*Ну, а свадзьбу как празднавалі? Ці вянчаліся раней у цэркві?*] Ай, не! Ну, мала хто вянчаўся. [*Мала хто вянчаўся…*] Ага, ну ў маё ўрэмя. Раньшэ, дык вянчаліся, але ў маё ўрэмя ўжо не вянчаліся, як я ішла замуж.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1928 г.н. у в. Багданава Бешанковіцкага р-на***

***

[*А вот, напрымер, як раньшэ ў сваты хадзілі? Як раньшэ свадзьба прахадзіла?*] Тожа ж таксама знакоміліся, а тады вялі – знакомілі з радзіцелямі. І так было, што надумаў у сваты і паехаў куды-та. Там ёсць дзяўчына. Прышоў – ага, матка, можа, і ня хоча аддаваць, а дзяўчыне ён панравіўся і так выхадзілі замуж. Ну а бальшынство ж, канешне, знакоміліся на танцах. Раньшэ танцы былі. Цяпер во, клуб гэты адзін, вот, і той закрыты, нікаго нет ужо. А раньшэ ў Свеччыне танцы, у Забор'е танцы, в Давыдкавічах танцы… І ўжо запіскі пішуць, прыглашаюць туды свячан, туды – забарцаў, і сабіралася маладзёж. Пяшком жа хадзілі, во. Во, дзе тая Свеч? Дзе тая Дукоўшчына? Гэта 8 кіламетраў адседа! А хадзіла маладзёж, гуляла… І аттуда прыходзілі сюды ў клуб. Гулялі вот. Ну, гармошкі былі, балалайкі, бубен, цымбалы былі, весела была!

[*А вось мама ваша ці расказвала, як раней у сваты хадзілі?*] У сваты як хадзілі… Ну, вот дагаварываліся. Бралі ўжо там, ці красную, тады ўжо бацька ішоў… Мамка, навернае, не хадзіла – толькі бацька. Ну, і прыходзяць ужо к дзяўчыне. Вот, так і так, прышлі вот мы к вам, – гаварылі, што ў вас дзяўчына ёсць. Ну, вот це ўжо людзі, к каму прышлі, застолле там якоенебудзь ладзюць, на стол там што-нібудзь. А што раньшэ была? Еслі яічніцу спякуць – гэта ўжо бальшое ўгашчэніе было! Ну, і бутылку паставюць. Самагонку гналі, канешне. Купляць – дзе б бралі? За што? Ну, сядзяць ужо, гаворадь, дагаварываюцца, калі свадзьбы б не была. Панравіліся, пазнакоміліся, пайшлі, распісаліся – і вот табе і свадзьба. Ну і радзіцелей там прывялі, пасадзілі, яічніцу спяклі, бутылку на стол паставілі… Яго радзіцелі, мае радзіцелі, – во во такая свадзьба. Во так і жывём ужо 56 год, жывём і радуемся, і ругаемся…

[*Ну, вы скажыце, а ці былі раней заручаны, можа, якія?*] Ну, вот я да этага і хацела вам эта сказаць. Заручаны. Ну, прыглашаюць маладзёж, пішуць запіскі. Ну, як абыкнавенная вечарынка, толькі што называлася ўжо “заручаны”. Сабіраюцца, канешне, – маладзёжы была многа – і танцуюць да утра, гуляюць, а на заўтра ўжо свадзьба. Апяць прыходзяць са ўсіх дзеравень, прыходзюць нявесту глядзець ужо – наражаная, усё… За сталом сядзяць, а мы выглядываем: хоць праз акно, хоць у хату. Зайдзеш там, у первый у прыстроек, выглянеш: нада ж маладуху паглядзець. Ну, а тады, еслі ў другой хаце, там танцы ужо, там ужо відзіш – прыйдзець жа маладая і з жаніхом. Там глядзім ужо. Інцерэсна было. Вот, вот такія былі.

[*А ці караваі рабілі?*] А хто іх раньшэ пёк? С чаго было печ тыя караваі? Свадзьба была, так еслі і напякуць пышак з мукі, пышак надзелаюць гэтых,

нарэжуць, і гэта на тарэлку. І еслі сахар яшчэ ў каго ёсць, трошку кіпяточкам там развядуць ды пальюць па іх, сладкія. Ой, што ты ужо ўгашчэнне! А стаім пад вакном малыя, а там, хто ўжо за сталом, гэту пышку ўжо табе чэраз акно. Раньшэ самадзелачная гэта такая ўкусняціна была! Што ты?! А хто там гуляець свадзьбу, выйдзець за стала. Помню, у нас Марыя такая была, выйшла, танцуець, барыню пляшыць: плацье чорнае, какое-то тонкае ў яе было, здзесь на разіначке… А там гэтых пышак натканых, ну, і падружкам раздаюць, ядзім – смачна, што ты!.. [*А ці пеялі песні на свадзьбе нейкія?*] Ай, пелі, чорт іх знаець, я іх ня помню. [*Жанчыны старыя да, пеялі?*] Пелі, і маладыя пелі, і старыя пелі. Мы ў вайну, я сама, каб мне цяпер хто сказаў, як ты гэта помніла? А мы ж пелі песні, сабіраліся ў адну хату, пелі і бажэственныя песні! Колькі іх была многа! І мы пелі малымі ж былі, па 7 гадоў, па 5 было. [*Ну вось раскажыце, якія бажэственныя песні вы пелі?*] Хоць мы бедна жылі, но мы паследні кусок дзялілі з саседзямі, хадзілі, дружылі, пелі, танцавалі… На сабе і драва таскалі, і ў щавель у той хадзілі за 10, за 5 кілометраў, картошку гнілую сабіралі па полю, каторая перазімавала, капалі ў зямле. Яна на вярху, яе б цяпер ня еў. Пясок елі! Крахмал гэты пяклі, елі… А што было дзелаць? Галодная смерць страшнее ўсяго!

[*Ці былі пасля вяселля перазолкі якія-нібудзь? Дык, а гэта як увогуле было?*] Ну, вот чэраз нядзелю ўжо пажаніліся, матушка прыглашае дочку з зяцем к сабе ўжо на госці. Ну, потым сабіраюць ужо сваіх блізкіх: кросную, кроснага, саседзей, еслі дружныя вот. Ну, там, можна сястру, брата… Ну, вот апяць такое самае гулянне, застолле, песні, танцы і ўсё. [*А вось, а ці былі якія-нібудзь прыкметы, там, на вясяллі? Каб маладыя, там, багата жылі, шчасліва, можа, сажалі там куды маладую ці іх разам?*] Сажалі. Во яшчэ хата стаіць, во гэта, у гэтай хаце жыла дзеўка. Гэта ягонага роднага бацькі брат тут жыў, у гэтым даму. І вот Ірыну замуж аддавалі. Адзевалі фату, плацце, там, у тый хаце чэраз дарогу, і пасадзілі на дзяжу, на хлебніцу. Хлебніцы былі, і апракінулі хлебніцу дном уверх, паставілі і накрылі шубаю. [*Дык а навошта гэта так рабілі?*] Гэта, каб багата ўжо жыла б, і паўшубкам накрылі, ну, аўчын такі. Ну, кагда паднялі гэту нявесту, ўвадзілі ў дом, за стол саджалі і дзяжу гэту паднялі, а там – чорная кошка пад дзяжой! Так яны і ня жылі… Вось гэта сейчас я ня помню, а ён мне, хазяін, часта расказваець: так яны і ня жылі. І ён быў харошы, красівы, высокі. Яна навучаная была, харошая дзеўка, – разашліся. Хай самі разашліся. Сын адзін у іх быў… Купілі ў Лепелі дом, – яна ў магазіне работала, была бугалцерам. І сын утапіўся…

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1932 г.н.***
***у в. Свяча Бешанковіцкага р-на***

***

[*Як раней вось вяселле спраўлялі, у сваты ці хадзілі?*] Ну ў сваты хадзілі. Я раскажу, як ка мне прыхадзілі. Прыйшлі ў сваты ў яго ў дзярэўню, я сама родам з Багданава, прыйшоў малец, цётка і матка. І гаворуць: "Тут у вас авечкі прадаюцца?" А папа гаворыць: "Ну авец я не ваджу." А мне радоўка ў поле была. А мне малец не панравіўся, а я гавару: "Ну, вы тутака авец дагаварывайцесь, а я пайшла ў поле!" Я за яго не пайшла. Ну, многа была. І з дзярэўні Багданава прыхадзілі. Ну прыйдуць. Што дагаварываюцца, а еслі я не сагласна, – ну дзе ж я пайду, еслі я яго не люблю? Ну, прынасілі гарэлку, пілі. Ну, што большэ?.. Ну было так, што дагаварылася ў Чашнікі. Малец, я яго не знала, а з гэтым ужо хадзіла. Прыехаў ён у запоенным і з гарэлкай. Прыехаў. Усё. І гэтат прыехаў. Гэты схаваўся на грудцы, а таму адказываю. А што за прычына? Ты абясціла ідці! Усё, ну не пайду – і ўсё. Ну, дык такіх было ў мяне… Ну што я магу большэ сказаць? Песні свадзебныя. Раньшэ ж пеялі іх, ну як, вот, і адпраўка была. Песні пеялі. Цяпер жа гэтага няма. [*А вот свадебную песню можа памятаеце якую?*] Ну, свадзебную песню…

Ой борам, борам, барамі,
Услана дарожка рублямі.
Хто эту дарожку пратаптаў?
Хто ж яе рублямі ўваслаў?

Уваслаў рублямі, – ну там, – сужэніка
да дзеванькі ходзючы, ей падарачкі носючы.
Первый дарочак – платочак,
Втарый дарочак – вяночак,
Трэцці дарочак – конь вараный,
Чацвёрты дарочак – сам маладый.

Во гэта свадзебная, гэта пяецца мальцу. [*А дзяўчынке можа што пяецца?*] Ну, а дзяўчынке:

Непраўдзівая каліна, непраўдзівая каліна,
Казала – цвіцеці ня буду, казала – цвіцеці ня буду.
Непраўдзівая дзеванька, непраўдзівая дзеванька,
Казала – замуж я ні пайду, казала – замуж я ні пайду.
Як пасваталі, дык пайшла, як пасваталі дык пайшла.
Белая каліна зацвіла". – Ну, трошку збілася тут.
"Белая каліна расцвіла, белыя цвяточкі пусціла, маладога"…

Забылася… А, калі я іх пяю, божа мой?! Ну і так пяецца песня… Як гэта яе начынаюць? Ай, забылася…

[*А як раней увогуле свадзьбы спраўлялі?*] Ну, як спраўлялі раньшэ? Маладуха гатовілася, цвяты іскала, ну як у сваты прыязжалі, тады і запоеннымі прыезжалі. Радзіцелі яго прыязжалі, ну, а тады ўжо к свадзьбе. Ну вот, еслі дзеўка гатовіла падаркі, абвязывалі ягоную радню, ну а тут ужо, як прывазілі, свякроў устрэчала, усім падаркі ж давала. Ну, што тут такое была?.. Тое ж врэмя – гэта ж не цяпер, у рэстаранах. У мяне во нядужа даўно ўнучка зайшла ў рэстаранах. Дык во, еслі ішлі – цвятоў дужа многа. Гэта дачка мая жывець, дык бабу дажа на свадзьбу не пазвалі. [*А вось, ці былі дзявішнікі там, мальчышнікі ці ладзіліся?*] Ну, дык ладзіліся, канешне. [*Дык, а што там? Танцы таксама, песні пелі?*] Ну, во гэта ж дзелалі заручаны: давалі перад свадзьбай. [*А як заручаны, раскажыце?*] Давала гармонья, сабіралася маладзёж. Ну, еслі былі мальцы ў дзеўкі, – драку ўстраівалі. Ды вун якую драку! [*Было, да? Памятаеце?*] Было, помню! Дажа лампу снімалі мае мальцы. Яшчэ дажэ, калі мяне ў чужой хаце цвяты надзевалі, ну вялі з чужой хаты ў сваю. Як надзевалі цвяты, садзілі – скамеечка, – запевалі песню, дык я дажа па радзіу: “Садзіся, Фенечка, нізенька”, – ай, як успамінаю, начынаю плакаць. І тады што палучылася?.. Вялі мяне тут, на парог. А сабралася маладзёжы дужа многа: первый стол адсядзелі, прыехаў малады. А мне плоха стала, сурочылі мяне і мне плоха стала. І я стала паміраць. Ну тады – хто што. Снялі цвяты з мяне, усё снялі… Дзядзіна вадой змыла. Хто гаварыў – бярэменна, хто што сачыняў ужо тады! А тады, як змылі, – цвяты надзелі. Ну, свадзьба прайшла, ўсё нармальна прайшло… А на заручанах завяліся біцца! Тады ж, ну, тады мая радня пайшлі ж – раньшэ ж свету не было, лампу вешалі, – лампу забралі, гарманіста забралі. Гэта маладзёж кучай хадзілі (17 марта ў мяне свадзьба была), кучай хадзілі, – ну, раз не сумелі па харошаму гуляць, гуляйце так. Раньшэ інцерэсная была свадзьба, ні цяперашняя.

[*Дык а вось скажыце, у маладых, можа, былі якія-нібудзь прыкметы? Што рабілі, каб яны там жылі шчасліва ці багата?*] Ну, прыкметы якія?.. Ну, вот я маладуху, ну, нявесту, устрэчала, – слала палавік, палаценца засцілала, хлеб, соль, вада. Яны ваду бралі, чэраз галаву вылівалі эту ваду. Ну, вот так во встрэчала. [*А вось, а даўней, можа, на дзяжу садзілі ці на шубу там?*] На шубу – да. Во правільна ты гаворыш! На куце, – гэта на багацце, гэта садзілі на багацце. [*Можа яшчэ што-небудзь такое была, каб вось шчасліва жылі?*] Ну, матка гаварыла, каб ужо ў вас і вялося, і каб дружна, каб бацькоў не забывалі, ну эта во такое во. Можа, хто знаў той, як эта гаворыцца, а я нічога не знала і мая мама нічога не знала, дык і нічога ў нас такога і не было. [*А вось ці пяклі караваі на вяселле?*] Каравай – да. Каравай пяклі. Цяпер жа ж купляюць, а тады пяклі караваі. Помню, мне дзядзіна прывазілі. Пякла караваі… Ну, а большэ ў мяне нічога такога не была. [*А можа, ну вось этыя караваі, можа, ён такій асаблівы быў? Можа, ну, да пэўнага моманту трымалі, можа яго ўкрашалі чэм?*] Ну ўкрашалі чэм: цвяты былі, букет цвятоў.

А караваі – ну спечаныя, як крэст на караваі, ну і нічога ў нас такога і не было. [*Ну, можа, лебедзямі нейкімі?*] Ну дзелалі, дзелалі птушачак. Садзілі. Вот утка, а калі яе маленькія вуцяткі былі, – во такое во была. А гэта ўжо столькі гадоў прайшло, што я, думаец, помню? Толькі помню што…

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1936 г.н. у в. Свяча Бешанковіцкага р-на***

***

[*Як у сваты хадзілі?*] Ну, ка мне ў сваты прыхадзілі. [*А вот хто гэта ішоў у сваты?*] Дык, цяпер жа ўжо памёрлі, адна я асталася. Мне ж ужо 86 гадоў. [*А вот хто даўжон ісці? Бацька ідзе жаніха ці каго так бралі?*] Прыехаў адзін малец ка мне. Адзін і другі прыехаў, вянчацца не хацелі. Бацька не аддаваў мяне замуж, а бацька веруючы мой быў… Сагласіўся вянчацца, палюбіў мяне, павянчаўся. Гэта ў 50 гаду.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1926 г.н. у в. Багданава Бешанковіцкага р-на***

***

[*Як даўней свадзьбы спраўлялі? Не так жа ж, пэўна, як цяпер?*] Нет, не так. Вот я табе начну здалёка. Во так во.

Сабіралася нас многа і дзед такі стары заходзіць: «Ну, что ж, дзеўкі! Да Дзімітры дзеўкі хітры, а после – хоць жопу вытры!» А Дзімітры – гэта ўвосень, перад Піліпаўкай. Гэта называюць Дзмітрыеўскія Дзяды, тада ўжо ў сваты ніхто не ездзіў. Нельзя было! Ужо пака гэта во Каляды прыйдут па праваслаунаму календару, тады ўжо можна і ў сваты, і ўсё. Можна жаніцца. Тады ўжо ждзіцце, дзеўкі, каб к вам хто в акно пастукаўся, – сваты прыедуць. Раньша ж і цяпер так: знакомяць і ўсё там. Такое, во, было.

Ну, прыехалі ў сваты. А пра гэта ўжо ўся дзярэўня знаіць, што к той дзеўке сваты прыехалі. Ці высватаюць, ці не высватаюць – Бог яго знаіць. Дапусцім, высваталі, то будзе свадзьба. Тада сабіраюцца радзіцелі. Радзіцелі маладога прыяжаюць да радзіцелей маладой. Гэта называецца – запоіны. На іх дагаварываюцца, када будзе свадзьба. У наша врэмя таржэственнай рэгістрацыі, як цяпер, не было. Ездзілі ў сельсавет. Штамп гэты паставяць і ніякіх не зналі гражданскіх бракаў.

Свадзьбы былі не так, як цяпер, у рэстаране ўсе: радзіцелі і ўсе разам. Напрымер, малец з адной дзярэўні, а дзеўка з другой дзярэўні. Мальцавы родственнікі гуляюць у яго, і ён там на куце сядзіць, а родственні маладой гуляюць у яе. Яна адна на куце сядзіць. Прыбраная яна, у вянку там. Дагаварацца,

калі сваты, гэта дружына пачотная прыедзе. Рагатку ім закідывалі. Гэта быў выкуп за дзяўчыну, што яны яе з дзярэўні вывозяць. Прыяжаюць да маладой, выкупляюць там, таргуюцца. Цёшча далжна зяцю яешню спеч. А ён даўжон ёй заплаціць. Ну, гуляюць. І маладыя выходзяць са стала і едуць з дружынай маладога да яго ў дом. А там ужо тады гуляюць разам.

Патом, называецца после свадзьбы первае васкрасенне – перазолкі. Малады едзець к родственікам нявесты. А ей нельзя ехаць. І прыглашае цясця з цёшчай. А на другое васкрасенне ўжо нада адблагадарыць зяця. Тада прыглашаюць цесць у госці зяця і прыбліжаных ягоных. Апяць гуляюць. Тады ужо ўсё. Счытаецца, – свадзьба закончылася. Вот гэта гуляюць свадзьбу.

А, яшчэ адзін мамент прапусціла. Вот, напрымер, зяць едзіць прыглашаць цясця і цёшчу ў госці. Ён вязець бутылку віна. Бутылка віна красная і далжна павязана быць красная лента. Гэта значыць, што маладая была чэсная. Еслі бяз ленты, значыць гэта ўжо не дзевачка. А цяпер такога няма.

[*А вот на кажух ці сажаюць?*] Сажаюць. Сажалі маладую. Песні піялі, сажалі, вянок ёй надзявалі на галаву. А як яе прывязуць, то фату знімалі і надзявалі платок. “Чапцы” іх називалі. [*А на дзяжу ці сажалі?*] Дык во на дзяжу і сажалі так. На дзяжу тую клалі кажух тый, а тады маладую тую садзілі, каб ужо і хлеб быў, і багатая яна была.

[*А каравай ці пяклі на свадзьбу?*] Абязацельна пяклі. А каравай пяклі ў маладой. І ў маладога пяклі каравай. Цвяты ў каравай торкалі. Ну, буханка хлеба, а красіва спечана так. Умельцы пяклі. Ну, не такі, як цяпер. Цяпер тарты гэтыя. А патом дзялілі гэты каравай і дзеньгі за яго плацілі. Караваямі абменьваліся, меняліся. А каравай кросныя вязлі. Кросная маладога вязла каравай маладой, а тады абменьваліся яны там.

[*А хто ранней на свадзьбе рукавадзіў?*] Сват быў. Ён і рукавадзіў. Ну, хто торшку смялейшы, нада так сказаць. Бальшога рукаводства там не было: той выступет, тоя скажа. А гармонік, як заіграіць, то ўсе ў пляс – і ніякі тамада не нада быў. [*А музыкантаў прыглашалі на свадзьбу?*] Да. Музыкантаў прыглашалі. Ну, тады ж у нас, у наша врэмя, мала дзе, кроме гармошкі. Гармошка была, другой музыкі не было. Гарманіста заказывалі. [*А во гаворацъ, што нявеста сірата, ці хто памёр, то на кладбішча нада заехаць.*] Гэта у нас не дзелалі. Ну, гэта як дзе. У каждай дзярэўне заведзена сваё, свае абычаі. [*А вот венчаліся ранней?*] Венчаліся, но мы ўжо после вайны, тады ж быў запрэт, не венчаліся. Тады ж савецкая ўлась была і гэта, мы не венчаліся. Бацюшкі не было дажа. А раней край, як нада была вянчацца! Вянчаліся людзі. Савецкая, да, уласць была. Усё гэта пад запрэтам было. Тада ж былі камсамольскія свадзьбы. Без гарэлкі сядзяць… Якая гэта свадзьба?!

***Запісана у 2013 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у в. Клешчыно Бешанковіцкага р-на***

***

Было дажэ свадзьбы гулялі: адзін гэты стакан ці калі два, – і ждём, пакуль да цябе очередь дойдзець. [*А вот свадзьбы раней жа не так? Раскажыце, як свадзьбы раней гулялі?*] Ну, гулялі обыкновенно. [*Ну раскажыце, як у сваты ездзілі раней?*] Ко мне, як я замуж ішла, прыйшоў ён і дзядзька мой. Не мой, ягоны. Ён з дзядзькам прыйшоў у сваты, а майго соседа пазвалі і сосед прыйшоў. Ну сядзелі, згаварываліся-згаварываліся, ну і згаварыліся: сагласна. Ну, тады я… Малады ўжо ж бутылку нясець, ну выпілі, замачылі. Ну і ўсё. А тады, цяпер эта ў ЗАГС, цяпер як свадзьба – едуць распісвацца. А мы ўдзвюх з ім, ніякіх свідзецеляў, не на чым было ехаць, ні машын. Пайшлі ў свой сельсавет, распісаліся. Во і ўсё. [*А за стол потом ці было, ці не?*] Як прыйшлі ніякага ні застолля, тады бедната было ў 55-м гаду. Бедната – нічога не было, ніякіх ні свідзецеляў. І за стол дажэ нічога, прыйшлі, распісаліся – і ўсё.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1934 г.н.***
***у в. Высокая Гара Бешанковіцкага р-на***

***

[*Ясна, можа помніце, як раней свадьбы спраўлялі?*] Як раней спраўлялі свадьбу? Бедна. [*Бедна?*] Ага, перагі свае пяклі. Жытняй мукі намалоцяць, твораг, масла, там, перагоў якіх напякуць. А цяпер гэтага не стаўляюць, ні масла, ні твораг. [*А вось у сваты раней хадзілі?*] Хадзілі, і цяпер ходзяць. І я сягодня пайду на гарэлку ў сваты. [*У сваты пойдзіце?*] Не ў сваты, а на гарэлку. [*А вот раней свадзьбы – цяпер на машынах, а раней на чым? На канях?*] На канях, як яшчэ замуж ішла. Шорхалкі прычэпліваюць, едуць. [*А можа там якія песні пеялі вот, свадзебныя?*] Свадзебныя пеялі. [*А ў якой паслядоўнасці гэта ўсё адбывалася? Колькі дзён спраўлялі свадзьбу, сколькі дней было?*] Даўней у нядзелю бальшынство свадзеб. [*Куды маладыя?*] Свадзьба з пераездамі. Ды ў нядзелю маладыя праязджаюць да маладой, пасядзяць, і вечар назаўтра, панядзелак, гэта едуць да маладога, ён вязець. Там пасядзяць за сталом. Увечары ці утрам тады раз’язджаюцца, а каторыя багацейшыя – у суботу пачынаюць. [*А вот вінчацца ездзілі ж?*] Ездзілі, і цяпер вінчаюцца некаторыя. [*А ў савецкае врэмя ці ездзілі венчацца?*] Не. Пасля вайны, мусіць, не венчаліся.

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1934 г.н.***
***у в. Тумілавічы Докшыцкага р-на***

***

[*І як святкавалі?*] Ну, па-дзеравенску ў нас. [*А як гэта па-дзеравенску*?] Вот будзіць заўтра вяселле, субота, – нада даць маладзёжы. Маладзёжы многа! Музаканта вот вечарам, вот танцуюць, а назаўтра ўжо збіраюцца госці і садзяцца, музакант абязяцельна. Малады едзіць к вянцу: едуць, заяжджаець па маладуху, як дагаворуцца, а то не за стол ні садзюць, доруць да венца, маладога. Падоруць, бываець, – такі абычай, еслі малады хочаць ужо там, – падорацць кашалёк з дзеньгамі, маладуху толька падорацць. Ну і едуць хто на сваей падводзе, малады – на сваей, маладая – на сваей. Тады ўжо павянчаюцца, тады ўжо едзіць з маладым умесце. Ну, і гуляюць у маладой. Ну, гэта – як дагаворуцца. Як даўней, дык гэта абязацельна ў нядзелю, ў панядзелак. У маладога радні пасядзіць, тады ў маладой, і гэдак сама маладой – госці ўперадзі сядзяць, а маладога после. [*А ці хадзілі ў сваты?*] Абязацельна. [*А да вас ці прыходзілі?*] А як? Прыхадзілі! [*Ну і да вас хто прышоў?*] Вот ідзець жаніх, бярэць, – вот, німа бацькі, – там, дзядзьку, бацьку, там, хроснага, ну і ідуць. [*А колькі чалавек абычна ідуць?*] Бываець два, бываець тры возьмець. Ну, як ужо парадней – раднейшага, ну а як німа, дык чужога возьмець: адзін жа ж ня йдзець. [*Нада самастаяцельны, старэйшы чалавек?*] Ну, там… А маладуха ўжо зберыць тожа каго бліжэйшых, раднейшых, ну і пасватаюцца: вып'юць, пагаворацць. [*А што гаворацць?*] Ну ўсяк, прысядзь…Ну а што там гаварыць ён будзіць? Прыдзець, там, што-небудзь такое… Шуткамі там што-небудзь… [*А як шуцілі, можа ўспомніце?*] Ну, прышлі: "Можа прадаецца ў вас што? Можа там цялуха? Яшчэ што, ці, там, цялёнак?" [*А адказвалі як?*] Усяк шуткамі адкажуць, як хто сумее. То здумаецца, ні адзін, а ўжо ж прыдзець радня, бліжэйшых пазавеш, ну і ўсё. Тады дагаварваюцца ўжо: калі на якое врэмя свадзьба.

[*А ці многа да вас сватоў прыходзіла?*] Два чалавекі, дзядзька ў яго быў. [*А так толькі адзін раз да вас прыйшлі – і ўсё?*] І ўсё. А тады ўжо дагавараваюцца: калі свадзьба жа ж ужо. Як пры Саветах, дык нада пераш распісацца, а тады ўжо гэта. А як даўней жа, дык нічога не нада: пасваталіся, ўжо ідуць у цэркву, у споведзь к бацюшку на якое там врэмя. Кажуць: будзіць вяселле. Вінчаюцца і ўсё. [*А можа ў вёсцы такое было, што многа хадзілі сватацца да дзяўчыны? Ці, можа, не падабаліся ўсё, ці бацькі хацелі багацейшых?*] Ну, гэта бываець такое, ну я ні знаю. І к маей сястрэ, яна ні хацела ісці, адказалі: з Несцераўшчыны малец. Эта ўжо после вайны. Што не прыхадзі, – не пайду. Ён усё роўна, кажаць, – я ж меншая была, – "Пайдзём на сяло, каб ня быць дома". Ну, і пайшлі. А ён усё роўна прыехаў. Зімой жа ж, мароз… Ну, і паехаў назад, і ўсё. [*А вось, калі прыехалі сваты і згадзіліся,*

*і бацькі не супраць, і дзяўчына, тады можа садзіліся адмячалі? Ці ставілі на стол што?*] Мне расказвала маці яго, што яна была адна дачка. На прымакі ж даўней гналі, – зямля нада ж было. Вот, там есць дзеўка, – у прымакі нада: “Ну, а можа мне нада ісці? Табе!” Прыедуць, зразу, як ні дагаворуцца, – не, не пайду, – і ня будуць браць, і ўсё, і паедуць. А цяпер ужо после вайны, дык болей мяне дагавараваліся. Не ў знаёмы ня йдуць. Гарэлку нясуць. [*А ці многа бралі гарэлкі?*] Тады ў сваты ўжо даўней абвязвалі. [*Бутэльку?*] Не, гэтых людзей, сватоў, рушнікамі абвязаваць нада ў маладухі, каб было чым. Вот як даўней. Цяпер купляюць, а даўней нада наткаць было, нада карункі зробіць, а то і вышыць. Вот прышло тры чалавекі, – маладога не абвязваюць, а гэтых нада абвязаць. Ездзілі вянчацца ў цэркаў, на кані едуць: нада, каб быў пояс, лейцы кароткія, нада завязаць пояс. Паясы такія самадзельныя робілі, яны мэтры два, а то і шварэй… Тут такія куртасікі да канцоў. [*Гэта замест лейцаў такія?*] Не лейцы – лейцамі, а гэта ўжо… Завязаць, закончыць нада. Гэтаму чалавеку нада кароткія лейцы, нада пояс. [*А каня, можа, украшалі чым такім?*] Украшалі: во, шорхаўкі ў каня. Во, кругом шыі во такая і званочкі, а тады там і лентачкі. [*Шорхаўкі гэта называецца?*] Шорхаўкі, і лентачкі там. І ў грыву ўплятуць тамака, к дузе прывяжуць, – пекна было! Як вот у нас спявалі! Было маладзёжы, рэчка, усё такое, свята, з музыкай, з гармошкай: пяюць, ездзюць, купаюцца… А цяпер жа ж… Даўней жа ж вядуць дзяўчыну за стол, – пяець там песенькі кароткія. Там к вянцу адпраўляюць, – тожа песенька кароткія. Тады прыедуць ужо ад вянца, – тожа песенькай устрачаюць: эта хоць і пастаронняе, а людзей жа ж назьбіраецца многа – уся дзярэўня. І бацька, значыць, з тарэлкай, дзве румачкі, – прыгласіць ужо ў хату.

[*А што яшчэ рабілі, як сваты прыязджалі. Вось, можа, бутэльку бралі, ці дзве?*] Не, бутэлькі мала. Літры тры-чатыры, а то і пяць. У іх там і цёткі, – усіх жа ж сабіраць нада ў сваты. Ну што, з двума бутылкамі прыдзеш? Даўней жа ж у нас гэдак не пілі гарэлку, як цяпер п’юць. Даўней болей бралі гарэлкі. [*А ў сваты вы вось прышлі з кім, з бацькай?*] Не было бацькі, – дзядзька. [*І гэта проста вячэра такая была?*] Ну, “сваты” называліся, “сваты”. [*І што там спявалі?*] Ну, дужа ж не співаюць. Як свадзьба, тады співаюць. [*А ў Вас ці многа было прыданага?*] Цялушка. Калхоз быў. Еслі б пры Польшчы я ішла замуж, бацька купіў зямлі яшчэ многа. Знаў, што чатыры дачкі, сын, дык нада дома што б было, і купіў яшчо дзесяцін дзесяць, ці болей, зямлі. Дык эта распрадзяліць, дык можа там по актару на дочак, астальное сыну. Ужо ты астаешся на месці. [*А ці многа ў Вас натканага, вышытага?*] У нас жы ж усё знішчана было! У нас жа нада было зжавацца, і то ж нейкая была: рубашку шылі і ўсё, – купляць жа не было. Мы ня тут жа жылі, – тры кіламетры. Хутар. [*А даўней жа ж вот дзеўка замуж ішла, якія рэчы былі,*

*што апраналі?*] А, ну плацце. Усё ж ні купляеш, – ні хватала. Прымерна вот ужо пазычаеш: у таго есць вянок, вэлін гэты… Усё нада, гэты вэлін, можа, ходзіць.

[*А калі ў Вас вяселле было?*] Зімой. Ну гэта 15 февраля. [*Як вы – ездзілі у царкву?*] А как жа?! У Докшыцы дажа. У нас у Тамілавічых царква – не было свяшчэнніка. Мяняліся яны часта. [*А камуністы ні ганялі, хто вянчаўся?*] Гэна хто парцейны. [*Парцейным нельга?*] Не. Гэтыя баяліся, і хрысціць яны запрашчалі, ціха хрысцілі, а гэтым – не…

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1930 г.н. і мужчыны 1925 г.н. у в. Рачныя Докшыцкага р-на***

***

[*А вось як раней вяселле ладзілі?*] Ну, вяселле ж… Прыйдуць і з гарэлкай, і радню збіралі. [*Ну, спачатку прыходзяць сваты да маладой. А сваты хто прыходзіць?*] Ну, браты, бацька. Сколькі ёсць братоў, ці бацьку хроснага пазавуць. У заручыны. У мяне яшчэ браты прыехаўшы былі, а сярэдні быў у прымаках, у Шалашыхі. [*Дык вось прыходзяць сваты…*] Ну прышлі сваты. Ужо ён прыехаў, паглядзеў дзеўку ж, мяне. Я сюды на танцы не хадзіла і ён к нам не хадзіў – далёка. Ну, прыйшоў… Прышлі, ён жа ўжо ўвідзеў мяне і гаварыў, што калі пойдзець, – буду браць. Ну, як прыйшлі, паглядзелі, пагаварылі, іх угасцілі, самі не елі. Гэта ж пасля вайны было, бедна. Кароў у нас не было. Цялушачку толькі гадавалі. Як прышлі ў сваты, сказала ж: “пайду”. Ён быў у аўторак. А ў суботу і з гарэлкай прышоў – заручыны. [*А колькі дзён было вяселле?*] Даўна ж вяселле... Прывёз ён мяне ў нядзелю рана. Не! У нядзелю прыехаў ка мне. І селі за стол. Ён падарыў ужо кашальком сваім, адарыў мяне кашальком сваім. Мая радня ўжо падарылі да ягонай. А тады паехалі ў цэркву вянчацца. Паехалі, бацюшка вянчаў нас, венчыкі дзяржалі над галавой. [*А вось хто дзяржаў гэтыя венчыкі?*] Браты, мальцы. Прыехалі тады к нам. І начавалі яго госці, саджалі за стол. І ўвачара сваіх саджалі. А тады на заўтра ўжо яны начавалі дзе ў каго тут у суседзяў, на футары і тут ў хатах спалі. Рана ў панядзелак садзілі іх за стол і сваіх. І на нач сюды ехалі ў панядзелак, вязлі маладуху сюда, да мужыка. У панядзелак тады мае госці былі і танцы былі ў гэтага Маркі, дзе гэта каплічка, у гэтай хаце. А маладзёжы поўная хата была. Поўна хата стаялі. Ён, мужык мой, не танцаваў. Так мы сядзелі на куце, прышоўшы на вечарыну. Прышлі ж маладыя. Як даўно казалі, нада маладым затанцаваць, каб маладзёж после жанілася, ішла замуж. Дык ён танцаваць не ўмеець. А мае радня былі маладыя жанчыны, толькі пажаніліся з мужыкамі. Дык, Валька маміна, гэта была сяструха дваюрадная,

кажыць: “Паўла, ідзі вазьмі Галю, папытайся ў Ягора, ці разрашыць ён табе танцываць, вазьмі хоць Галю, выведзі танцываць.” Ну і мяне ў вянку ён, яшчэ не знімала на танцах, плацце было атласнае, зборачкі былі такія. Я з сярэдняй братавай плацце прывёз мне – свайго не было. Купляць за што? Ні ў яго не было грошаў купляць новага, дык братавай плацце і братавай вянок даўні польскі быў: кветачкі розавенькія, зялёненькія лясточкі. Швагра мамін узяў меня танцаваць. Ну і пашла, вальс патанцавалі. Танцавалі мы з ім вальс. Маладых поўная хата набітая! Мяне ніхто не знаў тутака. А тут у хату, як прывязлі, на парог з іконай, дык бабы маладзейшыя, дзеўкі былі старэйшыя за мяне і ён быў старэйшы за мяне на 13 гадоў, дык тут, як увайшла, – з іконай. [*А на вяселле ці давалі прымяраць фату сяброўкам?*] Прымяралі ж хто-небудзь, як надзіваецца маладуха, дык можа тады. І радня была, і падруга мая была.

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1927 г.н.***
***у в. Несцераўшчына Докшыцкага р-на***

***

[*А вот скажыце, ці быў такі паненскі вечар?*] Быў. [*А што гэта, калі ён быў?*] У суботу вечарам. Начыналася свадзьба з суботы. Помню я сама тут гуляла ў гэтай дзярэўні. Работала шчытаводам. Дзяўчынка выхадзіла замуж, прыгласіла на свадзьбу. І вот паненскі вечар сабраўся: дзяўчат пазвала, сядзелі, піялі дзяўчаткі, ну якія песні – я ўжо забылася. А назаўтра ехаць свадзьбе. Ну, праўда, ім каня прыслалі, павозку, пасадзілі маладых, а гэтыя ж старыя, каторыя гулялі, ну во ў гэтым канцы была свадзьба і ў гэтым, адгэтуль туды пераізжалі. Вясёлыя тут очэнь людзі былі. Старуха ўзяла качаргу, шархуны пачапіла, барабаніць і пабегла. А тут хлопец быў назад прышоўшы з арміі, кажыць – А ты што?, – узяў, прыцягнуў санкі, мяне на санкі пасадзіў і пацягнуў мяне. Людзі смяюцца і песні пяюць. Там ужо сабраліся, госці селі за стол, началі ўжо есці, піць, піяць, – ну вясёлая была вёска! Піялі тут очынь красіва даўнейшыя песні. Но я з німі не абшчалася.

[*А вот скажыце, а вот як ужо пажаніліся, павінчаліся ў цэркві, патом куды едуць? Да маладой ці маладога?*] Да маладой зразу. Абгуляюць, а тады назаўтра едуць к маладому, там гуляюць. [*А ў маладой, устрычаюць жа радзіцелі?*] Устрычаюць. [*А як устрычаюць?*] Хлебам-соллю, у хаце іх перай-маюць, яны прыходзяць у хату. [*А вот на кажух устрычаюць іх?*] Да, на кажуху абычна. На касматым. Даўней жа такіх поўна было. [*А для чаго гэты кажух, не казалі?*] Каб багата жылі. [*А вот не гаварылі, вот патом, вот*

*пагуляюць у маладога, вот, а патом праз сем дней нада ехаць да маладых?*] Ездзілі. Маладыя ездзілі, бацькі ейныя, ягоныя ўстрычаліся. [*А вот гаворуць, эту нядзелю дзеўке нільзя да маткі ездзіць, да?*] Ну каб жа ня бегла на следующчы дзень.

***Запісана ў 2012 г. ад жанчыны 1927 г.н., жанчыны 1932 г.н. у в. Лапішкі Глыбоцкага р-на***

***

А ў сваты хадзілі, во і ка мне тожа ён. Прыйшлі ў сваты, высваталі мяне ўжо і ўсё, ну і Слава Богу. З'ездзілі ў сельсавет, зарэгестрыраваліся. Свадзьбу дзелалі, купілі быка, там у аднэй другей дзярэўні. Напапалам раздзялілі, на свадзьбу самагонкі нагналі. Гарэлкі ж не было куплёнай, толькі самагонкі нагналі. А на врэмя свадзьбы мае брацікі дваюрадныя завяліся біцца і ягонага дзядзьку роднага рэзанулі. Скока было!..

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1938 г.н., мужчыны 1934 г.н. у в. Бальшыя Галыні Бешанковіцкага р-на***

## Пахавальная абраднасць

[*А вот раньшэ ці прыглашалі ксяндза на пахароны?*] Прыглашалі. [*А вот савецкае врэмя, ні было ксяндзоў, як што рабілі?*] Ну біз ксяндза, – што зробіш? [*Прыглашалі каго маліцца?*] Ну, ксіндза прыглашалі. Так жа ж бабкі, прымерна як я, прыглашаюць пяюць. [*А вот якой парой вязуць хараніць? З раніцы?*] З абеда. Так у два часы ўжо павязуць, а тады ж ужо пахароняць. І піялі ж даўней, апускаюць і пяюць, у яму. А тады ўжо тануць закапываць і зноў запяюць. І дамоў раз'язджаюцца на жалобы. [*А вот гаварылі, што як ляжыць пакойнік у хаце, і каму як баляць зубы, дык можа пальцам як пацярэш, дык тады ня будуць?*] Казалі, алі ж вот ні знаю – дзе за што. Можа, за нагу падзіржацца нада. І хто баіцца нябожчыкаў, нада троху азяцца за нагу. І тады яшчэ бралі, калі крэпка зубы баляць, нябожчыка пальчыкам пакалупаць. [*Тады ўсё перастаніць?*] Тады пірастаніць. [*Можа, там яшчэ лячыліся? Там, гавораць, што калі крэпка балелі, тады нада на парог лажыцца, як гроб нясуць?*] Гэтага я ні знаю, ня чула.

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1936 г.н. у в. Гайдукі Пастаўскага р-на***

***

[*А вось пры саветах запрешчалі бацюшкаў, ксяндзоў, а вось як бяз іх хавалі?*] Так і хавалі. Памоляцца ілі, там, тайна прывязуць. Ілі ў дзярэўні былі старыкі такія, што пачытаюць што-нібуць, кнігу свяшчэнную, памоляцца. І мы харанілі свайго сына без бацюшкі. Заказалі, – там ён маліўся. А тут у нас музыка была. [*А вось ці часта раней быў аркестр на пахаранах?*] Цяпер нешта ў дзярэўні не, ня едуць. [*А ў вёсцы раней было такое?*] Ну было, хто хацеў. Заказывалі, прыязжалі. [*Ці было такое, што вот хароняць якога такога прэдседацеля, ці яшчэ якога-небудь у калхозе, і там на кладбішчы выступаюць там?*] Цяпер так. А раньше… [*Раней, напэўна, і красты, і труны, – ўсё ж самі рабілі?*] Усё самі рабілі раньше, первые гады. А тады, у нашым калхозе, напрымер, нескалька лет, што дзелалі ў масцярской там труну і крэст бясплатна, калхоз даваў. [*А вот раньша доскі, пэўна, самі гатовілі, каб на смерць было?*] А раньша гатовілі, у каго былі доскі, заранее гатовілі, каб было, кажуць, на гроб. Дзіржалі доскі. І былі ў дзярэўні, рабілі.

***Запісана ў 2012 г. ад жанчыны 1930 г.н., мужчыны 1936 г.н. у в. Гулідава Глыбоцкага р-на***

***

[*А ці казалі, што людзі-чараўнікі цяжка паміраюць?*] Казалі, во злая баба была, яна зло людзям рабіла, тады, кажыць, гэдак цяжка! Але бываіць, і па хваробе цяжка паміраіць. [*Як памёр чалавек, што ў хаце нада рабіць зразу?*] Сразу нада памыць, адзець, зрабіць пасцелю: састаўлялі табурэткі, тады пасцелюць, паложаць. Бабкі былі, прыхадзілі піялі святыя песні. Тады ўжо, як сабіраюцца хараніць, прыводзяць бацюшку. Ідзець на кладбішча там памоліцца. І хароняць. [*А як пасцель яму слалі, гэта нада галавой да абразоў?*] Да-да, галавой. Нагамі ў парог. Абязацельна. Нада каб ён “падняўся” і сам “пайшоў”. Як паложуць наабарот, дык нада “перакуліваціца”. [*А ёсць такі абычай, што як выносяць яго, то абсыпалі зернем?*] Гэта каторая свечка стаіць, гарыць ў зерні. А як выносяць з хаты, бралі гэта зерне ззаддзе за ім сыпяць. [*А як выносяць: ці можна падмятаць хату?*] Ну мятуць, мыюць. Вынесуць яго, а тут астаюцца ў хатах. Вынеслі ўсё гэта, прынялі, прыбралі і сталы паставілі. Прыехалі, пахаранілі, памаліліся, памянулі. [*А на памінкі нада кашу варыць?*]Варуць кашу. І кажды нада каб папрабаваў. [*А што яшчэ, можа якія клёцкі варуць?*] Сматра дзе. [*А тут ў вёсцы?*] У нас у вёсцы не варуць клёцак. Робяць там катлеты якія, кілбасы зробяць, салаты. [*А як памёр, нада зеркала завешаць?*] Завешываюць, каб пакойнік не прыдаўся ў зеркале.

Усё – і целевізар закрывалі. [*А целевізар і не глядзелі тады?*] Не глядзелі да сарака дней целевізар. Там жа бываіць і песні і музыка, а гэта жалобныя дні. [*А пакойніка хто должен вынасіць з хаты?*] Не родственнікі, чужые. [*А нагамі уперод?*] Да. [*А сама працэсія: у якім парадку ідуць?*] Сначала крэст нясуць, вянкі, машына ідзець, а ззадду ідуць усе, праважаюць. [*А ў савецкае врэмя з бацюшкамі не хавалі?*] У нас цэрква была не закрытая. Хто быў камуніст, а хто быў абыкнавенны гражданін. [*А пры саветах паметнікі, не красты, а звёзды ставілі?*] Гэта камуністам. На нашых кладбішчах такіх не было. Салдатам, якія ў вайну пагіблі.

***Запісана ў 2012 г. ад жанчыны 1933 г.н.***
***у в. Лапішкі Глыбоцкага р-на***

***

[*А вот скажыце, а ці былі такіе случаі, што вот з музыкай харанілі ў савецкае врэмя яшчэ?*] Ну было, тутака ў нас парынь адзін, дажы два, у аднэй вот жанчыны, яе сын адзін разбіўся ў Віцебску, на стройцы з пятага этажа ўпаў, а роўна праз сорак дней другі разбіўся. І вот паняслі першага, а крэст забыліся. Ну, чую, кажуць, нешта будзіць блага. Праз сорак дней этат разбіўся на матацыкле, і не адзін: утраіх ехалі. Іх машына збіла. Дзевачка з Мінска была, тая сразу насмерць. Дык мальчыка з музыкай харанілі. [*А так абычна ж не харанілі?*] Ну так не. [*А вот гавораць, раней вот, як камуністаў харанілі, ім вот крэст не ставілі, нейкі вот памятнік такі сразу, тумбу нейку.*] Ай, ну эта ж дурасць такая, эці камуністы. Яны і іконы выкідывалі, як жа пашлі ў эці камуністы, было тут у нас эткае. Адзін мужык з Белевіч, ён крэст з тумбачкі спіліў і ў возера ўкінуў, і праз нескалька дней сын утапіўся. Ну можа ім і загадавалі, каторыя вышэйшыя. Ну красты, дзе ў дзярэўнях стаялі, усе ўбіралі. І касцёлы закрывалі, і цэрквы, – невядома што рабілі.

***Запісана ў 2012 г. ад жанчыны 1940 г.н.***
***у в. Гулідава Глыбоцкага р-на***

***

[*А вот, скажыце, савецкім врэменем не разрэшалі ў цэрквы хадзіць.*] Я сама, як паступала ў піянеры, дык баялася ў цэрквы хадзіць. Дзяцей нельзя было хрысціць. А я не глядзела, – пайду і ўсе. Дэрэктар школы дзяцей сваіх крысціў. Ён вродзе бы не знаіць, як ён не знаіць, калі ўся сям'я хрышчоная. [*А дык і бацяшку на кладбішчы тожа не можна было прыглашаць, як хто памрэць?*] У нас бацюшкі не было… Церкавь далёка, машын тады не было…

[*А вот раней гаварылі, што тады замест крыста звязду ставілі камуністам.*] А камуністам, – да. А вось маю падругу… У Соні, як забіла брата, звязду сразу салдату прывязлі, а цяпер ужо паставілі памятнік… [*То есць памянялі?*] Не, не памянялі, ён так і стаіць са звяздой… [*Стаіць са звяздой?*] Ну дык у арміі яго прыбіла гэтай, ай ну літой, папаўся і… Ай, там не дай Божэ, пляменнік мой! [*А адкуль ён сам гэты пляменнік?*] Са Слабады быў у Глінава, ён такі нейкі: не бралі-не бралі і ўзялі, і папаўся пад гэту… Салдат прывазілі, гроб адкрывалі. [*А вот не было такога: сначала паставілі звязду, а потым, як Савецкі Саюз разваліўся, патом крэст ставяць?*] Родственнікі ставяць. [*Ну а так было, што мяняюць?*] Было. Раней не давалі ні ікон, нічаго. У нас на кладбішчы. Што гэтых камсамольцаў казнілі, ведзь тожэ бала звязда, а цяпер пямятнік паставілі… Можа вабшчэ нельзя нічога ўбіраць… Ну, гэта ж паставілі салдаты звязду красную гэтую, а яны зрабілі памятнік, і стаіць памятнік…

***Запісана ў 2011 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Гліннае Докшыцкага р-на***

***

[*А вот пры Савецкім Саюзе, можа, запрашчалі і на кладбішча хадзіць?*] Дык вот гэта ж і гавароцца пра Савецкі Саюз. Тады ж цэрквы ламалі. Каго заставлялі цэрквы ламаць, ды кто ламаў, таму і саснілася: будзеце вы сваім дзецям з гэтых досак грабы робіць. І точна! Вайна тады як была, як наляцела паліцыя, яны ў балота ўцікалі, а на трасевішчы пулямі па балоту, па гэтаму: тады ж баяліся па першансву на балоты хадзіць, гэта цяпер разработалі. Дык точна: многа пагібла і па двое хавалі ў гроб, усяк… Гэты з самых тарфяніках капалі тарфы, так там тыя ўваліваліся, дык тыя асталіся цэлікам. А так жа, гэты самыя, пагіблі і точна не было досак! З цэркоўных і робілі грабы. Відзеш, як ім і саснілася – і точна так гэтак было. Каторыя бацькі ламалі красты, сцягвалі ўсе і робілі гэным дзяцям. А другія, дажэ не ад вайны пагіблі, а вот ездзілі на коніках: з каня зваліўся і забіўся, і гроб з гэтых дасок робілі. Нельзя было. [*А вот вайной тожа ж не было з чаго рабіць, можа і хавалі так?*] І хавалі так, да ўкруцяць у якое гэта пеленка, то ў шынелі, во во тамамка, як у балотах убівалі. А там после, фронт, як перайшоў, тады ж досак хоць якіх найдуць, і тады ўжо робілі грабы, перахоўвалі. Перакопвалі, гэты самыя, і знасілі на кладбішча. А тады ж толькі лішбы дзе. А да нас хавалі, во, тутака ў Замасточчны, на кладбішчы, на гарэ, у пясок, каб вада не падхадзіла. Гэта окала школы – там жа тожа на гарэ. І тады, гэты самыя, а немцы прыйдуць, выкапаюць яму, паліцыя, гэтыя, каторыя былі западнікі ўваходзілі. Нашы залезлі на сячыне ў балоце на сасну, толькі чуюць на гэтай гарэ:

“Га-га-га!”, – засмяяліся гэтыя з паліціі. А яны адкопвалі, думалі – яма: там жа свежае насыпана. А там чалавек быў захаронены, а яны думалі – яму адкапалі. Яны там хахаталі, смотрацьтам на гарэ, а як ужо вечарэіць, дык хадзілі па дзярэўні шукаць, каб дзе што з’есці, есць ж не было чаго. Дык, кажуць, пайшлі паглядзець з чаго смеяліся. Прыходзяць, а чалавек наверху, а закапаць яны не закапалі. [*А вот, гаварылі што па такім парцейным, што вот крэста не ставілі, як памерлі?*] Стаўлялі звязду на столбік. [*А патом як гэта звязда? Можа, як Савецкі Саюз разваліўся, знімалі?*] Мусіць, хто свае аставаліся, дык яны перахоўвалі. На кладбішчы, бываець, хоць вайной хоць дзе ж, хавалі дзе папала: тады ж баяліся на кладбішча насіць, таму шта паліцыя. Тут школу пастроілі і гэтую школу разарылі, і сцягвалі, каб не было, што называлася, дзе стаяла іх камендатура. Дык парцізаны ўнічтожылі гэту школу, зона каб не была нямецкая, таму што там і тут пераход парцізанскі, на пагорку, дык яны ўнічтожалі. І цэркаў тутака была, дык на месцы цэркві стаўлялі школу. Казалі, быццам гэта бацюшку хавалі. Бацюшак даўней каля цэрквы хавалі, дык баяліся школу гэтую ахраняць. А цяпер, дык ужо ў гэнай штколе ўжо няма дзяцей, і людзям нікаму не здаюць.

***Запісана ў 2011 г. ад жанчыны 1928 г.н. і жанчыны 1923 г.н.***
***у в. Вуглы Докшыцкага р-на***

***

[*А ці ёсць такі абычай, што як пахавалі, і на следуюшчы дзень нада ісці?*] Да. Еслі пахавалі, значыць гэта абізацельна нада. Сёння пахавалі, заўтра ўстаюць... Ну, сколька там? Свае... Сматра хто калі ўспеець, ну да абеда еслі, – да абеда, утрам ідуць. І едуць і ідуць, ну там свае... і... ідуць, і едуць, якая разніца. Там эта дапіюць. Бываюць, перш атлівалі пахароны, засцілаюць простыні, астаўляюць і закуску, водку, чарку, і вот і кажды возме чарачку, адліець і выпіць. [*Гэта на пахароны так было?*] А і на пахаронах, як пахаваюць. І на прыкладзенах тое самае тожа, свечку паляць, адпіваюць, прыглашаюць. І каб крыхадзіў у хату, гэта ж прыглашэнне. З’ездзіў сначала ў цэркаў, а патом ўжо з цэрквы едуць на кладбішчэ, вязуць свечкі палюць там, ну і... Гэдак сорак дней і ў год гэдак, усё ўрэмя гэдак. А як жа ж харонят, так з батюшкай хароняць, ужо ж бацюшка. Хто з бацюшкам, а хто, бываець, без бацюшкі, ну а цяпер усе з бацюшкам. Раньша без бацюшкаў харанілі пры савецкай уласці. А цяпер жа ж цэркаў адкрыта, так з бацюшкам. Тады б хто, – бацюшка не паехаў.

[*А вот як без бацюшкі так? Можа, бабушку якую прыглашалі?*] Да. Тады ў хаце бабушка моліцца, на кладбішчы моліцца і магілы свенціць. Вот

тады ж не разрышалі дужа, но ўсё раўно, вада как-нібудзь... Верыш? І нахадзілі ваду. І тады свянцалі магілы. Цяпер бацюшка, а тады гэткія бабкі. Маліліся, свянцалі. [*А вот ці былі такія вот бабушкі, што хадзілі на кладбішчэ, так ходзяць, такія жабракі, каторыя молюцца?*] Маліліся і на кладбішчы, да-да, былі. Раньша. Можа, цяпер нама. Цяпер бацюшка ходзіць, так цяпер не, а раньша бацюшкі не было... Ну, када камуністы былі, ну дык хадзілі бабкі. А то і мужыкі старыя ўжо, можа, па гадоў дзевяноста. Маліліся, паміналі, хадзілі, у хату прыхадзілі паміналі, па хатах. І на кладбішчэ хадзіў вот. На Пасху ідуць на кладбішчэ і ходзяць гэтыя старыкі, молюцца над магіламі, ім даюць, ну, хто што, хто яйка, хто грошы там. Раньша якія там грошы былі? После вайны ж, нічога не было. Ну дык, хто кусочык сала дась там, каўбаскі хто. Нікаторыя ж умелі… У нас у Чарніцах маей мамы цётка. О-ой, яна як бацюшка пела, малілася: Хрыстос Васкрэс. Эта яна очень-очэнь... Яе так бралі, пад ручкі, вадзілі кажды да сваей магілы. Ну а цяпер жа бацюшка цяпер. Ня ходзюць старушкі.

***Запісана ў 2011 г. ад мужчыны 1934 г.н. і жанчыны 1935 г.н. у в. Чарнічка (I) Докшыцкага р-на***

***

[*А кладбішча раньша ці гарадзілі?*] Не-а. [*А можа які раўчук капалі, ці што было, каб вот скаціна не перахадзіла.*] Ну ў нас жа ніхто не пушчаў скаціну, і не прынята было. А цяпер абгарадзілі. А што толку гарадзіць? У дзярэўні, мальцы, людзей нет, нет людзей. Але пайду я, тут, мусар панясу (соснік у мяне там), гляжу – разламалі! Ну зачэм? Хто? Яны пакрашаны, і разламалі! А я сабрала жардзіны, доскі… А каму мешала, скажыце?! Раз прыезжала на кладбешча два парня: бацька прыезжаў і друга ўзяў і матка яго былі. Я тут гаварыла сваім к аўталаўцы хадзіла. Хто мог паламаць всё? [*А вось кладбішча – гэта святое месца?*] Ну канешне, святое! Мама мая гаварыла, што раней на гэтым кладбішчы была каплічка, у вайну капалі акопы пападаўся кярпіч. Мама гаварыла: каплічка такая. А вот як ужо вязут хараніць чалавека, тады прыязжае бацюшка і ў званіцы звоніць. Званіны. Ну, вы можа чулі. Вы ж ходзіце ў царкву, мальцы. А после ўжо бацюшка ня ездзіў, тады ўжо стары чалавек такі хадзіў туды. А тады, як савецкая власць, я ужо не помню. Разбурылі тую каплічку – і ўсе. Там жа вада была. І тады аж з Празарокаў прыязжалі, бралі тую ваду – яна свянчоная. Яна па зрэнію памагала, па зрэнію, у каго вочы бальныя. [*Яна тут за кладбішчам?*] За кладбішчам. Дык яна там ужо заросшая, – ня знойдзеш. Рэдка калі найдзешь гэту крынічку, а цякла вада ўсё врэмя. [*А як на якое, можа, свята хадзілі да яе? Ці*

*так проста?*] Ну, я не знаю, можа на якое і свята і хадзілі, але мама казала, што с Празарок жэншчыны прыхадзілі, вады набіралі, брали на лячэнне.

***Запісана у 2010 г. ад жанчыны 1924 г.н. у в. Зерчаніцы Ушацкага р-на***

***

[*А вот скажыце, а раней вот памятнікі тут ні ставілі, наверна?*] Ну ні было, дзетка, гэта самае, вазможнасці. Не было дзенег. Не ставілі памятнікі. Канешне, ставілі храсты, дзерывянныя храсты. [*А вот камнем не абкладвалі?*] Камнем – не. Эта ў яўрэяў. [*У яўрэяў? Па кругу не аблажывалі камнем?*] Кругом, а ў яўрэяў жа ж ложуць вабшчэ на ўсю магілу камнем, там жа не хрэст, а камень. [*Дык а ў нас не было, што там камешкамі?*] Ну, камушкамі ў каго было ў састаяніі прывесці гэты камушкі. После вайны, і што? Бедната ж была – не на чым. На сабе ж камушкаў не паносіш. Адкуль? Каб аблажыць. Абкладалі, хто ў каго сіла была, у каго мужчыны былі. А што аставаліся ўдовы, – дзе ж яны?..

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1939 г.н. у в. Горкі Верхнядзвінскага р-на***

***

[*А там вот, на кладбішчы, у канцы, ёсць без крэстоў магілкі.*] Можа, старыя, можа, нет нікаго. [*Там такой металічэскій столбік і там такая дашчэчка. І напісана фамілія і кагда памёр*]. А ня крэст, да? [*Ня крэст*]. Так можа там самаубійцы. А ў цэнтры кладбішча? [*Не, на краю*]. На краю, можыт быць, какія самаубійцы. Іх раньшэ не харанілі на кладбішчы. Іх харанілі за заборам, еслі сам павесішся там, ці што такое. Іх патом харанілі не на кладбішчы. Ну дык я, знаіця, я на эцім кладбішчы ваабшчэ не была, ні знаю, тут ні хадзіла, я ні знаю. А вот там, у нас, я знаю, дзе мая мама пахаронена, Махірава такое. Дык там, знаіця, салдат многа харанілі. Кагда-та в Баравухе этай там палкі тры эці было. Асобенна дзісантнікі сільна разбіваліся, кагда прыгалі з парашутаў, і многа разбіваліся. То ў возера ўтануць с эцім парашутам, і тагда на эцім кладбішчы харанілі. І тожа былі такія забітыя, і звёздачка надпісывалі хто. Ну, ані ж далёкія былі. Эта ж саюз быў, – атаўсюды. [*А вот скажыце, раньшэ ж на некаторых звёздачкі вместа крэста*]. Ну так я і ґавару, вот такіх вот маладых харанілі. Ну раньшэ ж ваабшчэ было, ня верушчыя, шчытай, што ўсе былі эці. Ну і так вот са звёздачкай харанілі, вот так вот у нас, усех, каторыя гіблі. Ну дзе-та пяцідзесятыя годы, у скорасці после вайны.

Хто знаіць? У іх сілы не была, такой снароўкі, парашуты былі, наверна, ні такія, як сійчас. Многа пагібла. А ціпер, хто не раскроіцца, упадзёт, бывала.

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Луначарскае Верхнядзвінскага р-на***

***

[*А вот кладбішча Ваша раней, пэўна ж, і памятнікі раней не ставілі?*] Народ не ставіў, таму шта бедната была, бедна жылі: вайна ж, нечога было есць. Чаму памятнік? Бабушкін там памятнік. После вайны нейкі закон быў, не вадзіла нас малых на кладбішча. Дак яна ўжо памерлы, дык мы не знаем, дзе бабушка была пахавана, таму шта зарозшая ўжо ўсё. Цяпер людзі багатыя, цяпер году няма, а зразу і памятнікі, і абгародкі ўсе ставяць. [*А памятнік калі трэба ставіць, да года нельзя?*] А ў нас ужо ставяць. Калі да году нельзя, ну хто да году ждзець? А хто, кажа, чым у восень прыкладаць, дык, кажуць, ужо заадно, кажуць, паставіць памятнікі. Гародку паставяць – і ўсе. Стараюцца, пакуль жывыя, паставіць. Можа, памруць, тады, биваіць, не выйдуць, – зразу прыкладаюць. Тады ўжо надзежна.

***Запісана ў 2011 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Чарніца (II) Докшыцкага р-на***

***

[*А ў вайну як раней харанілі? Не было ведзь надта врэмені. Можа, па-другому как-та ці?*] Ну як па-другому? Яму не было выкапаць, некаму было выкапаць. Во, суседка мая, матка памёрла з вайны, а людзей не было. Сама яна яму выкапала і на кладбішчы пахараніла. [*Дык, можа, яшчэ і гроб не рабілі?*] Ну гроб, дык я не знаю. Зробілі які-небудзь, ці не? І самой прышлося яму капаць, – ну што ж рабіць? [*А папы, не было іх пры немцах?*] Нікога не было тут, з вайны хаты былі спаленыя, ні адной хаты не было, толькі 2 бані былі, засталіся. Усе хаты. Хат было многа, ня гэдак, як цяпер. Была бальшая дзярэўня, хаты стаялі. Усе былі спалілі...

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1935 г.н.***
***у в. Шо Глыбоцкага р-на***

***

[*Ну вот памёр чалавек, гэта ж нада прыглашаць, каб абмывалі яго людзі, ці самі абмываюць цяпер?*] Даўней звалі чужых людзей, а цяпер ужо

прылаўчыліся самі. Ужо сыны, дочкі, там каго пазавуць. [*Дык вот, гаворуць, як баба памірае, дык нада каб і бабы мылі, а мужык…*] Да-да, мужчыны ж ня будуць бабу мыць. Мужчыну мужчына мыець, а бабу – баба. [*А можа былі такія ў вёсцы людзі, якіх часта прыглашалі абмываць, во такая бабушка можа?*] Былі, спецыяльна. Яны не баяліся нічога, звалі іх, хто ні памрэць, іх звалі. [*А вот ці прыглашалі такіх людзей, піюноў, хто піяў?*] Ну дык а як? Прыглашалі, піялі. [*А калі яны вот, на первый дзень, як ён ляжыць ці?*] Па пакойніку? Ну, як памрэць, удзень ён памрэць, прыберуць яго, адзенуць, паложуць, а тады вечарам гэтых пеўчых прыглашаюць. Ну, яны ж пяюць гэтыя святыя песні ўсякія, ну там, да дванаццацці папяюць. Ну, тады ўжо дамоў, пакуль гарэлку ня вып'юць. Ага, тады на заўтра іх прыгласяць, пяюць, пакуль не закапаюць пакойніка. [*А вот бацюшку ці прыглашаюць?*] А бацюшка на стол ня йдзець. А так яму ў сумку паложуць бутылку "Маскоўскай", калбасы, шчэ чаго. Ён дома прыйдзіць, вып'ець, а за стол вродзе бы яму не паложана. [*А вот жа ж гавораць, што неяк нада ва ўсём новым хараніць, усе стараюцца неяк там, каб чыстае было?*] Я вам скажу, як после вайны ўжо не было чаго, дык тады хаваліся, паміралі, што б ні папала надзівалі, абы ня голый. Гэта ўжо цяпер ужо новенькае, каб і насочкі новенькія, каб і рубашачка, і маечка – усё, усё было новенькае, а после вайны дзе ж ты возміш? [*А вот заранее ці гатовілі сабе адзежу старыя людзі?*] А не, не гэта. Як памрэць, тады ўжо былі ў нашай дзярэўні швачкі, тады ўжо шыюць. А цяпер ужо зложана, ужо дажа ў мяне зложана.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1935 г.н., жанчыны 1928 г.н., жанчыны 1930 г.н. у в. Шо Глыбоцкага р-на***

***

[*А вот скажыце, як чалавек памер, на якія дні яго памінаюць?*] Ну на якія дні памінаюць? Ужо на той дзень, як адпраўлюць яго. А тады ешчо на 3 дзень на кладбішча ходзяць, ну а тады шасціны, 40 дней дзелаюць і тады гадаўшчыну дзелаюць. [*А вот эта – шасціны, гадаўшчыну – дома робяць?*] Дома. У цэркве памянуць, а стол дзелаюць дома. [*А ці прашаюць на шасціны?*] Ай, ну канешне! Адзін жа не сдзелаешь: завуць людзей. Як збяруцца, дык і 40 чалавек, сколькі людзей есць – столькі і прыглашаюць. [*А вот як памінкі ў той дзень, як пахавалі: што нада на стол паставіць?*] Усё ставяць, як і на свадзьбе. Цяпер ці свадзьба, ці пахароны – адзінакава ўсё. [*А вот раней якія блюды, можа, ставілі?*] Раней, я ж вам гавару, што раней людзі бедна жылі. З вайны што гатовілі? Толькі клецкі, юшку, і, гэта, каша гэта і гарэлка толькі. Абхадзіла толькі тры чаркі, можуць, чалавек выпіць, хто п'ець, – тры.

А цяпер жа нап'юцца, пойдуць, пагуляюць па вуліцы, і апяць за стол садзяцца – цяпер саўсем па-другому. Па тры чаркі, можа, і адна чарка хадзіла… Не. Чарак многа было. Ну, алі гэтак – толькі тры. [*А вот, гаворыць, як с кладбішча вазврашчаюцца, нада абязацельно рукі памыць, патом ужо за стол?*] Ну так жа і дзелаюць. Гэта ж культурна: там берыш і пясок гэтат у рукі ўсе, як закапваюць.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1933 г.н.***
***у в. Багданава Бешанковіцкага р-на***

***

А кладбішча ў канцы вескі тут – это чурылаўскае і даласчанское. Там дзярэўня Далосцы і наша дзярэўня хароніцца. [*А вот скажыце, кладбішча – гэта месца свтое ці не?*] Святое. [*Ну вот а чаму яго называюць так?*] Ну, столькі людзей ляжыць там ужо, людзей, неізвестна сколькі, канешне. Святое – вот бацюшка цяпер, як прыходзіць на кладбішча, гаворыць: курыць нельзя, нічога с кладбішча браць нельзя. Ну, вы ж ужо, навернае, знаеце? Тэлевізар гледзіце, як 3 мужчыны сабрасі после дзядоў пашлі, пазлівалі ўсё ў бутылкі і ўсе памерлі. І адзін зняў ажарэлле гэта з крэста, жонке падарыў – і жонка тая памерла. [*А вот раней жа памтнікаў не было, як цяпер?*] Былі. Камень бальшы і туды крэст. Дрэвы садзілі. Былі першабытныя. [*А дрэва чаго садзілі?*] Каб не пацераць, каб памяць. Ну а цяпер ужо гэта ўсё есць. А раней… І цяпер тожа хароняць жа разам, калі сем'я, адзін каля аднаго. Да. Дык і цяпер таксама сваё кладбішча. [*А калі вот гэтыя памятнікі паявіліся, што цяпер ставяць?*] Як пабагацелі. После вайны бедна былі, саўсім бедныя былі: із дзерава дзелалі. А тады пабагацелі, сталі жалезыя. А цяпер ужо сталі памятнікі ставіць, дзе стаялі жалезныя, – паснімалі, і сталі памятнікі ставіць.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1932 г.н.***
***у в. Чурылава Бешанковіцкага р-на***

## Памінальныя абрады

[*А вось Дзяды, толькі адзін раз ў год бываюць?*] Ну, бывае ж мёртвая Раданіца – гэта тожа памінаюць. На Троіцу і Дзмітраўка, – тры разы. А на кладбішча Вяліканне так ходзім. Бацюшкі кажуць: гэта ня можна, гэта вясёлы празднік, а іх там не нада беспакоіць. [*А вось раней, калі бацюшкі не было ў савецкая врэмя, ці хадзілі на Вяліканне?*] На кладбішча? [*На кладбішча.*] А ну вайна прышла… Усе ў ручную робілі... Уперад ужо, калі вайна скончылася, сталі гэтыя цэрквы, касцёлы аднаўляць. Дык што яны ў Празыроках – касцёл

засыпалі і дзе цэрква – разаб`юць. Ну, касцёл ужо абарудавалі красіва. [*А вот Раданіца, на Раданіцу што рабілі?*] Ну гэта едзем у цэркву, у цэркві моляцца, бацюшкі перадаем запіскі, бацюшкі за царскімі дзвярамі, а тады памолюцца – ён выходзіць на цэркву, і абедню служыць. Пасля гэтай абедні ўсе запіскі, і ён кожную запіску чытае. А ў нас кожнага свечкі гараць у руках, ён прачытае ўсе на мертвую Раданіцу – і ўсё. [*А на кладбішча на мёртвую Раданіцу?*] І тады тожа на кладбішча ходзім. [*А вось, ці бяруць што з сабой на кладбішча? Перакусіць? Водку там, можа?*] Так а цяпер не разрашаець. [*А раней?*] Бралі раней. Так водкі і гэтак, гэтыя, яйкі. Ходзяць гэтыя пьяніцы і забіраюць гэтыя яйкі. Дзе водка стаіць, – і яе забіраюць. Гэта ж, знаеце? Гэта пьяніцы. Ім жа хочацца... [*А раней болей на кладбішча хадзілі на Вяліканне ці на Раданіцу?*] На Вяліканне, на Раданіцу і на Дзмітраўку – усе врэмя хадзілі.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1922 г.н.***
***у в. Хралы Глыбоцкага р-на***

***

[*Скажыце, а вот на кладбішча ці хадзілі, на магілкі на Пасху?*] Не, на Пасху нeяк у нас не хадзілі. Вот на Радуніцу. У нас і цяпер так: на Радуніцу дажэ лучше сталі хадзіць, як раньшэ. Бывала ж, Радуніца быў рабочы дзень, а цяпер ужо выхадны – Радуніца. Дык, гляджу, і з гарадоў прыязджаюць на Радуніцу дужа ў нас. Дзе-небудзь на Тройцу ходзяць, на Пасху, а ў нас на Радуніцу. Да Радуніцы сходзіш, убярэш свае магілачкі, павымецеш, траўку абарвеш – усё зробіш. [*А з сабой насілі што на Радуніцу на кладбішча?*] Ну, бралі ўсягда выпіўку, яйцо абязацельна на Радуніцу бралі свежепокрашенное. Там усё: закуска, калбасу, булка абязацельна і выпіўку. І паміналі тады на кладбішчы. [*А скажыце, цвяточкі цяпер жа нясуць на Радуніцу?*] Нясуць. Бог ведае, цвяты нясуць. [*А раней ці насілі?*] Раней іх не было, мусіць, тых цвятоў. Ці, можа, грошаў у нас не было, не знаю. Не насілі раней. А цяпер глядзіш – ва ўсіх, і ў мяне магілачкі ёсць: у мяне старык мой памёр, і мама, і ўсе старыкі. Дык цвятоў поўна ёсць. Вы відзіце, які выбар. Раней іх не было, наверно. А можа грошаў у нас не было купляць тады. [*А яечка – эта проста палажыць, прынясці?*] Да. Даўней, можа, што бядней было, дык разаб’юць, пакрышуць па магілачках. А цяпер ужо, як мы багацей, дык цэлае яечка паложаць. [*А яшчэ, можа, канфеткі?*] Канфеткі лажылі. Дажэ вот, еслі так паложыцца, на кладбішча сходіць, дык ужо не нясеш нічога, – канфеткі паложыш. Лажылі канфеты. [*Скажыце, ці садзіліся абедаць на магілкі?*] Садзіліся. Гаворaць дзе-небудзь гэта нельзя. Садзіліся абязацельна. Скацерачку бралі.

Даўней па магілцы рассцілалі скацерку. Ну і цяпер ужо ж больш культурней: столік здзелаюць, скамеечку, расцеляць скацерачку – паміналі. [*Скацерка отдельная должна быть ілі?*] Скацерачку бярэш чысценькую, беленькую засцілалі. [*Скажыце, а гэта на найніцу нада, на які?*] Гэта не знаю. Слалі і ўсё. [*А потым вот паабедаюць і астаўлялі на магілкі водкі ці адлівалі?*] Адлівалі па чарачкі водкі, хто нядужа даўно памёршы. А хто даўнія памёршыя, дык ужо … хлебца, і булачкі, і солькі лажылі …

[*А вот скажыце, на Радуніцу, а на Тройцу ці хадзілі?*] Ходзюць, і на Тройцу ходзюць. Але ў нас дужа не прынята. А на Тройцу, дык у людзей… На Тройцу ходзюць, да на Радуніцу. У нас сходзяць, каму время ёсць ездіть. [*Скажыце, а вот ці чулі такія Дзяды ёсць?*] Ёсць Дзяды, памінаюць. [*А сколькі іх?*] Дзмітраўскія Дзяды ў ноябре, верна? А тады яшчэ якія, не знаю. [*А што на Дзяды? Гэта нада дома рабіць?*] Дома, дома. [*А што, можа, варацъ спецыяльна?*] Куццю ці кашу… Тады не на кладбішча ішлі, а дома памянём. [*Дык гэта Бальшыя Дзяды?*] Да, Бальшыя Дзяды.

[*А скажыце, а ці хадзілі тут такія вот жабракі раней?*] Хадзілі. А тады цяпер жа ўсе багацейшыя, а тады ў саміх не было нічога. Бедната была пасля вайны, а не дай Бог маёй маладосці! Бедна дужа жылі. Папка пагіб на вайне, а нас трое дзяцей, мама адна. Дык цяжка жылі, але давалі, ўсё роўна што-небудзь давалі. Хоць хлеба кусочак, дажэ две і бульбіны бросяць. Давалі, давалі. [*А вот не было такога, што яны і за памерлых маліліся?*] Не, мне не прыхадзілася такое, але хадзілі і давалі, што было, і давалі. [*Дык яны проста прасілі?]* Ага, прасілі. [*А не маліліся?*] Не, не было, каб такія прыхадзілі, што і маліліся. Можа дзе і былі, ну тут такіх не было. [*Скажыце, а вот раней, можа, як такія камуністы былі, дык іх хаанілі, і з музыкай хаанілі? Не чулі такога?*] Даўней ні камуністаў. Нядужа даўно і з гэтай музыкі не стало. Цяпер ужо больш сейчас з бацюшкам харонюць. А так, усё з музыкай хаанілі. [*З музыкай, да? Гэта ўсіх так хаанілі?*] Да, дажэ ў дзярэўне ў нас простых людзей з музыкай хаанілі.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1934 г.н.***
***у в. Высокая Гара Бешанковіцкага р-на***

***

[*А ці правілі Дзяды, памятаеце вы?*] Ну Дзяды ўсе правілі і цяпер правяць. [*І цяпер усе правяць. У годзе колькі Дзядоў, можа ўспомніце?*] Ну вот на Асяніны ж Дзяды. [*Гэта калі?*] Гэта ў восень. І Троіца – Дзяды бываець. [*Перад Троіцай, да?*] А Вялічкай не бываець Дзяды. Вяліканье: у суботу варацъ яечкі, булкі пякуць – усё, як у дзярэўні. А Дзядоў няма, – пост. Посная куцця

на Вяліканне, а на Троіцу Дзяды, во як цяпер. І Асяніны – Дзяды, нейкія Стаўры даўна… [*А клікалі дзядоў?*] Ну як у вечары скажу: “Хадзіце ўсе мае пакойнікі, хадзіце на вячэру”. [*А вось вы, можа, чулі пра такія абычаі, каб дзяды прыходзілі, што трэба было?*] Не-а, гэткага не. Гэткага нічога врэднага, дзеткі, ня робіла і бацькі мае ня робілі. Нічога гэткага. Я не знаю, хто гэткія людзі врэдныя ёсць. А маё патомства: вот і баба мая ў гэта во, што мэкаў, кідала. Я вам расказала, – а гэта баба была маміна маці, – яна нам вадзіцы з кропу ў вайну зробіла. Кропу накідала ў вадзіцу. Кропу, укроп. Ну і прынясла, і пасаліла, і кажыць: “Мар’я”, – малака ж нет, нічога посля вайны. – дык кажыць: “Во, рабятам хоць бульбіну зварыш, няхай прагоняць гэтай. Вадзіцу я зробіла. Агурковай”. Агурков яшчэ не было – акроп парослы. Растуць, у мяне – дужа многа завезей… А гэта баба савсем глухая была. На сяле сядзела, на лаўках. На вуліцу выдзець, во, лаўкі былі, сядзіць, а малец няхай спіць галодны, мака паеўшы. Хай ён спіць, тады ўсё прайдзёт. Вот і родныя: і бацькава, і мацярыва – і як жыць?

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1927 г.н.***
***у в. Несцераўшчына Докшыцкага р-на***

***

[*А вот после вайны цяжка ж наверна жылося?*] Ну да, да. Ну але ж, знаеце як? Зямля ж была, хазяйство было какое, карова ж астаўшыся была, былі коні. Ну вот так і выжывалі вот. [*А жабракі ці хадзілі?*] Ой, хадзілі. Я помню жабракоў. [*Дык а гэта хто хадзіў? Эта после вайны ці так людзі?*] Да, после вайны было жабракоў очень многа. [*Эта старыя людзі ці ўжо…?*] І маладыя хадзілі. [*А вот эта ж нада было нешта даць ім?*] Да, давалі хоць… У нас тут такой аграх Ваўчкоў на дароге работал, дык гаварыў, сягодня, – гаварыт – 12 жабракоў, за утра 12 жабракоў! І гаварыт усім па адной бульбіне даваў. Вот, ну дзе ты ім хлеба наберыся?! Ну дык гаварыў, па бульбіне даваў, гаварыт. [*А вот не расказывалі, яны маліліся ці проста хадзілі?*] Некаторыя маліліся. Ну некаторыя не, а каторыя, у нас – такая была эта, Журавіха называлі, маленькая такая бабка. Ну дык во яна каталічка была. Ідзёт, ну і яна: “Анёл панскай”. Вот прачытает. Тады, як яшчэ там малітва?.. Тока прачытает эту малітву і начынает зяця клясць! А маць, а перамаць!.. Ну і сідзіт. Зяця этага адклянёт, а тады ўжо ей сдавала. І свякроўка яе карміла ўсё время, яе, – яна бабка была такая харошая! Малілісь каторыя, каторыя не. [*А бывала, што вот, можа, прыхадзілі і памінали памёрлых, вот што, дабракі ці каля царквы сядзяць? На кладбішче?*] Да, да. А на кладбішче, я помню, малая была. Ну скока мне была?.. У нас у Кублішчыне, как есць

дарога пасрадзі кладбішча, і вот на адну сторану і на другую – адны былі жабракі сідзелі. Дажэ воўкаўскія хадзілі, мышкоўскія, – усі расказывалі. Ну і я помню: хлеб бралі, – а хлеб пяклі свій, во такую булку – і вот эту булку поўнасцю бралі на кладбішча. Ну і вот, парежут кусочкамі яго, і тады настольнік, эту, хлеб этат, і ўдвух няслі хлеб этат і раздавалі ім. А яны сзадзі, рукі выставіўшы. Госпадзі! Усё помню я эта, з дзецтва запомнілась эта на ўсю жызнь, как яны прасілі. Усю булку – і ім не хватала! Ну але ўсі насілі, і ўсё. А тады ўжо дальше – большэ. Тутака сталі яны ўжо хлеб ня браць, ужэ так і не давалі хлеб, там ужо баранкі там, ужо булкі, вот ужэ там. [*То есць людзі ўжо трохі лепей сталі жыць?*] Да, ужо лепей троху сталі. А тады ўжо і саўсім не сталі прыхадзіць. [*Дык гэта во на кладбмичэ, да?*] Да.

***Запісана ў 2022 г. ад жанчыны 1940 г.н.***
***у в.Фралоўшчына Мёрскага р-на***

***

[*Дык а вот, як на могілках, ці вот хадзілі даўней вот жабракі такія?*] Хадзілі. Хадзілі паміналі. Давалі ім ўсё, давалі і, гэта, і гарэлкі дадуць, як нап'ецца якая жабрачка, заваліцца і ляжыць. [*Гэта вот гэтыя жабракі яны аднекуль здалёк былі? Ці яны тут недзе жылі?*] Не тутэйшыя, блізкія. Мы і знали іх. Там, у Таргунах, не было жабракоў там. Сценкі, Здзедзены такія там нейкія былі. [*Дык а гавораць ім пяклі нейкую булачку спецыяльную?*] Даўней жа ж, як Дзяды, дык мама спецыяльна пякла такую булку, вам скажу. Вот такі вот курчык, вот такі вот, доўганькі. Гэта заўтра ж прыдзіць ужо ж па курцах, прыдзіць баба, знали. [*Курцы – іх пяклі на Асяніны ці на кажнае?*] На каждыя Дзяды. Дык і пяклі. Ну іна тады ўжо прыдзіць, ну, кажа: памяні, можа, прыпомні, там, Таня ці Манька. Яна ўжо памоліцца, гэта баба. І… А дык, кажыць, прыйшла раней нанач, дык у бані начавала. Хоць у чыю ж, баню топяць, ну дык яна назбіраіць хатуль ці торбы гэтыя…

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1922 г.н.***
***у в. Шалашы Докшыцкага р-на***

***

[*А вот як саветы ж прыйшлі апяць тут, цэрквы началі закрывацца?*] Да, гэта пры гэтым, пры Сталіну. Гэта ён, гэты Сталін, здох каб ён там! <…> [*А вот скажыце, пры савецкай уласці вот дзяцей хрысцілі як, цэрквы ж закрывалі, а як тады было?*] Ціханька. Хто на рабоці вот робіў тады, ну была цэрква у Празароках, але вот хто на рабоці робіў, той на такой вот, напрімер,

бухгалціра якія там, дзе ў канторы там, ці хто, – баялісі. Ціханька. Учыціля якіі дзе былі – ціханька. А так, казалі, што вот учыціля былі, хто быў у парціі, застаўлялі іконы выбрасываць. Іконы выкідывалі, – во які быў закон! [*А вот, як чалавек памрэ, ці прыглашалі бацюшку тады вось?*] Ні было ўжо бацюшку. Гэта ўжо нільзя, тады ўжо самі малілісі людзі каторыі. Во ў дзярэўні ж умелі тожа маліцца. Маліліся самі людзі і ваду гэту дзе бралі, там дзе якая ж цэрква і была, – няўсюду ж было пазакрывана, – там дзе якая адна была, аставалась. Тады, ну, адзін аднаму перадавалі то вады гэтай свянцонай – магілу пасвянціць, то зёлкамі пакуруць магілу гэтай. Ну і свае людзі малілісь Богу і так закрывалі.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1940 г.н. і мужчыны 1934 г.н. у в. Шо Глыбоцкага р-на***

***

[*А вот на Радауніцу ці хадзілі?*] Канешна, гэта ж памінальны день! [*А на Троіцу?*] І на Троіцу хадзілі. Усе празднавалі, усё было ў парадку пасля вайны. Адзін канёк быу, інвалідзік, і ён абрабатываў усім зямельку, і что вы думаеце? Ніхто ня быў не запаханы! Плаціць нечым было. Усе робілі і ўсім хватал. Ну работалі, канешна…

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1931 г.н. у в. Манякова Мёрскага р-на***

## НАРОДНЫЯ СПОСАБЫ ЛЯЧЭННЯ. ГІГІЕНА

Доўгі час у беларускай гуманітарыстыцы феномен народнай медыцыны заставаўся маладаследаванай праблематыкай. І калі па яго функцыянаванні ў вясковым грамадстве Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. існаваў шэраг даследаванняў, то па пазнейшых перыядах ён адсутнічаў. Фактычна не даследаваным заставаўся дадзены комплекс у першыя паваенныя дзесяцігоддзі. Але ўжо ў 1960 – 1970-я гг. пад уплывам значнага прагрэсу навуковай медыцыны мела месца ажыўленне цікавасці этнаграфічнай навукі да народнамедыцынскай праблематыкі. Аднак з-за ідэалагічных абмежаванняў гэта тэндэнцыя не атрымала распаўсюджання. Як адзначаюць даследчыкі, больш таго, народнамедыцынскую праблематыку працягвалі ацэньваць амаль выключна з пазіцыі крытычнага, матэрыялістычнага пункту гледжання. Такая пазіцыя доўга захоўвалася ў беларускім народазнаўстве. І толькі ў канцы 1980-х гг. змяняецца парадыгма ўспрымання народнай медыцыны ў структуры традыцыйнай культуры[19]. Немалаважнае значэнне набыло вывучэнне народнай медыцыны ў сувязі са стратэгіямі выжывання і адаптыўнымі практыкамі насельніцтва. Беларускія даследчыкі канца XX – пачатку XXI ст. (Т. Валодзіна, Г. Барташэвіч, У. Ганчар, У. Філіпенка) разглядалі народную медыцыну як комплексную з’яву і складаны механізм, які ўключаў як рацыянальныя спосабы лячэння, так і сімвалічныя. Аднак у рамках сваіх даследаванняў беларускія навукоўцы разглядалі пераважна традыцыйны пласт народнай медыцыны. Яе функцыянаванне ў паваенны перыяд у айчынным народазнаўстве засталося маладаследаваным. Гэта датычыцца як цалкам беларускай тэрыторыі, так і асобных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў краіны.

У дадзеным выданні прадстаўлены комплекс матэрыялаў, якія адлюстроўваюць стан народнай медыцыны Паўночнай Беларусі ў пасляваенны перыяд. Усе матэрыялы былі ўзяты з архіву Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай. Варта адзначыць, што публікацыя матэрыялаў па дадзенай праблематыцы з архіва ўжо адбывалася ў першым выпуску “Полацкага этнаграфічнага зборніка ” (2006). У ім некаторае адлюстраванне знайшлі таксама і матэрыялы, якія раскрываюць асаблівасці функцыянавання народнай медыцыны ў пасляваенныя гады.

Як паказвае аналіз этнаграфічных крыніц, у тым ліку і матэрыялаў палявых даследаванняў, у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў насельніцтва Паўночнай Беларусі ў лячэнні значнае месца па-ранейшаму адводзілася народнамедыцынскім практыкам. Згодна з ўяўленнямі насельніцтва, ўвесь

[19] Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1 / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – С. 13–14.

комплекс хвароб, у залежнасці ад этыялогіі, можна падзяліць умоўна на дзве часткі. Да першай можна аднесці лячэнне хвароб, прычынай якіх сталі жыццёвыя натуральныя выпадкі. Да найбольш распаўсюджаных хвароб гэтай групы адносяцца вывіхі, удары, пераломы костак і г.д. Да іншай жа групы адносяцца хваробы, прычынамі якіх лічылася ўздзеянне варожых сіл, парушэнне каляндарных забарон, уздзеянне на чалавека тых ці іншых "дэманаў хваробы" (персаніфікаваных вобразаў хвароб). Сярод найбольш распаўсюджаных хвароб другой групы ў насельніцтва рэгіёна варта вылучыць "сурокі" і "ўпуд"[20]. Такім чынам, яшчэ ў паваенны перыяд усе хваробы можна ўмоўна падзяліць на натуральна-побытавыя і магіка-міфалагічныя (ці "звышнатуральныя" і "натуральныя"). Нягледзячы на істотную трансфармацыю ўяўленняў пра хваробы і спосабы іх лячэння ў насельніцтва рэгіёна ўяўлення пра магіка-міфалагічную этыялогію некаторых хвароб працягваюць фіксавацца і ў пазнейшыя перыяды. Палявыя этнаграфічныя даследаванні ў рэгіёне, праведзеныя ў канцы XX – першых дзесяцігоддзях XXI ст., сведчаць пра іх функцыянаванне ў сталага сельскага насельніцтва і на сучасным этапе.

Аналіз палявых этнаграфічных матэрыялаў паказвае, што істотнае значэнне народная медыцына прыпісвала рацыянальным сродкам лячэння і папярэджанні хвароб. Асаблівую ролю адыгрывалі лекавыя сродкі расліннага паходжання, таму лячэнне многіх хвароб, як гэта вынікае з аповядаў рэспандэнтаў, у пасляваенны перыяд ажыццяўлялася вылучна пасродкам лекавых раслін. Аднак у палявых матэрыялах гэтая сфера народнамедыцынскіх ведаў не праяўлена так шырока, як сімвалічныя спосабы дыягностыкі і лячэння хвароб. Аналіз этнаграфічных крыніц паказвае, што значны комплекс лекавальных аперацый па-ранейшаму насіў сімвалічны характар. Галоўным чынам, сімвалічныя спосабы лячэння былі звязаныя з феноменам знахарства: менавіта знахары ажыццяўлялі гэтыя метады лячэння.

Мадэрнізацыйныя працэсы другой паловы XX – пачатку XXI ст. не спрыялі захаванню традыцыйных спосабаў лячэння ў сельскім грамадстве Паўночнай Беларусі. Калі яшчэ ў першыя пасляваенныя гады маладаступнасць да медыцынскіх устаноў спрыяла захаванню шматлікіх праяў народнай медыцыны, то ў наступным сітуацыя істотна змянілася. З развіццём сеткі медыцынскіх устаноў і распаўсюджаннем медыкаментозных сродкаў неабходнасць карыстацца традыцыйнымі спосабамі лячэння адпадала. Але ў той жа час яшчэ ў пачатку XXI ст. сярод вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі па-ранейшаму фіксуюцца праявы народнай медыцыны.

***У. Я. Аўсейчык***

[20] Валодзіна Т. Хвароба // Беларуская міфалогія: энцыкл. сл. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 530–531; Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1 / склад. А. У. Лобач, У. С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – С. 20.

***

[*А вот после вайны? Ціфам не балелі?*] Нет, не балелі. [*А вот чэм балелі?*] Кароста. Ой, балелі! Ей сама перабалела. Вшэй поўная галава, кароста спанавала, усё сцянула. Ой! [*А как лечылісь?*] Абмазывалісь нейкай маскай. Мама варыла. Абмазывалі. Прыехала тут з Францыі сем'я адна. Срулі фамілія. Саруль. Прыехала сем'я і дзеці былі такія, – я іх знала, – і наабмазывалі дзяцей, дзевачак, маскай такой ад каросты, і дзевачкі памёрлі… Сказалі, што тут па рублю пшаніца, усё дзёшава, – ацец мой расказывал, какая там, ва Францыі, паліціка была.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1938 г.н. у аг. Друя Браслаўскага р-на***

***

[*А вот, говорят, лекарств не было, чем лечились?*] Дужа дорага было лячыцца, врачэй дужа что не было, а толькі частные. Ездзілі ў Лужкі, помню, там нейкі доктар важны быў, а бальніц тут дужа что не было. [*А, может, испуг?*] А эта ўжо бабкі. [*Расскажыте*] Ну, былі бабкі, алі я гэтага не знаю, я да іх не абрашчалася, а тык былі і памагалі ад рожы якой, і даже цяпер ёсць, старые передалі малітвы гэтым маладым, я вот знаю ў Дзісне ёсць, 60-га года.

***Запісана ў 2019 г. ад жанчыны 1944 г.н. у в. Завуцце Мёрскага р-на***

***

[*А як раней называлася? Можа, "падучая"?*] Падучая. [*А адкуль гэта хвароба берыцца?*] А бог яе ведае: хто кажыць – з пуду усяк бываець. І бываець, кажуць, і бярэменная чаго спужаецца, і рабенку тады врадзіць. [*А ці можна вылечыць?*] Ну не знаю, у нас, вот, Грыня хадзіў у школу, кідала балезнь, паехаў у Польшчу і, кажуць, вот у Польшчы вылечылі. [*А ці былі такія бабакі, што ваду давалі?*] Былі, а ці дапамагалі яны ці не, я не знаю. Вот яна даець ваду, а ці дапамае яна ці не? Але кажуць: ідзі к ей, яна табе дасць вады ці ад пуду, ці ад чаго. [*А ці былі ў вашай весцы такія?*] Вот, як мяне вужака ўкусіла, мяне, дык былі такія: ён, вот, нейкую малітву, ці што, ён замовіць і, кажуць, палепшыець. Гэта я прымерна кажу. Бальніц жа не было. Гэты не памог, – той умеець. Дык к другому сходзіць, і прахадзіла.

***Запісана ў 2009 г. ад мужчыны 1925 г.н. і жанчыны 1930 г.н. у в. Рачныя Докшыцкага р-на***

***

[*А ці былі, вот, тут такія бабушкі, што, вот, вадзічку давалі?*] Былі! Ад спуду давалі вадзічку. Рожу загаварывалі. Ад змяі загаварывалі. Еслі дзеці не спалі, “начніцы” называліся, тожа насілі к бабкам. Былі, былі. Быў яшчэ мужчына, ён гадаў. І вот мама мая пашла к яму, ужо бацька на вайне быў, фронт ішоў ваўсю. Пагадай ты мне, гаворыць, на руку. Ну ён ўзяў ейную руку і ей сказаў, што ўсе браты пагінуць, а твой Паўка прыйдзець жывы з вайны. І так спраўдзілася. Усе браты пагіблі, а ён прыйшоў адзін тока. Вот. І пацераеш ты пасля вайны чалавека, сына. І точна! Пасля вайны там поле такое і там было ўсё замініравана і, – ну, наверна знаеце, – што мальчышкі беспрызорна бегалі: можа, рыбу глушылі, можа, міну разражалі… І яго разнясло на дробныя кусочкі. Так хадзіла матка, у кофту сабірала, што асталося: дзе там якая галава, косці асталісі. Тады палажылі ў мінны яшчычак і пахаранілі. Вот, вот гэта было.

***Запісана ў 2016 г. ад жанчыны 1937 г.н.***
***у в. Казімірова Полацкага р-на***

***

[*А не было тут такіх бабак, што вадзічку давалі?*] Во, Мацееха была. Дзяцей вадой, хто спужаееца. І не было даўна. Адзін Шашок на ўсі Докшыцы, а яму плаціць нада. [*А хто такі Шашок?*] Врач. Адзін врач і ўсё. А па дзераўнях ніякіх врачэй не было, нічога. Людзі ж гэтак не балелі, цяпер інсульт, інфаркт. Патаму што врачэй не было дрэнных. Я слабым радзіўся, дык атміраюць, а хто сільны, той…

***Запісана ў 2009 г. ад мужчыны 1928 г.н.***
***у в. Стараселле Докшыцкага р-на***

***

[*Ну а вот пасля вайны, калі галодна было, ці хварэлі людзі?*] А вы знаеце што: хварэлі троху, і васпаленне было, мая мама сама ў склепе тожа адна хварэла, ей пашчі месяц банкі ставілі. [*Ну а ці вошы там?*] Вошы, – керасінам мазалі: часаліся. [*А дзе вы керасін той бралі, не было ж пасля вайны?*] Ну, я не знаю, даставалі ж недзека! Я не знаю, дзе яны бралі... Былі вошы. Знаеце, я паехала (у мяне была очэнь бальшая каса), і паехала я ў Полацк (мяне папа на кані, – нада брыцца). Цяпер ужо нет ў Полацке бальніцы тый, яе знялі. Вот, і знаеце, прыхадзілі ўсё врэмя, глядзелі; ёсць лі ў мяне вошы.

А мне мама кажыць: не давай атрызаць, патамушта як памрэш, не нада, каб абстрыжэна. Тык я не давала.

[*А вот ці былі тут такія бабушкі, што вадзічку давалі, лячылі?*] Былі, у Лажаншчыны была, дажа і мне гэта. [*А што з вамі случылася?*] Ну, тады ж, як гэта бамбілі, што спужалася: я не спала. Яна мне і ўсю праўду сказала. [*І што сказала?*] Кажыць, – я ж яшчэ ляжала, – яна да Храстова вылечыць, яна мне ешчо плацце пашыець. Мама хадзіла, а ішла з адный із двораў, ну, ўдваіх, у яе сына там што-та не было: з арміі ці з вайны, ці што. Гэна ўзяла ці не дваццаць яек, ці трыццаць, – я не знаю. Тады ж яйкі былі, і каровы, і куры былі. Ну, ідуць, а мама, – у яе палатна (даўней ж ткалі) трубачка гэта, на рубашку якраз, гэта яшчэ не пашыла. А яна кажыць, хоць бы мая дзяўчынка паздаравела ды яна паспала, ідзець яна, сваё думаець, мама, а эта: "Ай, хваціць і дзесяць", – палажыла каля камня. – "Як пойдзем назад – вазьму". А яна, гэта баба, усё ей сказала. Яна шла, а сказала: "Я гэта палатно тваё браць ня буду, ты ішла і ўсё врэмя малілася, каб твая дзяўчына паздаравела. Яна, – гаворыць, – выздаравеець. Я ей тока дам вады ад іспугу". А яшчэ сказала: "Калі пойдзеш дадому, яек тваіх не будзе", – саседке гэтай. [*Ня ўзяла? А так парадак быў, які падарак даць за вадзічку?*] Ну, давалі што-небудзь. Ну, там, хто што, хто грошы. [*А ад чаго яшчэ тая бабушка памагала?*] Ну, усё яна памагала. [*А як змяя ў лесе ўкусіць?*] І гэта яна памагала, усё-ўсё [*Ну, а вот як сурочыць чалавек?*] І еслі сурочуць. [*А што эта за залатнік такая хвароба?*] Залатнік, – гэта, навернае, грыжа. Мне думаецца так. [*А валасень ці валаснік?*] Да, валасьнік. Гэта, гаворыць, валасы не нада ў ваду дужа кідаць. [*А то што яны могуць?*] А то тады можуць у пальцы… На калосіка, на жытне загаваравалі, – і тады стока многа гэтых валосікаў вылазіць! [*А вот, можа чулі, пра такога Далмана, западнага?*] А-а, Далман. Мама дажа ездзіла, як мы ў склепе былі. Ну, ездзіла. Я ж не аперыравалася яшчэ, асколкаў многа было, а ён сказаў, што "я яе ня вылечу, яе врачы вылечуць". І тожа сказаў, што "прыйдзеш, нічога нікому не давай, вады ей дам ад іспуга, ад усяго". І точна, к нам тая бабка пашла.

***Запісана ў 2020 г. ад жанчыны 1930 г.н.***
***у в. Кублічы Ушацкага р-на***

***

[*А вот, можа скажыце: раней жа ўрачэй не было, як цяпер, самі ж лячыліся, пэўна?*] Самі прымерна. Еслі ты спугаўся, то ніякі врач не поможыць. Да. Што ў цябе разыйшоўся нерв, еслі ты іспуганы, дык я, як гэта гаворыцца ды прыйшло да разгавора, я сколькі людзям памагала, еслі ты сарваўся прымерна: як старыя робяць што-нібудзь, такую работу, сарвецца ў цябе

жалудак, ну і ён тут ужо дзе ў цэнрты, яго нет. Ён ужо не таўхаецца, ён ужо дзе-то прыспасабляецца. Пачаму цяпер жа многа забалеваній гэтых? Ну, жалудкаў такіх, бываюць, што ён не ў сваім месце апрэдзеляецца – і ўсё вот, гаворaць, “вывіх”, “рожа” бываець такая, што яна не… Ну, ня гэтыя! Не, не злечыцца інач. [*Можа, якія словы, вот, казалі, вот, калі вылечвалі?*] Абязацельно. [*А можыце, можа, узгадаць гэтыя словы, ну вось што гаварылі?*] Гаварылі што вот вы, маладзейшыя усе. Я скажу вот так:

Рожа-ражавіца, харошая дзявіца,
Рожа вадзяная, касцяная, урочная, улечная,
Пабежная, пасмешная, култанавая, усякая разная,
Ты хадзіла-бушавала, пака дух мой не ўчувала.
А ты, рожа, выхадзі! Корні, (прымерна, Пецькі), не сушы!

І ўсё. Бог на помашч, і з легкім духам! Гэта табе і ўрач не паможыць, патаму што яна гэта. У нас быў прэдседацель, ужо ён і ў Віцебску быў, ужо ён памер. Друг ягоны, – 85 гадоў сёлета, – год ешчо толькі ці прашоў, як ён памер. Ну і што тут у нас, у калхозе гэтыя? Я сама робіла у калхозе, ну, брыгадзір, памошчнік начальніка участка. Я па такіх, на такой рабоце, я 20 гадоў робіла. Ну і вот, сабранне ў нас: ён ужо то чарнеіць, то бялеець – сядзіці на гэтым у нас, на сабрані, ну, (а ён паехаў у Віцебск – яму парэзалі гэты палец). Усё. Ну, я тады яму сказала, ён жа прэдседацель, а я тожа па рабоце па сваей з народам жа роблю. Ну, вот яго павела к адной бабке – не палучылася. Тады к другой, – ну вот і ўсе! Астаўся. А так і не знаю, што з яго было. Яго б, можа, яму рэзалі, выразалі, атразалі саўсім той палец! Яго і, гэта, а як каторая, ёсць такія ўрачы, яны дажа гаворaць, што нада абраціцца куды-та па кустарному, гэта ты не паможаш. Вот іспуг дзецкая становіцца, вот рабёнак. Во время спахваціўся ты, – памогуць. А еслі не? Сколькі есць такіх, не пра нас і не пра вас сказана, сколькі такіх ёсць, што, ну, дзецкая гэта балезнь. Іна даходзіць да таго, што чалавек ідзець і будзець падаць, і ўсё – у яго прыступы дзелаюцца. Гэта тожа бальніца ня можыць. У нас у жэншчыны такое палучылася. Іна на работу хадзіла, усё як нада быць. Яна на пенсію пашла: вот, ілі с іспугу ей калі стала, ілі што – яна ў Віцебску стаіць на ўчоце дажа. Ну, дык ей сказалі гэтыя таблеткі, штоб ужо спіртных гэтых, штоб ужо ні бралася, кроме голага напітку, значыць. Гэта і утрам, і вечарам гэтыя таблеткі нада піць, так. Ну, усе раўно, іна на галаву, а ў яе ўжо началіся такія прыступы: дажа яе дзержалі, ну, і такой атвазілі ў бальніцу. Цяпер ей на галаву дало: іна як рассееная, гэта бяз гэтага не абойдзецца. Раншэ гаварылі, вот, дзяцей вазілі. Цяпер жа столькі не ражаецца, як ранше ж, па столькі дзяцей ражалася. О, Божа! Ну, дык гэтыя вазілі па бабках. Цяпер ужо дужа рэдка найсці такіх

старыннных гэтых бабак, – усе ўжо гэтыя. А маладыя – гэтага не. А вот, еслі вазілі дзе ўжо падсаветваець, ну іна загаварваець, усё дзелаець, а тады гэтыя яны ўжо едуць дамоў: рабенак заснуў, значыць яму пайшло на пользу, еслі не – значыць нет.

[*А вот скажыце, валасень – такая балезнь, – як яго лячыць?*] Валасень тожа ізлечваўся толькі загаворамі. Вылівалі на жытніі каласкі, прыгаварвалі во гэта. Гэта тожа лечыцца гэтым. Ізвіх, гавораць, там, тое расцяжэнне жыл. Усё, бываець абычно, ну, абамкнешся нагой неправільна, станешь ці ў костачцы, ці ў пальцы-дзе, ці што, ну і што? Яны – "расцяжэнне", "расцяжэнне", ну, усе раўно, гэта гэтаму. Усе такія вот, ат іспуга. Ну, урочная бываець балезнь такая: вот, еслі хто паглядзіць, ці што, і ў дзяцей бываець, што, ну, тожа. Ну, многа кустарных гэтых. [*А ўрокі вот, ад чаго яны? Гэта спецыяльна ці такі мамент можа быць?*] Што гэта? Урачэць нехта. А хто-нібудзь, мінута такая, можа быць? Так і скаціне, так і людзям, як пры на сказана, мы ж дзержалі скаціну. Любому. І рабёначку можа быць. Ну, каму хочаш. Вот, ілі што-нібудзь падумаў, ілі мінута папала, ілі гэтыя вот, гавораць, на такія людзі "ўрэдныя". Раньше ж усе время кармілі. І вот, матка корміць-корміць рабёначка, а тады адымаець, адучаець ужо ад грудзі. Ну а тады яна яго пажалела, – яшчэ раз дала чэраз прамежутачык, яшчэ малако не прапала. Яна стала, – вот гэтыя, гавораць, дужа врэдныя людзі, каторыя два разы адымаюцца. Дужа вока тады, ну і мінута можыць быць дрэнная. Сейчас вот табе сдзелаецца кружэнне ў галаве, – вот такое усе. Рабенак можыць крычаць, аж з сябе. Нада змыць яго, дажа без шоптваў. Ну вот, ліюць тады вадзічку, наотмаш мыюць, ну усе такое, – ты знаешь, без гэтага не абходзяцца. [*А не казалі там, падалом сціралі?*] Ну, бывалі. Ну, бывала і так. Ну, дажа і ўсякая. [*Ясна, а вот можа яшчэ такія балезні? Гаворaць вот, "вогнік" такі. Ня чулі?*] Ну гэта вот вогнік. Я прама загавор не чула такі, гэтыя абычна ў хаце, як адмачвалі вокны, такія пуцікі цякуць. Тады гэтыя яны гэта бяруць і намазваюць гэтым і кажуць… Гэтай, як іна называецца? Ай, вот як ўжо помніла сказаць! Як яны гавораць, што гэтыя і тады мажуць гэтым па акну, гэтымі пуцічкамі, што яны такія адстаюць. [*А вот, можа чулі, такая – калтун на галаве, такія валосы скруцяцца?*] Вот гэта дужа ўрэдна, еслі стрыгуцца валасы – выкідаюць, а з іх птушкі уюць? Забіраюць птушкі ў гнезды? А гэта нельзя кідаць. Тады галава будзець балець. Да, і будуць звівацца. Гэта счытаецца – калтун. Ну, гэта, гэткіх я… Дажа не знаю я такіх загавораў, але знаю, што гэта нельзя. Нада ўсегда спаліць, не кідаць.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1938 г.н.,***
***мужчыны 1937 г.н. у Бешанковіцкім р-не***

***

[*А якія яны балезні лячылі?*] Ну, бабкі лячылі, знаіця, ад балезней. Ад упуду – гэта ў первую вочарадзь. І ад сырвы: сарвесся, а ў дзіреўні цяжка работа. Во ў нас тут во ёсць бабка, я ўсё пасылала, ну яна тожа памагаіць. Вот маладая, а наўчылася: матка ейная шаптала. Ну яны малітвы чытаюць, – і памагаіць. Ад пабояў, во рыбята, што паб'юцца – сіняк здзелаюць, балючы. Бабка прыйшла, пашаптала, "давай кампрэсік яму паложым, – пройдзецць". Глянь – і прайшло. Ну ён пабіўся, не паламаў, а пабіў. З пабоеў бабы памагалі, рожэніцам памагалі. Раньшэ ж радзілі, вот жа дома. Я і свайго мальчыка, я ж радзіла першага, ну, на дваццатым годзе. Ну, якое пітанне тады было? Што тады, – што тады.

***Запісана ў 2014 г. ад жанчыны 1927 г.н.***
***у в. Соржыца Бешанковіцкага р-на***

***

[*Ну вот, а як дзіцёнак спужаецца даўней, як вот лячылі?*] Бабушкі. Даўней бабушак гэтых многа было. Жабракоў было і бабушак. Ну, жабракі не лячылі, а есці хацелі… Сыны, як цяперака – прыстарэлы дом, еслі дзеці не хочуць. А калі дзеці добрыя – к дзіцям. А даўней жа сынам цяжка было. Сваі дзеці, пяцёра там ці шасцёра, а даўней ні панімалі этыя аборты, раджалі і ўсё. Сямёра, васьмёра, дзвеннаццаць дзяцей – многа. А карміць жа нада, а тут яшчэ старая гэта. Так яны піхаюць іх да сына, да другога ідзі, па-вочарадзі, па месяцах даець этай бабі… Дык і ў жэбры ўхадзілі. Вот і торбы чараз плячо… Як Дзяды, – цяпер жа памінаюць на магільніку, – а даўней паміналі эты старанькія бабкі.

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1930 г.н.***
***у в. Дзедзіна Докшыцкага р-на***

***

[*Рожа прыключылася?*] Да, вот тут, за магазінам, лён быў. А ў меня так спрытна палучалася: я і на адну руку рву, і на другую. А некаторыя только адной рукой могуць, а я – то на гэту, то на гэту. А якраз хлебны дзень быў, людзі стаялі каля магазіна ды глядзелі, а я – напроць магазіна. А потым з начы ўстала, і ў мяне ўскочыў тут сіняк, як скуліны, сіні вудыр такі! Я пайшла к жэншчыне загаварываць. Яна загаварыла і кажа: "Гэта ў цябе рожа". [*Так гэта нехта так сурочыў?*] Да, сурочыў нехта, глядезлі і нехта сурочыў. Ад суроц бываець ўсяк.

***Запісана ў 2020 г. ад жанчыны 1931 г.н.***
***у в. Лажане Ушацкага р-на***

***

[*Раней врачэй не было, лячыліся, пэўна, самі?*] А врачы гэта, знаеце, як хто захварэіць – не так гэта лёгка. Нада, каб дужа багаты быў лечыцца. [*А тады, можа, такія бабкі былі, якія лечылі?*] Можа і былі. Тамака, як нашы казалі, там, Ушачамі, дак баба. Ездзюць, кажуць, вылечваюць многа каго. [*А вот ад кіх яна хвароб лечыць?]* Ад упуду, казалі, там. Ад усяго. Аж там, пад Ушачу, гэта, ездзюць. Тут у нас няма, так загаворы ёсць ад рожы. [*А вот рожа – што гэта такоя за балезнь?*] Вот мой сын, тожа ўжо пад 60, 2 гады толькі да пенсіі. Дак казаў, як шчака распухла, сёлета ўвосень, но ён жа верыць Богу. Пайшоў да бабкі – загаварыла. Раз, другі раз – і ўсё. Дак мне самой многа чаго. Во гэдак раз шчака, раз нага распохла, паехала да бабы загаварыла яна 2 разы, і нага – пухліна адпала. [*Ад чаго гэта рожа бываець?*] Ад холада, ад усяго. [*Ад холаду?*] А хто ж яго ведаіць? Вот, зробіцца. [*А вось такія балезні, як валасень, ці валаснік?*] Ну валаснік, нейкія ёсць тожа хваробы. Тут у нас, ён са мной, памёр ужо. Так яму той валаснік пяту выеў. На назе, ну, пята гэта. Дык як сталі выліваць: на ваду, там, каласкі нада, і як popстануць глядзець: там глаза добрыя нада, – маленькія ёсць. Як сталі глядзець, яму нага як забалела, як сталі выліваць, – гэтыя валаскі выхадзілі, валаснік выядаў. Ну і нага зажыла, ну але пяты не было добрай, – такая. Ён памёр. Мы разам малыя гулялі, так ён кажыць: “во ў меня якая пята”. А матка тады вылівала яму. Нада каласкі с жыта, тады на ваду, на цёплую, над нагой выліваць… Во якія было. Дык нагу выеў, што і пята гэта некрасівая. Ну, і хадзіў жа ж, усё...

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1929 г.н.***
***у в. Хралы Глыбоцкага р-на***

***

[*А звіх, як вот, звіхнул, там, нагу ці што?*] Нітку давалі з лёну. Нітку, такая палатняная нітка, загаварывалі і на кажны сустаў узялок вязалі і прахадзіла, нада прывязаць к наге – і пройдзець. [*А як дзічы на руках? Барадаўкі?*] Барадаўкі, гаворать, камні пад параг нада было закапаваць, пасчытаць сколькі… Ай, гэта няпраўда, я гэтак робіла – не памагло. У мяне былі, самі сыйшлі. [*А зубы як балелі сільна?*] Зубы мне загаварываў, старык такі быў. Пілемон яго звалі, ён сказаў: “ідзі па дарозе – найдзеш камень, дзе кола па камянні па гэтым ездзіць, вазьмі гэты камянёк і ні с кім не гавары, і нясі, прылажы к зубам, к роту, а тады назаўтра пад плот яго закапай, каб ніхто не хадзіў, палажы”. І праўда, у мяне перасталі зубы балець. [*Так які камень*

*трэба ўзяць было?*] Ну, вот даўней ездзілі на конях, на калёсах, а кола дзе ідзець, і ў гэтым камянёк ляжыць. [*У каляіне гэтай?*] У каляі гэтай, да, гэты камянёк узяць і тады палажыць к зубам і падзяржаць, і пад плот закапаць, каб ніхто не хадзіў па ім. І памагло – перасталі зубы балець.

***Запісана ў 2020 г. ад жанчыны 1931 г.н.***
***у в. Лажане Ушацкага р-на***

***

[*А вось, можа, у вас такі вопыт быў, калі дзіцёнак малы спужаецца?*] А як малы спужаецца, куруць толькі гэтымі, зёлкамі. А як спужаецца… Можа, і не знаю. Ад пуду загаварваюць. [*А як на скорую руку?*] Ну вось, як захварэе, нада гэта курыць яго гэтае дзіця. [*А калі яго там сабака спужаецца?*] Ну, гэта ж ад пуду шчытаецца. Курыць нада яго. [*Там не абстрыгалі…*] Поўсць абстрыгалі, тожа на гэты вугалькі ад сабакі ад гэтага. А вот я ж забываюся, а вы напамінаеце. Стрыгнаць нада на вугалькі і зёлачкамі гэтымі пакурыць. Стаць над гэтым во, каб ён дыхаў, і дымок гэты во глытаў.

[*А яшчэ кажуць, такая хвароба была, ну і зараз сустракаецца "валаснік"?*] А гэта валасень у пальцы – не дай Бог. Во, не валасень, а проста так выбаліў. Во і значок яшчэ ёсць, дужа балеў доўга. [*А што за валасень?*] Ну, гэтае во гняець вялікі палец. [*А адкуль бярэцца?*] Ай, ну ад некуль, я ж не скажу. Не знаю, ніхто не расказваў. [*А як, ці лечылі бабкі?*] Лечылі, неяка вылівалі, ня ведаю, навошта гэта, такія з гэтага, ну як вам сказаць, такія, як чарвячкі выхадзілі. [*То есць волас?*] Да, воласы гэтыя.

[*А даўней не казалі, не было ў вас такой хваробы "калтун"?*] Ой! Калтуны ёсць, ён можа і цяпер ёсць. Я сама насіла. [*А што гэта за хвароба?*] Во, валасы саўюцца, во і калтун. Еслі галава баліць во каму, кажуць, трэба запусціць гэты калтун. А цяпер ж гэтаму ніхто не вераць, гэтаму, не робяць. Абстрыгаюць. Галава баліць і баліць, лечуць. Мне дужа балела галава. З маладосці так балела галава, што я нічога не магла, – ні робіць, нічога. Мне пасаветавалі, кажуць: запусці, а ты не сячы яго. А ты, – кажуць, – як няма, так не зложуцца валасы ў месца… Панімаеце? А калі цябе ўжо нада, калі ён ёсць, – ні пачашэш, ні разбярэш, – будзіць звівацца-звівацца, хоць там яго хоць ножам, хоць тапаром сячы – нельзя. [*І ён выйдзе?*] Яго нада год насіць. А тады ён ўжо як яму ўжо сойдзе срок, так ён ужо сойдзе, – атрастаюць валасы. А так ён так прыльецца к галаве, і такі крэпкі, што носіш жа гэтак. Ну і я тожа насіла. Мне з маладу. [*І ці дапамагло?*] Ну не знаю, я ж насіла год, а тады абрэзала, у печку кінула. [*А можна абразаць?*] Ну, кажуць, яго нада, пакуль ён сам не стане адхадзіць. [*І потым гэты кор ужо адходзіць?*]

Ага, гэтыя валасы адрастаюць, і суніца на ніз. Не зжымаець ужо болей. Ужо усе валасы бярэць у месца. І часацца нельзя. [*А потым яго зразаюць і ў печку?*] Да. Адрэзала і ў печку кінула. Я сама не зрэзала. Мне сястра зрэзала, была ў меня, кажыць: "Давай Ліда я цябе зрэжу, надаеў ён цябе, зрэжам і гэтак". [*А гэта ён ўжо апусціўся? Ну, ён ўжо адходзіць?*] Да, адхадзіў. [*А калі раней зрэзаць?*] Ну, раней жа не разрашаецца. [*А што будзе?*] Тады хужы можа быць. [*Яшчэ?*] Да, можа яшчэ. Ён у сваё врэмя нада каб быў. Год, а то, можа, і болей носюць. Я многа знаю бабак з гэтымі калтунамі было. [*А не расказвалі, ад чаго ён бярэцца?*] А, ну кажуць во ад растройства, ад пуду. Бальшынство ад гэтага. Толькі ад гэтага можа быць. [*А не расказвалі, што ў кожнага ёсць, але…*] Не, ну не знаю, ці ў кожнага ён ёсць, ці няма. Но ні кожны жа носіць яго. Можа, ён ісць у каго. Ён, еслі не нада, не зложыцца. Чашы яго, ён будзе расчэсвацца, чашы яго хоць як а ўсё ён не скрапаецца. Нада – не пачашы дзень-два, ён ужо пачынае ціскаць валасы. Сціскаць, сціскаць у месца. [*А гэта больш у жанчын?*] А ў мужчын, я не знаю, ня чула, каб у мужыкоў. [*А што так выходзіць, што ў мужыкоў няма, ім што, галава не баліць, а ў жанчын?*] Мужыкі ж ня носюць валасы длінныя. [*Гэта можа яшчэ ад таго, што валасы длінныя?*] Да, у мужчын жа валасоў дліных няма, за што шчэпіцца? А ў жанчын валосы. Вот. Кажуць валосы длінныя, а ўм каротак. Прыказка. А ў вас, можа, даўгія?

<…>

[*А яшчэ не расказвалі пра такую хваробу "радзімец", "радзімчык"?*] А я не чула пра такую. А, урадзімчык каторы. Калека, ці як там. Урадзімец, кажуць, гэта зробіў. [*А што гэта?*] Ну, бальныя родзяцца. [*Бальныя родзіцца?*] Да, да. Гэта ўжо з роду. [*А ад чаго гэта?*] А ўсяк можа быць. З усяго. Можа і па наследству. [*А па наследству – гэта як? Гэта вінаваты бацькі?*] Да, бацькі. [*А што нельга рабіць, каб такі радзімец не быў?*] Ня можна аборты робіць, як жанчынам. [*Нельга аборты робіць?*] Да, можа на дзяцей атражацца. Нельзя.

[*Даўней казалі яшчэ пра хваробу звіх, як руку звіхенеш.*] Ну, бывалі. [*А што рабіць, як руку звіхнеш?*] А там можа што пацягваюць, ці можа што ў бальніцах робюць. У мяне гэткага не здаралася. [*А яшчэ во кажуць, што неяк калі многа рабілі ў полі, рука развівалася?*] Да, да. [*А што рабілі?*] Спохне ад сярпа. Я тожа жала сярпом. Ну, навязь навязвалі. [*Навязь, аткуда бралі яе?*] Вот ёсць такія бабкі, што знаюць. Так яны вот так сюды на руку прывяжуць і ўжо тады. [*Гэта нейкія нітачкі?*] Нітачкі, да. [*А што гэта за нітачка?*] Ну, нітачку возьмуць проста, прастую, не цяперашнюю, што нітку. І гэтак завязвае, шэпчыць, і гэтак на руку. Паходзіш, – і легчэ з гэтай нітачкай. [*А потым куда гэтую нітачку?*] А ў печку кінуў і ўсё. Яна ж не святая.

[*А яшчэ, кажуць, у дзяцей у малых больша, можа быць вогнік?*] А гэта вогнік, гэта нейкая хвароба. Я чула, але не знаю. Не было гэткага ў дзяцей маіх. [*Яшчэ вось, калі малыя дзеткі не спяць, крэпчуць, кажуць крэптуны такія.*] Можа і ёсць, што такая плаксіва. У мяне сын сем нядзель крычэў. [*А тады што рабілі?*] А тады ў цэркву паехала і ўвілася. Эта нада ўвадзіць. Бацюшка ўводзіць, не перахадзіць у цэркву, а бацюшка выходзіць, моліцца, а потым за руку ў цэркву ўводзіць. [*Гэта вас? Гэта вам нельга было так называецца, увадзіць трэба было?*] Да, так як ўвілася… [*Праз сем нядзель?*] Так ён сем нядзель крычэў, не было спакою, а патом як у цэркву знасіла і стал спать, і стаў папраўляцца, як бацюшка памаліўся і ўвёў у цэркву, так стаў малец расці. [*А калі дзіцёнак крычаў, можа бабкі?*] І бабкі нагаварвалі. І ў Бірулі насіла, бабка была, і ў зёлках усякіх купала, ён летам радзіўся, усякія цвяты ўжо былі. На пар пакладу ў вадзічку, усякія кветкі. Што не робіла, – пака ў цэркву не знасіла, не ўвілася.

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1932 г.н.***
***у в. Несцераўшчына Докшыцкага р-на***

***

[*А бабкі нічога не раілі? А бабак не было такіх, што лячылі?*] Не-а. І не лячылі. Гэткія. Ці яны людзі самі апусціўшыся былі. Варам бы во абварылі яны пад прыпечкам дзе, на печы. Два катлы заварыла вады дый абліла іх. [*А што зусім не было такіх бабак, якія там вадзічку давалі? У Вас у Таргунах ці былі такія?*] Ну мая бабка тожа ваду гэтую шаптала. [*А яна толькі сваім?*] Дык хоць і чужым рабяткам ад спуда, дык яна памоліцца. “Отчэ наш…” ці якая там была, можа, яшчэ малітва ад вады. Давала ваду, прыхадзілі к ёй. Яна грошай не брала: хто што такмака дасць, можа там дваццаць капеек еслі… [*Толькі ад спуду ці яшчэ можа што-небудзь?*] Не. Гэта ж яна чараў ніякіх не прызнавала. Былі ж усякія людзі. А яе зналі ў дзярэўні! І скажуць: “Яна ж лепей чараўніцаў гэтых”. [*Гэта чараўніцай называлі, што людзей лячыла?*] Чараўніца, скажуць, а яна: “Не. Я нічога не чарую”…

[*А ці было ў Вас такое, што, вось, дзеці малыя і не спяць, крычаць? Можа казалі, што гэта начніцы?*] Во было, і памёр мальчык у мяне. Можа я сама вінавата. Падняла сала. [*Гэта калі яшчэ цяжарная Вы хадзілі? Паднялі цяжкое?*] Я ўжо апаследняе врэмя хадзіла. Мусіць, там нядзелю ці болей да родаў было. І врачоў жа не было, нічога, так я бабак звала. Гэта залоўка мая старая, было ёй восемдзесят гадоў… Ці семдзесят пяць… [*Гэта ўрачоў не было, так бабак запрашалі?*] Ну, дык яны ў мяне пабудуць. Не было не бальніц, нічога. [*Дык а як гэтых бабак звалі, што вось так прыходзілі да*

*жанчын? Можа там павітушкі ці там бабкі, як іх называлі?*] Ну, пры родах ходзюць. Скажуць вот так. [*А хто першы раз купаў: бабка ці?..*] Бабка нядзелю была кала мяне. Купала майго большага мальца. [*Яна купала. А што яна яшчэ рабіла, як народзіцца дзіцёнак, што робіць?*] А мужык падойдзіць паглядзіць. Ён жа ўжо старэйшы быў, так можа любіў, што мальчык. Падыйдзець паглядзіць, а ён плачыць і плачыць. Ну можа ўжо да гэтак, як з воч ці што. [*А як з воч? З урокаў, да?*] Як урокі, кажуць, можа заўрочыцца. Ці ён пацешыцца так. [*А гэта бацька так пацешыцца і дзіцёнак?*] Можыць быць, можыць. Такое можыць быць. Дык яна, скажа, ты, каб не паглядаў на яго часта. [*Дык што гэта: і бацька родны можа сурочыць?*] Вот можа. Любы можыць. [*А нічога не казалі вот, што можна зрабіць, каб дзіця не сурочылі? Можа там якую булавачку зашпіліць?*] А во ну гэта казалі, да. Прышпіліць. Шпіляць у падол дзе-небудзь…

**Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1927 г.н.**
**у в. Несцераўшчына Докшыцкага р-на**

***

[*А вось раней сярпамі жалі, а вот як рука разаўецца?*] Як рука, дык яшчэ нічаго, а як спіна. Первы раз як сярпом заложыш і вядро такое к спіне звяжаш, прывяжаш каб спіна не балела, вот тады і жнеш. Даўней не так, як цяпер, такая выгада людям, а мы вот як пачнем жыта жаць… [*А вось як дажыналі жыта, можа, там на полі пакідалі якую бараду, як там называлася?*] На полі нічога не пакідалі, астаўлялі толькі маленькі шматок. Звяжаш, прынясеш – гэта ўжо гаспадар у хаце. І гэты гаспадар стаіць датуль, пакі не стануць вазіць жыта ў пуню. Як стануць вазіць, так гаспадара нясеш туды стаўляеш і тады жыта складаеш. [*Не, гаспадар – гэта толькі як пачыналі, а як сканчалі, што рабілі? Можа хлеба клалі краешак?*] Не, нічога, як сканчалі ж ўжо нічога. [*Ці, можа, бараду?*]

[*А вось такая хвароба жоўтачка?*] Жаўтуха? [*Што гэта?*] Пасля вайны рабіла санітаркай дзеравенскай, дык таблеткі разнасіла. [*Ну а залатнік?*] Ай, гэта я не чула. [*Падрыў.*] А, залатнік! А гэты залатнік, сынок, у мяне самой было. І гэдак жывот балеў. І вот паехалі ў Вольберычы, такая дзярэўня, там старыц быў. Гаварылі, што ён загаварваець. Взяла водку, самагонку і паехала. Ну, ён паглядзеў на мяне, а тады сказаў: "Ну, заплоціш добра – вылечу цябе." Ну вось ён. Я кажу: "Дзядулька, я заплачу, толькі вылечы. Самая што ў гадах, дзеці малыя былі, робіць нада". Ён пайшоў, наліў у бутылку вады. Доўга недзе быў, а потым прыйшоў, балтнуў гэту бутылку і гаворыць: "Глядзі, хто цябе зробіў, баба ці мужчына?" А ў гатаў бутылкі галава бабы –

платок завязан. Поўнасцю відаць – баба. Вось гэта жэншчына. А хто гэткі? Я думала хто гэткі? Там жа ж не напісана хто там такі. А гэта была баба, якая са мной ездзіла. Яна ж маладзенькая, ей жа хочацца знаць, яна будзе абхадзіць гэтага чалавека. А вось я табе, дзетка, скажу: як прыйдзеш дамоў, яна к табе прыйдзе, прынясець тры разы. І вот знай, што гэта яна табе зробіла. Ну добра, я прыехала. Яна прыходзіць, саседка мая, прыносіць яйцы і кажа: "Я брала ў табе яйцы, табе не было, я бабке не стала астаўляць, прынясла цяпер." Ну, я кажу: "Прынясла, добра." Тады пасля хлопцы прыйшлі, мая малодшая, з той хадзілі, а тады мая падбягае і кажа: "Мама, хлопцы прыйшлі з бутылкамі, каб выпіць, каб закусіць." Ну, я ей кажу: "Глядзі там сама, я замарылася". На пякоту шлі, мы пакуль там пабылі, так снег растаяў, сагі чуць прыцягнуў дамоў, а мы на пякоту ўжо шлі з гэтай бабай. Кажу, я замарылася, ідзі. А яна кажа: "А дзе ты была?" – тая баба пытаецца. А я кажу: "К саседзям у Стараселле". Я ж не прызнаюся ёй, дзе я была. А яна кажа: "Валечка схадзі, мы купілі талерачак новых, прынясі, хлопцы ж чужыя, а ў Ліды старыя талеркі". Яна пайшла гэтая дзяўчына, прынясла талерачак ужо ў мяне на памяць: два раза прыйшла. А ён сказаў тры разы. Тады тая баба пайшла паглядзела на стол, што тады чаго, і кажа: "А капуста ў цябе ёсць сырая?" Я кажу: "Ёсць, але яна ўжо ў бочцы на дне і ўжо няўкусная, толькі варыць". "Валечка, схадзі прынясі мне качан." Тая дзяўчына прынясла, вось я ш ужо тады і дагадалася. Яна не мне робіла, а хазяіну майму, а мне паўліяла. [*Так што і залатнік можна падробіць*]. Да, да ўсё. Залатнік гэты, дзетка, і ён мяне ненавідзеў бы. Хазяін мой. Гіркаў дужа, мацярыўся. [*Падробілі?*] А залатнік, ён само сабой. Залатнік мяне лячыў: яйка, соль і водку. Сто грам і загаварыў. Гэта ўжо даў мне выпіць, соль у гарэлку ўсыпаў, размяшаў, яйка сырое выпіла. Потым палажыў мяне і на пуп палажыў камень такі (кілаграма два). А залатнік той, ён ходзіць, пакуль на места станець, камень гэты прыгаіць-прыгаіць: гэта ж залатнік ва мне ходзіць. Ён пакуль на месца зайдзіць, а ўжо як на места станець, дык асцепяніцца. Паглядзеў: "О, вот ён на месце, ўжо камень не прыгаіць".

<...>

[*А вы сказалі сваім спосабам лічылісь?*] А гэты спосаб быў – трава такая, ад падыму. Я сабірала, мне падсказалі старушкі. Як яна называецца?.. Надсаднік. А яна гэткая, як бруснічнік. А яна бысокая і дудачка над ей. [*Тады што? Заварываць і піць?*] Заварываць. [*А вот як сурочыць хто?*] Ад воку? Не помню, ну нешто ж робілі ад сурокаў. [*Ну а вас не сурочылі?*] Як рабят, так падалом вот так вот. [*А як узнаць, што вот сурочылі? Як гэта праяўляецца?*] А вот знаеш, у нас быў мужчына дужа сурочлівы, ён як гаварыў, так тое і робіцца. Ён ідзець, а ў нас тут у лесе ля Бяруль козы хадзілі. І вядома ж,

а яны ж, вядома, казяняты брыкают, а ён ідзе і кажа: “Во, якія красівыя казянопачык!” І толькі ён перагаварыў, потым зайшоў ў магазін, як той казлянёк здох. [*Ну, ён жа не са зла, проста вока такое?*] Вока гэткае. [*Чаму такое можа быць?*] Гэткія вочы бываюць, калі рабёнак народзіцца, і маці корміць грудзю і атучваець ужо ад грудзі. А тады яна пабудзе так колькі врэмя, а патом жалка ёй стане і яна зноў дае сачыць. Во гэта ўжо патом бывае.

[*А якой парой адучалі ад грудзі?*] А гэта як калі. [*А як вот капрызы ў дзіцёнка?*] Як капрызы? [*Наравіцца ён?*] Бярозка нізенькая, лахмаценькая, і во даць гэтай бярозкай па жопе. [*А вось такую хваробу “сцень”, ці чулі вы?*] Не знаю такой. [*Ну вот пуд, што можа з пуду прыключыцца?*] З пуду ўсякія хваробы прыключаюцца. У мяне мама сільна крэпка балела, яна як ляжыць, ей здавалася ўсё. У яе сястра старэйшая ўсё хадзіла, рады старацца дома маме. Яна была спужаная. І з ёй случылася, даўна звалі катарплюшаў па-польску – гэта на лёгкіх пятна палучаюцца. Папа павёз яе к доктару ў Докшыцы, а ён сказаў, каб хочаш, каб твая дачка жыва была, карову давай. А папа пажалеў, а дачкі не пажалеў. І за тры месяцы на той свет. [*А як лечылі вот пуд?*] А бальшанство загаворамі. А толькі ёсць мох. Зябра завецца. Курганкамі такімі, ён ад пуду. [*А вось як руку парэжаш сільна, як кроў суняць?*] Ай ну клалі нешта. Як вот пальцы на нагах як папрэюць, меж пальцаў такая, як драбенчатая, закладаеш. [*А як завецца?*] Ай, я не знаю як яе завуць. Драбенчатая такая. [*А як панос?*] А мы палынь варылі, маці-і-мачыха. [*А вот, як маленькі дзіцёнак родзіцца, у яго як шорстка такая на спіне, ён круціцца. Можа выкатывалі чым спінку?*] Ай ну гэта так… Такой патрэш-патрэш.

***Запісана ў 2011 г. ад жанчыны 1926 г.н.***
***у в. Бірулі Докшыцкага р-на***

***

[*А што можа быць з пуду?*] Во спужаешся, а тады ўсё трасецца, спаць хочацца, вось увесь дзень бы не ўставаў бы, ляжаў, ногі млеюць. З пуду можа быць і жаўтуха, і малярыя, не знаю па-цяперашнему як яе зваць. [*Трасца?*] Трасца. Трасло, у сцюжу кідало. Жара на дварэ, а цябе гэтак калоціць. А тады адкалоціць і будзе добра – гэта з пуду бывае. [*А яшчэ, што можа быць з спуду?*] Гэтак мой брат спужаўся. Вайна была і ў лес яны ўцяклі, а тады, кажа, што няма ўжо немцаў, прыйшлі, і зямлянaчка ў нас была. Тата у нас быў кавалём, кузня была. Хату ўжо спалілі, а кузня засталася, так ён гэна ўсё вон выкінуў, ну там, як прыдуць. Ён грубачку зробіў маленькую, і ўжо мы тут жыць будзем. Там баня ж яшчэ засталася – не спалілі, зямлянку не спалілі і кузню не спалілі. А хата ўжо згарэла – няма. Дык ён ўзяў печку зробіў –

грубачку гэту. Ну і прыйшлі ж яны і з братам ўжо, з сынам, і там ўжо робяць, а тады відзюць нехта крычыць: "Ай, немцы! Ай, немцы!" Дак яны не пабеглі ўжо ў лес, а ўжо ў гэтай будцы засталіся. А як пачулі, што немцы ідуць, гэты замок быў прывешаны к гэтай, замкнены быў, дык яны гэты замок ўзялі, кінулі на пол, а венікам сляды пазамяталі, каб слядоў не было. Каб не ўвідзелі немцы, што сляды пайшлі ў зямлянку. І яны, адзін і другі, сталі за грубачкай, немцы паглядзелі і пайшлі. Па-свояму там, па-нямецку, загердулякалі і пайшлі. Ну во ждалі-ждалі: няма – няма. Тады выйшлі і пабеглі ў лес. А гэты ўжо, мой жа брат Віця, гэтак спужаўся, гэтак ўжо ійсці ня можа. Тата яго нясці, а ён жа ўжо і ладны такі, а там і гразь… Во якая і ўсё! Но неяк жа завязлі. Там у нас і ў лесе зямлянкі былі. І тамака у нас ўсё было. Там і карова была, там усе. Ну, а сюды яны ўжо прыхадзілі ўзнаваць, як там што. Паціхла ўжо ўсё, Віця, мой брат, сусем ужо ня можа, як з пуду. Як з пуду ўжо жоўты зробіўся. Ну і мама там малілася, але ж сваяму, можа, і не памагла, свайму можа і не паможа ж.

[*Свайму можа не памагчы?*] Свайму можна і не памагчы. Тады кажаць, што на скібку хлеба вошаў нада накласці, а тады маслам памазаць і каб ён еў. Так жа ня будзеш есці, вошы ж. Ну і з'еў, і знаеш, гэтак трошку ачунеў, троху неяк лепей стаў. Тады яшчэ і так неяк атыйшло. Гэдкі пуд быў. Во, відзіш, – немцаў спужаўся. Ён іх і ня відзеў, толькі што чуў, але, відзіш, спужаўся. А тады ўжо палепшала, тады ўсё, тады ўжо дахторкі хадзілі па хатах і хіну ад трасцы насілі. Ну і хіну дадзем гэтаму, Віця зваўся, каб ужо і трасца не было. Ведама, знаеш ужо, ўсякая халера прычэпваецца, як не здароў. [*А што яшчэ рабілі, як трасца была? Вось вошаў давалі з чым-небудзь… А яшчэ што, можа, памагала?*] Чай нейкі варылі, не знаю гэны чай. Які там чай быў, з чаго? Ня ведаю.

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Тумілавічы Докшыцкага р-на***

***

[*А вот скажыце, раней дактароў так жа не было, як цяпер?*] Не было. [*Так, можа, самі лячыліся?*] Свамі лякарствамі. У каго васпаленні – банькі гэтыя ставяць. Я сама відзела, як ставілі банькі, яны ж тады нацягнуць, а тады яны рэжуць, і круг гэты выходзіць. [*А вот ёсць такія балезні, каторыя дажа врачы не лечат. Напрыклад рожа. Ці ведаеце вы?*] Гэта нада малітву. [*Малітву?*] Ага. [*Ці вот як спужалісь?*] Ну воць, бывае малы, ішла з малым, а сабака скочыць ей на плечы. І ваду тады загаварываюць. [*А ёсць такія бабушкі, што загаварываюць?*] Ёсць. [*А дзе?*] Рожу гэтую загаварываюць.

Вот тут на пасёлку, за магазінам есць. Загаварываець рожу. [*А з чаго робіцца рожа?*] І цемпература. Загаворваюць, тады і лягчэй становіцца. Тады муку, муку ржаную тожа загаварываюць і тады абсыплюць.

[*А ці чуеце вы што-небудзь пра валасень, валасенькі?*] Валасень! Вот я вам раскажу аб валасні. Брат мой, ён ужо памер, і тады я была ў бацькоў, мне была малая, была дзяўчына, было 21 год, як яна памерла. Дык ён ляжыць і я ляжу, забалела тожа рожу, гаварылі, і яна зразу прарвала, ужо бруд пайшоў, а ён ляжыць з нагой, ён плачыць, брат, і я плачу. Я кажу, мне хужа баліць, і ў яго валасень стаў тачыць, ужо косці сталі вываліваца, ужо ён хадзіў, памер у яго ўжо. Дык вылівалі валоссі ў жыта, тады звяжуць пучок і тады сагрэюць, і пучу гэтую, дзе баліць, і тады выліваюць і гавораць: "усякія шэрсці і сівая шэрсць вылезай на гэтыя калоссі", – усе гэта моляцца і моляцца, тады загаіў гэту нагу, а так бы нагу зусім не змаглі падняць, гэта бый точна знік. Нада загавор – і ўсё. Тады ў вадзе ўсё гэта пралажыць і гэта гаварыць. Як родзіцца рабенок даўней, – мне мама казала, – маленькі ён, толькі галоўкай круціць, кашу бярэць, як будзеце купаць у гэтай вадзе, – белы попел пасыпце ў гэты і накрыш купайце. Відзеце, што на пяленцы: дык не могуць пяленку разадраць – столькі валос! А гэтыя валасы, як яна ходзіць бярэменая, казалі: не нада ні Бог ні сабака-ката нагой падкідываець! І як势 стануць купаць гэтага малога, раптам станець гэта точна.

[*А вот, можа, яшчэ ў малых дзяцей балезні ведаеце? Нічога не казалі?*] Можа гэта ён не спіць. Тут яму нада які гэта, што я вам гавару? Ён ня будзе спаць. [*А вот не чулі пра крахтуны для дзяцей балезні?*] Ну воць, кажуць, "крэпчуць" есць такія крыкуны. Дауней ужо маліліся, дык вот гэтак, тады ж не врачы не лечылі, як цяпер. Будзьце з Богам, і Бог вам дасі, малыя тоже балеюць. [*А вот вы не чулі балезнь падучы?*] Ай, гэта пакрываецца. [*А можа эпілепсія?*] Ці эпілепсія, ну яе цяпер многа, я вам скажу. За тое, што п'юць, п'юць бязбожна, п'юць! Вось тут у нас адзін чалавек, ён сколькі разоў браніўся! П'ець, ходзіць і ходзіць, валіцца і не жывы, гэта эпілепсія. [*А можа як раней яе лячылі?*] Ну маліліся, маліліся. Курылі зелкі.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1922 г.н.***
***у в. Хралы Глыбоцкага р-на***

***

[*В духов верили раньше людзи, там домовик, такое?*] Верілі, яны і сейчас некаторыя вераць. Ну, гэта, жылі дамавік ілі, гэта, чарадзей гэты, як называлі раньшэ. Ну, гэта сейчас яны паўміралі. Раньшэ. Счас ужэ нет іх, Стэхваны паўміралі і ўсе гэтыя, каторыя і дзяцей лячылі раней ад пуда, ад

падрыва, раньшэ. Ад падрыва раньшэ ваду давалі і людзей лячылі. Былі раньшэ – лекараў было многа. Патаму што не было ж бальніц, былі ж раньшэ ўсё на этам начыналась наша жызнь, на этам самам.

***Запісана ў 2013 г. ад мужчыны 1931 г.н.
у в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на***

***

[*А вот як раней дзетак лячылі, спужаецца рабёнак каго?*] Даўней, еслі дзеці спужаюцца прымерна сабакі, нада выстрыгчы таго сабаку. Пакураць ілі вады даць яму палізаць на парозі. Еслі сабакі рабёнак спужаўшыся, дык абізацельна гэтаму сабаку місачку вады ўзяць чыстай, і паставіць на парозі, каб ён палізаў гэтай вады, а патом гэтай вадой гэтага дзіцяя змываць і піць яму даць. І паўсці яго выразаць і курыць, дык гэта накрыж выстрыгчы, пакурыць дзіця таго. Маей сястры была дачка, дак Боткінай перабалела, сабакі, ішла яна, і гэдак спужалася. [*А што, можаць, і Боткіна ад?*] Ну, ад пуду. Зжаўцела бедная, яна на той раз: "Ай, мама! Сабакі спужалася". А тады глядзіць, што яна ўжо захварэла, у бальніцы ляжала… Так тожа во гэдак сабаку гэтага выстрагала яна і піць давала гэтаму сабаку, і курылі яе, і вылечылі. А то гэдак захварэла. [*Ну а, гавораць, малыя дзеткі ўрокаў баяцца?*] А ўрокаў баяцца. Нада, вобшчэм, дзіця падалком іхнім сціраць, рубашоначкай сцёрці яго: сцёрці гэдак падалком, каб ён не баяўся. Мая дачка была такая ўрочлівая, бедная. Яна такая праворная, такая гаварлівая была, гэткая красівая, як кукалка, дык гэткая яна красівая, дык куды выду, дык яе хочуць пацiскаць, хочуць падзержаць абізацельна. Прыду дамоў – перакрычыць. Мама наўчыла мяне малітву ад урокаў, нагаваравала яна ўсё, мама, і яе сцірала, і ўсё, каб яна не баялася ўрокаў, ужо стаяла ў мяне гэта вадзічка, я тады змыю – змыю і пайду. [*А нам раскажыце гэту малітву*]. "Госпадзі, Ісусе Хрысце, я ж нічога не знаю, Госпада Бога ўспамінаю. Ніхай з мяртвых душы с таго свету не ўстаюць! Ніхай эта дзіця ўрокі не бяруць!" Імя назваць, ну, на вадзічку, і на яго прагаварыць. [*Колькі раз падалом сцiралі, можа тры?*] Дажа можна і сваім падалом жанчыне сцёрці гэтага малога. І абізацельна вот. Я даўней сама была дзеўка такая праворная, поўная, з ранняга ў дзеўкі пайшла, як ні прыду адкуль – у мяне на пальцы то, то ў мяне рожа, то што. Дак мама гаворыць: нада булаўку ілі іголку ў падол, каб была ў падале ўсягда, насіць з сабой булаўку эта, дзе-нібудзь, каб этыя вокі не бралі.

[*А вот як ні спіць дзіцёнак, крычыць, як эта, "начніцы" называліся?*] Ну, даўней нейкія начніцы… Мама, помню, як малыя ні спяць, тада яна палала ў паланачках, (даўней дзеравянныя былі паланачкі этыя), тады яна

возьміць у паланачку, а то ў падол, у прыпол, і “пылаю-пылаю, начніцы выганяю”. Далей дык і не помню, што гавару, а нада стаяць, прымерна, мяне выганіць на двор – стаі. Стаю, і мне нада, – яна прагавараваець, – а мне пляваць чараз плячо, каб ужо начніцы гэтыя выхадзілі. [*Ну эта ўжо вот вечарам?*] Вечарам, на захад сонца, перад сном. [*А вот, гаворaць, што ў маленькіх дзяцей, вот, такая шорстка бывае на плячах, і яна ім муляе?*] Ну вот, каля сабакі, каля ката дзе-нібудзь пакачаецца, тады ўжо, як купаем, мама возьмець попелу, усыпіць попелу ў ваду, і тады этыя плечыкі сціраець уже. Дак у попелу гэтым як варса такая палучаецца, як купаеш, дак нада попелу мягкага ўзяць і тады ў гаршок сціраць – сціраць і ў вадзіцу змыавць. Так проста, – во, гэдак во разніміць пальцы, а яны, – во, гэдак во, як цягнецца.

[*А во такая хвароба калтун?*] На галаве, гэта с пуду бываець, з растройства бываець калтун гэты, но яго нільзя снімаць, пакуль ён сам ні атрасцець. [*А як узнаць тады?*] Ну ён тады атрастаець-атрастаець… У нас тут, у саседкі тут, быў калтун гэты. Дык у яе каса, валасы густыя, ні абразала яна і ні абразала, і гэдак ён у яе звіўся: каса гэта звісла-звісла, і гэдак ён у яе сплёўся саўсем. Яна ўжо год насіла. Кажу: ты ж год атнасіла, – давай, абрэжам. Не, ну мы пашлі с саседкай, давай, кажу, снімем. Ну, мы яе пасадзілі яе, дала іконку ў рукі, кажу: маліся! І я памалілася, і тады снімала ей. Яго нільзя, пакуль ні сойдзець назад, а еслі яго да пары снімеш, – можаць спаралізаваць. <…> [*А вот, гавораць, што ён бываець жаночы і мужчынскі?*] Ну гэта як яго радзяліць. Ну жаночы, дак ён скарэй адрастаець, а еслі мужчынскі, ён дужа сільны, ай, ужо сільны, круты такі.

[*А вот, гавораць, бываець валасень такі ў пальцу?*] Ну вот бываець. Во, помню, у маей братавай, да вайны ішчо, быў. Большага брата. Дак у ей на бальшым пальцу. Дак усё мама валівала ваду на воск. Нeяк валівала гэты валасень. Дак тады вот, як на воск валіваець, дык цягнуцца нейкія, як валосікі. І ў яе выгніла: костка аттуда выйшла, палец быў такі, куртаты. [*А рожа што за хвароба?*] А рожа, дак гэта вот бальшынство с урокаў. [*А як яна праявіцца можа?*] Яна тады чэшацца, красная, красная робіцца. [*А дзе хочаш можаць?*] І на руках, і на нагах, я сама яе сколька вынасіла, гэтых рожаў! У нас была бабка, дак мне памагала. Як схажу куды на танцы куды-нібудзь, – то на назе, то на ліцэ, то на руцэ дзе-нібудзь сечас апухаець і краснoе становіцца. [*А рожу ш мачыць не можна?*] А мачыць яе нельзя. Загаварываць. Маць-і-мачыха, (назвалі даўней “ружоўнік”) падкладывалі гэтым ружоўнікам. То мукой жытняй абсыпалі, то такой льняной трапачкай завязавалі. Краснага яна асобенна ня любіць, краснага нічога ні надзеваць, не завязаваць, нічога, – тады болей развіваецца.

[*А вот жыта жалі, рука разаўецца, вот што тады?*] Ну, эта навязь навязывалі. Помню, вот як даўней бадзяюцца этыя венікі, даўней жа простамі

ніткамі візалі ж усё. Простыя. І тады атвязавала мама простую эту нітку, і тады тры разы абверчавала, каб гэта ж ужо прахадзіла скарэй. Ішчо мама ўмела загавараваць, тады ўзельчыкі вяжаць. [*А ўзельчыкі – эта ад чаго?*] А ўзельчыкі тады ўжо вязалі – эта ад навязі. “Дзевяць, восем, сем, …”, тры разы гэдак. [*А што прагаваравала?*] Ну, я ні знаю, ня помню, якую малітву прагаваравала.

[*А вот як ад змяі?*] Ад змяі я ўмею, патаму што змеі мне очань паказаваліся. Помню, пашла ў лес за раку ў ягады, дзе ні ступлю, – там змея. Кінула туды за Рачныя, прышла ў бор сюды. Апяць прыхаджу – ляжыць змяя пад сасной, я і гэта кінала. Ну, асталася дома. Пайду ў Якаўшчыну, прыхаджу сюды, гэтага галля на венікі наламлю, падхаджу да бярозы – апяць ляжыць змяя. Эта як устрэцісся з якім чалавекам, – я абізацельна ўвіджу змяю. Ну, тады мама наўчыла мяне загавараваць. Як прыдзеш ў лес, загавары эту малітву. Вот стоіць мне не прагаварыць эту малітву, забыцца, я абізацельна ўвіджу змяю: “Гадзіца белаводзіца: падкрушэўныя, падкарчэўныя, падпечныя, падрэчныя, падугольныя, падгнойныя! Гад-гад, вынімай свой яд, свой яд жарасны”. [*Так эту малітву можна, як і ўкусіць?*] І як укусіць таксама. [*Дак а якія змеі бываюць?*] Ёсць вужы, дак эта яны абычна поўзаюць каля будынкаў. [*А слімень, ці чулі такую?*] А слімень, дак гэта яны такія, яны тонкія, не даўгія, яны не кусаюцца, не апасныя. Змяя вот самая страшная.

[*А сам сабе можа чалавек загавараваць?*] Ну, я сама сабе загавараваю, памагіаць. Але абычна, каб хто другі загавараваў. Тады лепей. [*А залатнік што такая за хвароба?*] Залатнік – эта ад падыму. Залатнік – эта пры спіне, якая там ёсць сасуда. Еслі падымеш цяжасці. Ці расцяжэніе, ці што, – жывот баліць. Мая мама ўсё даўней яйкі нагаваравала. Яйцо сырое нада нагаварыць і выпіць. Жанчыны ўсё прыбягала к ей з яйкамі. [*А ад змяі на ваду і на…?*] На ваду і на хлеб.

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1936 г.н.***
***у в. Дзедзіна Докшыцкага р-на***

***

[*А вот скажыця, раней жа ж, пэўна, урачэй не было, дык самі лячыліся?*] Ну канечна! Што вы! Усякімі травамі! І мама нас лячыла малых і што толькі ня дзелала: і на вітранку хварэлі, вот вітранку нейкую сабіралі. Я яе цяпер не знаю, а нашы бабы тут во мне прынасілі. Я сама была забалела сёліта на вітранку, яшчэ і сёліта ў вітранкі – не магу няяк абгаіцца. А вітранка такая, яна гарачая, цімпіратура вялікая, дык дахтароў жа ж не звалі. Вот у вітранацы ты пакупаіш рабёначка (рабёнак гэты ўвесь чыста красны ўвесь, у пузырках), ну але вымаем у вітранцы, а тады давалі ад цімпіратуры моч

іхную, дзецкую. І ўсё сьніміць абізацельна… [*А скажыця раней жа ж такія бабушкі былі, што вадзічку давалі ад упудаў?*] Дык яны і цяпер ёсць, калі былі. Вот да Даўманіхі ўсі хадзілі. Я і цяпер хадзіла да Даўманіхі. Ну, яна ўже аднаглазая, уже нічога ня можыць дужа, ну, дзякуй, і дала бутылачку вады. Можа, памагло трохі. Ну, я і верыла! Толькі нада верыць усяму, еслі ты ідзеш да якога-небудзь, хто табе замаўляіць. Вот у нас тут, у Квачах, ёсць. Эта ж ад вужакі, вятранкі, ад ветру, з'віх якой-небудзь – яна ўсё загаварваіць. У Квачах ёсць адна.

***Запісана ў 2012 г. ад жанчыны 1927 г.н.***
***у в. Канстанцінава Глыбоцкага р-на***

***

[*А як даўней лячылісь, як дзіценак спужаецца? Што робілі?*] Даўней па дактарах не вазілі, па бабаках вазілі рабенка. [*А ці былі ў Старыне, што вадзічку давалі?*] У нас у Старыне не было, аж у Таргуны вазілі. Я помню, тут во, што хата стаіць, ужо нікога няма, саседзі мае. У іх быў сын і быў спужаўшыся, і яны вазілі яго і ў Таргуны, і за Таргуны – усюды, дзе толькі хто. І вылічылі! Але ўжо іх няма. [*А вам ці прыхадзілася па вадзічку ездзіць? Бралі вы самі?*] Ну, з каровай бываець дзе што… Ездзілі. Ды мужык ездзіў. [*А ці чулі вы пра Далмана?*] Чула, дзетка. [*А што пра яго расказывалі?*] Даваў ваду, лячыў людзей. [*А ці добра памагаў?*] Усяк. Каму паможыць, каму – не. Як і доктар. Далман, дык што ён – Бог? [*А як дзіцё спужаецца можа што самі рабілі?*] Рабілі! Як ідзець первы дым у печ, у юшку стаўялі кружачку вады і тады змывалі і папіць давалі. І чэраз склянкі, і чэраз рэшата, і чэраз парог. Бываець, сабака спужаў, нада, каб сабака паглытаў вады, а тады даць таму хто спужаўся.

[*А што рабілі, як у малых дзетак шорстка на спінкі?*] Не знаю я гэтага, дзетка. [*А як начніцы?*] Клалі на пупок воўну ад кажуха. Памочуць ці ў гарэлку, ці ў ваду свянцоную, і клалі на пупок. І бываець, сагрэецца дзіцятка і спаць кладзецца. [*А ад дзецкай, ці прыпадка?*] Ну дзецкай тут у нас дужаткі не было, але там далей было, у суседкі, дык яна лечыла па ўсіх дактарах. [*І што, памагло?*] Памагло. [*А хвароба з чаго бывае?*] З пуду. У майго сына ў самога было. [*А як дзіцё пісаецца?*] Усяк робюць. Бульба, што расцець на агародзе, патом на бульбеўнічку, такая, як бульбінка зялёная, вот, і з яе атвар даюць, бульбінку труць. І некатырыя, я тожа знаю, – вот у бульбіне расцець, як пырэй, трава, – дык вот гэту бульбінку нада зварыць і даць. А ці яно памагаець, ці не?.. [*А залатнік што за хвароба?*] Залатнік, – эта ўсегда загаварывалі бабкі. Залатнаік і рожу. Цяпер жа і рожу лечаць дактары, а даўней не лячылі, а толькі загаварывалі. [*А вы слоў не знаеце ад рожы?*] Знаеш што, дзетка, я ўжо пазабывалася, я знала, але ўжо пазабывалася.

[*А адкуль вы наўчыліся?*] Ад жэншчыны. У мяне ў самой была рожа апухшы, і дужа часта ў маладой ячмень быў на воку. І суседка была: загаворыць, перавяжыць во так нітачкай пальчыкі, і тады кажуць: "Ячмень, ячмень! На кукіш! За кукіш кабылку купіш. Кабылка здохніць – ячмень ссохніць." Вот гэткія славы гаварылі. [*А ад рожы?*] А ад рожы тожа загаварывалі: "Ідзі, рожа, за сіне, мора там табе пасцель бела паслана…" І ўжо я далей не знаю, пазабывалася. [*А як сурочаць?*] Толькі вадой лечылі ўрокі. Загаварывалі, былі такія бабы ў Тумілавічах, тутака-во старыя людзі. [*А як рука разаўецца?*] Навезь навязывалі. [*А навезь з чаго?*] З ніткі. Ад веніка нітачку гэту. І тады быў у нас дзед, сусед, ён пашэпчыць і ўзялкоў дзевяць навяжыць і адлічыць назад: "9, 8, 7, ...". Во гэткае было. [*А як каўтун на галаве?*] А каўтуны даўно насілі, дзетка. [*А з чаго ён прыключаецца?*] Гэтага, дзеці, я не знаю. [*А як ад яго збавіцца?*] Яны гэты калтун насілі сколькі там можна. Насілі, – валасы збітыя, звязанныя, – а тады ўжо выразалі і там славы нейкія гукалі. [*А круг, ці лішай?*] Тожа загаварывалі. [*А дзічы, бародаўкі?*] Бародаўкі, еслі яны не мешаюць, то іх лепей не чапаць, таму што яны врэдныя дужа. Гэдак даўней казалі. У мяне самой барадаўка была на плячы. [*А як пазбаўляліся?*] А як малыя бародаўкі, нейкае было такое лекарства, ужо после вайны, чорнае такое выпекалі (барадаўкі). А не, дык былі такія казлы, насекомае, такія зялёныя бальшыя. Дык уловяць гэтага казла, і каб гэты казёл скусіў гэту бародаўку. А што ён? Калі скусуець, а калі і не скусуець. [*А каб веснушэк не было на твары?*] Гэта ў то врэмя ніхто нічога не рабіў. Патаму што ўсе было дарага. [*А як зубы балелі?*] А зубы савімі срэдствамі. Закладалі салам несалёным і ўгрывалі, і соль сыпалі ў торбачку і прыкладалі. [*А звіх?*] Конь звіхнець ці чалавек, – толькі навезь навязывалі.

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1931 г.н.***
***у в. Старына Докшыцкага р-на***

***

[*А вось звіх?*] Ну, гэта тожа загаварываюць. [*А ад чаго звіх бывае?*] Вывіхнуць руку ілі нагу, калі будзеш несці. Ці ты паваліўся, ці ты так, ці крануў ні так, ці што – і звіх жа тады зробіцца. [*А вось, кажуць, што яго можна выпраўляць, вось так дзёрнеш і стане. Ці ў вас так не рабілі? Ці ў вас загавор трэба было?*] Ну, гэта. Як у нас, дык у нас врачоў німа на месці, дык мы загаварываім. Ну дык можна, але гэта нада спіцыаліст, а так яшчэ горай выдзервіць яе. У нас загаварывалі, звіх загаварывалі тожа. [*Вось раней камбайноў не было, жыта серпамі жалі і рэзаліcь. Можа, што рабілі, каб кроў суняць? Ці можна было неяк?*] Трапкай закруціш і даёш далей. [*А нічога не чулі, што можна сказаць нешта?*] Ай нічога ня робілі, як на назе праб'еш

дзе-нібудзь тамака, дык пяском засыпіш і пайшоў. Каб у нас гэтак хто там што там – ого! Як лечаць, як лечаць! Кроў пайшла з нагі: ну што? Чым? Пясок. [*Ці вось, калі жалі многа, дык рука развівалася?*] Ну, гэта тады нада было нітку навязываць. [*А якую нітку? Любую?*] Не. Гэта, як вот даўней ткалі кросны, ну, і бываіць, што ідзець нітка назад там, скока. Ну, у бёрду ня ўлезла, і яны ідуць назад. Дык вот, тую нітку навязываць. [*Яе трэба адрэзаць?*] Але тожа бальшынство, як разавецца рука, гэта загаварываюць. [*Ці можна было адразу гэтую нітку, гэта ж суровая нітка?*] Хоць якая, калі суровых не было, абы нітка, абы тая, што ішла назад.

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1926 г.н.***
***у в. Хралы Глыбоцкага р-на***

***

[*Дык а так врачэй жа ж не было. Можа, якія балезні самі лячылі?*] Чаму гэта самі? Хто гэта сам табе балезні вылечыць, еслі ты прастудзіўся? Ну прастудзіўся, значыць навараць. Нада наварыць – трава такая ёсць ад кашлю, – багну навараць, пап'юць. А як лехкія баляць, усё ж дастаўлялі. Дзяцей малых воспы прышчыпліваў адзін, усё роўна. [*А вот казалі ёсць такая балезнь, як рожа?*] Апяць – загаварваць. Гэта ёсць малітва. Гэткая малітва і загаварваюць рожу. Рожа. Рожу доктар ня вылечыць. [*Доктар такія вот балезні ня лечыць?*] Вужака ўкусіць, – апяць загаварваюць. А доктар ад вужакі ня вылечыць. [*А вот якія яшчэ? Гаварылі, балезнь такая – валасень?*] Тожа валасень выліваюць. Бярэць жыта, з жыта бяруць каласы, ну, і свянцонай вады гэтай, каторай свенцаюць на Крышчэнне ў цэркві. Гэту свянцоную ваду, ішчэ молюцца, і валасень гэта, на гэтым каласе, як выліваеш у вадзе. Калі валасень, то валассё адломіцца і атлечывалі. Доктар цябе цяпер вылечыць? [*А вот, гавораць, вот, як малыя дзеці не спяць, дык, гавораць, нейкія начніцы?*] Ну што? Палаюць іх. [*Да? Як?*] Ну, гэта называецца "палаюць". Малога на рукі возьмуць, Богу молюцца, як папалошчуць, неяк калышуць. І свянцонай вадой памыіць, – праходзіць. Ці даўней гадавлі дзяцей, як цяпер? Як калхоз стаў, дык бабы насілі на поле рабят, сквярэцца цэлы дзень на жарэ, эта цяпер ужо стала, што тры гады нада да роду сядзіць, после родаў сядзіць. А хто тут насіў, як калхоз стаў? Бяры, як у нас, тры бабы насілі: бяруць рэбят на плечы і есці ім на цэлы дзень, аж у Танілавічы за сем-восем кілометраў нада было пёрці, цэлы дзень так галава пячэцца на сонцы. Цяпер, канешна, сядзяць, цяпер усе сядзяць. Да родаў сядзіць тры гады і пасля родаў. А нам ніхто не плаціў. Я Пецю радзіла, сына свайго радзіла, на трэці дзень касіць пашла.

***Запісана ў 2011 г. ад жанчыны 1923 г.н.***
***у в. Чарнічка (II) Докшыцкага р-на***

***

[*А якія ўвогуле яшчэ хваробы былі? Помніце, даўней? Ну, даўней жа не хадзілі там па ўсіх пытаннях у бальніцу.*] Ай, ну, не хадзілі. Ну, халера яго ведаець... Вот, як гэта раньшэ называўся, туберкулёз. [*Сухота?*] Можыць быць так. А раньшэ, дык і людзі так не балелі. Ну, вот гэта цяпер, гэты апендыцыт, раньшэ гаварылі "заварот кішок". [*А як яго лячылі?*] Паміралі. [*Да? Не лячылі ўвогуле ніяк?*] Не, паміралі. Еслі заварот кішок, – паміралі. Я б тожа памёрла, каб не цяперака жыла. [*Дык, а можа што, як бы чаі якія пілі спецыяльныя, елі што, каб так не хварэць?*] Ай, халера іх знаець? Я на такіх, прама, разгавораў, прама, не было на такую цему. [*А вось вы кажаце "Халера яго знаець", а што гэта значыць? Што за халера?*] Ай, эта нейкая хвароба такая ёсць. [*Да?*] Да, раньшэ гаварылі "халерай забалеў". Ай, ты знаеш, маладыя мы гэтым не інцерэсаваліся. На работу – з работы. Тут прыйдзеш даму: то касіць, то вазіць, то да часу ночы сена складаем, дык, дужа гэта… Гэта цяпер, як дзелаць нечага вот, каб сабраліся старыя, ну дык пагаварыў бы. Ну а раньшэ маладым гэта неінцерэсна было. Туды-сюды ж, хто на работу, хто з работы, тое-сёе – так і пайшло. Вот так.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1936 г.н., мужчыны 1934 г.н.***
***у в. Далосцы Бешанковіцкага р-на***

***

[*А ці былі тут у вёсцы такіе жэншчыны, што, можа, вадзічку давалі там ад якіх балезней?*] Давалі. Канешне, былі. [*А вот ад чаго яны давалі?*] І ад пуду. Да, ад пуду. Я даю, вада ад пуду ў мяне мінаецца. Усім даю. Да, дзеці асобенна, як пугаюцца. [*Дык вот ад пуду, а што тады нада рабіць вот?*] Нічога, ваду нагаварыць нада. [*А гэта спецыяльныя нейкія словы?*] Ну, словы ж нада казаць з раніцы вот, калі: "Ранняя зарыца, усяму свету памачніца, памажы (там, па імені) і младзенцу". А тады кругом ножак абнесьці, тры разы ў сталавых, каб аставаўся ўсё ножках і мінаецца ждёт. [*А з чаго вот пуд бываіць?*] Хоць ад чаго, хоць каго можыць спужацца: і сабаку можыць спужацца, і агонь, пажар бываіць, а гляніш у вакно – спужаішся. Ці, там, едучы, у мяне тут недалёкам саседка жыла, дык прыхадзіла гэта зяцю вады:

– Баба Соня, дай зяцю вады. Ехаў, – нехта там дарогу перабігаў, дык затармазіў і дужа спужаўся. Дык, цэлую ноч, кажыць, ня спіць.

[*А вот якія яшчэ? Гаворуць, уроцы такіе вот бываюць?*] Ну бываіць і гэта, ёсць такіе глаза ніхарошыя. Ніхарошые глаза і на скаціну могуць палядзець. Ёсць і харошые глаза. Я як ехала адзін год, дык дзіця: плачыць і плачыць,

плачыць і плачыць. Прама яна ня можыць, змокла тая маладзіца. Я падыйшла, кажу: дайце мне свайго дзіця, я яго панашу. Панасіла-панасіла яго, панасіла, і ён у мяне ў руках і заснуў. Ну наце, кажу, хай сьпіць. Нехта вот паглядзеў, нехарошы чалавек. [*А вот ці ёсць такая балезнь "валасень", ці "валаснік"?*] Ой, не дай Бог, сынок, не дай Бог! Эта ў руках, у пальцы бальшэнство. Не дай Бог! Даўна вылівалі, о. [*А як вылівалі?*] Я ужо ня помню як. Ёсь, ёсь! Некалі мая цёця тут жыла, у яе мужыка быў. Ой, не дай Бог, – мучэўся, крычэў крэпка!.. І вужака укусіць, дык умелі і загаварваць. А да вайны ў нас у атрадзе жэншчыну ўкусіла ужака. Цяпержака і ўрачы ўжо, кажуць, лечуць, ну дык хадзілі бабы к ей, давай мы табе загаворым і нічога нібудзіць, а яна ні паверыла. Ей аднялі. Былі бабы, умелі загаварываць. Не знаю, не ўмею.

[*А вот, можа, чулі, такая падучая балезнь. Не чулі?*] Но Бог яго знаіць, я не знаю. Ну ёсць падаючая, ёсць такая балезнь. [*А падрыў?*] Падрыў не знаю што гэта, дзетка, не знаю. [*Ці залатнік?*] Да, залатнік, гэта бабская балезня. Мама ўмела загаварваць. После вайны ў нас жа нічога ні было – ні есці, ні адзежы ніякай – голые былі і босыя. Дык яна хадзіла ў западныя туды, ну за Докшыцы. Пойдзець туды, там загаварвала бабам жываты. Дровы ездзіла, ну хто дасць жыта, там, трошку, хто чаго. Хто мукі, хто прынясець, ужо мы "багатыя"! Мы ж траву елі. После вайны, тады ўжо ягады началіся. Ягады, з траву, а тады ягады, якія ляпешкі пяклі. Сабе землянку выкапалі. Галадалі, Божа-Божа, як галадалі! У каго сем'я бальшая, дык не дай Бог нікому, каб ніхто не дажыў так…

***Запісана ў 2011 г. ад жанчыны 1925 г.н.***
***у в. Беразіно Докшыцкага р-на***

***

[*А раней жа ж урачэй не было, а вот як лячыліся раней?*] Ну, травамі лячыліся: разныя старухі травы здавалі. Былі ж і ўрычы, але ж да ўрача трудна дабіцца было, трэба было мець грошаў. А хто там даўней? Не плацілі табе грошы. Даўней во табе зямелькі кусочак – і тут і ўсё, і мяса, і хлеб, і грошы – ўсё. [*А вот скажыця, якімі травамі лячыліся?*] Ну вот зьверабой трава добрая, календула добрая, як цьвіцець, чабор, ліпа. [*Ад чаго вот, зьверабой?*] Ну, зьверабой болей ад жалудка, ад жалтухі зьверабой заврываюць. [*А чабор ад чаго?*] А чабор ад прастуды, ліпа тожа ад прастудаў заварваюць. [*А вот вы гаварылі, бабкі былі такія, што вадзічку давалі?*] Былі і цяпер ёсць. [*Ад якіх балезняў яны лечаць?*] Лечаць ад усякіх, але ці памагаюць? Вот дапусцім ад іспугу, ад уродстваў там ад якіх – гэта памагалі. Дзійствіцельна памагалі. А калі ўнутры што загніло, дык ніхто табе не паможа, ня якая бабка. [*А вот*

*валасень, ці чулі такую балезнь?*] Чула. Даўней старухі яе замаўлялі і вылівалі. Як выліюць, дык казалі, валосываліцца. Гэта было.

***Запісана ў 2012 г. ад жанчыны 1937 г.н. у в. Хоцькі Глыбоцкага р-на***

***

[*Што, можа, рабілі, вот, як рука разаўецца, як жнуць, а што тады вот нада?*] Знаеце што, эта кросны як ткалі, дык такі і атход ідзець. Тры ніткі ідуць, у краснах жа лішняе. Гэта "атход" зваўся. І тады гэным адходам як перавяжыш эту руку, а то, знаіш, і як венікам хвошчуць, дык эту нітачку развяжы, тады пераважы, і не станіць ламаць. А ў Гулідаве ж во ёсць Вара такая, яна ад гэтай, ад рожы дванаццаць сартоў знаіць. Знаеце што рожа эткае? [*А што гэта?*] Вот нага распухніць, вогнік, і смыліць крэпка, а яна тады замовіць, абсыпюць, абверціш і нідзе ні пухліны ні стаіць. Дванаццаць сартоў у Гулідаве. Яна ў Хрыстоўскай бабкі навучылася. Рожу ж этую і ксяндзы, і духоўныя, і бацюшкі запрышчаюць. Гэта ні в коім случаі няможна гэтыя загаворы, нельзя, не нада. І во тут во, каля Глыбокага, ксёндз захварэў на эту рожу. Нага ўжо так баліць, так баліць, распохшы, там ужо што раюць гэтыя саседзі, там яму ўжо, што нада загаварыць. Быў такі Сіняўскі, у Ракаўцах, каля Верхняга, і эты Сіняўскі очань ужо вылечваў і рожу, і вужаку. Такі ўжо знахар быў гэткі. Гэта ў Вудзеле быў ксёндз. А ксёндз усё цярпіць, значыцца і ўсім кажыць, што няможна загаварваць, эта грэх, эта ні нада. Ну, як ужо прышлося так ужо трудна яму, значыцца, пазвалі гэтага Сіняўскага. Загаварыў ён яму эту рожу, і стала добра. І стала нага харошая. Тады з этай амбоніі, у касцеле ж амбонія, дзе ксёндз навуку кажыць, тады з этай з амбоніі: "Дзяткі, ратуйцеся як хто можа". Эта знаіця, раней быў ксёндз, і бацюшка, і вот не разрышалі хаваць, эта… А вот, як была камуніста, а вот пахавалі гэтага, завіце, кажыць, і ксяндза, і бацюшку, – хоць каго. Ксёндз як памёр, завіце мне бацюшку, вшыстко една малітва. А як толькі людзі хаваліся, дык ні разрышаў, каб людзі бралі бацюшку хаваць. А ён памёр, а не было ж ксяндзоў, эта ж рэдка было, і тады кажыць: "Вшыстко едно".

***Запісана ў 2012 г. ад мужчыны 1931 г.н., жанчыны 1929 г.н., мужчыны 1930 г.н., жанчыны 1929 г.н. у в. Верацеі Пастаўскага р-на***

***

[*А чым лячыліся раней ад хваробы?*] Ні помню. Неяк, памятаю, бярэзіны бралі сучок на тапор і паліл яе. А вось так во бярезінкі сучок дыміцца

і на тапор, во так вот, прыжымалі і там такое выдзілялася выдзяленне, тады гэта заплуталі. Цяпер, як я балею, змяць гэта і на месца кладу. Калі балелі і праполіс клалі: у гэту дырку праполіс заложышь, і тожа ўспакаіваецца. Таксама праполісам пользаваліся, на гарэлкі яго настаівалі. А цяпер ўсе врач робіць. [*А раней чым яшчэ лячыліся?*] Як я балела, дык я знаю, што я дзелала і так, і так. Цяпер ужо ўсі ідуць к врачу. [*Вось барадаўкі: ад чаго, казалі, яны бяруцца?*] Во яшчэ! Такіх цяпер няма. Невіжу я іх, казюлькі такія зелененькія. Так вось, зловішь такога казілка, ён такую мазь пускае, на гэтаю барадавачку пасадзішь яго і гаворышь: "Кызя, кызя, дай мазі, а я табе – дзічку, і па мордзе фічку". І вось гэта прагаварываешь і ждешь, каб ён пусціў мазь на гэтаю дзічку. А мая ўнучка ў Мінску жывець. Прыехала, а ў яе на лыткі села дзічка. Яна к хірургу паішла, а ён гаворыць, там, даў ей мазькі. Але, гаворыць, паедішь у дзеревню, – папрыкладай чыстацел. Мне таксама казала медсястра з Віцебску, што сокам чыстацела надо мазаць.

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1930 г.н.***
***у Бешанковіцкім р-не***

***

[*А як у вас лячылі ад суроцы?*] Ну, бабкі лячылі ад суроцы, так называлі раньше – глаз. Лячылі бабкі дзяцей ад іспугу, шыптухі такія былі. [*А чым яны лячылі?*] Яны проста шапталі, яны Богу хрысціліся і на іконы маліліся, дажа кусочкам хлеба іспуг лячыць, і ваду давалі, а лячэнія я не знаю…

***Запісана ў 2013 г. ад жанчыны 1935 г.н.***
***у в. Бачэйкава Бешанковіцкага р-на***

***

[*А ешчо скажыце, а ці былі бабушкі такія, што вадзічку загаварылі, можа, ад якіх балезней, можа, ад іспугу, можа, ад зглазу?*] Да. Якая рожа паявіцца, – загаворуць і ўсё прападаець. Врачы гавораць: мы рады не найдзем, ідзіце да бабушак. Былі бабушкі такія. А цяпер ўсё вывелася. [*Ну, а вот, можа, як да бабушкі ехаць некалі, можа, гаварылі як рэбёнак спугаецца, што там падалом сціралі ці як?*] Да, мачой гэтай дзяцёнка, тады свянцонай (вада), такая Агата, яна тожа зглазу харашо. [*Гэта на Агату свенцілі?*] Ага, ксяндзы свенцюць, вот. [*А, можа, яшчэ цвяточкамі падкурывалі?*] Да, такія былі сінія цвяточкі такія, "пуднік" зваўся, а цяпер іх нету, усё бур'янам зарасло. Такоенебудзь зелле, яго пап'еш. І тады ваўчкі былі, яны ад нерваў памагалі. Цяпер

нічога, усё бур'яном… Я адзін раз паплятуся туды аж, дзе я жыла ў Баранаўшчыне, паплятуся. Я не дайшла на адну гару, думаю, набяру гэтых калючак дзядочку. Адна ў псіхбальніцэ дзяўчыну ўсюды вазіла-вазіла, ай, кажаць, спужаны дзяцёнак, кажаць, уціхую я цябе прынясу ваўчкоў, кажаць. Памаглі толькі тваі ваўчкі, калючанькія такія, жоўценькія. А цяпер ўсё заглушылі, бур'яны во такія, я не дайшла на тую гару, каб далезці. Во і земляніка. Даўней пайду – землянікі і літр, і два набяру туды ў далёчку, там набяру, а цяпер – усё. Пустыр. Толькі дзікі і козы, во, пад хату козы прыходзяць, яблыкі ўвосень. [*А вот былі вот такія, што, можа, мужчыны, што загаварывалі змяю, не чулі такое?*] Да, змяя якая ўкусіць, то прападзеш, пайдзет у рану – і ўсё. Дажа Ларка цяпер ешчо ёсць у Браславе. [*Загаварываець?*] Да, да яго ляцяць тады. [*А тут не чулі такога Далмана тут, дзе жыў?*] А Далман – гэта ў Верацеях. [*І тут чулі пра яго, да?*] Да. Я сама ездзіла. [*Ездзілі, так раскажыце.*] Так я яго не відзела, сын загаварываў. [*Сын?*] Да, ну што ён. Ён ужо не то. Во Далман так быў. На ходу машыны ехала бабка з намі, тады з адной бабкай з псіхбальніцы ехала, яна расказывала, што ей балелі, а яна гаворыць: ай, дзядзька, не магу я тваё сена грабіць, (маленькі такі, у кажушку хадзіў), я не магу, дзядзька, тваё! Нясі ложку вады! Как загаварыў, так па сённішні дзень зубы не баляць, – во, які сільны быў. Ён на ходу машыны загаварываў. [*Да?*] Станець, міліцыя лётаець-лётаець: ай, машына спорціцца! А ён сейчас загаварыў, стаіць машынка: ну што, мальцы, будуць мучыцца? Нада адгаварываць. Во, сіла была, ну гэта чорнакніжнікі, тады ж у Верацеях такая...

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1939 г.н.***
***у в. Гавейкі Браслаўскага р-на***

***

[*А вот яшчэ не гаварылі? Ну, вот як жэ ж раней урачэй не было, – бабушкі былі, што вадзічку давалі?*] Да, загаварывалі. У самой такая Васільева была, ну, старая – болей стараверы зналі. Мне самой было гэта сама, гэта рожа, ну. І вот ужо казаў-то взрослая, – я гляджу, жанаты можа? Вот відзеце, так ужо можна нагаварыць за то, што после первага. І рожа была, і адразу температура сорак, і адразу ў бальніцу. Ну што малы, – то каралёны. У грудзі малака нет ні. Цяпер у Слабодке ж бальніцы. Прышла – як загаварыла, адразу мяне температура спала, адразу! А так, сорак дяржала, і адразу 39 ужо і пашло: 38… Тока сказала – не мачы. А тут рэзалі, і кнаты ўсаджвалі, і што ня робіл, а нічога не памагала. Усадзяць гэты кнот, за ноч зарасцець – кнот выдзёргіваюць ізноў. Вот загаварыла – і ўсё. Так что гэта стараверы, вот, і ў нас яшчэ Чароніха занала. Ну яна, ну старыя яны, ужо ж усе паўміралі, каторыя зналі. Можа, каторыя перадалі сваім, але мала каторыя перадалі.

А вот гэта дужа такое, ну, важнае, казаў, тут. І вылечылася я за нядзелю. Прыехала дамой – і ўсё з рабёнкам. Так хто і казаў тут, што з рабёнкам, і мне ўсё было, ну. [*А вот якія балезні яшчэ? Вот, як гаворачь, якая змея ўкусіць, ад змяі загаварывалі, не было такога?*] Загаварывалі і гэта самае. Ну гэта не цяпер. Цяпер усе ўрачы ёсць.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у в. Завер'е Браслаўскага р-на***

## Сродкі і спосабы гігіены

[*Вось вы казалі, – аір. А ім пол слалі ці не?*] Слалі, слалі. Абычна якія празнікі, тады сабіралі. Раньшэ ж палы былі дома, а у карыдоры палоў не было. Была зямля там выбітая такая. Гліны, усяго намяшана. Цвёрдая такая. Зямлі. І вот тады насцілалі. І ў дом унасілі і насцілалі. А як зімой, тады лапак гэтых яловых. Тожа ў карыдоры, як якія празнікі. Да і так, як не празнікі. Субота, што там, як убіралі ўсё, – тожа сцялілі. Дажэ гаварылі, што ад блох харашо Ці праўда, ці не. [*А вот, можа ўспомніце, Вы сказалі блохі. А вот у вайну балелі чым небудзь такім? Блохамі, вшывасцю?*] Было, было. Клапоў, блох было. І вшы былі. Усяго было. [*Як з імі спраўляцца? Як спраўляліся з блохамі?*] А я ўжо і не помню як з імі спраўляцца. Ну, адзежу, канешне, стараліся, каб кіпятком яе пракіпяціць там. У бочку якую, а тады туды гарачай вады. Ну вот і аір гэты самы. Гаварачь, што блохі дохнуць. Ці праўда, ці не.

[*А чым адзежу мылі раней?*] Вот адзежу мы ў асноўным з попела вадой. Вот. Загружалі, насыпалі попелу там у якую бочку, а тады туды ваду грэлі. Гарачай вады. Пастаіць, адстаіцца. І адзежу мылі, і галовы мылі, і самі мыліся. Мыла было. Ну якое мыла пасля вайны? Самі варылі мыла, там, з якіх атходаў, мясных асобена. Курыца там і косці, там, якога парасёнка рэжуць. Тады ўсе адходы гэтыя вараць. Мыла, помню, доўга вараць. Пака застынець.

[*А вось, можа ўспомніце. У вас бані тапілі па чорнаму? Ці быў комін?*] Па-чорнаму, па-чорнаму. [*А можаце расказаць, як гэта была?*] Ну як. Па-чорнаму. Перамычына, зверху кацёл. І многа такіх было. После вайны, кажуць, салдацкі кацёл. Такі вот круглы. Вот. Умураваны, а падніз дровы ложыш і так яно топіцца. І пад катлом гэтым вада гарыць, а далей там камянёў накідана. Зроблена. Камні грэюцца сначала, вада сперадзі, а ззадзі камні. Вот. Ну і вада гэта сагрэецца. Ну і мыюцца. Гэта называлі "лугам". Там, дзе гэты попел стаіць. Адстаіцца зверху. І бяльё, і самі мыліся.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1938 г.н.***
***у в. Слабодка Браслаўскага р-на***

***

[*А вот, можа помніце, где соль бралі? Вот солі ж не было, магазіны не работалі. Да і дзенег вот…*] Мы мыліся шчолакам. [*Шчолакам. А что такое “щолак”?*] Зала. Залой, гэта самае. Вады нальюць, зала, яна скользкая, як мыла. Гэта сальюць, – так і мыліся вот. [*Ды і сціралі тожа так?*] І сціралі.

***Запісана ў 2021 г. ад жанчыны 1926 г.н. у аг. Друя Браслаўскага р-на***

***

Ну, мы малыя былі (я з 37-га). З лесу выйшлі, і сколькі мне там было? Гадоў шэсць. Нічога не было – усё пагарэла. Што на нас было? А мы з крышы, з бані, з істопкі, адну палавіну гэту знялі і гэтак выйшаўшы. Не было немцаў, ціха ўсё, – пагарак. А як было добра пад гэтай крышай – нікаго не баяліся! Гэта очэнь было харашо. А мы з лесу, – не было, каб лячыць кляшчэй, – чэшымся. А тады кароста стала, – венікаў не было. [*А што рабілі, калі там кароста?*] Як лячылі? Шчавук такі. [*А гэта што, ветачкі?*] Конскі шчавель, карнямі. А ў корнях, краскі такі жоўтай. І ўжо змазвалі па руках, гэтую каросту. Цяпер часотку находзяць на жываце, так рукі параз’ядае.

[*А вошэй ганялі?*] Адзін у аднаго шукалі. І вот выйшаўшы із лесу звязала коўтачку сябе і адзела. Памытая, ўсё, кіпятком палівала. Гэта рукамі сшытая? Гэтак, кажу: мама, глянь, – я ў кіпяток кідала кіпяціла. У бане ў кажнага свой тазік, кожны мыецца, а тады ўсе з адной бочцы. А тады прынясеш як гэты катуль гэтай адзежы, а там і блохі такія куслівыя. Тады на печку ўсё, на пар. Тады трэскаеш, а тады памыеш. Не дай!.. Тады клапоў, як пазавазілі! [*А ад клапоў што?*] Дзеці малыя – люльку гэту, калыску, кіпятком. А яны не баяцца, усё раўно жывуць! А неяк вывеліся, не стала іх…

***Запісана ў 2009 г. ад жанчыны 1937 г.н., жанчыны 1942 г.н., жанчыны 1936 г.н. у в. Тумілавічы Докшыцкага р-на***

***

Ай, было гадасці! А клапоў, а клапоў... Дзе былі блохі і вошы ў хаце – па палу кіпяток. Палынь варылі, ашпарывалі. А з галавы вычэсавалі, спасаліся. Ну, а после ўжо дуст паявіўся. Як паявіўся дуст, – на базары, помню, купіла, белы – дуст быў, называўся эта ж вот. После ўжо ў маей маладосці мы лён дустам падкармлівалі дажэ. Лён сеялі тут у нас, і мы дустам падкармлівалі яго. А тады я панясла ягады прадаваць на базар, ужо трошку падрасла,

і купіла дусту. Ягады прадала. А пачочак, як сода, як вот сода пачочак, вот такі белы дуст. І вот этага дуста, мы ў бане яшчэ жылі, там, у бане. У этай бане было прусакоў!.. Вот эты, як цяпер называюцца “тараканы” – эта прусакі. Тараканы былі чорныя такія, бальшыя, вусы длінныя, а прусакі – эта небальшэнькія такія, яны тожэ вусатыя і небальшэнькія. Што іх было! Дзе ў бане, там жэ не абклеена, не крашэна. Вядома ж, – баня. Дзе якія шчэлкі – толькі вусамі (шавеляць)…

Прынясла мама на ножык, на кончак, і па шчэлках па гэтых дусту панямножку. Дзе яны дзелісі? Невядома. А так было. У бане ўжо печ зробілі, неяк есць было сварыць. Іх (прусакоў) – цьма-цьмушчая па печы па гэтай: неяк есці дастаць! Вот такая гадасць была. Во, прыняслі былі ўсякай халеры. Гэта, мы кажам годы ўжо после, як паўзраслелі, кажам, што гэта ад перападаў воздуха. Чужыя людзі перайшлі. Эта ж вабшчэ другі народ быў, другі говар. Другое ўсё. [*Гэта вы пра немцаў*?] Пра немцаў.

***Запісана ў 2020 г. ад жанчыны 1933 г.н.***
***у в. Мажуйкі Ушацкага р-на***

***

[*Калі нарадзецца, аддзенне адкуль бралі для рабёначка?*] Ну, аддзенне ўжо зналі. Я, калі я ражу, садзілася і шыла сама. Так для кой куклы распашонкі шыла, а цяпер спалытна было. Можа, пяленка, палатняная пяленка. Усе жы было палатнянае, палатняная адзежа, з лену ўсе ткалі, саматканыя. Даўней, знаеце, как жанчынам цяжка было? Хлеб нада спячы і пасціраць усе. Гэта цяпер сціральная, гэтак яшчэ не такая. Даўней жа ўсе выжмакаеш у руках. І не была ні мыла, нічога. Вады нагрэеш, залы насыпіш і як мыльнае ўсе. Даўней жа ўсе дзераўное было, з льну аддзеваліся. Я скажу, верхнія брукі палатняныя, сінія, красны. [*А чым?*] Краскай. Куплялі неяк у магазінах. А цяжка было сціраць усё гэтае льняное. Тады абмягчыцца, становіцца такое каламнятае. А цяпер сядзіць, – гэтая сціральная машына. Нада мужык, каб лепшую купіў!..

***Запісана ў 2010 г. ад жанчыны 1920 г.н.***
***у в. Шо Глыбоцкага р-на***

## ЗМЕСТ

Прадмова ........................................................................................ 3
Пасляваенная вёска Паўночнай Беларусі:
узровень жыцця і стратэгіі жыццезабеспячэння .......................................... 5
Штодзённасць вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі
пасля вызвалення ад нацысцкай акупацыі
і ў перыяд пасляваеннага аднаўлення ......................................................... 53
Вёска Паўночнай Беларусі ў фотаздымках эпохі ........................................ 89
Святочна-абрадавая культура ................................................................... 110
Народныя спосабы лячэння. Гігіена .......................................................... 160

*Навуковае выданне*

# ПАСЛЯВАЕННАЯ ВЁСКА ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ Ў ДЫСКУРСЕ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ

Зборнік матэрыялаў экспедыцый
Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў

Складальнікі
СУМКО Алена Вячаславаўна
АЎСЕЙЧЫК Уладзімір Яўгенавіч

Рэдактар: *І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі: *аддзел па сувязях з грамадскасцю*

Падпісана да друку 26.12.24. Фармат 60×84 1/16. Бумага 80 г/м$^3$. Цыфравы друк.
Ум. друк. арк. 11,38. Улік.-выд. арк. 11,16. Тыраж 130 экз. Заказ 490.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 27.05.2004.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.